НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ

Восень 1939 года ў гістарычным лёсе Беларусі

НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ
Інстытут гісторыі

Восень 1939 года ў гістарычным лёсе Беларусі

*Матэрыялы
Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі
(Мінск, 24 верасня 2009 г.)*



Мінск
«Беларуская навука»
2010

УДК 94(476)“1939”(082)
ББК 63.3(4Беи)я43
В76

Выданне падрыхтавана ў рамках выканання Дзяржаўнай комплекснай праграмы навуковых даследаванняў на 2006–2010 гг. «Гісторыя беларускай нацыі, дзяржаўнасці і культуры» (навуковы кіраўнік праграмы – доктар гістарычных навук прафесар А. А. Каваленя), заданне «05» – «Станаўленне і развіццё беларускай дзяржаўнасці ў геапалітычных працэсах XIX–XX стст.» (навуковы кіраўнік – кандыдат гістарычных навук дацэнт М. У. Смяховіч)

Рэцэнзенты:

доктар гістарычных навук, прафесар Я. К. Новік;
доктар гістарычных навук, дацэнт У. І. Кузьменка

Восень 1939 года ў гістарычным лёсе Беларусі : матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф. (Мінск, 24 верас. 2009 г.) / рэдкал. : А. А. Каваленя (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. навука, 2010. – 414 с.

В76

ISBN 978-985-08-1187-5.

У кнізе прадстаўлены матэрыялы Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Восень 1939 года ў гістарычным лёсе Беларусі», якая адбылася ў Мінску 24 верасня 2009 г. У дакладах і паведамленнях беларускіх і замежных даследчыкаў на багатым фактычным матэрыяле з выкарыстаннем новых архіўных дакументаў і найноўшых дасягненняў гістарыяграфіі адлюстравана складаная і шматпланавая праблема гістарычнага лёсу Беларусі ў міжваенны і пасляваенны перыяд.

Адрасавана студэнтам і магістрантам, аспірантам і суіскальнікам, спецыялістам у вобласці сусветнай і айчыннай гісторыі, шырокаму колу чытачоў.

УДК 94(476)“1939”(082)
ББК 63.3(4Беи)я43

ISBN 978-985-08-1187-5

АРГКАМІТЭТ

Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі
«ВОСЕНЬ 1939 ГОДА
Ў ГІСТАРЫЧНЫМ ЛЁСЕ БЕЛАРУСІ»

Каваленя Аляксандр Аляксандравіч – Акадэмік-сакратар Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, дырэктар Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, доктар гістарычных навук, прафесар (старшыня аргкамітэта);

Даніловіч Вячаслаў Віктаравіч – намеснік дырэктара па навуковай працы Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт (намеснік старшыні аргкамітэта);

Смяховіч Мікалай Уладзіміравіч – загадчык цэнтра гісторыі індустрыяльнага грамадства Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт (кіраўнік сакратарыята);

Анофранка Наталля Васільеўна – малодшы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі;

Ганчарэнка Кірыл Дзмітрыевіч – лабарант І катэгорыі Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі;

Жылінскі Марат Генадзевіч – вучоны сакратар Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт;

Забаўскі Мікалай Міхайлавіч – дэкан гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя Максіма Танка, доктар гістарычных навук, прафесар;

Зенчанка Сяргей Валянцінавіч – малодшы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі;

Ладысеў Уладзімір Фёдаравіч – прафесар кафедры новай і навейшай гісторыі Беларусі Беларускага дзяржаўнага універсітэта, вядучы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, доктар гістарычных навук;

Літвін Аляксей Міхайлавіч – загадчык аддзела ваеннай гісторыі і міждзяржаўных адносін Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, доктар гістарычных навук, прафесар;

Мазец Валянцін Генрыхавіч – старшы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт;

Несцяровіч Мікалай Барысавіч – старшы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, кандыдат гістарычных навук;

Новік Наталля Яўгенаўна – старшы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт;

Ходзін Сяргей Мікалаевіч – дэкан гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта, кандыдат гістарычных навук, дацэнт;

Яноўская Валянціна Васільеўна – загадчык сектара гістарыяграфіі і метадаў гістарычнага даследавання Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт.

ДАКЛАДЫ НА ПЛЕНАРНЫМ ПАСЯДЖЭННІ

А. А. Каваленя

Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Мінск

ЦЯРНОВЫ ШЛЯХ УЗ'ЯДНАННЯ БЕЛАРУСІ

Гісторыя не толькі настаўніца жыцця, аб чым сцвярджалі старажытныя мудрацы, гісторыя – гэта невычарпальная крыніца народнай мудрасці, духоўная скарбонка збліжэння і паразумення паміж народамі, пераадольвання нацыянальнага і канфесійнага супрацьстаяння. Вядома, што гісторыя толькі тады добра служыць людзям, калі мінулае паказваецца аб'ектыўна, асабліва найбольш складаныя і супярэчлівыя яго старонкі. Вельмі важна, каб лёс народа і фарміраванне яго дзяржаўнасці асвятляліся не ў чорна-белым колеры, як гэта робіцца іншым часам, а раскрываліся ва ўсёй паўнаце развіцця падзей, іх узаемасувязі і ўзаемаўплыве. Прычым для доказнай інтэрпрэтацыі гістарычнага вопыту недастаткова выпадковых, тым больш ангажыраваных крыніц, навукоўцы абавязаны выкарыстоўваць па магчымасці самы шырокі пласт разнастайных дакументальных матэрыялаў, абапіраецца на дакладныя факты, а не абмяжоўвацца агульнымі развагаміі і заключэннямі, тым больш пошукам таго, хто вінаваты.

Апошнія месяцы, асабліва напярэдадні 70-годдзя падпісання пакта Рыбентропа–Молатава і пачатку Другой сусветнай вайны, гэтыя падзеі даволі актыўна эксплуатуюцца прадстаўнікамі розных палітычных плыняў. Некаторыя з іх імкнуцца паставіць у адзін рад фашызм і сталінізм. Прыходзіцца з жалем канстатаваць, але фактам з'яўляецца тое, што і сёння гісторыя выкарыстоўваецца як палітычная зброя, дзеля вырашэння пэўных палітычных мэт. Вялікая шкоднасць такога падыходу ў тым, што мінулае ацэньваецца з пазіцый сучасных уяўленняў, якія пераносяцца на канкрэтную палітыку ў адносінах той ці іншай краіны

альбо асобы. На жаль, нават і пасля 70 гадоў пасля пачатку Другой сусветнай вайны зноў і зноў уздымаецца пытанне аб роўнай адказнасці нацысцкай Германіі і СССР за распальванне вайны. Здавалася, што прынятыя рашэнні ў Ялце (1945 г.), Нюрнбергу (1946 г.) і Хельсінкі (1975 г.) дазваляюць сусветнай грамадскасці і палітычным элітам дзейнічаць у межах выпрацаваных міжнародных актаў. Аднак хваля супярэчлівых, самавыключных ацэнак передваеннага і ваеннага перыяду працягваецца. Цікава тое, што ў апошнія гады грамадскі інтарэс не толькі не заціхае, а наадварот, распальваецца з яшчэ большай сілай. Парадокс у тым, што новае абвастрэнне ніяк не звязана з выяўленнем і публікацыяй новых дакументаў і матэрыялаў, якія б дазвалялі па-новаму асэнсоўваць падзеі, узбагачалі гістарычны працэс раней невядомымі фактамі. Як вядома, у 1990 г. Міністэрства замежных спраў СССР апублікавала зборнік дакументаў «Год кризиса, 1938–1939: документы и материалы» [1], дзе былі змешчаны многія раней невядомыя дакументы і пратаколы дагавораў, якія былі заключаны паміж Германіяй і СССР, у тым ліку і сакрэтны пратакол. Як бачна, пытанне не ў новых сенсацыйных фактах, а ў іх новай інтэрпрэтацыі, якая звязана з сучаснай маральнай і палітычнай ацэнкай.

Не толькі заходнія публіцысты, палітыкі і ангажыраваныя навукоўцы ўдзельнічаюць у пераацэнках падзей передваеннай і ваеннай гісторыі. Расійскі кніжны рынак перанасычаны самымі рознымі, нават неверагоднымі небыліцамі. У пагоні за чытачом, ды і не толькі, некаторыя аўтары імкнуцца стварыць «шэдэўры» накшталт «Национал-социалистический меч оттачивался с НКВД СССР», «НКВД–гестапо: тайное сотрудничество», працягвае ствараць свае праекты Разун-Сувораў. Прыхільнікі заходніх каштоўнасцей гатовы прыпісаць Савецкаму Саюзу ўсе магчымыя і немагчымыя грахі, каб насаджаць у памяці людзей успамін аб СССР як «імперыі злачыннасці». Такая актыўная кампанія нігатывізму, якая накіравана на дэскрыдытацыю савецкага мінулага, прыносіць свае разбуральныя вынікі, уносіць сумяціцу ў душы не толькі маладога пакалення, але і ўсяго грамадства. У сувязі з гэтым нагадаем, што нашы апаненты робяць гэта асэнсавана і мэтанакіравана, цэлячыся ў мінулае, яны пападаюць у будучыню і разбураюць яе.

За прыкладам далёка хадзіць не патрэбна. Ужо ў пачатку ліпеня 2009 г. Парламенцкая асамблея Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе прыняла рэзалюцыю «Объединение разделенной Европы: защита прав человека и гражданских свобод в XXI веке в регионе ОБСЕ», якая фактычна прыраўняла нацызм і сталінізм. Не паглыбляючыся ў дэталёвы аналіз дакумента, зразумела адно – еўрапейскаму грамадству прапанавана своеасаблівая форма дыктата сучаснасці над мінулым. Гэта небяспечны падыход, бо гісторыю спрабуюць ацэньваць і асуджаць з улікам сучасных маральных крытэрыяў, прычым, па неабгрунтаваных і надуманых праблемах. У дадзеным выпадку здаецца, што еўрапейцы забылі, хто іх выратаваў ад карычневай чумы.

На жаль, і некаторыя замежныя даследчыкі не толькі адстойваюць ранейшыя пазіцыі, але і ствараюць новыя міфы. Вось свежы прыклад. Дырэктар Польскага інстытута міжнародных спраў Славамір Дэмбскі апублікаваў у спецыяльным выпуску весніка артыкул «Польша, Советский Союз, кризис версальской системы и причины начала Второй мировой войны». Разглядаючы дзейнасць палітычнай эліты Польшчы і СССР у перадваенны перыяд, аўтар асноўную ўвагу ўдзяліў праблеме мадэрнізацыі Версальскай сістэмы. Раскрываючы дасягненні і пралікі ў працэсе фарміравання міждзяржаўных адносін у міжваенны перыяд, аўтар зазначае, што ў «...приходе к власти нацистов в Германии, чему в значительной степени способствовала Москва, предписывая германским коммунистам бороться не с нацистами, а с социал-демократами, Сталин видел симптом кризиса капиталистического мира» [2, с. 53].

Як кажуць – «прыехалі». Вядома, што пасля развалу СССР усю адказнасць за пралікі і памылкі, якія безумоўна мелі месца ў міждзяржаўных адносінах у 30-я гады XX ст., можна ўскласці на лідэраў савецкай дзяржавы. Але гэта антынавуковы падыход, імкненне штучна палітызаваць гістарычныя падзеі. Навукоўцам важна аб'ектыўна высветліць развіццё міждзяржаўных адносін, а не шукаць вінаватых. Пры такім метадалагічным падыходзе не выключана пастаноўка іншых праблемных пытанняў. Напрыклад, што здзейснілі лідэры заходніх дэмакратый, каб не дапусціць станаўлення германскага нацызму? Хто садзейнічаў разбу-

рэнню Версальскіх дамоўленасцей? Хто фінансаваў нацысцкія праекты? Як супрацьстаяла станаўленню германскага нацызму Варшава? Хто спрыяў заключэнню Мюнхенскага дагавора? Пытанні можна працягваць... Зразумела, што пошук аб'ектыўных адказаў на гэтыя і многія іншыя праблемы дазволіць праліць святло і, магчыма, убачыць чорнага ката ў чорным пакоі.

Агульназразумела, што жаданне ідэалізаваць дзейнасць палітычнага кіраўніцтва СССР, у тым ліку і І. В. Сталіна, – справа антынавуковая. Сёння кожнаму вядома, што ў тыя гады было дапушчана шмат памылак, пралікаў і нават злачынстваў. Але і здзейснена было нямала. За кароткі тэрмін у краіне ўзведзены тысячы новых прамысловых прадпрыемстваў, шахт, руднікоў, пабудаваны новыя гарады, значнае развіццё атрымала адукацыя, навука, культура. І калі ўсё станоўчае і адмоўнае прыпісваць толькі асобе І. В. Сталіна, то тым самым прызнаваць яго бязмерную геніяльнасць і палітычную ўнікальнасць. А з другога боку, акрэслены падыход у ацэнцы гістарычнага працэсу не дазваляе ўбачыць стваральнай працы мільёнаў людзей, іх гістарычнага месца ў агульным працэсе сацыяльна-эканамічных пераўтварэнняў XX ст.

Вядома, што шматлікія захады, якія накіраваны на агульную крытыку і ахайванне савецкага мінулага і яго палітычных лідэраў, – справа не выпадковая, гэты працэс разлічаны на падтрыманне напружанасці ў грамадстве, недаверу народа інстытутам дзяржаўнай улады. Разгляд складаных працэсаў сацыяльна-палітычнага развіцця грамадства ў адрыве ад гістарычнага часу, без уліку ўсяго комплекса станоўчых і адмоўных падзей, без глыбокага аналізу ўзаемаўплыву сусветных палітычных і сацыяльна-эканамічных працэсаў, якія непасрэдна і апасрэдавана ўплывалі на стан грамадскага жыцця, – справа контрпрадуктыўная, антынавуковая і, зразумела, прыстасаваная да патрэб дасягнення пэўных палітычных мэт.

Апошнім часам, асабліва напярэдадні 70 гадавіны заключанага 23 жніўня 1939 г. Дагавора аб ненападзе паміж Германіяй і СССР, у СМІ актыўна абмяркоўваюцца падзеі таго часу. У пачатку нашай размовы неабходна зрабіць адну прынцыповую рэмарку. Справа ў тым, што не толькі публіцысты і журналісты,

але і гісторыкі робяць сур'ёзную памылку, калі падпісаны Дагавор аб ненападзе паміж Германіяй і СССР называюць «савецка-германскі дагавор», альбо «пакт Молатава–Рыбентропа», што з'яўляецца гістарычна памылковым і прыстасавана да вядомага палітычна-метадалагічнага падтэксту. Сутнасць у тым, што пэўныя дакументальныя крыніцы адназначна сведчаць аб тым, што ініцыятыва заключэння дамовы зыходзіла не ад кіраўніцтва Савецкага Саюза, а ад палітычных лідэраў Трэцяга Рэйха. Дакументальная спадчына яскрава сведчыць пра тое, што менавіта Гітлер і яго акружэнне праяўлялі не проста намаганні, а ў пэўным сэнсе вядомае вераломства дзеля хутчэйшага заключэння дамоўленасці паміж Германіяй і СССР. Ведамства Рыбентропа падштурхоўвалася да актыўных дзеянняў дзеля хутчэйшага заключэння германска-савецкай дамовы. Невялічкі экскурс у праблему сведчыць аб тым, што аб'ектыўным і гістарычна пераканаўчым з'яўляецца ўжыванне такіх дэфініцый, як «пакт Рыбентропа–Молатава», «германска-савецкі дагавор», што дакладна перадае рэальнае развіццё знешнепалітычных падзей таго часу.

Аналізуючы стан міждзяржаўных адносін у перадваенныя гады, звернем увагу на той факт, што пакт Рыбентропа–Молатава – гэта даволі складаная палітычна-дыпламатычная падзея. Яе нельга спрошчана разглядаць і ацэньваць, тым больш без уліку ўсяго комплексу супярэчлівых міждзяржаўных адносін, якія адбываліся ў свеце ў 30-я гады XX ст.

У гэтым рэчышчы неабходна падкрэсліць яшчэ адзін важны момант. А менавіта той факт, што асэнсаванне міжнародных падзей у краінах Еўропы ў пачатку XX ст. патрабуе зазірнуць крыху ў глыб гісторыі, што дазволіць зразумець некаторыя глыбінныя працэсы, якія адбываліся яшчэ да Мюнхена і да пакта Рыбентропа–Молатава. Пытанне становіцца відавочным, калі аналізаваць праблему з улікам нацыянальна-дзяржаўных інтарэсаў беларускага народа, пераемнасці яго гісторыі. Пры гэтым вельмі важна падкрэсліць, што Рэспубліка Беларусь – гэта не толькі суб'ект міжнароднай палітычнай сістэмы, але і дзяржава, якая мае не толькі абавязкі, але і правы адстойваць гістарычную нацыянальна-дзяржаўную спадчыну і нацыянальныя інтарэсы.

Разгляд праблемы патрабуе акцэнтаваць увагу на тым факце, што ў пачатку XX ст. пытанне нацыянальна-дзяржаўнай незалежнасці Беларусі знаходзілася толькі ў зародкавым стане. Беларуская нацыянальная эліта ў той час не мела дастаткова значнай знешнепалітычнай вагі. Тым не менш, нават у гэтай сітуацыі нацыянальныя сілы аказаліся здольнымі паставіць перад міжнароднай супольнасцю пытанне аб фарміраванні беларускай дзяржаўнасці. Актыўную пазіцыю займалі дзеячы беларускага нацыянальнага руху: Антон Аўсянік, Алесь Бурбіс, Язэп Варонка, Тамаш Грыб, Лявон Заяц, Васіль Захарка, Усевалад Ігнатоўскі, Канстанцін Езавітаў, Яфім Карскі, Язэп Канчар, Пётр Крэчэўскі, Антон Луцкевіч, Іван Луцкевіч, Язэп Лёсік, Іван Серада, Раман Скірмунт, Аркадзь Смоліч, Адам Станкевіч, Браніслаў Тарашкевіч, Аляксандр Цвікевіч і інш. Яны імкнуліся данесці свой голас у абарону беларускай дзяржаўнасці.

Зразумела, што ў той час многія міждзяржаўныя працэсы адбываліся без уплывовага ўдзелу беларускай нацыянальнай эліты. Яскравым прыкладам таму з'яўляецца заключэнне Брэсцкага і Рыжскага дагавораў. Фактам застаецца і тое, што вырашэнне пытанняў дзяржаўнай цэласнасці Беларусі і ў першым і ў другім выпадках адбывалася без запрашэння і афіцыйнага ўдзелу беларускіх прадстаўнікоў. Ні міжнародная супольнасць, ні нават Савецкая Расія не праявілі неабходнай настойлівасці ў захаванні дзяржаўнай цэласнасці Беларусі. Тым больш, што нічога канструктыўнага не было здзейснена з боку кіраўніцтва Польшчы, якая наадварот усяляк ігнаравала праблему беларускай дзяржаўнасці. Прыгожы лозунг «За вашу і нашу свабоду!», які шырока прапагандавалі рэвалюцыйныя сілы Польшчы ў перыяд барацьбы з расійскім царызмам, аказаўся на практыцы зусім забытым польскім кіраўніцтвам, асабліва пасля падпісання ў сакавіку 1921 г. Рыжскага мірнага дагавора[1].

[1] Больш падрабязна гл.: Брыгадзін, П. Фарміраванне ідэі беларускай дзяржаўнасці ў 1917–1918 гг. / П. Брыгадзін, У. Ладысеў. – Мінск, 1998; Тихомиров, А. В. Дипломатия БНР в период послевоенного обустройства Европы и польско-советской войны (ноябрь 1918 – март 1921 г.) / А. В. Тихомиров [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: //http://library.by/portalus/modules/belarus/referat_readme.php?subaction=showfull&id=1141338827&archive=&start_

Пры гэтым варта падкрэсліць і зазначыць той факт, што вайну 1920 г. развязала Польшча. З гэтага вынікае, што мірны дагавор, які быў падпісаны ў Рызе, прычым без удзелу прадстаўнікоў беларускага народа, стаў актам гістарычнай несправядлівасці, які навязаў агрэсар сваёй ахвяры, а значыць гэты дагавор не мог і не быў справядлівым у адносінах беларускага народа. Дарэчы, гэтаму прынцыповаму і вельмі важнаму палітычнаму і нацыянальна-дзяржаўнаму факту недастаткова ўвагі ўдзяляюць не толькі настаўнікі і выкладчыкі ВНУ ў працэсе выкладання гісторыі, але і навукоўцы пры асэнсаванні гісторыі беларускай дзяржаўнасці. Дадзены пастулат павінен з'яўляцца зыходным і для палітычных лідэраў нашай дзяржавы пры выпрацоўцы канцэптуальных падыходаў знешнепалітычнай дзейнасці.

Важна нагадаць, што такое развіццё палітычных падзей было негатыўна ўспрынята ў нацыянальна-свядомым беларускім асяродку. Напрыклад, лідэры Беларускай народнай рэспублікі празмерна крытычна ацанілі звестку аб заключэнні Рыжскага мірнага дагавора. Ужо 25 сакавіка 1921 г. быў прыняты даволі рэзкі зварот да міжнароднай супольнасці, у якім выкрывалася злачынная сутнасць заключанага дагавора ў адносінах да беларускага народа. У прынятым дакуменце, у прыватнасці, значылася: «У Рызе 18 сакавіка 1921 года ўчынен цяжкі праступак урадамі Польскай і Савецка-Расійскай Рэспублік супраць 16-мільённага насялення Беларусі. Гэты ганебны праступак носіць названне мірнай умовы паміж Польскай Дэмакратычнай Рэспублікай і Расійскай Савецкай Рэспублікай. Польшча і Расія, не маючы паміж сабою супольных граніц, тры гады ваявалі на тэрыторыі Беларускай Рэспублікі, палілі, руйнавалі, грабілі і мучылі насельніцтва, а ўрэшце, завяршаючы бясконечны рад сваіх бясправій, раздзерлі жывое цела Беларускага народу надвое. Польшча заграбіла заходнія, а Расія – усходнія беларускія землі. Рыжскі польска-бальшавіцкі мір –

from=&ucat=8&; Ладысеў, У. Ф. Насуперак волі народа: з гісторыі палітычнага банкруцтва беларускіх нацыяналістычных партый і арганізацый у Заходняй Беларусі / У. Ф. Ладысеў. – Мінск, 1976; Цвикевич, А. Краткий очерк возникновения Белорусской Народной Республики / А. Цвикевич. Киев, 1918. (Репр. изд. – Минск, 1990).

гэта кашмарная насмешка над дэмакратыяй і яе ідэаламі. Імя яму насілле і грабёж.

Урад Б.Н.Р. імянем Беларускага народа заносіць самы гарачы пратэст перад усімі культурнымі дзяржавамі і народамі свету, шукаючы заступніцтва і справядлівасці, і заяўляе:

1. Мір, разрываючый на часці жывы арганізм Беларусі, ніколі не будзе прызнаны Беларускім народам;

2. Супраць гвалту і паняволення Беларускі народ бароўся і будзе бароцца да канца за сваю незалежнасць і непадзельнасць» [3].

У гэтым рэчышчы важна зазначыць, што не толькі радыкальна настроеная частка беларускай нацыянальнай эліты, але і свядомая частка інтэлігенцыі востра адчувалі і пастаянна выказвалі пратэсты супраць падзелаў адзінага арганізма беларускага народа. Вельмі важна нагадаць, што непарыўная нітка гэтых ідэй сягае ў глыб нацыянальнай гісторыі, яны ад асветніцы Ефрасінні Полацкай і беларускага златавуста Кірылы Тураўскага, Францыска Скарыны і Мікалая Гусоўскага, Сымона Буднага і Пятра Мсціслаўца, Льва Сапегі і Мялеція Смятрыцкага, Сімяона Полацкага і Казіміра Лышчынскага, Георгія Каніскага і Марціна Пачобута, Міхаіла Агінскага і Тэадора Нарбута, Івана Насовіча і Яна Чачота, Тамаша Зана і Адама Міцкевіча, Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча і Станіслава Манюшкі, Францішка Багушэвіча і Ігната Буйніцкага, Яфіма Карскага і Алаізы Пашкевіч і многіх многіх іншых, хто сваёй руплівай працай унёс вялікі ўклад у справу нацыянальнага самавызначэння.

Яшчэ перад Першай сусветнай вайной духоўным арганізуючым набатам прагучала абагульняючая думка значнай часткі творчай інтэлігенцыі. Яна выкладзена ў адным з вершаў, які быў надрукаваны ў 1913 г., пачынаючым паэтам Беларусі – Янкам Купалам. З болем у сэрцы і крыкам душы паэт перадае ўвесь трагізм фарміравання беларускай нацыі. Радкі верша напоўнены жалобным зваротам да роднага народа, да ўсіх тых, хто можа дапамагчы выправіць гістарычную несправядлівасць, якую многія стагоддзі трывае беларускі народ. Паэт пранікліва і з вялікай надзеяй на светлую будучыню беларускага народа, верай у набыццё ім дзяржаўнай незалежнасці ў сваім вершы «Над Нёманам» распавядае:

«Рынкам жывога тавару няслава.
Край ўвесь зрабіла, загнала на ўбой,
Дзе ўжо лет сотні Масква і Варшава
Торг груганоўы вядуць між сабой...»

Вядома, што агульная большасць нацыянальна свядомай інтэлігенцыі, тых, хто разумеў важнасць вырашэння пытання фарміравання беларускай нацыі і дзяржаўнасці шмат рабілі дзеля спаўнення векавой мары беларускага народа. Сваім паэтычным дарам яны абуджалі беларускі народ, заклікалі да барацьбы за набыццё нацыянальна-дзяржаўнай незалежнасці. Даволі востра адгукнуўся на Рыжскі дагавор і будучы класік беларускай літаратуры Якуб Колас. У вершы «Беларускаму люду» ён выклаў яскрава акрэсленую ацэнку здзейсненай падзеі, якая ў чарговы раз падзяліла беларускі народ:

Хіба забудзем мы тыя межы,
Што правадзілі бяз нас?
Раны глыбокі, ох, яшчэ свежы!
Помсты агонь не пагас.

Нас падзялілі – хто? Чужаніцы,
Цёмных дарог махляры.
К чорту іх межы! К д'яблу граніцы!..
Нашы тут гоні, бары!

Аднак эмацыянальна-абвостраныя пачуцці прадстаўнікоў БНР і нацыянальнай інтэлігенцыі аб ганебнасці Брэсцкага і Рыжскага дагавораў, спроба данесці гэтыя ідэі да палітычнай эліты еўрапейскіх краін так і засталіся незаўважанымі заходнімі лідэрамі. Наперакор гістарычнай рэчаіснасці і этнічным межам, Рыжскі дагавор па-жывому правёў тэрытарыяльную мяжу, якой падзяліў адзіны арганізм беларускага народа. У склад Польшчы было далучана амаль 113 тыс. км^2 беларускай тэрыторыі з насельніцтвам 4,6 млн чалавек. Неабходна прызнаць, што гэта гістарычны факт, з якім можна пагаджацца ці не пагаджацца, але несумненна тое, што ў першай палове XX ст. супраць волі беларускага народа адбыліся два падзелы Беларусі [4, с. 53].

Тым не менш, як было наканавана развіццём палітычных падзей у Еўропе, верасень 1939 г., як ужо адзначалася, стаў лёсавы-

значальным у грамадска-палітычным жыцці беларускага народа. Зробім невялікі экскурс і паспрабуем высвятліць, якія найбольш значныя падзеі міжнароднага жыцця ў гэты перыяд адбываліся? Гэта дапаможа зразумець, чаму савецкае кіраўніцтва прыняло рашэнне заключыць Дагавор аб ненападзе паміж Германіяй і СССР.

Пасля прыходу ў Германіі да ўлады нацыстаў галоўным напрамкам дзейнасці палітычнага кіраўніцтва на міжнароднай арэне стала патрабаванне вярнуць тэрыторыі і адмяніць абмежаванні на ўзбраенне Трэцяга Рэйха, якія былі прадугледжаны ўмовамі Версальскага дагавора. Вялікабрытанія і Францыя выявілі гатоўнасць да ўступак агрэсіўным намерам германскага кіраўніцтва ў абмен на ўзаемныя гарантыі бяспекі. Яны лічылі, што такім чынам можна будзе ўлагодзіць нацысцкі рэжым, а гэта дапаможа вырашыць супярэчнасці, якія ўзніклі паміж Англіяй і Францыяй, з аднаго боку, і Германіяй, Італіяй – з другога.

Важна нагадаць, што ў гэты час нацысцкаму кіраўніцтву Германіі ўдалося разгарнуць у краіне небывалую кампанію прапаганды шавінізму. Палітычныя лідэры ўзялі на ўзбраенне асновы ўнутрыпалітычнага жыцця Трэцяга Рэйха, нават, зрабілі стрыжням і важнейшым ідэалагічным інструментарыем ідэю расавай выключнасці германскай нацыі. Зазначым, што гэты пастулат эфектыўна выкарыстоўваўся дзеля паспяховай рэалізацыі ў грамадстве палітыкі нацыянал-сацыялізму, з'яўляўся эфектыўным стымулятарам распальвання варожасці і нянавісці да іншых народаў. Нацыяналізм паразітаваў на біялагічных пачуццях людзей: захаванні і прадаўжэнні роду арыйскай расы, фізіялагічнай і фізічнай выключнасці германцаў. Нацысцкаму кіраўніцтву і яго ідэалагічнаму апарату ўдалося ў кароткі тэрмін не толькі разгарнуць шырокую хвалю нацыянальнага ўздыму, але нават разбэсціць значную частку грамадства, стварыць у краіне шавіністычны ўгар, насадзіць у шырокіх колах грамадства ідэі расізму, жорсткасці, рэваншу за «версальскую ганьбу». Нацысцкія ідэі аказаліся не толькі досыць папулярнымі, але ўспрымальнымі ў асяроддзі германскага грамадства. Так, у час грамадскага апытання ў Саарскай вобласці, якая 15 гадоў знаходзілася пад кіраваннем Лігі Нацый, быў атрыманы ўражваючы вынік. На пытанне

«Ці хочуць жыхары вярнуцца ў склад Германіі, альбо жадаюць быць часткай Францыі?» каля 90,9 % удзельнікаў плебісцыду выказаліся 13 студзеня 1935 г. за ўз'яднанне з Германіяй. У выніку 1 сакавіка 1935 г. тэрыторыя Саарскай вобласці была ўключана ў склад Германіі, якая вымушана была выплаціць Францыі кампенсацыю за вугальныя шахты.

Маючы шырокую грамадскую падтрымку, правячыя колы Германіі сталі дзейнічаць празмерна актыўна на міжнародным «полі», асабліва ігнаруючы міжнародныя версальскія рашэнні. Так, у 1935 г. нацысты аб'явілі аб аднаўленні ў краіне ўсеагульнай вайсковай павіннасці. Германскае кіраўніцтва прыступіла да стварэння моцнай арміі і авіяцыі. Ужо 21 мая 1935 г. Гітлер перайменоўвае рэйхсвер у вермахт і назначае сябе вярхоўным галоўнакамандуючым. Прычым захад не праяўляў неабходнай настойлівасці выканання германскім урадам дамоўленасцей у Версалі. Наадварот, летам 1935 г. было заключана англа-германскае марское пагадненне, якое адкрыла шлях для значнага павелічэння танажу германскага ваенна-марскога флота і будаўніцтва падводных лодак. Пры фінансавай падтрымцы заходняга капіталу ў кароткі тэрмін было пабудавана 300 новых ваенных заводаў, рэканструявана і мадэрнізавана авіяцыйная прамысловасць. Да 1938 г. ужо мелася 30 самалётабудаўнічых, 15 авіяматорных і 110 дапаможных авіяцыйных заводаў. Калі да 1932 г. у Германіі не было ніводнага ваеннага самалёта, то ўжо ў 1934 г. іх было пабудавана 840, у 1936 – 2530, у 1938 – 3350, а ў 1939 г. ужо мелася 4733 самалёты навейшых мадыфікацый. Ваенная вытворчасць Германіі з 1934 да 1940 г. вырасла ў 22 разы, што з'явілася важкай падставай для ўзмацнення ваенна-палітычнай агрэсіўнасці палітычнага кіраўніцтва Трэцяга Рэйха, асабліва пры прыняцці важных міжнародных рашэнняў.

Звернем увагу на тую акалічнасць, што значную ролю ў аднаўленні ваенна-эканамічнага патэнцыялу Германіі адыграў замежны капітал. З 1924 да 1930 г. Германія атрымала столькі ж займаў, колькі ЗША за 40 гадоў да Першай сусветнай вайны. Да сярэдзіны 30-х гадоў XX ст. у германскую прамысловасць было ўкладзена 27 млрд марак замежнага капіталу, 70 % якога належала амерыканскім фірмам [5, с. 4].

Палітычнае кіраўніцтва нацысцкай Германіі рабіла ўпэўненыя крокі па ўмацаванні сваёй уплывовасці ў знешнепалітычным жыцці. Па-першае, наладжвалася ваенна-палітычнае супрацоўніцтва з найбольш экстрэмісцкімі рэжымамі дзеля стварэння блока падтрымкі і паспяховай рэалізацыі сваіх агрэсіўных намераў. Так, 24 кастрычніка 1936 г. падпісваецца пакт аб утварэнні «восі Берлін–Рым», згодна з якім Германія прызнала анэксію Абісініі, і абедзве дзяржавы абяцалі праводзіць агульную палітычную лінію ў адносінах вайны ў Іспаніі. У лістападзе 1936 г. Германія і Японія заключылі так званы Антыкамінтэрнаўскі пакт. Ужо ў верасні 1940 г. Германія, Італія і Японія заключылі ў Берліне ваенна-палітычны і эканамічны саюз – «Траісты пакт» («вось Берлін–Рым–Токіо»). У далейшым Антыкамінтэрнаўскі блок значна пашырыўся. Да пачатку 1939 г. да яго далучыліся Венгрыя і Іспанія, а ў лістападзе 1941 г. – Балгарыя, Фінляндыя, Румынія, Сіам, Манчжоў-Го і кіраўніцтва Кітая на чале з Ван Цзінвэем, а таксама акупіраваныя гітлераўскімі войскамі Данія, Славакія і Харватыя. Акрамя акрэсленых у дагаворы мер барацьбы супраць уплыву Камінтэрна ў сакрэтным дадатку да яго прадугледжвалася абавязацельства бакоў не аказваць дапамогу СССР, калі ён будзе ў стане вайны з адным з яго ўдзельнікаў.

Заручыўшыся знешнепалітычнай і ўнутрыпалітычнай падтрымкай, германскае кіраўніцтва значна актывізавала палітыку пашырэння «жыццёвай прасторы» для арыйскай расы. Германскі фюрэр распачаў рэалізоўваць планы ўз'яднання тэрыторый, якія былі населены ў большасці немцамі. Важным крокам далейшай мілітарызацыі і ўмацавання ўплыву нацыстаў ва ўнутранай і знешняй палітыцы стаў увод 7 сакавіка 1936 г. германскіх войск у Рэйнскую дэмілітарызаваную вобласць. Рашэнне было станоўча ўспрынята большасцю насельніцтва Германіі, як факт аднаўлення яе тэрытарыяльнага суверэнітэту. Гітлер ішоў на рызыку, разумеючы, што гэты крок, які пагражаў бяспецы Францыі, мог выклікаць узброенае супраціўленне, тым больш, што суадносіны сіл былі не на карысць Германіі (яна мела 36 дывізій, а Францыя і Чэхаславакія – 55). Аднак французскі ўрад бяздзейнічаў.

Настроі палітычных апазіцыйных колаў еўрапейцаў яскрава акрэслены ў прамове У. Чэрчыля, які ў парламенце вельмі рэзка крытыкаваў дзейнасць англійскага ўрада. Міжнародную палітыку лідэраў еўрапейскіх краін ён лічыў нікчэмнай, якая патурала германскім агрэсіўным намерам. «Помня о гигантской силе и влиянии нашей страны, – падкрэсліваў дэпутат, – мы не можем испытывать удовлетворение, глядя на нашу внешнюю политику последних пяти лет. Это были годы бедствия. Какой главный факт мы должны учитывать? Вот он: невероятный триумф нацистского режима. Нарушение демилитаризованного режима Рейнской области является серьезной угрозой безопасности Голландии, Бельгии и Франции. Когда эта область будет укреплена, она станет барьером к главной двери в Германию, давая ей свободу к продвижению на востоке и на юге через свой черный ход». В то же время вся Европа увидела, что Франция не способна дать отпор немцам. Если 100 французских дивизий не осмелились противостоять трем батальонам в Рейнланде, на какую помощь могут рассчитывать союзники Франции?

Гражданская война в Испании послужила проверкой боевых возможностей новой германской армии и сплотила два фашистских государства. Италия теперь не грозила переметнуться к западным союзникам. Перевооружение стран «Оси» шло заметно быстрее, чем аналогичные процессы на Западе, а события в Испании отвлекали внимание англичан и французов. Теперь можно было начать новую фазу активных действий. Не теряя надежд заполучить в союзники Англию, Гитлер назначает послом в Лондоне Риббентропа. Одновременно, 25 ноября 1936 г. подписан направленный против СССР «Антикоминтерновский пакт». Схема «Майн Кампф» действовала эффективно. Геринг, второе лицо в государстве, сказал на закрытом заседании 17 декабря 1936 г.: «Битва, к которой мы приближаемся, требует колоссальной производительности. Предела процессу перевооружения не видно. Альтернативой являются победа или разрушение. Мы уже на пороге мобилизации и мы уже вступили в войну. Единственное, чего пока нет, это собственно стрельбы» [6, с. 4].

Вядома, што ў адпаведнасці з умовамі Лакарнскіх дагавораў[1] Германія не мела права размяшчаць у Рэйнскай вобласці свае войскі і будаваць ваенныя ўмацаванні. Аднак пасля ўвода ў дымілітарызаваную зону германскіх вайсковых фарміраванняў было распачата актыўнае будаўніцтва сістэмы магутных ваенных умацаванняў на граніцы з Францыяй[2], якая цягнулася на 500 км па мяжы з Нідэрландамі, Бельгіяй, Люксембургам, Францыяй і была ў глыб на 35–100 км, дзе пабудавана каля 16 тыс. абарончых кропак. Становішча на французска-германскай мяжы генералу де Голю бачылася больш чым песімістычна: «В зависимости от обстоятельств, мы призовем людей из резерва первой очереди, либо из запаса. А затем, глядя сквозь амбразуры укреплений, будем безучастно созерцать, как порабощают Европу» [7, с. 111].

Бяздзейнасць англійскага і французскага ўрадаў па стрымліванні агрэсіўных намераў Германіі распальвалі агрэсіўныя намеры нацысцкіх лідэраў. Германскія ваенна-палітычныя колы сталі даволі свабодна дзейнічаць у Цэнтральнай і Усходняй Еўропе. Новы акт агрэсіі – аншлюс Аўстрыі. Перад тым як здзейсніць гэты крок, Гітлер заручыўся падтрымкай брытанскага ўрада, на чале якога стаяў прыхільнік палітыкі «ўміратварэння» Германіі Н. Чэмберлен. Пад лозунгам аб'яднання зямель, населеных немцамі, 11 сакавіка 1938 г. 200-тысячнае германскае войска без супраціўлення захапіла Аўстрыю, а 13 сакавіка было аб'яўлена аб яе «ўз'яднанні» з Германіяй.

Беспакаранасць агрэсіі натхняла нацыстаў да новых акцый. Германскія агрэсары ўжо планавалі падзяліць і захапіць Чэхаславакію, якая займала выгаднае стратэгічнае становішча ў цэнтры

[1] Лакарнскія дагаворы былі заключаны паміж Германіяй, Францыяй, Бельгіяй, Вялікабрытаніяй і Італіяй у 1925 г. – сем дагавораў, падрыхтаваных на канферэнцыі, якая праходзіла ў швейцарскім Лакарно з 5 па 16 кастрычніка 1925 г. і падпісаных 1 снежня ў Лондане. Важнейшым дакументам быў Рэйнскі гарантыйны пакт, які прадугледжваў захаванне недатыкальнасці франка-германскай і бельгійска-германскай граніцы і выкананне пастаноў Версальскага дагавора 1919 г. аб дэмілітарызацыі Рэйнскай зоны. Уступілі ў дзеянне 10 верасня 1926 г. пасля таго, як Германія стала членам Лігі Нацый.

[2] У літаратуры гэта лінія атрымала назву «Заходні вал», альбо «Лінія Зігфрыда».

Еўропы і мела добра развітую прамысловасць. Фармальным поводам для захопу краіны паслужыла германскае патрабаванне да Чэхаславакіі адмовіцца ад суверэнітэту над Судзецкай вобласцю, на тэрыторыі якой пражывала нямецкая нацыянальная меншасць. У напружанай абстаноўцы, што склалася вясной 1938 г., урады Вялікабрытаніі і Францыі заявілі, што яны не збіраюцца ваяваць за Чэхаславакію і патрабавалі ад апошняй уступак Гітлеру.

Кіраўніцтва Савецкага Саюза ў пісьмовай форме запэўніла ўрад Чэхаславакіі аб тым, што з мэтай процідзеяння германскай агрэсіі СССР гатовы нават перавысіць меры, што былі прадугледжаны савецка-чэхаславацкім пагадненнем і аказаць аднабаковую дапамогу Чэхаславакіі без Францыі, калі такая просьба паступіць ад чэхаславацкага ўрада. У гэты час Вялікабрытанія і Францыя ўзмацнілі націск на кіраўніцтва Чэхаславакіі, патрабуючы прыняць германскія ўмовы і адмовіцца ад пагаднення з Савецкім Саюзам, якое было заключана ў 1935 г.

Як бачна, міжнародныя адносіны развіваліся ў значнай ступені пад дыктоўку германскага ваенна-палітычнага кіраўніцтва. Германія захапіла палітычную ініцыятыву і, абапіраючыся на ўсё ўзрастаючую магутнасць вермахта, пашырала тэрытарыяльную жыццёвую прастору. Значным крокам стаў падзел Чэхаславакіі. Для прыняцця рашэння па чэшскай праблеме 29–30 верасня 1938 г. у Мюнхене была склікана канферэнцыя, у якой прынялі ўдзел А. Гітлер, Н. Чэмберлен, Э. Даладзье і Б. Мусаліні.

На канферэнцыі ішла канкрэтная размова аб перадачы Германіі часткі тэрыторыі незалежнай краіны. Неабходна адзначыць тое, што лідэры Германіі, Англіі, Францыі і Італіі прынялі рашэнне аб падзеле Чэхаславакіі, прычым, без уліку волі і інтарэсаў яе народа. Прадстаўнікі Чэхаславакіі сядзелі ў суседнім з падпісантамі памяшканні і чакалі рашэння. А побач вырашаўся лёс іх краіны.

Уражанні чэхаславацкага кіраўніцтва ад заключэння мюнхенскага дагавора даволі яскрава перададзены ў тэлеграме пасла СССР у Вялікабрытаніі І. М. Майскага. Раніцай 30 верасня паведамляў І. М. Майскі: «Когда в Лондоне стали известны условия мюнхенского соглашения, я поехал к Масарику выразить мое

глубокое сочувствие народам Чехословакии и мое глубокое возмущение предательством Англии и Франции в отношении Чехословакии. Масарик – высокий, крепкий, в обычных условиях несколько циничный мужчина – упал мне на грудь, стал целовать меня и расплакался как ребенок. «Они продали меня в рабство немцам, – сквозь слезы восклицал он, – как когда-то негров продавали в рабство в Америке!» [1, с. 41].

У выніку падпісанага пагаднення Чэхаславакія страціла 1/5 тэрыторыі і каля 5 млн чалавек насельніцтва, а таксама 33 % прамысловых прадпрыемстваў. Адзначым, што гэты акт дазволіў значна ўзмацніць германскі вермахт. Германская армія дадаткова атрымала 1582 самалёты, 469 танкаў, 2175 палявых і 500 зенітных гармат, 785 мінаметаў, 43878 кулямётаў, 1 млн вінтовак [8, с. 123].

Савецкае кіраўніцтва ўважліва сачыла за развіццём сітуацыі і было дастаткова добра інфармавана аб расстаноўцы палітычных сіл у Еўропе. Афіцыйная ацэнка стану міжнародных падзей была выкладзена ў перадавіцы газеты «Известия». У артыкуле «Политика премирования агрессора», які быў надрукаваны 4 кастрычніка 1938 г., на наш погляд, даволі аб'ектыўна ацэньваліся драматычныя падзеі таго часу. Газета выразна паказвала ўсю бесперспектыўнасць міжнароднай палітыкі еўрапейскіх лідэраў. Каб перадаць дух таго часу, прывядзём крыху пашыраную частку артыкула. «За короткий срок в Европе произошли события, – падкрэслівала газета, – значение которых не ограничивается перекройкой географической карты. Уже не первый раз и даже не первый год сталкиваются народы с фашистской агрессией, настойчиво втягивающей страну за страной во вторую империалистическую войну за передел мира. Абиссиния, Испания, Китай, Австрия, Чехословакия последовательно становились жертвами прожорливых фашистских людоедов. Но впервые мы узнаем, что захват чужих территорий, переход чужеземными армиями гарантированных международными договорами границ есть не что иное, как «торжество», или «победа» мира.

А ведь именно в этом пытаются убедить народы мюнхенские «миротворцы». Они в восторге от своих успехов, они готовы расточать друг другу самые лестные комплименты. Чемберлен обра-

тился к Даладье со специальным посланием, в котором «восхищается смелостью и достоинством», с которыми Даладье представлял Францию в Мюнхене. Если бы эта формула не исходила от официального лица, обращающегося к другому официальному лицу, ее легко было бы принять за злую насмешку. Надо думать, что немало англичан и французов, прочитав послание Чемберлена, с недоумением поставят перед собой вопрос: в каком смысле можно назвать «смелостью» покорное согласие удовлетворять прожорливые аппетиты агрессоров, в каком смысле можно назвать «достоинством» расправу сильного над слабым? Поистине велика храбрость – отдать на растерзание целое государство!» [9].

Аналіз архіўных дакументаў, апублікаваных крыніц і дыпламатычнай перапіскі перадваеннага часу пераканаўча сведчыць, што развіццё падзей у Еўропе вызначалася не толькі палітыкай вялікіх дзяржаў, але і залежала ад пазіцый малых і сярэдніх краін. У кіруючых колах некаторых дзяржаў значна пашырыліся мілітарысцкія тэндэнцыі, што садзейнічала ўсталяванню аўтарытарных рэжымаў, іх палітыка салідарызавалася з дзейнасцю нацысцкай Германіі і ў далейшым яны сталі яе сатэлітамі (Аўстрыя, Балгарыя, Венгрыя, Румынія, Фінляндыя).

Становішча на еўрапейскім кантыненце не ў апошняй ступені залежала ад палітычных крокаў кіраўніцтва Польшчы. Многія апублікаваныя крыніцы сведчаць аб тым, што знешнепалітычная дзейнасць польскіх лідэраў у гэты перыяд схілялася ў бок антысаветызму. Яе палітычныя дзеячы неаднаразова выступалі з патрабаваннямі аб наданні Польшчы каланіяльных уладанняў. У гэтым пытанні імкненні правячых колаў ішлі ў рэчышчы палітыкі нацысцкай Германіі. Дыпламатыя Польшчы добраахвотна ўзяла на сябе абарону інтарэсаў гітлераўскай Германіі ў Лізе Нацый, якую Германія дэманстратыўна пакінула ў 1933 г. З трыбуны міжнароднай арганізацыі польскія дыпламаты, абапіраючыся на дэкларацыю аб сяброўстве і ненападзе паміж Германіяй і Польшчай ад 26 студзеня 1934 г., апраўдвалі парушэнні нацысцкай Германіяй Версальскага і Лакарнскага дагавораў [1, т. 2, с. 369–370]. Каланіяльныя дамаганні Польшчы выклікалі заклапочанасць у англійскага ўрада, аб чым паведамляў з Англіі пасол Германіі

Г. Дзірксен, які вымушаны быў прызнаць, што кіраўніцтва метраполіі ўстрывожана «патрабаваннямі Польшчы ў каланіяльным пытанні, аказвае стрымліваючы ўплыў на пазітыўнае стаўленне з боку англійскага кіраўніцтва да патрабаванняў Германіі» [1, т. 1, с. 92].

Яшчэ да заключэння Мюнхенскага дагавора ў Польшчы ад імя «Саюза сілезскіх паўстанцаў» адбывалася вярбоўка ў «Цешэнскі дабравольчы корпус», фарміраванні якога накіроўваліся на чэхаславацкую мяжу. Ужо 25, 27 і 28 верасня «добраахвотнікі» ўчынілі шэраг узброеных правакацый. У лісце міністра замежных спраў Польшчы Ю. Бека, які быў накіраваны польскаму паслу ў Чэхаславакіі адназначна была сфармулявана афіцыйная пазіцыя Варшавы: «В данный серьезный момент мне стало понятно, что лишь мужественное решение может определить принципиальный облик нашего государства. В связи с этим я передаю Вам, г-н посланник, нижеследующую инструкцию:

Через летчика и шифром (возможно, по телефону) Вы получаете ноту, которая является ультиматумом, целью которого является положить конец фальшивой игре соседей и показать, что защищая справедливые интересы и честь нашего государства, польское правительство не остановится перед самым большим риском.

Вышеуказанную ноту Вы должны любой ценой вручить до 23 часов 59 минут сегодняшнего дня, так как срок данного ультиматума истекает завтра, 1 октября, в 12 часов дня.

Прошу не предпринимать какой-либо дискуссии по вопросу содержания ноты, так как это требование является безоговорочным» [1, т. 1, с. 31–32].

У выніку такой палітыкі польскага кіраўніцтва Чэхаславакія вымушана была 1 кастрычніка 1938 г. уступіць Польшчы Цешэнскую вобласць, дзе пражывала каля 80 тыс. палякаў і 120 тыс. чэхаў. Галоўным набыткам польскага боку стаў прамысловы патэнцыял. На прамысловых прадпрыемствах Цешэнскай вобласці ў канцы 1938 г. выплаўлялася каля 41 % чыгуна і амаль 47 % сталі, што выплаўлялася ў Польшчы [10, с. 149–153].

Дзеля разумення праблемы будзе нялішнім нагадаць, што ў 30-я гады XX ст. Савецкі Саюз паступова набіраў эканамічную

магутнасць і, адпаведна, уплыў у знешнепалітычным жыцці Еўропы і сусвету. Ініцыятывы СССР, у першую чаргу, былі накіраваны на стварэнне сістэмы калектыўнай бяспекі ў Еўропе. Аб чым яскрава сведчыць дзейнасць яго прадстаўнікоў на Жэнеўскай міжнароднай канферэнцыі па раззбраенні, дзейнасць якой працягвалася з 1932 па 1935 г. з удзелам прадстаўнікоў 63 краін. На гэтым форуме Савецкі Саюз настойліва прапанаваў здзейсніць прынцып усеагульнага і поўнага раззбраення, але гэтыя ініцыятывы не знайшлі падтрымкі ў заходніх дзяржаў. Па ініцыятыве СССР у маі 1935 г. былі падпісаны савецка-французскі і савецка-чэхаславацкі пакты аб узаемадапамозе супраць агрэсіі. Гэтыя міралюбівыя ініцыятывы маглі б стаць у далейшым сур'ёзным падмуркам стрымлівання агрэсіўнай палітыкі нацысцкай Германіі і яе саюзнікаў і паслужыць асновай стварэння сістэмы калектыўнай бяспекі ў Еўропе. Савецкі Саюз рашуча асуджаў агрэсіўныя дзеянні Германіі і прапаноўваў правесці міжнародную канферэнцыю дзеля арганізацыі сістэмы калектыўнай бяспекі і абароны незалежнасці краін, якім пагражала агрэсія.

Неабходна нагадаць, што ў савецкай знешняй палітыцы разам са станоўчымі дасягненнямі нараcталі і негатыўныя тэндэнцыі, якія не спрыялі збліжэнню з палітычнымі лідэрамі заходніх краін. Сярод іх былі спрошчаныя і прамалінейныя высновы ВКП(б) і Камінтэрна аб хуткай «сусветнай рэвалюцыі» і краху сістэмы капіталізму. Так, у прынятай на VI кангрэсе Камінтэрна праграме 1928 г. меўся вывад аб непазбежнасці крушэння капіталізму і хуткай перамозе сусветнай сацыялістычнай рэвалюцыі. Такія ўстаноўкі ВКП(б) і Камінтэрна ў большасці краін захаду ўспрымаліся як насаджэнне камуністычных ідэй і заклік да «камунізацыі» Еўропы. Яны з'яўляліся сур'ёзнай падставай неканструктыўнага дыялога і непаразумення паміж СССР і заходнімі краінамі. Не дадавалі міжнароднага аўтарытэту Савецкаму Саюзу і шматлікія ўнутрыпалітычныя рэпрэсіі, якія ўспрымаліся заходняй грамадскасцю з вялікай перасцярогай. У сувязі з чым правячыя колы захаду не праяўлялі неабходнай зацікаўленасці ў стварэнні сістэмы калектыўнай бяспекі. Палітычная актыўнасць савецкага кіраўніцтва на міжнароднай арэне ў 30-я гады XX ст.

магутнасць і, адпаведна, уплыў у знешнепалітычным жыцці Еўропы і сусвету. Ініцыятывы СССР, у першую чаргу, былі накіраваны на стварэнне сістэмы калектыўнай бяспекі ў Еўропе. Аб чым яскрава сведчыць дзейнасць яго прадстаўнікоў на Жэнеўскай міжнароднай канферэнцыі па раззбраенні, дзейнасць якой працягвалася з 1932 па 1935 г. з удзелам прадстаўнікоў 63 краін. На гэтым форуме Савецкі Саюз настойліва прапанаваў здзейсніць прынцып усеагульнага і поўнага раззбраення, але гэтыя ініцыятывы не знайшлі падтрымкі ў заходніх дзяржаў. Па ініцыятыве СССР у маі 1935 г. былі падпісаны савецка-французскі і савецка-чэхаславацкі пакты аб узаемадапамозе супраць агрэсіі. Гэтыя міралюбівыя ініцыятывы маглі б стаць у далейшым сур'ёзным падмуркам стрымлівання агрэсіўнай палітыкі нацысцкай Германіі і яе саюзнікаў і паслужыць асновай стварэння сістэмы калектыўнай бяспекі ў Еўропе. Савецкі Саюз рашуча асуджаў агрэсіўныя дзеянні Германіі і прапаноўваў правесці міжнародную канферэнцыю дзеля арганізацыі сістэмы калектыўнай бяспекі і абароны незалежнасці краін, якім пагражала агрэсія.

Неабходна нагадаць, што ў савецкай знешняй палітыцы разам са станоўчымі дасягненнямі нараслі і негатыўныя тэндэнцыі, якія не спрыялі збліжэнню з палітычнымі лідэрамі заходніх краін. Сярод іх былі спрошчаныя і прамалінейныя высновы ВКП(б) і Камінтэрна аб хуткай «сусветнай рэвалюцыі» і краху сістэмы капіталізму. Так, у прынятай на VI кангрэсе Камінтэрна праграме 1928 г. меўся вывад аб непазбежнасці крушэння капіталізму і хуткай перамозе сусветнай сацыялістычнай рэвалюцыі. Такія ўстаноўкі ВКП(б) і Камінтэрна ў большасці краін захаду ўспрымаліся як насаджэнне камуністычных ідэй і заклік да «камунізацыі» Еўропы. Яны з'яўляліся сур'ёзнай падставай неканструктыўнага дыялога і непаразумення паміж СССР і заходнімі краінамі. Не дадавалі міжнароднага аўтарытэту Савецкаму Саюзу і шматлікія ўнутрыпалітычныя рэпрэсіі, якія ўспрымаліся заходняй грамадскасцю з вялікай перасцярогай. У сувязі з чым правячыя колы захаду не праяўлялі неабходнай зацікаўленасці ў стварэнні сістэмы калектыўнай бяспекі. Палітычная актыўнасць савецкага кіраўніцтва на міжнароднай арэне ў 30-я гады XX ст.

успрымалася і расцэньвалася многімі заходнімі палітыкамі як спроба навязаць ім камуністычныя ідэалы.

Тым не менш, намаганні савецкага кіраўніцтва накіроўваліся на аб'яднанне дзейнасці СССР, Англіі і Францыі супраць пашырэння агрэсіўных намераў Германіі. У 1939 г. савецкая дыпламатыя працягвала актыўныя захады, каб схіліць англійскі і французскі ўрады да стварэння сістэмы калектыўнай бяспекі ў Еўропе. Неабходна звярнуць увагу на той факт, што палітычнае кіраўніцтва СССР было добра інфармавана аб дзейнасці і сапраўдных намерах урадаў заходніх краін, аб чым яскрава сведчыць выступленне І. В. Сталіна на XVIII з'ездзе ВКП (б) 10 сакавіка 1939 г. Ён у прыватнасці зазначыў, што ў Еўропе ўжо склаліся два блокі дзяржаў. З аднаго боку – краіны Антыкамінтэрнаўскага блоку, а з другога – краіны Захаду на чале Брытаніі і Францыі. Раскрываючы намеры англійскага і французскага кіраўніцтва, І. В. Сталін выказваўся дастаткова пераканаўча: «Формально политику невмешательства можно было бы охарактеризовать таким образом: «пусть каждая страна защищается от агрессоров, – падкрэсліў савецкі лідэр, – как хочет и как может, наше дело – сторона, мы будем торговать и с агрессорами и с их жертвами». На деле, однако, политика невмешательства означает попустительство агрессии, развязывание войны, следовательно, превращение ее в мировую войну. В политике невмешательства сквозит стремление, желание не мешать агрессорам творить свое черное дело, не мешать, скажем, Японии впутаться в войну с Китаем, а еще лучше с Советским Союзом, не мешать, скажем, Германии увязнуть в европейских делах, впутаться в войну с Советским Союзом, дать всем участникам войны увязнуть глубоко в тину войны, поощрять их в этом втихомолку, дать им ослабить и истощить друг друга, а потом, когда они достаточно ослабнут, выступить на сцену со свежими силами – выступить, конечно, «в интересах мира» и продиктовать ослабевшим участникам войны свои условия.

И дешево и мило!

...Или, например, взять Германию. Уступили ей Австрию, несмотря на наличие обязательства защищать ее самостоятельность,

уступили Судетскую область, бросили на произвол судьбы Чехословакию, нарушив все и всякие обязательства, а потом стали крикливо лгать в печати о «слабости русской армии», о «разложении русской авиации», о «беспорядках» в Советском Союзе, толкая немцев дальше на восток, обещая им легкую добычу и приговаривая: вы только начните войну с большевиками, а дальше все пойдет хорошо. Нужно признать, что это тоже очень похоже на подталкивание, на поощрение агрессора» [11].

Але нават нягледзячы на ўсю складанасць моманту, кіраўніцтва Савецкага Саюза шукала магчымасць стварыць сістэму калектыўнай бяспекі. Ужо 17 красавіка 1939 г. савецкае кіраўніцтва прапанавала «подвести солидную базу под отношения между тремя государствами, мы пытаемся объединить английское и французское предложения в следующих тезисах, которые мы предлагаем на рассмотрение британского и французского правительств:

1. Англия, Франция, СССР заключают между собою соглашение сроком на 5–10 лет о взаимном обязательстве оказывать друг другу немедленно всяческую помощь, включая военную, в случае агрессии в Европе против любого из договаривающихся государств.

2. Англия, Франция, СССР обязуются оказывать всяческую, в том числе и военную, помощь восточноевропейским государствам, расположенным между Балтийским и Черным морями и граничащим с СССР, в случае агрессии против этих государств» [1, т. 1, с. 386].

Як бачна, зробленыя савецкім кіраўніцтвам прапановы былі рэалістычнымі і канструктыўнымі, размова ішла аб узаемным абавязку краін дзеля аказання дапамогі, у тым ліку і ваеннай, у выпадку агрэсіі ў Еўропе супраць любой дзяржавы, з якой будуць заключаны дамовы. Тут неабходна зазначыць, што Парыж і Лондан прапанавалі сустрэчныя захады, у якіх Савецкі Саюз павінен быў узяць на сябе абавязак аказваць неадкладную ваенную дапамогу не толькі Англіі і Францыі, але і тым краінам, якім яны гарантавалі бяспеку, што было заведама непрымальнай для СССР умовай.

Англа-франка-савецкія перамовы працягваліся да 21 жніўня, але пазітыўных рашэнняў не знаходзілася. Начальнік штаба Чырвонай Арміі Б. М. Шапашнікаў вымушаны быў 15 жніўня прама заявіць, што СССР гатоў выставіць супраць агрэсара ў Еўропе 136 дывізій, 5 тысяч гармат, 9–10 тысяч танкаў і каля 5,5 тысяч самалётаў. Былі прапанаваны тры варыянты сумесных дзеянняў. Паўстала праблема, у выпадку ваеннай неабходнасці, пропуску праз польскую і румынскую тэрыторыю савецкіх войск. Польскія ўлады негатыўна аднесліся да такой прапановы. Для савецкага кіраўніцтва стала відавочным нежаданне ўдзельнікамі перагавораў дасягнуць пазітыўных і хуткіх вынікаў. Перамовы зайшлі ў тупік.

Сутнасць перамоў і напрамак міжнароднай палітыкі СССР былы даволі выразна выкладзены міністрам замежных спраў Савецкага Саюза В. М. Молатавым на сесіі Вярхоўнага Савета СССР 31 жніўня 1939 г.: «Вы знаете, что англо-франко-советские переговоры о заключении пакта взаимопомощи против агрессии в Европе начались еще в апреле месяце. Правда, первые предложения английского правительства были, как известно, совершенно неприемлемы. Они игнорировали основные предпосылки таких переговоров – игнорировали принцип взаимности и равных обязательств. Несмотря на это, Советское правительство не отказалось от переговоров и в свою очередь выдвинуло свои предложения...

Эти переговоры натолкнулись на то, что Польша, которую должны были совместно гарантировать Англия, Франция и СССР, отказалась от военной помощи со стороны Советского Союза. Преодолеть эти возражения Польши так и не удалось. Больше того, переговоры показали, что Англия и не стремится преодолеть эти возражения Польши, а, наоборот, поддерживает их. Понятно, что при такой позиции польского правительства и его главного союзника к делу оказания военной помощи со стороны Советского Союза на случай агрессии, англо-франко-советские переговоры не могли дать хороших результатов. После этого нам стало ясно, что англо-франко-советские переговоры обречены на провал.

Что показали переговоры с Англией и Францией?...

В немногих словах дело заключается в следующем. С одной стороны, английское и французское правительства боятся агрессии

и ввиду этого хотели бы иметь пакт взаимопомощи с Советским Союзом, поскольку это усиливает их самих, поскольку это усиливает Англию и Францию. Но, с другой стороны, английское и французское правительства имеют опасения, что заключение серьезного пакта взаимопомощи с СССР может усилить нашу страну, может усилить Советский Союз, что, оказывается, не отвечает их позиции. Приходится признать, что эти опасения у них взяли верх над другими соображениями» [1, т. 2, с. 345–353].

Дзеля аб'ектыўнай ацэнкі стану перамоў, на наш погляд, будзе цікавым звярнуцца да пазіцый, напрыклад, ваеннага міністэрства Францыі. Якія ўражанні аб перагаворах ваенных місій СССР, Францыі і Вялікабрытаніі засталіся ў французскіх прадстаўнікоў. «После оказанного с советской стороны прекрасного приема 13-го начались переговоры, – падкрэслівалася ў справаздачы, – протекавшие неизменно в очень сердечной атмосфере...

Следовательно, московские переговоры могут, видимо, продолжаться лишь в том случае, если будет достигнуто соглашение относительно условия для непосредственного сотрудничества, которое выдвинуто Советами и которое может быть принято лишь с согласия поляков.

Однако эти последние, несмотря на усилия французского посла в Варшаве и нашего военного атташе, упорно заявляют о своем отказе дать принципиальное согласие на вступление советских войск на их территорию. Г-н Бек и начальник штаба армии генерал Стахевич (начальник генштаба вооруженных сил Польши) проявили в этом отношении непримиримую враждебность, соглашаясь только на то, чтобы, с целью не доводить дело до разрыва московских переговоров, наша военная миссия могла маневрировать так, как если бы ни одного вопроса не было поставлено перед поляками» [1, т. 2, с. 292–293].

Непрымірымасць і катэгарычнасць польскіх палітыкаў была зразумелай. Іх нежаданне кампрамісаў і палітычная абмежаванасць былі абумоўлены гістарычнымі фактарамі, якія не дазвалялі зрабіць ім крокі насустрач цвярозаму рэалізму. Гэта яскрава бачна ў шэрагу дакументальных крыніц. Так, ваенны аташэ Францыі ў Польшчы Ф. Мюс павядамляў 19 жніўня 1939 г. у ваеннае

ведамства Францыі. «Сегодня в течение трех часов вместе с британским военным атташе мы беседовали с генералом Стахевичем и тщетно искали формулу для компромисса.

Завещанная Пилсудским (маршал, премьер-министр Польши в 1926–1928 гг. и в 1930 г.) догма, основанная на соображениях исторического и географического порядка, запрещает даже рассматривать вопрос о вступлении иностранных войск на польскую территорию. Только во время военных действий это правило может подвергаться смягчению» [1, т. 2, с. 278]. Дадзеная праблема агучана і ў тэлеграме пасла Францыі ў Польшчы Л. Наэля на імя міністра замежных спраў Францыі Ж. Банэ, у якой яскрава выкладзена і падкрэслена непрымірымасць польскага кіраўніцтва.

«Бек просил меня посетить его сегодня вечером. Он заявил мне, – павядамляў французскі дыпламат, – что, все обстоятельно рассмотрев и обсудив с маршалом Рыдз-Смиглы и не недооценивая силу целого ряда наших аргументов, он просит меня передать Вашему Превосходительству негативный ответ Польши.

«Для нас это, – сказал он мне, – принципиальный вопрос: у нас нет военного договора с СССР; мы не хотим его иметь; я, впрочем, говорил это Потемкину. Мы не допустим, что в какой-либо форме можно обсуждать использование части нашей территории иностранными войсками. В этом в конечном счете нет ничего нового; наша доктрина всегда была такой, и мы часто ее излагали» [1, т. 2, с. 278–279].

Неабходна нагадаць, што ваенныя магчымасці адпору агрэсіўных намераў фашысцкага блоку ў гэты час у сусветнай супольнасці былі больш чым значныя, патрабавалася палітычная воля і жаданне не дапусціць ваеннага пажару. Але палітычнай волі, якраз, і не даставала кіруючым лідэрам еўрапейскіх краін, перамагала стаўленне на палітычнае лавіраванне за кошт іншых краін, што не магло адмоўна адбіцца на лёсах народаў Еўропы.

У такой сітуацыі СССР вымушаны быў шукаць альтэрнатыву, каб не аказацца ў міжнароднай ізаляцыі. Крыніцы сведчаць аб тым, што савецка-французска-англійскія перамовы ў Маскве прымусілі германскае палітычнае кіраўніцтва актывізаваць усходнюю палітыку. Гітлер патрабаваў ад Рыбентропа высвятліць маг-

чымасць заключэння з СССР дагавора аб ненападзенні. Першая спроба была зроблена 3 жніўня, аднак савецкае кіраўніцтва адхіліла германскую прапанову. Нацысцкія лідэры робяць усе магчымыя захады, каб актывізаваць дзейнасць у напрамку пашырэння германска-савецкіх адносін. З аднаго боку, па розных каналах перадаюцца самыя розныя дэзынфармацыйныя матэрыялы, у якіх паведамляецца аб негатыўных намерах краін захаду ў адносінах да СССР. Так, праз германскага пасла ў СССР Шуленбурга паведамлялася, што Англія спрабуе ўтравіць Савецкі Саюз у вайну з Германіяй. З другога боку, германская дыпламатыя робіць настойлівыя крокі да актыўнага супрацоўніцтва Германіі і СССР. Ужо 14 жніўня 1939 г. міністр замежных спраў Германіі накіроўвае В. М. Молатаву тэлеграму, у якой паведамляе, што ён мае магчымасць прыбыць у Маскву для сустрэчы з вышэйшым палітычным кіраўніцтвам Савецкага Саюза. У адказ савецкі міністр замежных спраў В. М. Молатаў паведаміў 16 жніўня аб магчымасці заключэння германска-савецкага дагавора. Настойлівасць германскага боку нарастае. 19 жніўня германскі пасол Шуленбург зноў сустракаецца з В. М. Молатавым. У дакуменце адзначана, Шуленбург «извиняется за настойчивость, с которой он сегодня добивался приема, но срочность его дела требовала этого. Тов. Молотов замечает, что когда того требует дело, то не стоит откладывать. Шуленбург предупреждает, что все сообщенное ему Риббентропом соответствует взглядам Гитлера.

Шуленбург заявляет, что из последнего заявления т. Молотова германское правительство усматривает положительное отношение Советского правительства к вопросам, поднятым Шуленбургом. При нормальных условиях эти вопросы могли бы быть урегулированы обычным дипломатическим путем. Но положение в данное время необычное, и, по мнению Риббентропа, необходимы скорые методы урегулирования вопросов. В Берлине опасаются конфликта между Германией и Польшей. Дальнейшие события не зависят от Германии. Положение настолько обострилось, что достаточно небольшого инцидента, для того чтобы возникли серьезные последствия. Риббентроп думает, что еще до возникновения конфликта необходимо выяснить взаимоотноше-

ния между СССР и Германией, т. к. во время конфликта это сделать будет трудно» [1, т. 2, с. 274].

Савецкае кіраўніцтва пагадзілася прыняць германскага міністра замежных спраў 26–27 жніўня. Аднак у справу падключаецца асабіста германскі фюрэр. Гітлер накіроўвае 21 жніўня тэлеграму І. В. Сталіну, у якой паведамляе: «Я искренне приветствую заключение германо-советского торгового соглашения, являющегося первым шагом на пути изменения германо-советских отношений.

...Напряжение между Германией и Польшей сделалось нестерпимым. Польское поведение по отношению к великой державе таково, что кризис может разразиться со дня на день. Германия, во всяком случае, исполнена решимости отныне всеми средствами ограждать свои интересы против этих притязаний.

Я считаю, что при наличии намерения обоих государств вступить в новые отношения друг к другу является целесообразным не терять времени. Поэтому я вторично предлагаю Вам принять моего министра иностранных дел во вторник, 22 августа, но не позднее среды, 23 августа. Министр иностранных дел имеет всеобъемлющие и неограниченные полномочия, чтобы составить и подписать как пакт о ненападении, так и протокол. Более продолжительное пребывание министра иностранных дел в Москве, чем один день или максимально два дня, невозможно ввиду международного положения. Я был бы рад получить от Вас скорый ответ» [1, т. 2, с. 302].

Згода была атрымана і германскі міністр замежных спраў І. Рыбентроп прыбыў 23 жніўня 1939 г. у Маскву. Пасля перамоў вечарам 23 жніўня быў падпісаны германа-савецкі дагавор аб ненападзенні тэрмінам на 10 гадоў. Адначасова быў падпісаны «сакрэтны дадатковы пратакол». У ім у строга канфідэнцыяльным парадку агаворвалася пытанне аб размежаванні сфер узаемных інтарэсаў ва Усходняй Еўропе.

Як вынікае з тэксту дакументаў, пагадненне давала Савецкаму Саюзу пэўныя гарантыі бяспекі. Важна падкрэсліць, што ні дагавор аб ненападзенні, ні прыкладзены да яго сакрэтны дадатковы пратакол не ўтрымлівалі артыкулаў аб ваенным супрацоўніцтве дзвюх краін і не абавязвалі весці баявых дзеянняў супраць трэ-

ціх краін, альбо аказваць дапамогу ў выпадку ўдзелу адной з іх у ваенным канфлікце. Дасягнутыя дамоўленасці паміж СССР і Германіяй не рабілі іх саюзнікамі ні фармальна, ні фактычна, хаця некаторыя аўтары імкнуцца сёння даказваць адваротнае.

Германска-савецкі дагавор стаў вынікам крызісу міждзяржаўных адносін у перадваенны перыяд, які завяршаў яго фазу як дыпламатычны і палітычны акт, прычым, ён з'яўляўся плодам крызісу, а не яго прычынай. Не ўяўляў ён з сябе нічога экстраардынарнага з пункту гледжання палітычнай практыкі і маралі таго часу, асабліва, калі яго параўнаць з мюнхенскім пактам.

На наш погляд, дастаткова рэалістычна ацэньваў германска-савецкія дагаворы сучаснік тых непростых падзей У. Чэрчыль. Пасля заканчэння Другой сусветнай вайны ў мемуарах ён адзначаў: «Невозможно сказать, кому он внушал большее отвращение – Гитлеру или Сталину. Оба сознавали, что это могло быть только временной мерой, продиктованной обстоятельствами. Антагонизм между двумя империями и системами был смертельным. Сталин, без сомнения, думал, что Гитлер будет менее опасным врагом для России после года войны против западных держав. Гитлер следовал своему методу «поодиночке». Тот факт, что такое соглашение оказалось возможным, знаменует всю глубину провала английской и французской дипломатии за несколько лет» [12].

Сёння крытыкі германска-савецкага дагавора спрабуюць сцвярджаць, што менавіта яго заключэнне падштурхнула Германію да нападу на Польшчу. Адкрытыя дакументальныя крыніцы сведчаць, што яшчэ ў пачатку красавіка 1939 г. Гітлер аддаў загад распрацоўваць план ваеннага разгрома Польшчы. Ужо 28 красавіка Германія анулявала дагавор з Польшчай аб ненападзе, а германскі генштаб прыступіў да заключнага этапа распрацоўкі плана «Вайс». Галоўнакамандуючы германскімі сухапутнымі сіламі генерал Браўхіч 15 чэрвеня падпісаў дырэктыву аб нападзе на Польшчу.

Як бачна, гэтыя ўказанні прагучалі яшчэ ў той час, калі Рыбентроп не прыбыў у Маскву для падпісання дагавора. Лёс польскай дзяржавы быў прадвызначаны незалежна ад таго, быў падпісаны германа-савецкі пакт ці не. Зразумела, у той час ідэі гуманізму

і справядлівасці не авалодалі яшчэ розумам дзяржаўных дзеячаў. Многія міждзяржаўныя праблемы вырашаліся з пазіцыі сілы, вузкім колам заходніх палітыкаў, якія з іх амбіцыямі і эгаізмам дзейнічалі паводле свайго разумення і не лічыліся з інтарэсамі народаў.

Дзеля пастаноўкі канкрэтных задач Гітлер правёў 22 жніўня 1939 г. нараду вышэйшага каманднага складу, дзе выступіў з прамовай. З уласцівым яму запалам і дэмагагічнай рыторыкай ён не толькі ахарактарызаваў сітуацыю міждзяржаўных адносін, але і акрэсліў перспектыву іх магчымага развіцця ў бліжэйшыя гады. «...Отношения с Польшей стали невыносимыми, – настойваў германскі фюрэр. – Моя политика в отношении Польши, проводившаяся до сих пор, противоречила воззрениям нашего народа. Принятию моих предложений Польшей (Данциг, коридор) препятствовало вмешательство Англии. Польша сменила свой тон по отношению к нам. Состояние напряженности на длительный срок нетерпимо. Инициатива не должна перейти в другие руки.... Нельзя же вечно стоять друг против друга с винтовкой на боевом взводе. Предложенное нам компромиссное решение потребовало бы от нас изменения нашего мировоззрения, жестов доброй воли. С нами снова заговорили бы на языке Версаля. Возникла опасность потери престижа. Вероятность того, что Запад не выступит против нас, еще велика...» [13, с. 56–58].

Завышаная самаацэнка, празмерная самаўпэўненасць, паталагічная бескампраміснасць і запраграміраванасць на барацьбу, на вырашэнне ідэі сусветнага панавання германскай нацыі падштурхоўвалі Гітлера да прыняцця крымінальна-небяспечных рашэнняў. 31 жніўня 1939 г. ён падпісаў дырэктыву аб нападзе на Польшчу.

Вайна з Польшчай пачалася 1 верасня 1939 г. Нягледзячы на мужнае супраціўленне польскіх салдат і афіцэраў, германская армія, валодаючы вялікай ваеннай перавагай, акупіравала да 16 верасня большую частку тэрыторыі Польшчы і выйшла на «лінію Керзана» – прыкладную мяжу рассялення палякаў, з аднаго боку, і украінцаў і беларусаў – з другога, якая была вызначана Пражскай мірнай канферэнцыяй яшчэ ў 1919 г. Польскі ўрад 16 верасня пакінуў краіну, эмігрыраваў у Румынію, а потым у Лондан. Францыя і Англія аб'явілі 3 верасня вайну Германіі, але бяздзейнічалі.

Нямецкі вермахт граміў польскія войскі і знішчаў мірных жыхароў, а дзейсная дапамога саюзнікаў так і не была аказана Польшчы.

Кіраўніцтва Германіі не толькі ўважліва сачыла за развіццём сітуацыі ў СССР, але нават усяляк падштурхоўвала савецкае кіраўніцтва да актыўных дзеянняў супраць Польшчы. Ужо 3 верасня германскі пасол у СССР Ф. Шуленбург высвятляў у В. М. Молатава пазіцыю СССР аб магчымым увядзенні войск Чырвонай Арміі ў зону ўплыву, якая была вызначана германска-савецкім пактам аб ненападзенні. Дзейнасць палітычнага кіраўніцтва Савецкага Саюза ў гэты перыяд была даволі асцярожнай. Націск германскага кіраўніцтва пастаянна ўзрастаў. Нацысцкія лідэры імкнуліся хутчэй уцягнуць СССР у ваенны канфлікт з Польшчай. Кіраўніцтва Германіі пастаянна давала знаць, што чакае актыўных дзеянняў. У адной з дасланых тэлеграм падкрэслівалася, што германскія ўзброеныя сілы разгромяць «польскую армию в течение нескольких недель. Затем мы удержим под военной оккупацией районы, которые, как было установлено в Москве, входят в германскую сферу интересов. Однако понятно, что по военным соображениям нам придется затем действовать против тех польских военных сил, которые к тому времени будут находиться на польских территориях, входящих в русскую сферу интересов.

Пожалуйста, обсудите это с Молотовым немедленно и посмотрите, не посчитает ли Советский Союз желательным, чтобы русская армия выступила в подходящий момент против польских сил в русской сфере интересов и, со своей стороны, оккупировала эту территорию...» [14].

У Маскве ўсяляк імкнуліся адцягнуць час, каб не быць выкрытай міжнароднай супольнасцю ў прамой падтрымцы германскай агрэсіўнай палітыкі. 5 верасня В. М. Молатаў вымушаны быў заявіць, што СССР «считает, что время ещё не наступило... Чрезмерная поспешность может принести нам вред и содействовать объединению наших врагов». Аднак нацысцкія лідэры працягвалі падштурхоўваць Савецкі Саюз да актыўных ваенных дзеянняў.

Прыбягаючы да дыпламатычнага лавіравання і запэўнівання аб неабходнасці падрыхтоўкі войск Чырвонай Арміі, СССР не чакаў такога імклівага наступлення вермахта, усяляк адцягваўся

ўвод савецкіх войск у заходнія рэгіёны СССР. На чарговай сустрэчы Молатава і Шуленбурга 10 верасня савецкі міністр адзначыў, што «советское правительство имеет намерение воспользоваться дальнейшим продвижением немецких войск, чтобы заявить, что Польша разваливается на куски, и вследствие этого Советский Союз должен прийти на помощь украинцам и белорусам, которым угрожает Германия» [15]. Заява прадэманстравала, што для СССР баявыя дзеянні супраць польскай арміі не з'уляюцца галоўнымі, важнейшая задача – ажыццявіць уз'яднанне этнічных тэрыторый, на якіх пражывалі ў сваёй большасці беларусы і ўкраінцы.

Сродкі масавай інфармацыі СССР, БССР, УССР разгарнулі шырокую агітацыйна-прапагандысцкую апрацоўку насельніцтва. У цэнтральных газетах «Правда» і «Известия», а таксама ў рэспубліканскіх «Звязда» і «Советская Белоруссия» сталі рэгулярна змяшчацца матэрыялы аб цяжкім лёсе беларусаў на акупіраванай Польшчай тэрыторыі. Рабілася шмат, каб падрыхтаваць жыхароў да ўвядзення войск Чырвонай Арміі ў заходнія рэгіёны СССР.

Толькі 11 верасня быў аддадзены загад аб стварэнні Беларускага і Украінскага франтоў, была аб'яўлена мабілізацыя рэзервістаў. Але і гэтыя дзеянні савецкага боку не задавальнялі германскае кіраўніцтва. Каб прымусіць СССР выконваць дасягнутыя дамоўленасці, нацысцкія лідэры прыбеглі да палітычнага шантажу. У Маскву было накіравана пасланне, у якім гаварылася, што Германія прыпыніць наступленне супраць Польшчы, а на яе ўсходніх землях будуць створаны буферныя дзяржавы (беларуская, украінская, польская). У адказ у Берлін была накіравана таксама жорсткая заява, у якой падкрэслівалася, што ў выпадку прыняцця германскім бокам такога рашэння, Савецкі Саюз наогул не распачне ваенных дзеянняў.

Развіццё падзей вымушала СССР да больш актыўных ваенных дзеянняў. Ужо 16 верасня арміі Беларускага (камандуючы М. П. Кавалёў) і Украінскага (камандуючы С. К. Цімашэнка) франтоў былі разгорнуты і падрыхтаваны для вызваленчага паходу ў Заходнюю Беларусь і Заходнюю Украіну.

Такім чынам, прадстаўленыя матэрыялы пераканаўча сведчаць аб тым, што пачатак ХХ ст. характарызаваўся празмернай

супярэчнасцю міждзяржаўнага жыцця ў Еўропе. Палітычныя лідэры еўрапейскіх краін дапусцілі немала памылак і пралікаў, якія прывялі да бескантрольнасці сітуацыі і ўзнікнення ачагоў напружанасці і распальвання Другой сусветнай вайны. Між тым, падпісаны германска-савецкі дагавор негатыўна паўплываў на стан міжнародных адносін, аднак не мог карэнным чынам змяніць сітуацыю на еўрапейскай прасторы. Шматлікія крыніцы з вялікай верагоднасцю сведчаць, што нельга канцэнтраваць увагу толькі на адмоўных момантах германска-савецкага дагавора. Рэалізацыя гэтага пагаднення дазволіла не толькі ажыццявіць уз'яднанне беларускага народа, замацаваць тэрытарыяльную цэласнасць БССР, але і аднавіць гістарычную справядлівасць, ліквідаваць нацыянальную знявагу беларусаў. Перад працоўнымі Заходняй Беларусі адкрыліся перспектывы развіцця прамысловасці і сельскай гаспадаркі, навукі, культуры, стваральнай працы ў адзінай дзяржаве на карысць усяго беларускага народа.

Літаратура

1. Год кризиса, 1938–1939: документы и материалы в двух томах. – М., 1990. – Т. I: 29 сентября 1938 г. – 31 мая 1939 г.; Т. II: 2 июня 1939 г. – 4 сентября 1939.

2. Дембски, С. Польша, Советский союз, кризис версальской системы и причины начала Второй мировой войны / С. Дембски // Вестн. МГИМО. – 2009. – Спец. вып.

3. Тихомиров, А. В. Дипломатия БНР в период послевоенного обустройства Европы и польско-советской войны (ноябрь 1918 – март 1921 г.) / А. В. Тихомиров [Электронный русерс]. – Режим доступа: http://library.by/portalus/modules/belarus/referat_readme.php?subaction=showfull&id=1141338827&archive=&start_from=&ucat=8&.

4. Гісторыя Беларускай ССР. – Мінск, 1975. – Т. 2.

5. История Великой Отечественной войны Советского Союза 1941–1945 гг.: в 6 т. – М., 1960. – Т. 1: Подготовка и развязывание войны империалистическими державами.

6. От Версаля к Вене [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://parracida.livejournal.com/13701.html.

7. Молчанов, Н. Генерал де Голль / Н. Молчанов. – М., 1988.

8. История второй мировой войны 1939–1945. – М., 1974. – Т. 2.

9. Известия. – 1938. – 4 окт.

10. Гришин, Я. Я. Путь к катастрофе. Польско-чехословацкие отношения 1932–1939 гг. / Я. Я. Гришин. – Казань, 1999.

11. Правда. – 1939. – 11 марта.
12. Черчилль, У. Вторая мировая война: в 3 кн. / У. Черчилль. – М., 1991. – Кн. 1, т. 1. – С. 179–180.
13. Гальдер, Ф. Военный дневник. Ежедневные записи начальника генерального штаба сухопутных войск. 1939–1942 / Ф. Гальдер. – М., 1968. – Т. 1.
14. Телеграмма Риббентропа германскому послу в СССР Шуленбургу № 253 от 3 сентября 1939г. [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.vilavi.ru/prot/071205/071205.shtml.
15. Телеграмма германского посла в Москве Шуленбурга в министерство иностранных дел Германии от 10 сентября 1939 г. [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.vb.by/sarychev/content/61/main.php.

У. Ф. Ладысеў

Беларускі дзяржаўны універсітэт, Мінск

СТАНАЎЛЕННЕ НАЦЫЯНАЛЬНА-ВЫЗВАЛЕНЧАГА РУХУ Ў ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ

Нацыянальна-вызваленчы рух у Заходняй Беларусі праходзіў пад уплывам ідэй расійскіх рэвалюцый і з'яўляўся арганічным працягам вызваленчай барацьбы беларускага народа супраць войск кайзераўскай Германіі, а потым польскай інтэрвенцыі. Таму анексія заходнебеларускіх зямель паводле ўмоў Рыжскага мірнага дагавора 1921 г. выклікала актыўны пратэст інтэлігенцыі Заходняй Беларусі, беларускіх палітычных партый і арганізацый, якія існавалі ў краі. Яшчэ на этапе выпрацоўкі ўмоў прэлімінарнага дагавора паміж польскай і расійскай дэлегацыямі ў сувязі з недапушчэннем да перагавораў дэлегацыі БНР на чале з В. Ластоўскім, якая 5 кастрычніка 1920 г. прыехала ў Рыгу, яе прадстаўнікі афіцыйна заявілі, што мір, заключаны без удзелу прадстаўнікоў Беларусі, «беларускі народ не прызнае для сябе абавязковым і будзе змагацца з ім усялякімі магчымымі спосабамі» [1, арк. 77]. Так яно і сталася.

Не атрымаўшы падтрымкі еўрапейскіх краін і Лігі Нацый, урад БНР і партыя сацыялістаў-рэвалюцыянераў у верасні 1921 г. правялі ў Празе першую беларускую нацыянальна-палітычную нараду ў мэтах выпрацоўкі стратэгіі і тактыкі барацьбы супраць

польскай акупацыі. У ёй прынялі ўдзел прадстаўнікі беларускіх партый і арганізацый не толькі Заходняй Беларусі, але Літвы, Латвіі, Польшчы, Германіі і Чэхаславакіі. Сярод 37 дэлегатаў пераважалі прадстаўнікі Беларускай партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў (БПС-Р) – 18 дэлегатаў, у тым ліку В. Ластоўскі, Я. Мамонька, В. Маслоўская, Л. Заяц, К. Душэўскі і інш., і партыі сацыялістаў-дэмакратаў – 6 дэлегатаў (сярод іх В. Захарка, А. Цвікевіч, П. Крачэўскі, К. Езавітаў). У складзе дэлегатаў былі 5 народных сацыялістаў, 3 сацыял-дэмакраты, а таксама 5 беспартыйных прадстаўнікоў прапольскай арганізацыі «Беларуская народная сувязь» П. Алексюка [2, арк. 1–2, 28].

Нарада прыняла 11 рэзалюцый праграмнага і тактычнага характару. Рыжскі дагавор удзельнікі нарады ахарактарызавалі ў першай рэзалюцыі, якая была прынята адзінагалосна па дакладу В. Ластоўскага, трактатам аб падзеле Беларусі «паміж Расіяй і Польшчай». Таму «ўсе актыўныя беларускія сілы» заклікаліся да рашучай барацьбы «ўсімі маючыміся ў іх распараджэнні спосабамі супраць падзелу Беларусі...» Удзельнікі нарады далі ацэнку папярэдняй дзейнасці беларускіх палітычных сіл, асудзілі дзейнасць ваенных фарміраванняў С. Булак-Балаховіча на Беларусі, якія «ганьбяць беларускае імя...» Характэрна, што супраць гэтай рэзалюцыі выступіла толькі група П. Алексюка. Яшчэ больш адназначна адмоўную ацэнку атрымалі дзеянні Б. Савінкава, які быў абвешчаны «правакатарам беларускай дзяржаўнасці і ворагам беларускага народа», бо «прыкрываў авантуры польскай і расійскай рэакцыі» беларускім нацыянальным штандарам [2, арк. 14–15; 3, с. 1221–1222].

Прытрымліваючыся ранейшага лозунга «ні польскіх паноў, ні маскоўскіх камуністаў», дэлегаты прынялі рэзалюцыю, згодна з якой Рада БНР у Коўне прызнавалася «адзіным заканадаўчым органам Беларусі», а «адзінай законнай уладай – урад БНР», які мае мандат ад Рады БНР [3, с. 1221]. Усе палітычныя партыі і арганізацыі заклікаліся аб'яднацца вакол Рады БНР і ўрада Ластоўскага.

Такім чынам, нарада выпрацавала новую палітычную лінію – «арыентацыю на сябе». Да гэтага часу беларускія арганізацыі спадзяваліся на дапамогу Германіі, Польшчы, імкнуліся заручыцца

падтрымкай краін Антанты. З гэтага часу «апора на сябе!» Невыпадкова ідэолаг беларускага нацыянальнага адраджэння А. Цвікевіч у кнізе «Адраджэнне Беларусі і Польшча» ў 1921 г. адзначыў, што «будучыня Беларусі ў руках селяніна. Адраджэнне яе – яго ўласная справа [4, с. 184]. Ён лічыў, што «зямельнае пытанне на Беларусі з'яўляецца спінным хрыбтом беларускага адраджэння», таму што вырашэнне зямельнага пытання ў Польшчы цесна звязана з нацыянальным. Таму без стварэння нацыянальнай дзяржавы нельга вырашыць зямельнае пытанне ў Заходняй Беларусі. Нават з пункту гледжання сённяшняга часу нельга не пагадзіцца з такім меркаваннем А. Цвікевіча.

Заканамерна, што першапачаткова вызваленчы рух у Заходняй Беларусі набыў характар узброенай партызанскай барацьбы. ЦК БПС-Р яшчэ ў красавіку 1921 г. прыняў рашэнне аб падрыхтоўцы ўзброенага паўстання на тэрыторыі Заходняй Беларусі і летам 1921 г. стварыў Цэнтральны беларускі паўстанцкі камітэт на чале з У. Пракулевічам, а для аператыўнага кіраўніцтва партызанскім рухам – Галоўны беларускі штаб. На Гродзеншчыне і ва ўсходніх паветах Беласточчыны ўзброеная барацьба разгортвалася пад кіраўніцтвам Беларускай партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў.

Літоўскі ўрад таксама падтрымаў лінію беларускіх эсэраў на ўзброеную барацьбу, каб вырашыць пытанне аб «сярэдняй Літве» на сваю карысць. З Літвы паступала зброя, амуніцыя, выбуховыя матэрыялы, грошы. На літоўска-польскай мяжы ў мястэчку Мерач быў размешчаны штаб кіраўніцтва партызанскім рухам. Адтуль паступала зброя, накіроўваліся арганізатары партызанскіх атрадаў і груп. Так, на Гродзеншчыну быў накіраваны Вячаслаў Разумовіч (псеўданім «Хмара»), удзельнік партызанскай барацьбы яшчэ з войскамі кайзераўскай Германіі (у 1960-я гады з'яўляўся галоўным рэдактарам газеты «Беларускі голас», якая выдавалася ў Таронта). Ён узначаліў групу партызанскіх атрадаў. Некаторыя з партызанскіх атрадаў і злучэнняў былі даволі шматлікімі і добра арганізаванымі. Так, у партызанскае злучэнне пад камандаваннем Германа Шыманюка («Скамарох»), што дзейнічала на Беласточчыне (Г. Шыманюк, былы артыст маскоўскага

тэатра «Буфф», у снежні 1921 г. вярнуўся ў родную вёску Грабовец Бельскага павета), уваходзіла каля 12 партызанскіх атрадаў колькасцю да тысячы чалавек. Пры партызанскім злучэнні выдавалася нават газета «Беларускі партызан», у адным з нумароў якой быў надрукаваны ультыматум беларускіх партызан да Ю. Пілсудскага і адначасова змяшчаўся зварот да старшыні Лігі Нацый у Жэневе. У ім выказваліся патрабаванні спыніць рэпрэсіі ў адносінах да беларускага насельніцтва, закрыццё беларускіх праваслаўных храмаў, адмовіцца ад прэтэнзій на Беларусь, прызнаць яе права на самавызначэнне як нацыі, вывесці з беларускай тэрыторыі польскія вайсковыя часці і паліцыю. Ультыматум заканчваўся зваротам да старшыні Лігі Нацый «не дапусціць далейшых гвалтаў над Беларусамі» [5].

У падпольных паўстанцкіх структурах, згодна з данымі Галоўнага штаба беларускіх партызан, налічвалася ад 8 да 10 тыс. чалавек. На наш погляд, гэта перабольшванне. Значная частка іх займалася земляробствам і не прымала ўдзелу ў арганізаваных эсэраўскімі камандзірамі збройных акцыях. У адпаведнасці з дырэктывамі Галоўнага штаба, беларускія паўстанцкія структуры павінны былі ў канспіратыўных мэтах весці дзейнасць як асветныя гурткі, кааператыўныя арганізацыі, царкоўныя брацтвы.

Пазіцыю эсэраў на разгортванне партызанскага руху ў краі падзялялі многія падпольныя структуры КП(б)Б. Так, партызанскія атрады, якія дзейнічалі ў Палескім, Навагрудскім і частцы Віленскага ваяводствах, узначальвалі, як правіла, камуністы. Найбольшую вядомасць атрымалі С. Ваупшасаў, К. Арлоўскі, В. Корж, А. Рабцэвіч і інш., якія набыты вопыт партызанскай барацьбы з поспехам выкарыстоўвалі потым у гады Вялікай Айчыннай вайны. Ім аказвалася матэрыяльная і ідэйна-арганізацыйная падтрымка з боку СССР, а некаторыя мелі сувязь са штабам Заходняга фронту і органамі НКУС.

Нягледзячы на рознасць палітычных поглядаў удзельнікаў партызанскага руху, сацыяльную базу яго склала палітычна актыўная частка беларускага сялянства і мясцовай інтэлігенцыі, у тым ліку былыя бежанцы, што прымалі актыўны ўдзел у рэвалюцыйных падзеях у Расіі.

Асноўнымі аб'ектамі нападу партызан з'яўляліся памешчыцкія маёнткі, сядзібы асаднікаў, паліцэйскія ўчасткі і нават невялікія вайсковыя адзінкі. Дзеянні партызан наводзілі жах на мясцовую адміністрацыю і служачых дзяржапарату. Паводле афіцыйных даных, у 1922 г. было зроблена 878, а ў 1923 – 503 партызанскія напады.

Каб зламаць партызанскі рух, польскія ўлады ўзмацнілі паліцэйскі тэрор. Многія сотні сялян падвергліся арыштам і жорсткім катаванням у дэфензіве. Так, бацька Германа Шыманюка (59 год) у выніку катаванняў у дэфензіве звар'яцеў, маці засталася з пераламанай рукой, брат за час знаходжання ў турме атрымаў сухоты. Нават жонка Шыманюка Лізавета, былая артыстка тэатра «Буфф», падверглася здзекам у дэфензіве. З дапамогай засланых правакатараў польская дэфензіва ў пачатку 1922 г. раскрыла эсэраўскія паўстанцкія структуры і правяла масавыя арышты іх удзельнікаў. У маі 1923 г. адбыўся паказальны «працэс 45-ці» над беларускімі партызанамі ў Беластоку, у красавіку 1925 г. – «працэс 72-х» у Гродне. Дзесяткі партызан былі расстраляны па прыгавору ваенна-палявых судоў. Сярод асуджаных былі і два дэпутаты польскага сейма эсэры С. Баран і С. Якавюк.

Якасна новы этап у развіцці нацыянальна-вызваленчага руху быў звязаны з выбарамі ў кастрычніку 1922 г. у польскі сейм і ўтварэннем сеймавай фракцыі – Беларускага пасольскага клуба (БПК). Блок нацыянальных меншасцей сабраў у Заходняй Беларусі 286 тыс. галасоў. Гэта быў вялікі поспех беларускіх нацыянальна-дэмакратычных сіл. 11 абраных дэпутатаў прадстаўлялі практычна ўсе найбольш значныя тагачасныя палітычныя партыі: Беларускую партыю сацыял-дэмакратаў (Б. Тарашкевіч, А. Аўсянік, П. Мятла), беларускую партыю сацыялістаў-рэвалюцыянераў (С. Баран, С. Якавюк, У. Каліноўскі), Беларускую хрысціянскую дэмакратыю (Ад. Станкевіч), незалежных сацыялістаў (С. Рак-Міхайлоўскі) і беспартыйных (М. Кахановіч і В. Рагуля). Разам з сенатарамі В. Багдановічам (дэпутат БХД), А. Назарэўскім і А. Уласавым (беспартыйныя) паслы стварылі нацыянальную пасольскую фракцыю ў сейме.

Практычная дзейнасць Беларускага пасольскага клуба была накіравана ў першую чаргу на адстойванне нацыянальных і са-

цыяльных правоў беларускага народа шляхам унясення сацыяльных законапраектаў, афіцыйных запытаў дэпутатаў, арганізацыі сустрэч паслоў з сялянамі, рабочымі, інтэлігенцыяй і рамеснікамі беларускіх сёл і мястэчак, у час якіх прымаліся рэзалюцыі, запыты да польскіх улад. Большасць такіх мітынгаў заканчвалася сутычкамі іх удзельнікаў з паліцыяй, падчас якіх паліцэйскія нярэдка ўчынялі расправу і над дэпутатамі.

Нягледзячы на непаслядоўнасць у тактыцы БПК, разыходжанні ў поглядах на спосабы вырашэння сацыяльна-эканамічных праблем і нацыянальнага пытання, дзейнасць клуба мела вялікае значэнне ў грамадска-палітычным жыцці края. Парламенцкія, легальныя сродкі барацьбы сталі неад'емнай часткай далейшага развіцця нацыянальна-вызваленчага руху Заходняй Беларусі.

Ва ўмовах уздыму нацыянальна-вызваленчага руху пачатку 1920-х гадоў праходзіў працэс фарміравання новых палітычных партый і арганізацый, зыход з гістарычнай арэны ранейшых палітычных партый. Звузілася сацыяльная база БПС-Д, частка лідэраў якой пайшла на супрацоўніцтва з польскімі ўладамі. У сярэдзіне 1920-х гадоў партыя спыніла сваё існаванне. Узніклі моцныя цэнтрабежныя тэндэнцыі ў БПС-Р. З яе левага крыла ў ліпені 1922 г. вылучылася і аформілася Беларуская рэвалюцыйная арганізацыя (БРА). Яна стаяла на пазіцыях узброенай барацьбы з польскімі ўладамі і ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР, карысталася падтрымкай беларускай інтэлігенцыі, часткі сялян. У практыцы штодзённай барацьбы БРА паступова збліжалася з падпольнымі камуністычнымі арганізацыямі.

На хвалі ўздыму вызваленчага руху 30 кастрычніка 1923 г. на канферэнцыі Беластоцкага, Брэсцкага і Віленскага акружкомаў Камуністычнай рабочай партыі Польшчы была створана Кампартыя Заходняй Беларусі. Тактычныя ўстаноўкі КПЗБ прадугледжвалі перамогу сацыялістычнай рэвалюцыі, ліквідацыю памешчыцкага землеўладання і перадачу зямлі сялянам без выкупу, права на самавызначэнне Заходняй Беларусі і аб'яднання з БССР [6, с. 70–71]. Апошняя частка лозунга «аб'яднанне з БССР» была знята ў чэрвені 1931 г. па прычыне палітычнага характару: ішла актыўная падрыхтоўчая работа па падпісанні савецка-польскага дагавора аб ненападзе.

Уступленне 31 снежня 1923 г. Беларускай рэвалюцыйнай арганізацыі ў склад КПЗБ пашырыла ўплыў партыі на беларускую інтэлігенцыю і сялянства, садзейнічала яе арганізацыйнаму росту. Кіраўнікі БРА І. Лагіновіч (П. Корчык), А. Канчэўскі, А. Капуцкі адразу ж былі каоптаваны ў склад ЦК КПЗБ, а з восені 1925 г. І. Лагіновіч стаў палітычным сакратаром ЦК КПЗБ, функцыі якога ён выконваў да арышту органамі НКУС у лютым 1936 г.

Актыўная падтрымка нацыянальна-вызваленчага руху партыйнымі і ўрадавымі структурамі Савецкай Беларусі садзейнічала яго актывізацыі, росту партызанскай барацьбы. Невыпадкова II канферэнцыя КПЗБ у лістападзе 1924 г. узяла курс «на арганізацыйную і палітычную падрыхтоўку ўзброенага паўстання» [7, с. 10]. Аднак ва ўмовах спаду рабочага руху ў карэннай Польшчы, прызнання ў 1923 г. Саветам паслоў краін Антанты ўсходняй мяжы Польшчы тактыка партызанскай барацьбы была бесперспектыўнай і памылковай. Яна ставіла пад удар мясцовае насельніцтва, прыйшла ў супярэчнасць са знешнепалітычным курсам СССР на ўстанаўленне сяброўскіх адносін з Польшчай. Таму з восені 1925 г. ЦК КПЗБ узяў курс на спыненне партызанскага руху, вызначыў новую тактыку актывізацыі барацьбы ў абарону нацыянальна-дэмакратычных патрабаванняў.

Як заканамерны вынік практычных дзеянняў ЦК КПЗБ па згуртаванні левых сіл нацыянальна-вызваленчага руху ў краі з'явіўся выхад у чэрвені 1925 г. са складу Беларускага пасольскага клубу Б. Тарашкевіча, С. Рак, П. Мятлы, П. Валошына і ўтварэнне асобнай фракцыі Беларускай сялянска-работніцкай грамады. У жніўні 1925 г. у Сопаце бліз Гданьска на прадстаўнічай нелегальнай сустрэчы кіраўнікоў камуністычнага руху з прадстаўнікамі фракцыі БСРГ Б. Тарашкевічам, П. Мятлой, іншымі дзеячамі нацыянальна-вызваленчага руху была дасягнута дамоўленасць аб стварэнні шырокай арганізацыі рэвалюцыйна-вызваленчага характару, вызначаны асноўныя аспекты яе палітычнай праграмы [8, арк. 4].

Апублікаваная вясной 1926 г. праграма ўключала дэмакратычныя і сацыяльна-эканамічныя патрабаванні, якія адлюстроўвалі інтарэсы шырокіх працоўных мас, у першую чаргу сялянства.

У хуткім часе БСРГ пераўтварылася ў масавую арганізацыю. У студзені 1927 г. налічвала больш за 100 тыс. чалавек, аб'яднаных амаль у 2 тыс. гурткоў. Гісторыя нацыянальнага руху Польшчы такой масавай арганізацыі яшчэ не ведала.

Занепакоеныя ростам папулярнасці БСРГ сярод насельніцтва польскія ўлады ў студзені 1927 г. арыштавалі кіраўнікоў Грамады і больш як 400 яе актывістаў. Шырокі рэзананс у беларускай грамадскасці атрымаў так званы паказальны працэс над 56 кіраўнікамі і актывістамі грамады, які праходзіў у лютым–маі 1928 г. Суд прыгаварыў Б. Тарашкевіча, С. Рак-Міхайлоўскага, П. Валошына і П. Мятлу да 12 гадоў зняволення, іншых 33 актывістаў Грамады ад 3 да 6 гадоў турмы.

Аднак спыніць рост нацыянальна-вызваленчага руху польскія ўлады былі не ў стане. Аб гэтым сведчылі, у прыватнасці, выбары ў польскі сейм 1928 г., у час якіх за прадстаўнікоў КПЗБ прагаласавала найбольшая колькасць (каля 27 %) выбаршчыкаў і амаль палова ад гэтага ліку за прадстаўнікоў іншых беларускіх дэмакратычных сіл. Таму, нягледзечы на ўзмацненне рэпрэсіўнай палітыкі рэжыму «санацыі», мітынгі, дэманстрацыі, забастоўкі сталі штодзённай рэчаіснасцю палітычнага жыцця края. Нярэдка выступленні прымалі збройны характар, як гэта мела месца падчас выступлення сялян вёскі Асташына і навакольных вёсак Навагрудскага павета супраць падатковага прыгнёту ў сакавіку 1930 г., а таксама Кобрынскага павета ў жніўні 1933 г. І хаця гэта былі крайнія формы пратэсту, якія прыводзілі да неапраўданых ахвяр, яны садзейнічалі росту нацыянальна-палітычнай самасвядомасці насельніцтва края, ускосна набліжалі галоўную мэту – уз'яднанне беларускага народа ў адзінай нацыянальнай дзяржаве.

Крыніцы і літаратура

1. Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва. – Фонд 3. – Воп. 1. – Спр. 243.

2. Тамсама. – Спр. 151.

3. Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі. – Вільня; Нью-Ёрк; Менск; Прага, 1998. – Т. 1, кн. 2.

4. Цвікевіч, А. Адраджэнне Беларусі і Польшча / А. Цвікевіч. – Менск; Вільня; Берлін, 1921.
5. Беларускі партызан. – 1922. – Жнівень.
6. Ситуация и задачи партии (Резолюция I съезда КПЗБ). – Вильно, 1928.
7. II канферэнцыя Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі. – Вільна, 1925.
8. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Фонд 242. – Воп. I. – Спр. 58.

Магнус Ильмярв

Институт истории Таллиннского университета

ПАКТ МОЛОТОВА–РИББЕНТРОПА И БАЛТИЙСКИЕ СТРАНЫ: РЕАЛЬНОСТЬ И АЛЬТЕРНАТИВЫ

В истории народов Балтии 1939–1940 гг. представляют собой наиболее драматический период в XX в. Эти годы обозначили конец целой эры – первого периода независимой государственности. Без сомнения, общий шок от событий 1939–1940 гг. оставил глубокий след в нашем восприятии мира. В эти дни, спустя 70 лет, многие из нас смотрят на 1939 г. и последовавшие за ним события как на неизбежное зло, когда где-то далеко – в Москве и в Берлине – судьба государств Балтии была предопределена более, чем на полвека.

В исследовании внешней политики стран Балтии межвоенного периода возможны два подхода. Первый: прибалтийские государства были пешками в комбинациях крупных государств и были пожертвованы в жестокой игре во имя достижения политических целей этих государств. И только в этом можно видеть причину утраты независимости. Второй: рассматривать страны Балтии как субъекты истории, которые во имя собственных интересов пытались приспособиться к изменениям большой политики в Европе. При таком подходе решающими становятся воля, деятельность и ошибки руководителей государств, внешняя и экономическая политика, а также коррупция.

Применительно к трагедии прибалтийских государств, когда они были вынуждены подчиниться воле Советского Союза, обще-

принятая точка зрения гласит, что в данной ситуации прибалтийские страны были не в состоянии помешать тому развитию событий, которое привело к их включению в состав СССР, и решения лидеров этих государств в то время были практически единственно верными. В качестве оправдания всему произошедшему обычно приводят постулат о том, что любой другой шаг имел бы еще худшие последствия. К такому заключению подталкивают и соображения геополитического плана: во-первых, географическое положение стран Балтии, во-вторых – небольшой размер их территории и населения, по сравнению с могущественными и грозными соседями.

Известие о подписании Советским Союзом и Германией Пакта о ненападении от 23 августа 1939 г. произвело эффект разорвавшейся бомбы на общественное сознание стран Балтии. Весь мир при известии о заключении пакта Молотова–Риббентропа задался вопросом: какова цена заключенного соглашения и кто будет расплачиваться за него? Информация, полученная Таллинном, Ригой и Каунасом сразу после заключения пакта о ненападении, либо указывала на наличие секретного протокола, либо отрицала существование такового.

Факты говорят, что информированные круги в Таллине, Риге и также в Хельсинки были в курсе того, что в результате подписания германо-советского пакта о ненападении Эстония, Латвия и Финляндия попали в советскую сферу интересов, в то время как Каунас располагал сведениями о том, что Литва осталась в германской сфере интересов. Исходя из имеющейся информации, Эстония, Латвия и Финляндия, выжидая дальнейших шагов со стороны Советского Союза, не смогли найти соответствующих путей и средств сотрудничества для достижения общих внешнеполитических целей, как в их внешней политике, так и в военно-политической сфере.

В истории всегда существуют альтернативы, хотя история осуществляется однонаправленно, реализуя одну из нескольких возможностей. Но это не упраздняет ситуации выбора. Считается, что безальтернативный выбор существует только вне человеческого общества. И только фиксация того, что случилось в действи-

тельности, позволяет избежать оценок и сравнений, одобрения или осуждения произошедшего.

Был ли договор о взаимопомощи, который страны Балтии заключили с Советским Союзом, неизбежным? Общераспространенной точкой зрения является то, что осенью 1939 г. для балтийских стран альтернатив не было. Надо признаться, этот вопрос не из простых. Трудность заключается в том, что в поисках ответа на него можно легко пасть жертвой ничем не подтвержденных спекуляций. В данном исследовании мы будем исходить из гипотезы и выстраивания того, что могло произойти, если отталкиваться от реальных фактов. Обратимся к вопросу о том, какими возможностями выбора обладали балтийские страны в создавшейся ситуации.

Первая альтернатива: вооруженное сопротивление. Этот вопрос изучался в сравнении с моделью Зимней войны. В 1930-х лидеры стран Балтии один за другим публично провозглашали свою решимость оказать вооруженное сопротивление, невзирая на то, кто окажется их врагом. В конце сентября – начале октября 1939 г. решительный тон выступлений был позабыт.

Вторая альтернатива: Единый фронт балтийских стран, который выступил бы против требований Советского Союза и апеллировал к политической и моральной поддержке со стороны Лиги Наций и демократических стран, к нормам международного права, т. е. действенный нейтралитет.

Третья альтернатива: правительство в изгнании. Исторические исследования, освещающие события 1940 г. в государствах Балтии, лишь поверхностно затрагивают вопрос об ответных политических шагах на советские действия в этом регионе.

Возникновение независимых государств Балтии стало возможным после коллапса России и Германии в 1917–1918 гг. Очевидно, что хотя образованию государств Балтии существенно способствовали изменения в Европейской политической констелляции, их независимость была бы недостижима без единства политической воли самих народов Балтии и их победоносной вооруженной борьбы за свободу. Двадцать лет спустя перемены на уровне политической констелляции вместе с возросшими трениями между

европейскими великими державами отразились и на балтийских государствах, подтолкнув их на путь к потере суверенитета, для стойкой защиты которого они не проявили никакой инициативы.

По сути дела, катастрофа 1939–1940 гг. являлась также закономерным результатом серьезного кризиса во внутренней политике стран Балтии. Таким образом, тихая смерть независимости балтийских государств и их полное исчезновение с европейской политической арены были результатом долгого процесса, хотя не единственно по причине совершенно безысходной ситуации и не только из-за вынужденных действий, вызванных подписанием пакта Молотова–Риббентропа.

Со сменой принятой в обществе идеологии нередко меняется и трактовка историками прошлого. Другое дело, насколько рационально это работает. Сегодня еще невозможно написать историю народов Балтии так, чтобы она оказалась одинаково приемлема для всех. В истории каждого народа и государства есть события и периоды, в рассмотрении которых могут проявиться очень даже противоположные точки зрения.

Литература

1. Ilmjärv, M. Soviet Baltic Policy 1939–1940 as Reflected in Russian Publications / M. Ilmjärv // The «Baltic Frontier» Revisited. Power Structure and Cross-Cultural Interactions in the Baltic Sea Region. Proceeding of the International Symposium in Florence, February 29th and March 1st, 2008. Department of Scandinavian Studies, University of Vienna. – Vienna, 2009. – P. 173–188.

2. Ильмярв, М. Был ли выбор? Балтийские страны и трехсторонние переговоры 1939 года / М. Ильмярв // Отечественная история. – 2008. – № 4. – С. 47–66.

3. Ilmjärv, M. International Reverberation to Incorporation of Baltic States by Soviet Union in Summer 1940 and Later / M. Ilmjärv // Acta Historica Tallinnensia. – 2005. – Vol. 9. – P. 29–69.

4. Ilmjärv, M. Silent Submission: Formation of Foreign Policy of Estonia, Latvia and Lithuania: Period from mid 1920s to Annexation in 1940 / M. Ilmjärv // Acta Universitatis Stockholmiensis. Studia Baltica Stockholmiensia. – Stockholm, 2004. – P. 1–592.

5. Ilmjärv, M. Hääletu alistumine. Eesti, Läti ja Leedu välispoliitilise orientatsiooni kujunemine ja iseseisvuse kaotus. 1920. aastate keskpaigast anneksioonini. – Tallinn, 2004. – Lk. 1–986.

Р. Р. Лазько

Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф. Скарыны

КРАХ ВЕРСАЛЬСКАЙ СІСТЭМЫ Ў ЕЎРОПЕ І АБ'ЯДНАННЕ БЕЛАРУСІ

Расколатая рэвалюцыяй і грамадзянскай вайной Расія страціла магчымасць прыняць удзел у канферэнцыі дзяржаў – пераможцаў у Першай сусветнай вайне, скліканай у студзені 1919 г. у Парыжы. Аднак не з'яўляючыся ўдзельніцай мірнай канферэнцыі, Савецкая Расія ўнесла свой спецыфічны ўклад у фарміраванне новай сістэмы міжнародных адносін, стварэнне якой было адной з важных задач Парыжскай канферэнцыі. Расія прызнала нацыянальныя рэспублікі, якія ўзніклі на заходніх ускраінах Расійскай імперыі ў працэсе яе распаду – спачатку Украіна, Фінляндыя, потым прыбалтыйскія рэспублікі, і саступіла Польшчы па Рыжскім дагаворы заходнія часткі Украіны і Беларусі. Гэта былі вымушаныя страты, прадыктаваныя неабходнасцю для бальшавікоў згарнуць знешні фронт барацьбы, каб забяспечыць перамогу ў грамадзянскай вайне, якія сталі часткай кошту гэтай перамогі. Планы дзяржаў Антанты па тэрытарыяльна-палітычным перападкаванні Усходняй Еўропы не ішлі так далёка, і толькі вясной 1923 г., страціўшы надзею на рэстаўрацыю ў Расіі буржуазна-дэмакратычнага ладу, яны ў поўным аб'ёме прызналі геапалітычныя вынікі грамадзянскай вайны ў Расіі. Такім чынам, новыя дзяржавы Усходняй Еўропы з набытымі імі граніцамі аказаліся ўключанымі ў новую, Версальскую, сістэму міжнародных адносін, атрымаўшы ў ёй ролю санітарнага кардона паміж Заходняй Еўропай і Савецкай Расіяй. А стаўшы яе часткай, яны мусілі падзяліць і гістарычны лёс гэтай сістэмы.

Пры гэтым, аднак, становішча народаў Прыбалтыкі і фінаў, з аднаго боку, і беларусаў, украінцаў – з другога, у Версальскай сістэме аказалася істотна розным. Першым удалося выкарыстаць спрыяльную міжнародную кан'юнктуру ў перыяд фарміравання Версальскай сістэмы і стварыць свае нацыянальныя дзяржавы, стаць суб'ектамі гэтай сістэмы міжнародных адносін. Для белару-

саў і ўкраінцаў кан'юнктура аказалася менш спрыяльнай, абвешчаных імі дзяржаў захаваць не ўдалося і давялося апынуцца падзеленымі Польшчай і Савецкай Расіяй. Па гэтай прычыне нацыянальныя рухі беларусаў і ўкраінцаў, у адрозненне ад фінаў і народаў Прыбалтыкі, не былі зацікаўленыя ў стабілізацыі і ўмацаванні Версальскай сістэмы, нягледзячы на распрацоўку яе стваральнікамі механізма абароны правоў нацыянальных меншасцей, якімі беларусы і ўкраінцы сталі ў Польскай Рэспубліцы. Аднак не жадаючы ўвекавечання драматычнага стану падзеленасці, расколу сваіх этнасаў, беларускія і ўкраінскія нацыянальныя лідэры і арганізацыі, абапіраючыся на вопыт барацьбы за нацыянальную дзяржаўнасць у 1918–1920 гг., усведамлялі, што ўласных сіл для аб'яднання і стварэння нацыянальных дзяржаў зусім недастаткова. Даводзілася разлічваць на новы крызіс сістэмы міжнародных адносін, які б істотна аслабіў ці нават прывёў да развалу Версальскую сістэму, і адпаведна – на падтрымку моцных дзяржаў, зацікаўленых у яе развале. Такімі праціўнікамі сістэмы, валодаўшымі патэнцыялам, дастатковым для істотнага аслаблення версальскага ладу, былі толькі Германія (што агульнавядома) і Савецкая Расія. Гэтыя дзяржавы імкнуліся выкарыстаць у сваёй антыверсальскай палітыцы заходнебеларускі і ўкраінскі нацыянальныя рухі. Паколькі Заходняя Беларусь адыйшла да Польшчы, то далей мы будзем гаварыць пераважна аб яе палітыцы, умоўна зводзячы заходнебеларускую праблему да гэтага аспекта.

Для Савецкай Расіі панесеныя тэрытарыяльныя страты былі не толькі вымушанымі, але і часовымі, як часовай была і Версальская сістэма ў цэлым. Яна разглядалася бальшавікамі значна шырэй, чым гістарычны спосаб дзяржаўна-тэрытарыяльнага ўладкавання пасляваеннай Еўропы. Адпаведна з іх рэвалюцыйным светапоглядам, яна ацэньвалася як сродак стабілізацыі сусветнага капіталізму. Гэты падыход служыў вытокам глыбокай варожасці да Версальскай сістэмы, моцнай настолькі, што стваралася арганічнае імкненне разбурыць сістэму ўзброенай сілай. Пры гэтым, аднак, іерархія матываў непрыняцца мянялася ад пераважна ідэалагічных да пераважна геапалітычных, адпаведна з тым, як мяняліся ў Савецкай Расіі ацэнкі перспектыў сусветнай рэвалюцыі.

Першай, няўдалай, спробай разбурыць версальскі лад быў паход Чырвонай Арміі на Варшаву летам 1920 г., калі бальшавікі, па словах Леніна, пахіснулі ўсю капіталістычную сістэму. Няўдача першай спробы не збянтэжыла савецкіх кіраўнікоў. Як гаварыў Ленін па яе гарачых слядах, «асноўная палітыка наша засталася тая ж. Мы выкарыстоўваем кожную магчымасць, каб перайсці ад абароны да наступлення. Мы ўжо надарвалі Версальскі дагавор і дарвем яго, як толькі надарыцца зручны момант» [тут і далей гл. 1]. Ленін настойліва тлумачыў сваім таварышам па партыі неабходнасць рыхтаваць гэты момант. Калі нельга перамагчы двух сваіх ворагаў, «трэба ўмець паставіць свае сілы так, каб яны пабіліся паміж сабой... але, як толькі мы будзем моцнымі настолькі, каб перамагчы ўвесь капіталізм, мы не марудзячы схопім яго за каўнер». У сувязі з гэтым Ленін адкрыта гаварыў аб неабходнасці нацкоўваць капіталістычныя групоўкі адна на другую, нават падштурхоўваць іх да вайны паміж сабой, якая б аслабіла іх на карысць сацыялізму.

Выпрацаваны пад кіраўніцтвам Леніна курс міжнароднай палітыкі савецкай улады, пры ўсіх яго тактычных паваротах, застаўся прынцыпова нязменным на працягу міжваеннага часу. Праз 15 год Сталін нагадваў пра яго членам Палітбюро як пра вядомую ісціну, калі сцвярджаў аб фарміраванні ў Еўропе дзвюх новых груповак дзяржаў замест ранейшай Антанты. Ён амаль цытаваў Леніна: «Чым мацнейшай будзе бойка паміж імі, тым лепш для СССР. Мы можам прадаваць хлеб і тым і другім, каб яны маглі біцца... Нам выгадна, каб бойка ў іх была як мага даўжэйшай, але без хуткай перамогі адной над другой». Заўважым, што ў гэты час афіцыйная савецкая дыпламатыя адстойвала ідэю аб сістэме калектыўнай бяспекі ў Еўропе.

У той міжнароднай сітуацыі, якая склалася ў выніку Першай сусветнай вайны, «паставіць свае сілы так, каб ворагі сацыялізму пабіліся паміж сабой», можна было толькі адным спосабам – спрыяючы адраджэнню Германіі, капіталістычнага праціўніка Версальскай сістэмы, дапамагаючы ёй аднавіць сваю здольнасць біцца супраць версальскіх дзяржаў. Гэтай стратэгічнай мэтай бальшавікоў – раскалоць, аслабіць капіталістычную сістэму і садзейнічаць яе разбурэнню, у першую чаргу, была прадыктавана ра-

пальская палітыка. Відавочна, гэта яе негатыўная, разбуральная мэта была вядучай і непасрэднай да часу, пакуль у бальшавіцкай партыі панавала перакананне, што сусветная рэвалюцыя затрымліваецца ненадоўга. А такое перакананне было пануючым да сярэдзіны 1920-х гадоў. Толькі з гэтага часу вырасла значэнне іншага, стваральнага фактара рапальскай палітыкі, звязанага з імкненнем Савецкай Расіі, не чакаючы сусветнай рэвалюцыі, выйсці з міжнароднай ізаляцыі і пачаць з дапамогай Германіі пераўтварэнне краіны ў магутную сацыялістычную крэпасць, здольную ў зручны момант рашаць тую ж задачу развалу Версальскай сістэмы.

Паралельна гэтаму павароту змянілася і стаўленне да беларускага і ўкраінскага нацыянальнага руху ў Польшчы. Да сярэдзіны 1920-х гадоў савецкія ўлады спрыялі яго радыкалізацыі, падтрымлівалі ўзброеную барацьбу, імкнучыся такім спосабам «расшыць па нацыянальных швах сучасную польскую дзяржаву, не даючы ёй часу асесці і набыць устойлівасць...» Такую задачу ставіў Д. Мануільскі ад імя Выканкама Камінтэрна, выступаючы на III з'ездзе Кампартыі Польшчы (студзень 1925 г.). Неўзабаве, аднак, у сувязі з пераходам у СССР да будаўніцтва сацыялізму ў адной краіне, метады гэтага «расшывання» змяніліся: беларускі і ўкраінскі філіялы кампартыі Польшчы атрымалі дырэктыву згарнуць узброеную барацьбу і перайсці да стварэння масавага легальнага сялянскага руху. У Беларусі ўзнікла БСР «Грамада», а ў Заходняй Украіне – «Сельроб». Аднак калі санацыйны рэжым прыступіў да разгрому «Грамады» ў пачатку 1927 г., Масква фактычна адмежавалася ад яе, прадэманстраваўшы з'яўленне новых прыярытэтаў у савецкай палітыцы. З гэтага часу Заходняя Беларусь і Заходняя Украіна былі цалкам пераўтвораны ў заложнікаў еўрапейскай палітыкі СССР, якая заставалася па духу антыверсальскай, аднак была вымушана змяніць свае метады. Галоўным жа партнёрам СССР у гэтай палітыцы засталася Германія.

Новы істотны паварот у развіцці заходнебеларускай праблемы намеціўся ў пачатку 1930-х гадоў, не выпадкова супаўшы з адыходам Германіі ад рапальскага курса. Аднак неабходна ўлічваць не адну, а цэлы комплекс прычын гэтага павароту. Імі былі пагаршэнне ўнутранай сітуацыі ў СССР у выніку пераходу да суцэль-

най калектывізацыі; стабілізацыя рэжыма санацыі ў Польшчы; пагаршэнне міжнароднага становішча СССР. Гэтыя фактары прымусілі СССР зноў, прычым больш энергічна, чым у час стварэння «Грамады», шукаць паразумення з Польшчай, ахвяруючы дзеля яго і беларускім нацыянальным рухам.

Першая прычына была названа на адным з сакавіцкіх пасяджэнняў Палітбюро ЦК ВКП(б) 1930 г. Аказваецца, у сувязі з масавым сялянскім пратэстам супраць гвалтоўнай калектывізацыі існавалі апасенні, што «ў выпадку сур'ёзнага кулацка-сялянскага выступлення ў правабярэжнай Украіне і Беларусі, асабліва ў сувязі з маючым адбыцца высяленнем з прыгранічных раёнаў польска-кулацкіх контррэвалюцыйных і шпіёнскіх элементаў, польскі ўрад можа ўмяшацца». Хаця нельга выключаць, што Палітбюро перабольшвала свае апасенні, шукаючы апраўданне жорсткім метадам калектывізацыі, аднак гэтыя апасенні сапраўды існавалі і разам з іншымі фактарамі прымушалі выводзіць беларускае пытанне са сферы міждзяржаўных адносін з Польшчай.

На пазіцыю Масквы па гэтым пытанні паўплывалі таксама вынікі восеньскіх («брэсцкіх») выбараў у польскі сейм 1930 г. Яны засведчылі ўмацаванне сацыяльнай базы і палітычных пазіцый рэжыму санацыі, яе гатоўнасць бараніць сваю ўладу ўсімі сродкамі. Гэтыя вынікі, несумненна, абясцэнілі ролю камуністычнага руху ў Заходняй Беларусі і на Украіне як сродка «расшывання» польскай дзяржавы па нацыянальных швах. Было відавочна, што польская дзяржава стабілізавалася. Таму ўжо восенню 1930 г. савецкі паўпрэд у Польшчы У. Антонаў-Аўсеенка зандзіраваў магчымасць аднаўлення перагавораў наконт дагавора аб ненападзенні і выявіў прыхільнае стаўленне Пілсудскага да гэтых намераў. А ў чэрвені 1931 г. пленум ЦК КПЗБ прыняў рашэнне, якім адкідвалася апошняя частка лозунга аб праве «працоўных Заходняй Беларусі» на самавызначэнне аж да аддзялення ад Польшчы і далучэння да БССР. Ведаючы поўную залежнасць камуністычнага руху ад Палітбюро ЦК ВКП(б), можна з поўным перакананнем сцвярджаць, што гэта рашэнне было прынятае па распараджэнні Масквы. Яно аблегчыла заключэнне пакта аб ненападзенні з Польшчай у наступным годзе.

Спынімся, нарэшце, на трэцяй прычыне з названага комплексу фактараў, якія абумовілі чарговы паварот у развіцці заходнебеларускай праблемы. З'яўляючыся моцна залежнай ад замежнай палітыкі СССР, яна мусіла паўтарыць той паварот, які савецкая палітыка перажывала ў гэты час, выходзячы на новы этап, на якім СССР афіцыйна прытрымліваўся прынцыпу калектыўнай бяспекі (1934–1938 гг.). Савецкі ўрад быў вымушаны перайсці да гэтага курса, калі страціў рапальскую апору сваёй еўрапейскай палітыкі. Гітлераўская Германія згортвала палітычнае супрацоўніцтва з СССР, аддаючы перавагу Захаду, і гэта адбывалася ў даволі небяспечны для СССР момант, калі на Далёкім Усходзе ўзнікла пагроза японскай агрэсіі. Таму даводзілася не толькі сапернічаць з Германіяй на заходнім палітычным полі, але і забяспечваць свой еўрапейскі тыл перад пагрозай з Усходу. Але палітыка калектыўнай бяспекі не была чыста кансерватыўнай, абарончай. Страчваючы рапальскую апору сваёй еўрапейскай палітыкі ва ўмовах, калі Версальская сістэма захісталася, СССР не меў іншых магчымасцей забяспечыць сваю актыўную ролю ў справе новага еўрапейскага ўладкавання, акрамя ўдзелу ў калектыўных санкцыях супраць патэнцыяльнага агрэсара. А гаворка ішла менавіта аб гэтай перспектыве. Такім чынам, задача сутыкнуць ілбамі сваіх праціўнікаў заставалася актуальнай. Зрэшты, следам за З. С. Белавусавай звернем увагу на тое, што ў «Кратком курсе истории ВКП(б)», які выйшаў з друку восенню 1938 г. і прадстаўляў заслугі партыі перад народамі СССР і ўсяго свету, зусім не ўпаміналася аб калектыўнай бяспецы – настолькі нязначным аказаўся гэты эпізод у палітыцы.

З пераходам савецкага ўрада да палітыкі калектыўнай бяспекі звязаны апошнія старонкі замежнай беларускай палітыкі. Пасля ратыфікацыі дагавора аб ненападзенні з Польшчай савецкаму ўраду давялося пайсці насустрач патрабаванню і спыніць прапаганду ў савецкім друку традыцыйнага для яго тэзіса аб «польскай акупацыі» Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны. А восенню 1934 г., пераадольваючы польскае супраціўленне ўступленню СССР у Лігу Нацый, савецкі ўрад фактычна адмовіўся ад ролі СССР як пратэктара славянскіх нацыянальных меншасцей у Польшчы. Гэта

было зроблена ў форме адмовы карыстацца нормамі міжнароднага права і трыбунай Лігі Нацый для абароны правоў меншасцей. З гэтага часу аж да восені 1939 г. беларуская тэма знікае са сферы савецкай дыпламатыі, хаця і застаецца некаторы час адной з дзялянак у дзейнасці Камінтэрна.

Аднак і новая тактыка («палітыка калектыўнай бяспекі»), нягледзячы на яе асобныя поспехі, не прывяла да пераўтварэння СССР у адзін з вядучых фактараў еўрапейскай палітыкі, роўны Англіі, Францыі, Германіі. Восенню 1938 г. заходнімі дзяржавамі было праігнаравана жаданне СССР прыняць удзел у міжнароднай канферэнцыі, прысвечанай вызначэнню лёсу Чэхаславакіі. У ходзе летніх перагавораў 1939 г. Англія і Францыя не далі СССР картбланш для дзеянняў ва Усходняй Еўропе. Версальская сістэма развальвалася, Еўропа перабудоўвалася, а СССР не меў дывідэндаў ад гэтага працэсу. Даводзілася спадзявацца на сітуацыю, у якой ворагі сацыялізму пабіліся б паміж сабой. Рэальна стварыць яе савецкаму кіраўніцтву ўдалося толькі 23 жніўня 1939 г., у выніку падпісання дагавора аб ненападзенні з Германіяй з яго сакрэтным дадаткам. Адзін з аўтараў дагавора, В. М. Молатаў, назваў яго «паваротным пунктам у гісторыі Еўропы, ды і не толькі Еўропы». Гэта сапраўды было так, бо цяпер Гітлер набыў упэўненасць, што будзе ваяваць толькі на адным фронце – заходнім, абапіраючыся пры гэтым на савецкую сыравіну. Але і савецкія кіраўнікі, нарэшце, атрымалі магчымасць выканаць ленінскі запавет і пашырыць сацыялізм на ўсходнія тэрыторыі Версальскай сістэмы.

Праз тыдзень пасля пачатку вайны Сталін у прысутнасці Молатава і Жданава даваў Г. Дзімітраву інструкцыі аб арганізацыі дзейнасці Камінтэрна ў новых умовах. «Вайна ідзе паміж дзвюма групамі капіталістычных краін..., – сказаў ён. – Мы можам манеўраваць, падштурхоўваючы адзін бок супраць другога, каб добра пабіліся». Выгада для СССР такога развіцця падзей бачылася ў аслабленні абедзвюх груповак, што стварала магчымасць самому перайсці ў палітычнае і стратэгічнае наступленне. Гэтак жа ацэньваў дагавор і Варашылаў, спасылаючыся пры гэтым на Леніна: «Мы іх будзем умела заахвочваць, сутыкаць і г. д. і ў зручны момант, па ленінскай формуле, самі пяройдзем у наступленне».

У выніку разгрому Польшчы, якая б стала першым аб'ектам такога наступлення, па словах Сталіна, «мы б пашырылі сацыялізм на новыя тэрыторыі і насельніцтва». Ні адзін з савецкіх кіраўнікоў не бачыў якіх-небудзь перашкод у рэалізацыі гэтых намераў, у прыватнасці, звязаных з сітуацыяй на Далёкім Усходзе. Што і зразумела, паколькі да гэтага часу сітуацыя там змянілася на карысць СССР [2, с. 220–225].

У святле сталінскай заявы аб пашырэнні сацыялізму, якая прагучала ўжо 7 верасня, відавочна, што так званую пазіцыю чакання развіцця падзей, занятую савецкім кіраўніцтвам у тыя дні, неабходна разглядаць толькі як выяву пэўнай тактыкі, звязанай з несупадзеннем мэт СССР і Германіі ў вайне. Гітлеру не ўдалося ізаляваць Польшчу, у вайну ўступалі Францыя і Англія, таму яму было пільна патрэбна як найхутчэй разграміць свайго польскага праціўніка. Вырашэнне гэтай задачы аблегчыла б ваеннае ўзаемадзеянне Германіі з СССР. Яно таксама дало б магчымасць падзяліць з савецкім партнёрам палітычную і маральную адказнасць за ўчыненую агрэсію. Таму Германія пачала ціснуць на СССР ужо з 4 верасня, каб схіліць яго як найхутчэй заняць тэрыторыю Польшчы, аднесеную да савецкай сферы інтарэсаў. А Сталін марудзіў, бо настроены быў на зацягванне вайны без удзелу СССР, каб праціўнікі «добра пабіліся» і стварылі для яго доўгачаканую магчымасць «кінуць вырашальную гіру на вагі». Нельга не ўлічваць таксама і звычайную непадрыхтаванасць савецкай дзяржавы да такой маштабнай аперацыі, якая выявілася яшчэ да яе пачатку, у час мабілізацыі, што ішла з 7 верасня. Гаворка ідзе не толькі аб матэрыяльнай непадрыхтаванасці Чырвонай Арміі. Савецкаму кіраўніцтву даводзілася ўлічваць і псіхалагічную непадрыхтаванасць савецкага грамадства да ваенных дзеянняў, якія аб'ектыўна спрыялі фашысцкай Германіі, «галоўнаму падпальшчыку вайны», як да таго часу яе кваліфікавала савецкая прапаганда. Неабходна было таксама даць час і насельніцтву Заходняй Беларусі, каб яно зарыентавалася ў намерах савецкага кіраўніцтва, што было няпроста пасля пяцігадовага маўчання Масквы наконт лёсу беларусаў у Польшчы і пасля разгрому па ініцыятыве Сталіна незадоўга да вайны Камуністычнай партыі Польшчы.

Рашэнне аб уводзе войск было прынята, перш за ўсё, з улікам гэтых фактараў і не пазней 9 верасня. Акрамя прыведзенай вышэй спасылкі на дырэктывы Сталіна Камінтэрну яшчэ адным і досыць пераканаўчым аргументам на карысць гэтага сцвярджэння з'яўляецца варыянт дырэктывы наркома абароны К. Варашылава і начальніка генштаба РККА Б. Шапашнікава ваеннаму савету БВА ад гэтай даты. Яна прадугледжвала ўвод савецкіх войск у Польшчу ўжо ў ноч з 12 на 13 верасня. З прыняццем гэтага рашэння давялося паспяшацца пасля атрымання 8 верасня паведамлення аб заняцці нямецкімі войскамі Варшавы (інфармацыя, якая пазней не спраўдзілася). 14 верасня дырэктыва была выпраўлена і «вызваленчы паход» пачаўся 17 верасня – тады, калі болей адцягваць было нельга, не рызыкуючы стварыць сітуацыю, у якой давялося б прымаць Заходнюю Беларусь і Заходнюю Украіну з рук Германіі. Уступаўшыя на тэрыторыю Польскай Рэспублікі савецкія часці мелі карты з абазначэннем мяжы, на якой ім належала сустрэцца з часцямі вермахта. Гэта і зразумела: у такой сур'ёзнай справе, як размежаванне, якое належала правесці ў ходзе вайны, нельга было дапускаць экспромтаў.

Далейшы лёс Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны пасля ўступлення савецкіх войск быў вырашаны Палітбюро ЦК ВКП(б) згодна з савецкай геапалітычнай канцэпцыяй, вядомай з 1920 г. Адпаведныя дакументы апублікаваны і вядомыя даследчыкам. У рашэнні Палітбюро «Пытанні Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны» ад 1 кастрычніка распісана ўсё: і працэдура правядзення выбараў у Народныя сходы Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны, і план першачарговых пераўтварэнняў, і нават цэны на соль, керасін і запалкі. Несумненна, уклад у сваё аб'яднанне ўнёс і беларускі народ – тым, што не даў сябе знішчыць амаль за 20 гадоў падзелу: было што аб'ядноўваць. Аднак вырашальнае слова сказаў не ён. Аб'яднанне Беларусі стала лагічным наступствам развалу Версальскай сістэмы. Беларускаму народу заставалася толькі выкарыстаць новую сітуацыю ў сваіх інтарэсах, у інтарэсах кансалідацыі ў адзіны жыццяздольны арганізм, каб у лепшы час узяць уласны лёс у свае рукі.

Літаратура

1. Лазько, Р. Р. Беларусь у савецкай антыверсальскай палітыцы / Р. Р. Лазько // Міжнар. навук. канф. «Беларусь і суседзі: гістарычныя шляхі, узаемадзеянне і ўзаемаўплывы», 28–29 верас. 2006 / рэдкал.: Р. Р. Лазько (адказ. рэд.) [і інш.]. – Гомель, 2006.

2. Молодяков, В. Э. Несостоявшаяся ось: Берлин–Москва–Токио / В. Э. Молодяков. – М., 2004.

В. В. Даніловіч

Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Мінск

ДЗЕЙНАСЦЬ ПАСЛОЎ КЛУБА «ЗМАГАННЕ» Ў ПОЛЬСКІМ СЕЙМЕ (1928–1930 гг.)

Як вядома, згодна з Рыжскім мірным дагаворам 1921 г. польскія кіруючыя колы абавязваліся забяспечваць для ўсіх нацыянальных меншасцей II Рэчы Паспалітай роўныя палітычныя правы і свабоднае развіццё культуры і веравызнання. Аднак польскія ўлады не дбалі пра выкананне палажэнняў дагавора. Прыгожы лозунг «За вашу і нашу свабоду!», які шырока прапагандавалі дзеячы польскага нацыянальнага руху ў час барацьбы з расійскім царызмам аказаўся зусім забытым. Сутнасць унутранай палітыкі польскіх улад у міжваенны перыяд можна вызначыць «Польшча для палякаў».

Яскравай ілюстрацыяй такіх адносін польскіх улад да правоў нацыянальных меншасцей з'яўляецца дзейнасць паслоў клуба «Змаганне» ў польскім сейме.

У 1928–1930 гг. сейм з'яўляўся асяродкам апазіцыі рэжыму Пілсудскага. Гэты час характарызаваўся сталым супрацьстаяннем урада і сейма, бо ў апошнім прыхільнікі «санацыі» не мелі пераважнай большасці. Была фактычна ліквідавана адказнасць урада перад парламентам. Нягледзячы на вынесены сеймам вотум недаверу, тыя ж самыя міністры зноў прызначаліся на свае пасты, што вяло да частых змен урадаў [1, s. 115–116, 120–121].

Парламенцкая дзейнасць паслоў клуба «Змаганне» грунтавалася на цесным супрацоўніцтве ў межах лева-радыкальнага

сеймавага блока, у які акрамя іх уваходзілі паслы ад украінскага Сельроба і Аб'яднання сялянскай левіцы «Самопомоц», а ўзначальваў блок пасольскі клуб Кампартыі Польшчы [2, с. 18]. Усе фракцыі гэтага блока выступалі з агульнымі заявамі і прапановамі па важнейшых пытаннях унутранай і знешняй палітыкі. Яны падтрымлівалі адзін аднаго і выказвалі салідарнасць з усімі левaрадыкальнымі сіламі краіны. Фактычна ў сейме паслы клуба «Змаганне» выконвалі ролю фракцыі КПЗБ, хоць гэта афіцыйна і не афішыравалася.

Пасольскі клуб «Змаганне» з першага пасяджэння заняў актыўную радыкальную пазіцыю. У першыя ж дні сваёй сеймавай працы яго паслы зрабілі запыт у справе выбарчых парушэнняў. Але ён не быў прыняты сеймавай большасцю. Аднак на пасяджэнні 31 сакавіка 1928 г. сейм прыняў пастанову аб утварэнні надзвычайнай камісіі, якая на працягу 3 месяцаў павінна была на месцах пры сведках праверыць дакладнасць скарг выбаршчыкаў [3, с. 5].

Паслам клуба «Змаганне» даводзілася дзейнічаць у сейме ў выключна цяжкіх умовах. Найперш, яны не атрымалі пакоя для канцылярыі ў будынку сейма, тады як лаяльныя да ўлад фракцыі нават з меншай колькасцю членаў такія пакоі атрымалі. Прамовы паслоў клуба з-за іх выкрывальнага характару, які не падабаўся сеймавай большасці, вельмі часта зрываліся, ім не давалі гаварыць, а часам пазбаўлялі слова на некалькі пасяджэнняў. У парушэнне працэдуры працы сейма паслы клуба «Змаганне» сістэматычна не дапускаліся да галасавання, ад іх не прымаліся заявы і запыты, а калі фармальна і прымаліся, то часта заставаліся па сутнасці без адказу і фактычна без наступстваў [4, арк. 4; 5, арк. 11; 6, s. 17–18].

Таму «Змаганне» імкнулася ператварыць сейм у трыбуну палітычнай барацьбы з урадам «санацыі», выкарыстоўвала яго пераважна ў прапагандысцкіх мэтах і для абароны дэмакратычных правоў і жыццёвых інтарэсаў сваіх выбаршчыкаў. У арганізацыі не было ілюзій наконт змены на карысць народа зместу палітыкі ўрада з дапамогай абмежаваных магчымасцей парламенцкай дэмакратыі ва ўмовах рэжыму «санацыі». Аб усім гэтым паслы клуба «Змаганне» адразу заявілі ў адкрытым лісце да сваіх выбар-

шчыкаў і ў праграмнай дэкларацыі клуба. У чэрвені ж 1928 г. кіраўнік клуба Я. Гаўрылік у сеймавай прамове прама абвінаваціў існуючую палітычную сістэму Польшчы ў заганнай палітыцы прыгнёту народных мас «усходніх крэсаў» [7, арк. 9; 8, арк. 25].

Паслы клуба «Змаганне» атрымлівалі сотні лістоў ад сваіх выбаршчыкаў са скаргамі на самавольства ўлад і з просьбамі аб дапамозе [9]. Як маглі, праз прэсу і трыбуну сейма, паслы стараліся дапамагчы ўсім, хто звяртаўся да іх.

Беларускі сялянска-работніцкі пасольскі клуб (БСРПК) «Змаганне» актыўна ўдзельнічаў у абмеркаванні сеймам дзяржаўнага бюджэту. Паслы клуба выступалі з прамовамі супраць прыняцця як бюджэту цалкам, так і бюджэтаў Міністэрства зямельных рэформ, Міністэрства юстыцыі, Міністэрства ўнутраных спраў, Міністэрства рэлігійных веравызнанняў і публічнай асветы. Яны выкрывалі цяжкія вынікі зямельных рэформ для сялян, цяжкае становішча беларускай адукацыі, рэпрэсіўную палітыку ўлад [6, s. 382–385; 10, арк. 20–21; 11, арк. 161; 12, арк. 1–4; 13, s. 5–16; 14–17].

У лістападзе 1928 г. БСРПК «Змаганне» публічна ахарактарызаваў сваё становішча ў сейме як невыноснае і прама абвінаваціў парламент ва ўзмацненні прыгнёту народных мас і натхненні гвалту ўлад адносна іх [18, арк. 87–91].

Канец 1928 г. характарызаваўся абвастрэннем праблемы становішча нацыянальных меншасцей Польшчы. Сярод іншага, звязана гэта было са святкаваннем у лістападзе 10-годдзя аднаўлення польскай дзяржавы. Нямецкія, украінскія і беларускія фракцыі сейма салідарна адмовіліся ад удзелу ў арганізаваных з гэтай нагоды парламенцкіх урачыстасцях [19, s. 147]

У пачатку 1929 г. у сейме разгарнулася дыскусія вакол прапановы праўрадавага сеймавага блоку аб пераглядзе канстытуцыі 1921 г. у кірунку павелічэння паўнамоцтваў выканаўчай улады і абмежавання ўплыву грамадства на дзяржаўнае жыццё [20, s. 2]. 22 студзеня паслы «Змагання» рашуча выказаліся супраць гэтай прапановы, як скіраванай на пагаршэнне і без таго дрэнных сацыяльных умоў жыцця насельніцтва. У студзеньскай сеймавай прамове з гэтай жа нагоды Я. Гаўрылік прама заявіў, што лёс народных мас залежыць не ад буржуазных канстытуцый, а ад іх

арганізаванасці і салідарнасці ў справе паўсядзённай свядомай барацьбы за свае правы, што беларускі народ ніколі не пагадзіцца з існуючым падзелам Беларусі і будзе імкнуцца да ўз'яднання і поўнага сацыяльнага і нацыянальнага вызвалення [21, арк. 127–131; 22, арк. 128]. Супольнымі намаганнямі левaрадыкальнага блока, клубаў нацыянальных меншасцей, левых і цэнтрыстаў праект прыхільнікаў рэжыму быў адхілены [1, s. 127–128].

Актыўная сеймавая дзейнасць БСРПК «Змаганне» выклікала ўвядзенне з боку маршалка сейма І. Дашыньскага цэнзуры экстраных прапаноў і запытаў клуба. Маршалак прымаў іх толькі тады, калі з іх выкрэсліваліся ўказаныя ім месцы [23, арк. 110].

Не заставаліся па-за ўвагай «Змагання» ў сейме і пытанні знешняй палітыкі. Яго паслы ўхвалялі міралюбівыя ініцыятывы СССР, асуджалі ўрад Польшчы за адмову ад савецкай прапановы ўзаемнага, прапарцыянальнага скарачэння ўзбраенняў, а таксама ад шматлікіх прапаноў адносна заключэння савецка-польскай дамовы аб ненападзе, за антысавецкую прапаганду, сабатаванне гандлёвай і культурнай дамоў з СССР [24, s. 56].

Аднак левaрадыкальны сеймавы блок не пазбег у гэтай справе сектанцкіх праяў. Ён прагаласаваў супраць ратыфікацыі падпісанага ўрадам у Маскве дадатковага пратакола да пакта Келага–Брыяна (дамова аб адмове ад вайны як прылады нацыянальнай палітыкі, падпісаная 27 жніўня 1928 г. у Парыжы) аб тэрміновым увядзенні пакта ў дзеянне паміж удзельнікамі пратакола [25, с. 503–506; 26, с. 66–70], бо расцаніў гэты факт як манеўр для маскіравання антысавецкай палітыкі рэжыму Пілсудскага. Такі зігзаг быў незразумелы для шырокіх народных мас.

Сектанцкая палітыка камуністаў стварала ў левым рэвалюцыйна-дэмакратычным руху напружаную атмасферу падазронасці. Але БСРПК «Змаганне» не заўсёды прытрымліваўся сектанцкіх указанняў з ЦК КПЗБ і не замыкаўся на супрацоўніцтве ў межах сеймавага левaрадыкальнага блока. У пэўных умовах ён ішоў на ўзаемадзеянне з іншымі беларускімі пасламі сейма. Так, на пасяджэнні клуба ў пачатку верасня 1929 г. было прынята рашэнне ў сувязі з парламенцкім крызісам і нарадамі апазіцыйных груп па пытанні вотуму давер'я ўраду склікаць 10 верасня

ў Варшаве сумесную нараду з Беларускім пасольскім клубам, а 15 верасня, пасля адкрыцця сесіі, зрабіць некалькі запытаў аб незаконных дзеяннях адміністрацыйных органаў улады [27, арк. 8].

Аднак паслам БСРПК «Змаганне» часам не хапала вопыту разумення парламенцкіх закулісных гульняў. 6 снежня, калі прапанова аб недаверы ўраду была прынята большасцю галасоў, паслы «Змагання» адсутнічалі ў сейме, бо палічылі рэальнай пагрозу яго роспуску, што аслабіла пазіцыі левардыкальнага блока. У выніку камуністы Я. Грэцкі і П. Крынчык атрымалі строгія вымовы з папярэджаннем, а ўсяму клубу цалкам Кампартыя прапанавала выдаць спецыяльны камунікат, у якім самакрытычна вытлумачыць народным масам падставы адсутнасці ў гэты дзень у сейме і выказаць салідарнасць з астатнімі членамі блока. БСРПК «Змаганне» цалкам пагадзіўся з гэтым і абавязаўся, акрамя таго, растлумачыць сваю памылку на мітынгах [28, арк. 177]. У хуткім часе згаданы вышэй камунікат клуба з'явіўся і быў апублікаваны. Зразумела, што ў гэтым камунікаце, найперш, знайшла адлюстраванне сектанцкая палітыка камуністаў. Але, з другога боку, такое сумленнае прызнанне парламентарыямі перад выбаршчыкамі сваёй памылкі было і застаецца выключна рэдкім крокам, які садзейнічаў узмацненню ўзаемадаверу паміж імі.

Студзень і люты 1930 г. сталі напружанымі месяцамі дзейнасці БСРПК «Змаганне» ў сейме. У студзені замест урада К. Сьвітальскага быў утвораны кабінет К. Бартэля, які лічыўся лібералам. Але ўзначальваемыя Кампартыяй левыя сілы не мелі ілюзій наконт дэмакратызацыі кіравання краінай новым урадам. 15 студзеня Я. Гаўрылік у прамове, прысвечанай абмеркаванню дзеянняў К. Бартэля на пасту прэм'ера, прыгадаў факты рэпрэсій, здзейсненых супраць левага беларускага руху, як падчас папярэдняга прэм'ерства К. Бартэля, так і ў студзені 1930 г. [29, арк. 1–5].

Тым часам улады праводзілі курс на падаўленне левага руху ў краіне. Гэта яскрава засведчыла дыскусія ў сейме аб інструкцыі МУС, згодна з якой правядзенне пасольскіх мітынгаў ставілася ў залежнасць ад дазволу адміністрацыйных улад. У лютым пасля завяршэння ўрадавага крызісу сейм прыняў пастанову, якая не скасоўвала гэту інструкцыю, а паказвала на яе дрэннае выка-

рыстанне і раіла ўраду ўжываць інструкцыю толькі ў дачыненні да левардыкальных паслоў. З рашучым пратэстам супраць гэтага выступіў 25 лютага Я. Гаўрылік. Ён прывёў шматлікія факты рэпрэсій у адносінах да «Змагання». За гэту эмацыйную прамову маршалак сейма пазбавіў пасла слова на тры пасяджэнні [30, арк. 1–4].

Відавочная супярэчнасць паміж дзеяннямі, якія патрабаваў характар працы паслоў «Змагання» як сеймавага клуба нацыянальнай меншасці, і заданнямі, якія дыктавала кіраўніцтва КПЗБ у рэчышчы сваёй сектанцкай палітычнай тактыкі, была настолькі значнай, што Я. Гаўрылік, у якога з-за гэтага неаднаразова ўзнікала думка адмовіцца ад пасольскага мандата, і І. Дварчанін склалі ў лютым–сакавіку мемарыял, дзе крытычна ацэньвалі тактыку дзейнасці БСРПК «Змаганне». Па іх меркаванні, клуб павінен быў часцей вылучаць патрабаванні на нацыянальным грунце – у справах школ на роднай мове, рэвіндыкацыі (вяртання маёмасці) праваслаўнай царкве і г. д. Але гэты мемарыял прызначаўся не кіраўніцтву КПЗБ, а Камінтэрну, на адрас якога ён і быў высланы [31, s. 231–232].

Рэагаванню ж на мемарыял Я. Гаўрыліка і І. Дварчаніна, відавочна, перашкодзіла імклівае развіццё падзей у Заходняй Беларусі: вызваленне ўладамі былых кіраўнікоў БСРГ, перавыбары ў сейм у Лідскай і Свянцянскай выбарчых акругах, ліквідацыя «Змагання».

Аднак, нягледзячы на нязгоду сваіх кіраўнікоў з сектанцкай палітыкай камуністаў, арганізацыя працягвала сваю дзейнасць. Непасрэднае дачыненне да працы БСРПК «Змаганне» мелі перавыбары ў сейм у Лідскай (Ашмянскі, Валожынскі, Вілейскі, Лідскі, Маладзечанскі паветы) і Свянцянскай (Браслаўскі, Дзісненскі, Пастаўскі, Свянцянскі паветы) [32, s. 129] выбарчых акругах.

Пад ціскам масавых пратэстаў (да чаго дачыніліся і паслы клуба) супраць парушэнняў падчас парламенцкай выбарчай кампаніі 1928 г. і фальсіфікацыі вынікаў галасавання ў гэтых акругах польскі Найвышэйшы суд ануляваў у пачатку 1930 г. вынікі выбараў у іх і прызначыў там перавыбары.

«Змаганне» прыняло актыўны ўдзел у выбарчых кампаніях у гэтых акругах. Але з-за праследавання левых сіл уладамі і іх

прыхільнікамі клубу даводзілася пераадольваць значныя цяжкасці на гэтым шляху [33, арк. 225–226]. Самі паслы клуба выязджалі для правядзення мітынгаў і сходаў на месцы, нягледзячы на тое, што на такіх мерапрыемствах іх часта збівалі паліцыя і прыхільнікі супернікаў па выбарах. Усяго было праведзена 12 пасольскіх агітацыйных мітынгаў [34, арк. 68]. Вялікую дапамогу ў перадвыбарчай агітацыі «Змаганню» аказалі камуністы і камсамольцы. Толькі ў сумесна з імі арганізаваных мітынгах удзельнічала звыш 15 тыс. выбаршчыкаў [35, с. 47]. Дзякуючы такой актыўнай працы, нягледзячы на перашкоды і рэпрэсіі, 25 мая спіс «Змагання» атрымаў у Лідскай выбарчай акрузе 24851 голас, ці 25 % ад усіх галасаваўшых, што дало яму 2 мандаты ў сейм. Гэта быў значны поспех [36, арк. 80]. Пасля гэтага поспеху ўлады падключылі ўсе адміністрацыйныя сродкі і не дапусцілі яго паўтору ў Свянцянскай выбарчай акрузе.

Такім чынам, пасольскі клуб арганізацыі разгарнуў у сейме энергічную шматбаковую працу на карысць народных мас Заходняй Беларусі, у абарону культуры і нацыянальных правоў беларускага народа. Сеймавую трыбуну і пасольскія правы яго члены выкарыстоўвалі для зносін з насельніцтвам, каб праз галаву ўрада гутарыць з народам, падымаць яго палітычную і нацыянальную свядомасць.

Пры разглядзе ў сейме дзяржаўных бюджэтаў, абмеркаванні законапраектаў і дзейнасці ўрада паслы клуба «Змагання» выступалі з яскравымі выкрывальнымі прамовамі. Праз сейм імі было ўнесена, без уліку супольна паданых з іншымі клубамі, 11 запытаў і 13 прапаноў, 9 з якіх мелі экстраны характар [37, s. 340]. Паслы рабілі заявы пратэсту ў сувязі з парушэннем дэмакратычных правоў і свабод урадам і мясцовымі ўладамі, уздымалі жыццёвыя патрабаванні людзей, якія звярталіся да клуба. У сваіх выступленнях паслы крытыкавалі ўнутраную і знешнюю палітыку польскіх улад, імкнуліся раскрыць каланізатарскі характар іх дзеяння на «ўсходніх крэсах», нздольнасць урада кіраваць эканомікай, палепшыць сацыяльна-эканамічнае становішча насельніцтва, выкрывалі самавольства паліцыі і мясцовай адміністрацыі, рашуча асуджалі існуючыя парадкі. Не пазбягалі жорсткай

крытыкі з боку паслоў клуба «Змаганне» і палітычныя апаненты. Уся крытыка вялася з пазіцый іх левых сацыялістычных перакананняў.

Паспяховыя для «Змагання» перавыбары ў сейм у Лідскай выбарчай акрузе засведчылі значную падтрымку арганізацыі насельніцтвам. Аднак часта дзеянні сеймавага клуба «Змаганне», пад уплывам Кампартыі, былі не пазбаўлены сектанцтва, што адмоўна адбівалася на яго працы і выклікала зразумелую нязгоду часткі паслоў і актыву, якія спрабавалі надаць першасны характар менавіта нацыянальна-вызваленчаму напрамку працы арганізацыі. Але пры гэтым «Змаганне» разам з іншымі прадстаўнікамі левардыкальнага блока было важнай сілай у сейме і па-за ім, якая праводзіла лінію бескампраміснай барацьбы з дыктатурай Пілсудскага.

Крыніцы і літаратура

1. Smoliński, T. Rządy Józefa Piłsudskiego w latach 1926–1935 / T. Smoliński // Uniwersytet im. Adama Mickiewicza w Poznaniu. – Seria prawo. – 1985. – № 115. – S. 1–174.

2. Борьба трудящихся Западной Белоруссии за социальное и национальное освобождение и воссоединение с БССР: Документы и материалы: сб.: в 2 т. – Минск, 1962. – Т. 1: 1921–1929 гг.

3. Голас працы. – 1928. – 14 красав.

4. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці (далей – ДАБВ). – Фонд 1: Палескае ваяводскае ўпраўленне. – Воп. 9. – Спр. 1316.

5. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (далей – НАРБ). – Фонд 242: Прадстаўніцтва ЦК КПЗБ. – Воп. 1. – Спр. 155.

6. Posłowie rewolucyjni w Sejmie (lata 1920–1935). Wybor przemówień, interpelacij i wniosków / pod red. T. Daniszewskiego, G. Iwańskiego, M. Mińkowskiego. – W-wa, 1961.

7. Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці (далей – ДАГВ). – Аддзел навукова-даведачнай літаратуры, № 2254.

8. НАРБ. Фонд 242: Прадстаўніцтва ЦК КПЗБ. – Воп. 1. – Спр. 315.

9. Голас працы. 1928. – 23 траўня.

10. ДАБВ. – Фонд 1: Палескае ваяводскае ўпраўленне. – Воп. 9. – Спр. 939.

11. ДАГВ. – Фонд 93: Гродзенскі акруговы суд. – Воп. 1. – Спр. 3.

12. НАРБ. – Фонд 242: Прадстаўніцтва ЦК КПЗБ. – Воп. 1. – Спр. 217а.

13. Z pracy na terenie Sejmu Białoruskiego Klubu Poselskiego Chłopsko-Robotniczego «Zmaganje». – W-wa, 1930.

14. Зара працы. – 1928. – 5 чэрв.
15. Тамсама. – 13 чэрв.
16. Тамсама. – 20 чэрв.
17. Тамсама. – 27 чэрв.
18. НАРБ. – Фонд 242: Прадстаўніцтва ЦК КПЗБ. – Воп. 1. – Спр. 214.
19. Polska myśl polityczna XIX–XX wieku: w 3 t. / pod red. H. Zielińskiego. – Wrocław, 1979. – T. 3: Chojnowski A. Koncepcje polityki narodowościowej rządów polskich w latach 1921–1939.
20. Gospodarz Polski. – 1929. – № 9.
21. ДАБВ. – Фонд 1: Палескае ваяводскае ўпраўленне. – Воп. 9. – Спр. 520.
22. Тамсама. – Спр. 824.
23. НАРБ. – Фонд 242: Прадстаўніцтва ЦК КПЗБ. – Воп. 1.– Спр. 88.
24. Kowalski J. Trudne lata. Problemy rozwoju polskiego ruchu robotniczego 1929–1935. – W-wa, 1966.
25. Документы внешней политики СССР: в 22 т. – М., 1966. – Т. 11: 1 янв.– 31 дек. 1928 г. / под ред. М. С. Капицы [и др.].
26. Тамсама. – М., 1967.– Т. 12: 1 янв.– 31 дек. 1929 г. / под ред. И. И. Агаянца [и др.].
27. ДАБВ. – Фонд 1: Палескае ваяводскае ўпраўленне. – Воп. 9. – Спр. 789.
28. НАРБ. – Фонд 242: Прадстаўніцтва ЦК КПЗБ. – Воп. 1. – Спр. 135.
29. Тамсама. – Спр. 252а.
30. Тамсама. – Спр. 156.
31. Bergman, A. Sprawy białoruskie w II Rzeczypospolitej / A. Bergman // Prace Białostockiego towarzystwa naukowego. – 1984. – № 28. – S. 1–287.
32. Rzepeccy, T. Sejm i Senat Rzeczypospolitej Polskiej 1928–1933 / T. Rzepeccy, K. Rzepeccy. – Poznań, 1928.
33. НАРБ. – Фонд 242: Прадстаўніцтва ЦК КПЗБ. – Воп. 1. – Спр. 162.
34. Тамсама. – Спр. 46.
35. Ладысев, В. Ф. В борьбе за демократические права и свободы / В. Ф. Ладысев. – Минск, 1988.
36. НАРБ. – Фонд 242: Прадстаўніцтва ЦК КПЗБ. – Воп. 1. – Спр. 47.
37. Historia Sejmu Polskiego: w 3 t. / pod red. J. Michalskiego [ta in.]. – W-wa, 1989. – T. 2, cz. 2: Ajnenkiel A. II Rzeczpospolita.

А. М. Вабішчэвіч

Брэсцкі дзяржаўны універсітэт імя А. С. Пушкіна

ЭТНАКУЛЬТУРНЫЯ АДНОСІНЫ Ў ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ (1921–1939 гг.)

Палітыка польскіх улад у галіне культуры, асветы беларусаў і іншых нацыянальных супольнасцей на тэрыторыі Заходняй Беларусі ад Рыжскага мірнага дагавора 1921 г. да падзей верасня 1939 г. ажыццяўлялася ў кантэксце дзяржаўнай палітыкі ў сферы нацыянальнага і канфесіянальнага жыцця. Яна не атрымала пэўнага завершанага і цэласнага характару, складвалася пад уплывам заходнебеларускага нацыянальна-вызваленчага руху, палітыка-ідэалагічных, сацыяльна-псіхалагічных і іншых фактараў. На наш погляд, можна вылучыць 4 асноўныя мадэлі вырашэння нацыянальна-культурных праблем, прапанаваныя рознымі польскімі палітычнымі сіламі: нацыянальна-дэмакратычную; кансерватыўную; ліберальна-дэмакратычную; камуністычную [1, с. 19–22].

Нацыянальна-дэмакратычная мадэль распрацоўвалася эндэкамі і іншымі правымі польскімі аб'яднаннямі ў кантэксце інкарпарацыйнай канцэпцыі дзяржаўнага ўладкавання Польшчы. Перавага надавалася нацыянальным польскім інтарэсам, польская культура прадстаўлялася ў якасці вышэйшай, цывілізаванай. Асіміляцыя найбольш падатлівых беларусаў павінна была адбывацца гвалтоўнымі метадамі пры ўдзеле польскай школы, культурна-асветніцкіх арганізацый і ўстаноў, арміі, адміністрацыйна-паліцэйскага апарату, пры стварэнні перспектывы цывілізацыйнага росту. Вырашэнне яўрэйскага пытання планавалася ажыццявіць шляхам ізаляцыі яўрэяў ад грамадскага жыцця. Яўрэі прызнаваліся эндэкамі прыналежнымі да іншай (чужой) цывілізацыйнай плыні, таму іх нельга было асіміляваць, за выключэннем невялікай часткі.

Кансерватыўная мадэль прадугледжвала паступовыя, памяркоўныя метады нацыянальнай асіміляцыі няпольскага насельніцтва. Ідэолагі віленскіх кансерватараў разглядалі дзяржаўную

асіміляцыю ў якасці першага істотнага кроку ў напрамку дэнацыяналізацыі ўкраінцаў, беларусаў.

Ліберальна-дэмакратычная мадэль, якой прытрымліваліся нешматлікія народніцкія, ліберальныя і сацыялістычныя партыі і аб'яднанні, частка мясцовай польскай інтэлігенцыі, дэманстравала прыхільнае стаўленне да ідэй тэрытарыяльнай аўтаноміі ўкраінцаў і беларусаў, адмаўляла антысемітызм і нацыянальную дыскрымінацыю. Значная частка яе тэарэтычных пастулатаў укладвалася ў кантэкст федэрацыйнай ці краёвай канцэпцый дзяржаўнага ўладкавання, нярэдка ўтрымлівала элементы тэорыі рэгіяналізацыі. Паводле Л. Васілеўскага, беларусы і ўкраінцы заслугоўвалі тэрытарыяльнай аўтаноміі, яўрэі – культурнай аўтаноміі [2]. Выступаючы супраць планаў фарсіраванай паланізацыі эндэкаў, Л. Васілеўскі падтрымліваў дзяржаўную асіміляцыю. Стварэннем лепшых умоў для развіцця культуры, асветы на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў параўнанні з БССР можна было супрацьстаяць савецкаму ўплыву [3, s. 26; 4, s. 395]. Інтарэсы ўкраінцаў у Палескім ваяводстве прапаноўвалася разглядаць асобна ад заходнеўкраінскага насельніцтва, а палескі рэгіён падлягаў у перспектыве паланізацыі [5, s. 22–23]. Вырашэнне літоўскай праблемы бачылася Л. Васілеўскаму ў кантэксце нармалізацыі міждзяржаўных адносін і ўзаемнага забеспячэння правоў літоўцаў у Польшчы і палякаў у Літве [5, s. 13]. Л. Васілеўскі адмаўляў існаванне ў Польшчы рускай меншасці, называючы рускіх і іх культуру «пеpажыткам русіфікатарскай эпохі» [6, арк. 7]. У стыхійнай моўнай асіміляцыі яўрэйскай інтэлігенцыі бачылася аслабленне адметнасці яўрэйскага насельніцтва ад польскага [7, арк. 369]. У рамках дзяржаўнай асіміляцыі прапаноўвалася задавальняць нацыянальныя інтарэсы яўрэяў у галіне адукацыі, зняць абмежаванні і аблегчыць іх эміграцыю [8, арк. 33]. У цэлым пры пэўных уступках для няпольскага насельніцтва ліберальна-дэмакратычная мадэль надавала перавагу забеспячэнню інтарэсаў польскай дзяржаўнасці, не давала магчымасці для паўнацэннага нацыянальна-культурнага жыцця няпольскага насельніцтва.

Камуністычная мадэль надавала перавагу класавым (сацыяльным) інтарэсам у параўнанні з нацыянальнымі, падвяргала асу-

джэнню нацыянальную палітыку польскіх улад, адстойвала правы няпольскага насельніцтва. Адзіным сродкам вырашэння нацыянальнага пытання прызнавалася пралетарская рэвалюцыя. Польскія камуністы выступалі за права Заходняй Беларусі на самавызначэнне і ўз'яднанне яе з БССР, што было зафіксавана на II з'ездзе Камуністычнай рабочай партыі Польшчы ў верасні 1923 г.

У рэальнай палітыцы дамінуючыя пазіцыі як на ўрадавым узроўні, так і асабліва сярод адміністрацыйнага апарату на тэрыторыі Заходняй Беларусі набыла нацыянальна-дэмакратычная мадэль. Прадэкларававаныя рэжымам «санацыі» змены ў нацыянальнай палітыцы (замест нацыянальнай асіміляцыі – дзяржаўная асіміляцыя) сведчылі аб адыходзе ад папярэдняй нацыянальна-дэмакратычнай мадэлі ў бок ліберальна-дэмакратычнай. Аднак пасля непрацяглага (у 1926–1929 гг.) і эпізадычнага выкарыстання больш памяркоўных і завуаліраваных элементаў ліберальна-дэмакратычнай мадэлі з канца 1920-х гадоў фактычна адбылося вяртанне да папярэдняй нацыянальна-дэмакратычнай мадэлі. Пры выкарыстанні элементаў канцэпцыі рэгіяналізму (асабліва на Палессі) былі ўлічаны мясцовыя асаблівасці, аднак польская адміністрацыя свае дзеянні ажыццяўляла ў рамках афіцыйнай урадавай палітыкі дзяржаўнай асіміляцыі.

У другой палове 1930-х гадоў польскія ўлады ажыццявілі цэлы комплекс гвалтоўных мер: правялі канчатковую ліквідацыю нешматлікіх беларускіх школ, арганізацый, газет, разгарнулі дэрусіфікацыю і паланізацыю праваслаўнай царквы, узмацнілі кантроль за грамадскім жыццём. Адначасова з рэпрэсіўнымі дзеяннямі актывізавалася дзейнасць мясцовай адміністрацыі, ваенных колаў у напрамку ўзмацнення нацыянальна-культурнай асіміляцыі. Гэта часткова ці нават поўнасцю адпавядала ідэалагічным пастулатам (нават самым радыкальным) нацыянальна-дэмакратычнай канцэпцыі вырашэння нацыянальных пытанняў. Такая актыўнасць тлумачылася недастатковай выніковасцю папярэдніх мер у напрамку паланізацыі і асіміляцыі няпольскага насельніцтва (найперш беларусаў) і намерамі істотна паскорыць гэтыя этнічныя працэсы ў бліжэйшай перспектыве. На выпрацоўку планаў паланізацыі Палесся ўплывалі не толькі асаблівасці этнакан-

фесійнага складу насельніцтва, але і востры характар аграрнага пытання, слабая ступень урбанізацыі, высокі ўзровень непісьменнасці, няразвітасць сацыяльнай інфраструктуры.

Пасля майскага (1926 г.) дзяржаўнага перавароту праблема нацыянальных меншасцей стала манапольнай у дзейнасці адміністрацыйнага апарату, а не парламенцкіх структур. Насуперак папярэднім абяцанням аб выпрацоўцы асобных падыходаў да кожнай этнічнай супольнасці прэм'ер-міністр К. Бартуль 19 ліпеня 1926 г. адзначаў у польскім сейме, што не збіраецца заключаць асобныя пагадненні з нацыянальнымі меншасцямі ці мяняць заканадаўства [9, с. 129]. Менавіта на адміністрацыйны апарат ўскладвалася задача аб дзяржаўнай асіміляцыі.

Палітыка польскіх улад насіла асіміляцыйны характар не толькі ў дачыненні да беларусаў, але і адносна рускіх, украінцаў. На ўзроўні рэгіянальных уладных структур істотна абмяжоўвалася культура, асвета ўкраінцаў на тэрыторыі Палескага ваяводства. Вырашэнне літоўскай праблемы ставілася ў прамую залежнасць ад урэгулявання міждзяржаўных польска-літоўскіх адносін. Польскія ўлады не выпрацавалі асобных мер ці элементаў тэорыі рэгіяналізацыі адносна яўрэяў на тэрыторыі заходнебеларускіх зямель у параўнанні з іншымі рэгіёнамі Польскай дзяржавы.

Аналіз нацыянальна-культурнага жыцця заходнебеларускага краю ў 1921–1939 гг. дае магчымасць вылучыць два асноўныя тыпы этнакультурных адносін, якія адрозніваліся паміж сабой характарам, дынамікай узаемаадносін, уздзеяннем этнапалітычных, сацыяльна-эканамічных і іншых фактараў [1, с. 261–264]. Першы тып этнакультурных адносін (беларусы–палякі) вызначаўся канфрантацыйным, вострым характарам і выключаў магчымасці пазітыўнага культурнага ўзаемадзеяння. Канфлікт быў прадвызначаны палітычнымі, эканамічнымі, канфесіянальнымі, дэмаграфічнымі, сацыяльна-псіхалагічнымі фактарамі, ключавымі пазіцыямі палякаў у грамадскім жыцці. Агульнанацыянальны патрыятычны ўздым палякаў, які назіраўся адразу пасля аднаўлення іх дзяржаўнасці, змяніўся міфалагізаванымі месіянскімі канцэпцыямі, што знайшлі ўвасабленне ва ўрадавай палітыцы, дзеяннях мясцовага адміністрацыйнага апарату і грамад-

скай свядомасці, для якой стала характэрнай большая эгаістычнасць і неталерантнасць у адносінах да беларусаў, а таксама адносна іншых этнасаў. Дзяржаўная падтрымка павінна была забяспечыць польскай культуры пануючыя пазіцыі ў Заходняй Беларусі. Ва ўмовах пастаянных абмежаванняў, прыгнечання і гвалту супраць культуры, адукацыі, мовы, традыцый беларусаў замест узаемадзеяння, дыялога культур назіралася іх жорсткае супрацьстаянне. Зыходнай пазіцыяй для такога характару адносін з'яўлялася нераўнапраўнае становішча беларускай культуры ў межах Польскай дзяржавы. Дамінуючай была тэндэнцыя культурна-моўнай асіміляцыі беларускага насельніцтва, якая ажыццяўлялася дзяржаўным апаратам, рымска-каталіцкім касцёлам і іншымі грамадскімі інстытутамі. З'яўляюцца беспадстаўныя спробы рэабілітацыі на сучасным этапе грамадска-культурнай дзейнасці польскай супольнасці на тэрыторыі Заходняй Беларусі, якая быццам спрыяла працэсам беларускага нацыянальна-культурнага адраджэння. Паланафільскія настроі не атрымалі падтрымкі заходнебеларускага грамадства і не маглі паўплываць на агульны характар беларуска-польскіх культурных адносін. Пасля ліквідацыі інстытуцыянальных форм нацыянальна-культурнага жыцця беларусаў у канцы 1930-х гадоў іх асіміляцыя павінна была паскорыцца. Нягледзячы на пагражальны характар, асіміляцыя беларусаў не паспела набыць завершанага характару, не прывяла да незваротных этнатрансфармацыйных вынікаў, зводзілася пераважна да татальнай паланізацыі большасці сфер грамадскага жыцця. Былі задзейнічаны ўсе мабілізацыйныя механізмы этнакультурнага самазахавання беларусаў ва ўмовах рэальнай страты іх самастойнага існавання.

Другі тып этнакультурных адносін ахопліваў палякаў і нацыянальныя этнаканфесійныя меншасці (яўрэі, рускія, украінцы, літоўцы, татары), меў неаднародны характар, балансіраваў паміж канфрантацыяй і часовым суіснаваннем. У адносінах да славянскіх меншасцей (рускіх, украінцаў), літоўцаў ажыццяўлялася палітыка нацыянальнай асіміляцыі. Пад прыкрыццем дэрусіфікацыі адбывалася насаджэнне рускім польскай мовы, культуры, традыцый. Толькі рускія стараабраднікі атрымалі абмежаваныя магчы-

масці для захавання рэлігійных каштоўнасцей, традыцый, мовы. Адасоблены характар этнаканфесійнага жыцця стараабраднікаў стрымліваў яго асіміляцыю. Гэтую акалічнасць адзначалі ўлады Беластоцкага ваяводства, дзе прысутнасць стараабраднікаў была нязначнай. «Як маса, стараабраднікі з'яўляюцца замкнутым асяроддзем, якое не паддаецца асіміляцыйным уплывам і не страціла свайго маскоўскага фальклору, у палітычных адносінах не выклікае пярэчанняў». «Не праяўляюць тэндэнцыі да польскай культурнай асіміляцыі. Знаходзячыся ў памежнай паласе, з'яўляюцца хутчэй непажаданым элементам, хоць прызнаюцца лаяльнымі» [10, арк. 26 адв.; 11, арк. 30].

Украінскае насельніцтва заходнепалескага рэгіёна было пазбаўлена магчымасці (асабліва з пачатку 1930-х гадоў) мець уласныя культурна-асветніцкія і адукацыйныя ўстановы. Улічваючы адасоблены характар этнаканфесійнага жыцця яўрэйскай супольнасці, які выключаў перспектывы паскоранай асіміляцыі, адносна яе актыўна выкарыстоўваліся самыя разнастайныя абмежавальныя меры, аказвалася спрыянне эміграцыі яўрэяў, падтрымлівалася антысеміцкая кампанія. Вясной 1939 г. Беластоцкая ваяводская адміністрацыя прызнавала слабую выніковасць асіміляцыі мясцовых яўрэяў. «Нягледзячы на працяглыя ўплывы, «літвакі» не змаглі прывязацца да польскай дзяржаўнасці і культуры. Да цяперашняга часу карыстаюцца рускай мовай, складаюць пераважна дэструктыўны, у лепшым выпадку абыякавы да Польскай дзяржавы, элемент» [11, арк. 6].

Праблема тэрытарыяльнай прыналежнасці Вільні прадвызначыла напружаны характар польска-літоўскіх адносін. Літоўскае насельніцтва ў заходнебеларускіх мясцовасцях падвяргалася нацыянальна-культурнай асіміляцыі. Для польскіх улад уяўляліся нязначнымі праблемы татарскай этнічнай групы. Хоць татары мелі магчымасці для захавання рэлігійных, культурных і грамадскіх традыцый, аднак адбывалася паланізацыя іх інтэлігенцыі і іншых сацыяльных слаёў. У цэлым для нацыянальных і этнаканфесійных меншасцей на тэрыторыі Заходняй Беларусі былі істотна абмежаваны ці нават выключаны магчымасці для прагрэсіўнага, паступальнага нацыянальна-культурнага развіцця ў бліжэйшай перспектыве.

Крыніцы і літаратура

1. Вабішчэвіч, А. М. Нацыянальна-культурнае жыццё Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) / А. М. Вабішчэвіч. – Брэст, 2008. – 319 с.

2. Archiwum Akt Nowych w Warszawie (dalej – AAN). – Zespół 390. – Sygn. 74: Польская палітыка адносна нацыянальных меншасцей. Палітыка адносна ўкраінцаў. Дакладныя запіскі, артыкулы, вытрымкі прэсы, карэспандэнцыя (1909, 1916–1930 гг.).

3. Wasilewski, L. Zadania polskiej polityki narodowościowej / L. Wasilewski // Droga. – 1923. – № 4. – S. 25–28.

4. Wasilewski, L. Białoruś i ruch białoruski / L. Wasilewski // Przegląd Współczesny. – 1924. – № 9. – S. 386–396.

5. Wasilewski, L. Sprawa kresów i mniejszości narodowych w Polsce / L. Wasilewski. – W-wa, 1925. – 105 s.

6. AAN. – Zespół 390. – Sygn. 76: Нацыянальныя адносіны ў Польшчы. Руская меншасць. Артыкулы, нататкі, вытрымкі прэсы (1925 г.).

7. AAN. – Zespół 390. – Sygn. 73: Нацыянальныя адносіны ў Польшчы. Артыкулы, нататкі, газетныя выразкі (1910–1935 гг.).

8. AAN. – Zespół 390. – Sygn. 74: Польская палітыка адносна нацыянальных меншасцей. Палітыка адносна ўкраінцаў. Дакладныя запіскі, артыкулы, вытрымкі прэсы, карэспандэнцыя (1909, 1916–1930 гг.).

9. Paruch, W. Od konsolidacji państwowej do konsolidacji narodowej: Mniejszości narodowe w myśli politycznej obozu piłsudczykowskiego (1926–1939) / W. Paruch. – Lublin, 1997. – 424 s.

10. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці (далей – ДАБВ). – Фонд 1. – Воп. 10. – Спр. 2305: Справаздачы палескага і беластоцкага ваявод аб агульным рэлігійным настроі на тэрыторыі адзначаных ваяводстваў... (1933–1939 гг.).

11. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 10. – Спр. 1574: Рэферат беластоцкага ваяводы аб праблемах умацавання становішча і ўзмацнення ўплыву польскага насельніцтва ў эканамічным, палітычным і культурным жыцці ваяводства (30.01.1939 г.).

ВЫСТУПЛЕННІ НА СЕКЦЫЯХ

1. ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЕ І САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАЕ СТАНОВІШЧА ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ Ў 20–30-я ГАДЫ XX ст.

А. В. Бубноў

Сярэдняя адукацыйная школа, гарадскі пасёлак Краснасельскі (Ваўкавыскі раён, Гродзенская вобласць)

АДЛЮСТРАВАННЕ ДЗЕЙНАСЦІ БЕЛАРУСКАГА НАЦЫЯНАЛЬНАГА РУХУ НА ТЭРЫТОРЫІ ІІ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ У ПРАЦАХ ПРАДСТАЎНІКОЎ ПОЛЬСКАЙ МІЖВАЕННАЙ ГІСТАРЫЯГРАФІІ

Пэўны час існавала меркаванне, што вучоныя польскай дзяржавы ў міжваенны час не выказвалі вялікай зацікаўленасці да даследавання палітычных, культурна-асветніцкіх, эканамічных арганізацый, члены якіх лічылі сябе беларусамі і сваю дзейнасць каардынавалі з той групай насельніцтва, што вызначала сябе такой нацыяй. Аднак на самай справе беларускі нацыянальны рух Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд прыцягнуў да сябе пільную ўвагу не толькі гісторыкаў, але таксама і дзяржаўных дзеячаў, прадстаўнікоў мясцовай адміністрацыі, паліцыі, разведорганаў і іншых службаў бяспекі краіны, якія імкнуліся абмежаваць яго ўплыў на насельніцтва.

Толькі пры ўважлівым выкарыстанні набыткаў польскай міжваеннай гістарыяграфіі даследчык здольны грунтоўна разгледзець некаторыя дыскусійныя аспекты тэмы. Асобныя вывады вучоных з тых далёкіх ад сучаснасці гадоў і сёння патрабуюць

увагі. Таксама існуе пільная неабходнасць разгледзець мэтанакіраваны працэс стварэння польскімі аўтарамі некаторых памылковых тэзісаў, вызначыць мэты іх з'яўлення і ўплыў на сучасную гістарыяграфію пытання.

Большасць хлуслівых вывадаў, створаных асобнымі неаб'ектыўнымі аўтарамі, былі абвергнуты яшчэ сучаснікамі. Аднак асобныя памылковыя тэзісы (напрыклад, аб несамастойным характары, эфімернасці нацыянальнага беларускага руху, адсутнасці падтрымкі яго дзейнасці насельніцтвам, свавольстве мясцовай адміністрацыі як галоўнай прычыне нацыянальнага бяспраўя беларусаў) і сёння некаторымі аўтарамі лічацца дакладнымі. Каб абвергнуць дадзеныя «догмы», неабходна адлюстраваць працэс іх узнікнення.

Польская навука павінна была даследаваць беларускі нацыянальны рух, вызначыць яго слабыя і моцныя бакі, крыніцы дзейнасці і гэтым дапамагчы ўладзе. З 1926 г. з'яўляюцца аўтары, якія не толькі даследуюць агульнае становішча на тэрыторыі так званых крэсаў паўночна-ўсходніх пасля падзей 1925 г., але і закранаюць асобныя пытанні дзейнасці нацыянальных палітычных, культурна-асветніцкіх, эканамічных арганізацый.

У даследаванні З. Дрэшнера відавочны асноўныя рысы, характэрныя большасці прац польскіх даследчыкаў міжваеннага часу. Ён імкнецца апраўдаць палітыку паланізацыі і дзеля гэтага прыніжае ўзровень нацыянальнай самасвядомасці беларусаў, вызначае іх як вялікіх прыхільнікаў польскай культуры [1, s. 41]. Але, як заяўляе сам Дрэшнер, гэта прыхільнасць спіць глыбока ў сэрцы беларуса. Немагчыма не адзначыць і станоўчыя рысы даследавання. Аўтар адным з першых прызнае злачынствы польскай адміністрацыі, прапануе крокі па яе рэфармаванні, даследуе аграрнае пытанне. Не згодны ён і з ігнараваннем нацыянальных інтарэсаў беларускага насельніцтва, прызнае неабходнасць набыцця імі культурнай аўтаноміі, права на адукацыю на роднай мове і нават выказваецца за стварэнне польска-беларускага універсітэта [1, s. 49]. Ускосна пацверджана аўтарам і хлуслівасць палітыкі дзяржавы, калі абвешчаныя дэмакратычныя законы наогул маглі не выконвацца.

Аўтараў прац, якія былі апублікаваныя ў 1928 г., больш цікавілі вынікі выбараў у парламент і ў органы мясцовага самакіравання. Але некаторыя з твораў не толькі даследавалі агульнае становішча на тэрыторыі Заходняй Беларусі, але і ўздымалі асобныя пытанні з дзейнасці беларускіх нацыянальных аб'яднанняў.

Сярод іх выдзяляецца даследаванне А. Крысінскага, у якім ён без важкіх аргументаў імкнецца даказаць нешматлікасць беларусаў каталіцкага веравызнання і адсутнасць сярод іх выразнай нацыянальнай самасвядомасці. Вельмі павярхоўна, недакладна аўтар аналізуе дзейнасць БХД і не толькі абвяшчае адсутнасць жадання ў насельніцтва падтрымаць ідэі беларусізацыі школ, «касцёла», але і ўскосна прызнае неабходным весці барацьбу (у тым ліку і гвалтам) супраць такіх мэт [2, s. 354].

Але асобныя матэрыялы і высновы даследчыка маюць навуковы кошт, напрыклад, яго параўнанне ўмоў, якія ўплывалі на дзейнасць беларускага і ўкраінскага нацыянальных рухаў [2, s. 352]. А. Крысінскі адным з першых сярод польскіх даследчыкаў не толькі прызнае недакладнасць вынікаў афіцыйнага перапісу беларускага насельніцтва, але імкнецца назваць больш адпаведную рэчаіснасці лічбу. Таксама аўтар заяўляе аб пашырэнні пачуцця нацыянальнай адметнасці сярод заходнебеларускага насельніцтва, пацвярджае такую думку вынікамі выбараў 1928 г. па асобных акругах. Імкнецца даследчык дакладна вызначыць тэрыторыю, дзе колькасна значна пераважала насельніцтва беларускай нацыянальнасці [2, s. 378].

У той жа час у часопісе «Sprawy narodowościowe» друкуецца артыкул Я. Ахоты «З гісторыі дзяржаўных пачынанняў беларусаў». Значная частка яго прысвечана Берлінскай канферэнцыі 1925 г. і яе вынікам. Адлюстраваў аўтар рост аўтарытэту БССР на развіццё палітычнай сітуацыі ў Заходняй Беларусі, а таксама адсутнасць падтрымкі з боку Лігі Нацый, якая не адгукнулася да беларускіх пратэстаў ў Сейме і Сенаце [3, s. 20]. Такім крокам, як лічыць даследчык, сусветная арганізацыя падтрымала палітыку Польшчы на тэрыторыі Заходняй Беларусі.

Дзяржаўныя органы таксама друкавалі матэрыялы аб становішчы нацыянальных меншасцей у краіне. Працы «Mniejszości

narodowe w wyborach do Sejmu i Senatu w r. 1928» характэрны шматлікія недакладнасці, выкліканыя імкненнем апраўдаць нацыянальную палітыку дзяржавы і ва ўсіх непаразуменнях абвінаваціць толькі апазіцыйныя арганізацыі [4, s. 51]. Даследаванне адлюстравала цяжкае становішча, у якім апынуўся ўвесь нацыянальны беларускі рух пасля ліквідацыі Грамады. Яна вызначана як адзіны яго цэнтр, пасля знікнення якога пачалася міжасабістая барацьба, якая значна аслабіла арганізацыі [4, s. 55]. Адлюстравана аўтарамі працы з'яўленне новых дробных беларускіх груповак, даказваецца, што такое «rasproszenie» не спрыяла станоўчаму выніку на выбарах. Аналізуюцца передвыбарчыя платформы аб'яднанняў [4, s. 55], асвятляюцца выпадкі, калі арганізацыі аднаго напрамку не здольны былі дамовіцца паміж сабой аб сумеснай дзейнасці.

Наступныя цікавыя артыкулы па праблеме з'явіліся ў 1930 г., пасля нечарговых выбараў у Сойм і Сенат, калі стварылася новая палітычная сітуацыя. Неабходна адзначыць часопіс «Sprawy narodowościowe», на старонках якога рэгулярна друкаваліся матэрыялы, прысвечаныя беларускаму жыццю.

Асобна варта ўзгадаць працу П. Трэйдэнскага «Białoruskie stronnictwa polityczne w Polsce i ich ideologia», у якой аўтар пасля агульнай ацэнкі ўсяго беларускага грамадства даследуе яго асноўныя палітычныя плыні [5, s. 514–531]. Пачынае ён з аналізу памяркоўных груп і прызнае, што ні адна з іх не выйшла на першы план, але падрабязна прычыны гэтага, акрамя прызнання перманентнай барацьбы ўнутры аб'яднанняў, не разглядае. Аналізуецца дзейнасць групы Паўлюкевіча, Беларускай нацыянальнай партыі, Ф. Умястоўскага, Беларускай сялянскай партыі, «групы Астроўскага і Луцкевіча», БХД, Праваслаўнага аб'яднання, БСС. Аўтар адлюстраваў спробы аб'яднання беларускіх арганізацый з боку розных палітычных сіл [5, s. 542–543]. Але на тэрыторыі Заходняй Беларусі не існавала адпаведных рэалій для стварэння адзінага моцнага нацыянальнага руху.

Далей канфлікт паміж дзяржавай і прадстаўнікамі нацыянальнага руху паглыбляецца, што знайшло свой адбітак і ў працах польскіх даследчыкаў. Магчыма, праца Г. Элскага «Sprawa

białoruska. Zarys historyczno-polityczny» стала этапнай у развіцці польскай нацыяналістычнай гістарыяграфіі. У ёй крышталізуюцца асобныя вывады, якія характэрны нават некаторым выданням апошняга часу.

Даследчык імкнецца даказаць адсутнасць самастойнага нацыянальнага руху беларусаў і такім чынам апраўдаць рэпрэсіі яго прадстаўнікоў [6, s. 57–59]. Усімі сродкамі аўтар спрабуе пераканаць чытачоў у заканамернасці паланізацыі і нават вынікі выбараў 1922 г. разглядаюцца як паказчык колькаснай перавагі польскага насельніцтва на заходне-беларускіх землях [6, s. 60]. Аднак разам з гэтым Элскі абвяшчае, што ў краіне для беларусаў існуе магчымасць уздымаць свой матэрыяльны дабрабыт і развіваць нацыянальную культуру [6, s. 68]. Таксама ён імкнецца апраўдаць далейшы адыход дзяржавы ад дэмакратычных норм, спрабуе прынізіць усе дасягненні нацыянальнага руху і станоўча адлюстраваць дзейнасць паланафільскіх аб'яднанняў. Адлюстравана даследчыкам далейшая дыферэнцыяцыя беларусаў спачатку на 3, а пасля на 5 плыняў. Аўтар сведчыць, што ў такіх умовах аб'яднанні не маглі атрымаць мандаты паслоў і сенатараў.

Падобнымі падыходамі характэрна праца 1932 г. «Mniejszości narodowe w Polsce», якую стварыў З. Урбаньскі. Яе па іншаму, як абразу нацыянальнага гонару беларусаў, не назавеш. Сярод эпітэтаў, якімі ўзнагароджваліся нашы продкі, толькі зрэдку можна было знайсці нейкае выказванне, станоўчым чынам нас ацэньваючае: «...nie pozbawiony jednak zdolności realnego myślenia...» Працы характэрны вельмі нелагічныя вывады, аперыраванне лічбамі, валюнтарысцкія выказванні з мэтай апраўдаць дзеянні ўлады [7, s. 97]. Публікуецца матэрыял, на падставе якога аўтар імкнецца даказаць адсутнасць жадання ў беларусаў навучацца на роднай мове, які не адпавядае нават інфармацыі самой працы [7, s. 110, 119].

Аднак відавочна, што беларусы здолелі прымусіць паважаць сябе. З. Урбаньскі адным з першых заяўляе аб немагчымасці «справы беларускія» ў Польшчы трактаваць як малазначныя, другарадныя, лёгкавырашальныя і прызнае асобныя дасягненні нацыянальнага руху [7, s. 85]. Раскрываюцца асноўныя рысы

праграм БХД, БСС, групы Луцкевіча–Астроўскага, ТБШ, БІГіК, БНК, вызначаюцца ступень іх уплыву на насельніцтва, асноўныя вынікі дзейнасці. Аналізуючы дзейнасць БСС, З. Урбаньскі ўскосна прызнае згубнасць палітыкі Я. Станкевіча, які раскалоў арганізацыю [7, s. 114, 120]. Даследуе аўтар і лаяльныя да ўрада аб'яднанні, але ён так і не адказвае, чаму дзяржава не дапамагала прыхільным да яе беларускім арганізацыям. У нацыянальным руху пачатку 1930-х гадоў гісторык вылучае тры палітычныя плыні [7, s. 100].

Асобнае месца ў гістарыяграфіі нацыянальнага беларускага руху на тэрыторыі польскай краіны ў міжваенны час належыць даследаванню «Rola Komunistycznej Partyi Zachodniej Białorusi w ruchu narodowym białorusinów w Polsce», якое было апублікавана ў Вільні ў 1933 г. Яго аўтар, С. Віслаўх, з'яўляўся кіраўніком аддзела вывучэння нацыянальных меншасцей Інстытута Усходняй Еўропы ў Вільні.

Праца мае кошт не толькі як крыніца, яна з'яўляецца сапраўды навуковым даследаваннем са значнай колькасцю крыніц і аргументаванымі навуковымі высновамі. Таксама на яе старонках упершыню крытычна аналізуюцца працы папярэдніх распрацоўшчыкаў праблемы [8, s. 35–36].

С. Віслаўх маштабна адлюстраваў становішча ў Заходняй Беларусі, у тым ліку выкрыў шматлікія выпадкі знявагі інтарэсаў карэннага насельніцтва і віну за гэта ўсклаў на дзяржаву. Аўтар крытыкуе палітыку ўрада ў галіне сельскай гаспадаркі і прызнае, што так ствараліся ўмовы да пашырэння рэвалюцыйных ідэй. Ён сведчыць, што беларусаў наогул адштурхнулі ад грамадскага жыцця на іх жа тэрыторыі, не стварылі ўмовы для развіцця нацыянальных «угадовых» партый [8, s. 69].

Грунтоўна разгледжана аўтарам пазіцыя камуністычнага руху да беларускіх патрыятычных аб'яднанняў. Дакладна названы час і прычыны, што падштурхнулі Камінтэрн шукаць магчымасці ўплыву на беларусаў [8, s. 34], адлюстраваны поспех такой палітыкі. Аналізуючы дзейнасць нацыянальнага руху, аўтар сведчыць пра імкненне часткі інтэлігенцыі з дапамогай Савецкага Саюза далучыць свае землі да БССР, і таму яны імкнуліся пайсці с камуністычным рухам на кампраміс. Адлюстравана імкненне

сярод шэрага прадстаўнікоў партыі да супрацоўніцтва з нацыянальнымі аб'яднаннямі ў барацьбе за дэмакратычныя ідэалы і жаданне падтрымаць некаторыя частковыя патрабаванні прыгнечаных мас (краёвага сейму з нацыянальнай аўтаноміяй) [8, s. 34–38, 43]. Дакументы камуністычнага друку, якія шмат і трапна выкарыстаў аўтар, сведчаць аб прысутнасці ў складзе кампартыі здольных палітыкаў, якія, аднак, павінны былі дзейнічаць, па прычыне так званага дэмакратычнага цэнтралізму, у адпаведнасці з указаннямі Камінтэрна, а не сваімі перакананнямі і палітычнымі ўмовамі рэгіёна. С. Віслаўх публікуе выказванні прадстаўнікоў дзяржаўнай эліты, якія нават у самай малой праяве беларускага руху бачылі пагрозу свайму панаванню на беларускіх землях [8, s. 50].

Пасля 1933 г. II Рэч Паспалітая паступова пачала рыхтаваць умовы да гвалтоўнага вырашэння праблем развіцця нацыянальных меншасцей і даследаванні беларускага руху ў асноўным спыніліся.

У выніку, аналізуючы галоўныя навуковыя дасягненні гісторыкаў Польшчы міжваеннага часу, неабходна прызнаць, што іх працы ўскосна сведчаць аб існаванні мэтанакіраванай палітыкі паланізацыі ў адносінах да беларусаў, якой была падпарадкавана і іх праца. Адлюстраваны поспехі нацыянальнага руху, вызначаны асноўныя прычыны, якія прывялі да немагчымасці аб'яднання нацыянальных плыняў.

На падставе прац польскай міжваеннай гістарыяграфіі відавочна паступовая трансфармацыя адносін дзяржавы да нашага народа. У сярэдзіне 1920-х гадоў аўтары не ставілі пад сумненне яго самастойны характар, нават выказвалі падтрымку пажаданням беларусаў стварацъ не толькі сістэму адукацыйных устаноў за дзяржаўны кошт на роднай мове, але і мець пэўную аўтаномію ў складзе II Рэчы Паспалітай. Аднак паступова, пад уплывам змены савецкай нацыянальнай палітыкі ў БССР, адсутнасці рэальных крокаў з боку міжнароднай супольнасці ў абарону беларускай нацыянальнай меншасці, дзяржаўным апаратам ствараюцца ўмовы да гвалтоўнай дэнацыяналізацыі.

Адлюстраваны прычыны, якія не дазволілі прагрэсіўным і ліберальным плыням польскага палітычнага руху ажыццяўляць узважаную палітыку ў адносінах да беларусаў, што ў выніку

прывяло да арыентацыі насельніцтва на СССР і нежыццяздольнасці дзяржавы.

Неабходна прызнаць, што нягледзячы на палітычную тэндэнцыйнасць як даных афіцыйнай польскай дакументацыі, так і аўтарскіх прац, набыткі польскай гістарыяграфіі міжваеннага часу павінны дапамагчы даследаванню палітычных працэсаў на тэрыторыі Заходняй Беларусі.

Літаратура

1. Dreszner, Z. Sprawa mniejszości narodowych w Polsce a program państwowy demokracji / Z. Dreszner. – W-wa, 1926. – 61 s.

2. Krysiński, A. Liczba i rozmieszczenie Białorusinów w Polsce / A. Krysiński // Sprawy narodowościowe. – 1928. – N 3–4. – S. 351–379.

3. Ochota, J. Z historyj państwowatwórczych poczynań Białoruskich / J. Ochota // Sprawy narodowościowe. – 1928. – N 1. – S. 17–21.

4. Mniejszości narodowe w wyborach do Sejmu i Senatu w r. 1928 / oprac. przez wydział narodowościowy. W-wa, 1928 r. – 331 s.

5. Trejdeński, P. Białoruskie stronnictwa polityczne w Polsce i ich ideologia / P. Trejdeński // Sprawy narodowościowe. – 1930. – N 5–6. – S. 513–543.

6. Ełski, G. Sprawa białoruska. Zarys historyczno-polityczny / G. Ełski. – W-wa, 1931. – 105 s.

7. Urbański, Z. Mniejszości narodowe w Polsce / Z. Urbański. – W-wa, 1932. – 380 s.

8. Wysłouch, S. Rola Komunistycznej Partyi Zachodniej Białorusi w ruchu narodowym białorusinów w Polsce / S. Wysłouch. – Wilno, 1933. – 71 s.

В. П. Гарматны

Баранавіцкі дзяржаўны універсітэт

ГАСПАДАРКА ВАЙСКОВЫХ АСАДНІКАЎ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ (1921–1939 гг.)

Першы закон аб насаджэнні вайсковага асадніцтва на «Крэсах Усходніх» прыняты Сеймам II Рэчы Паспалітай 17 снежня 1920 г., але яго рэалізацыю распачалі толькі пасля спецыяльнага распараджэння старшыні галоўнай зямельнай управы «Аб надзяленні зямлёю салдата войска Польскага» ад 23 сакавіка 1921 г.,

дзе тлумачылася, каго закон разумеў пад салдатамі польскай арміі – гэта радавыя, прадстаўнікі малодшага каманднага складу, афіцэры і прыроўненыя да іх служачыя польскай арміі і фарміраванняў дабраахвотнікаў (апалчэнцаў), якія неслі вайсковую службу не менш чатырох месяцаў. Усе яны мелі права на бясплатнае надзяленне зямлёю [1, с. 26]. У мэтах паспяховасці палітыкі насаджэння асадніцтва і лепшага кантролю асаднікі аб'ядноўваліся ў саюз, які атрымаў назву «Саюз былых абаронцаў усходніх ускраін» («Цэнтральны Саюз асаднікаў»).

План насаджэння асадніцтва распрацоўваўся Міністэрствам Спраў Вайсковых (МСВ), а яго рэалізацыя ўладамі ўскладалася на спецыяльна ствараемую сумесную камісію з прадстаўнікоў наступных міністэрстваў: вайсковага, фінансаў, сельскагаспадарчага і аграрных рэформ. Гэтая камісія ажыццяўляла агульнае кіраўніцтва насаджэннем асадніцтва. У паветах ствараліся надаўчыя камітэты, якія прымалі зямлю з дзяржаўнага фонду і надзялялі ёю асаднікаў. Адборам кандыдатаў на атрыманне зямлі займаліся кваліфікацыйныя камісіі ў паветах з прадстаўнікоў МСВ [2, с. 72].

Вайсковым асаднікам (каланістам) для арганізацыі гаспадарак на новым месцы дзяржава перадавала бясплатна коней, буйную рагатую жывёлу, свіней, неабходную для вядзення гаспадаркі маёмасць. Паводле закона ад 17 снежня 1920 г., каланісту на абзавядзенне гаспадаркай польскім урадам перадавалася:

адна пара коней з вупражжу і воз (пасля дэмабілізацыі асадніка);

80 кубічных метраў драўніны і іншыя неабходныя матэрыялы для пабудовы хаты і гаспадарчых пабудоў;

крэдыт на 50000 марак (1921 г.) на стварэнне гаспадаркі;

крэдыт на будаўніцтва па прашэнні асадніка, якое разглядалася павятовай надаўчай камісіяй для вызначэння памераў неабходнай фінансавай дапамогі [3, s. 64].

Памер аплаты за зямлю быў прыроўнены да 30–100 кг збожжа за 1 га штогод з выплатай дзяржаве на працягу 30 гадоў, пачынаючы з пятага года пасля атрымання асаднікам зямлі. На гаспадарку адводзілася 80 $м^3$ будматэрыялаў і 2 000 000 марак грашыма, інвентаром або збожжам. Асаднік павінен быў пасяліцца на сваім

водрубе на працягу года і ў трохгадовы перыяд асвоіць яго, інакш ён пазбаўляўся свайго надзела [1, с. 27].

Ужо ў 1922 г. вайсковыя асаднікі Брэст-Бужскага (Брэсцкага) павета атрымалі 180 коней, 200 кароў, 90 авечак, 140 свіней, 4000 пудоў збожжа для пасеву, 5000 пудоў бульбы бясплатна [4, с. 31]. У пачатку 1923 г. для асаднікаў у Палескім ваяводстве было адведзена 128 тыс. га: Брэст-Бужскі павет – 6 тыс. га, Пружанскі – 5,5, Драгічынскі – 8, Кобрынскі – 6, Косаўскі – 10 тыс. га і г. д.

Вайсковым асаднікам праз Дзяржаўны банк павятовымі надаўчымі камітэтамі выдаваліся ільготныя крэдыты звычайна пад 6 % гадавых. Памер выдадзенага крэдыту залежаў ад памераў атрыманага надзелу (асады). Мінімальны памер крэдыту на 1921 г. складаў 125000 марак на асаду. Асаднікі, якія атрымалі надзел да 10 гаворнай зямлі маглі атрымаць максімум 150000 марак, ад 10 да 20 га – 175000 марак, ад 20 да 45 га – 200000 марак. Калі асаднік пасля дэмабілізацыі не меў каня, то крэдыт мог быць павялічаны на 50 %. Выплаты па крэдыту пачыналіся пасля двух гадоў і павінен быць пагашаны за 5 гадоў [3, s. 64, 72–73].

У рапарце пра становішча вайсковага асадніцтва на «Крэсах Усходніх» (чэрвень 1924 г.) К. С. Юсташэвіч, шэф Аддзела Асад Вайсковых Міністэрства Спраў Вайсковых, сцвярджаў, што дапамога ў будаўніцтве і выдзелены крэдыт агульнай колькасцю ў 2 млрд марак не прынеслі чакаемых вынікаў. Прыкладна такія ж меркаванні выказваў член сумеснай міжміністэрскай камісіі па надзяленні вайсковых асаднікаў крэдытамі і зямлёю, паводле якога крэдыты з-за вялікай інфляцыі пры іх выдзяленні мелі вартасць прыкладна ў 4 разы вышэйшую, чым пры іх атрыманні асаднікамі і далейшым выкарыстанні восенню 1921 г.

Агульная дапамога вайсковым асаднікам на 1923 г., па ацэнках тагачасных дзяржаўных асоб II Рэчы Паспалітай, была наступнай (табл. 1).

Аб недастатковай дапамозе дзяржавы вайсковым асаднікам сведчыць выступ у 1924 г. у Сейме прэм'ер-міністра У. Грабскага па справе правядзення ў Польшчы аграрнай рэформы. Паводле яго слоў, «асаднікі жадаюць працаваць, але для поспеху ім не хапае аднаго – грошай» [3, s. 78–79].

Табліца 1. **Дапамога дзяржавы вайсковым асаднікам, 1921–1923 гг.**

	Марак	Злотых
Дапамога, ажыццёўленая ў 1921–1922 гг. (натура, збожжа, сельскагаспадарчая жывёла і інш.)	2 829 724 323	10 111 150
З двухмільярднага крэдыту	600 000 000	75 000
Дапамога будаўнічая ад Міністэрства Грамадскіх Работ	9 000 000 000	1 065 220
З крэдыту ў 50000000000 марак	44 024 600 000	1 135 885
Разам	**56 454 324 323**	**12 387 255**

Галоўнымі крытэрыямі пры вызначэнні зямель, якія можна было адвесці пад «асады», сталі якасць і колькасць свабоднай зямлі, а таксама яе аддаленасць ад шляхоў зносін. Так, прадстаўнік Міністэрства вайсковых спраў паручнік Лявон Грушніцкі 26–27 кастрычніка 1922 г. наведваў маёнтак Толшча Высока-Літоўскай гміны Брэст-Бужскага павета Палескага ваяводства для агляду зямель пад будучыя асады – дзяржава кампенсавала яму кошт чыгуначнага білета ў 1000 марак, а таксама праезд амнібусам ад станцыі да месца прызначэння – 400 марак [5, арк. 32].

У канцы 1924 г. урад У. Грабскага выступіў з новым законапраектам па аграрным пытанні. Пасля працяглага абмеркавання 26 ліпеня 1925 г. Сейм II Рэчы Паспалітай прыняў шырокавядомы «Закон аб правядзенні зямельнай рэформы» (больш вядомы ў гістарыяграфіі пад назвай «Закон аб парцэляцыі і асадніцтве») [4, с. 30–32], паводле якога і праводзілася ў міжваеннай Польшчы аграрная рэформа. Яе галоўным кампанентам стала насаджэнне на «Крэсах Усходніх» вайсковых асаднікаў.

Дзеля атрымання зямлі вайсковаму асадніку неабходна было знайсці двух паручэнцаў, якія б неслі фінансавую адказнасць у выпадку яго неплацёжаздольнасці [6, арк. 11]. Здараліся і унікальныя выпадкі: у маёнтак Баравікі Косаўскай гміны Косаўскага павета перасялілася з Кракаўскага ваяводства сям'я вайсковага асадніка Францішка Стылінскага. Бацька атрымаў 44,79 га зямлі, а яго сыны: Мар'ян – 25,03 га, Ян – 24,69 га. Пры гэтым бацька з сынамі выступілі паручэнцамі адзін аднаго. Яны сумесна валодалі шматлікімі прыладамі працы, вялікай колькасцю свойскай

жывёлы і птушак, кожны з іх уносіў на свой надзел больш чым тону ўгнаенняў, што забяспечвала добры ўраджай [7, арк. 63].

Аб сярэдніх памерах ураджаю асадніцкіх гаспадарак у параўнанні з сялянскімі сведчаць даныя табл. 2.

Табліца 2. **Урадлівасць гаспадарак, 1923–1932 гг., ц/га [3, s. 147]**

Культура	Гаспадаркі асаднікаў		Дробныя сялянскія гаспадаркі			
			«Крэсы Усходнія»		Цэнтральная Польшча	
	1923–1927	1928–1932	1923–1927	1928–1932	1924–1928	1929–1933
Пшаніца	9,8	10,6	8,9	10,0	11,4	11,8
Жыта	8,9	10,8	7,5	8,6	10,0	11,4
Ячмень	9,1	11,9	8,3	10,0	11,2	12,1
Авёс	8,5	11,5	7,2	9,0	10,3	11,6
Бульба	105,7	128,8	82	92	102	113

Варта адзначыць, што асноўнай вытворчай сілай на «Крэсах Усходніх» за кошт сваёй шматлікасці заставаліся менавіта сяляне, а гаспадарка вайсковых асаднікаў выступала для іх узорам вядзення асабістай сельскай гаспадаркі (табл. 3).

Табліца 3. **Чысты прыбытак дробных гаспадарак, 1927–1933 гг. (у тысячах злотых з 1 га) [3, s. 153]**

	Гады					
	1927–1928	1928–1929	1929–1930	1930–1931	1931–1932	1932–1933
Польшча	209,84	149	104	27	11	?
Крэсы Усходнія	?	73	49	11	–7	?
Асадніцкія гаспадаркі	92,7	90,8	65,5	24,5	18,75	–11,3

Большасць асаднікаў атрымоўвала на «Крэсах Усходніх» па нізкім кошце ці наогул бясплатна па 15–45 га зямлі ў залежнасці ад воінскіх заслуг і звання: па прынятаму правілу палкоўнік атрымоўваў 30 га зямлі, капітан – 20, паручнік – 15, радавы – каля 9–10 га, але былі і такія асаднікі, якія атрымалі толькі па 3–5 га зямлі (табл. 4). Асаднікамі станавіліся таксама і генералы – адзін з бліжэйшых паплечнікаў Ю. Пілсудскага генерал Люцыян Жалігоўскі па нізкім кошце набыў у Драгічынскім павеце Пале-

скага ваяводства звыш 500 га зямлі [2, с. 73–74]. Пры надзяленні зямлёй асаднікаў польскія ўлады ўлічвалі ў першую чаргу іх вайсковыя заслугі і лаяльнасць да польскага панавання на гэтых землях, і толькі потым іх здольнасць займацца сельскай гаспадаркай.

Табліца 4. **Памер гаспадарак вайсковых асаднікаў Заходняй Беларусі па стане на 1932 г. [3, s. 112]**

Рэгіён	Колькасць асаднікаў	Памер гаспадаркі, га						
		да 5	5–10	10–15	15–20	20–25	25–30	30–35
Гродзенска-Навагрудскі	2415	0,3 %	4,0 %	29,4 %	32,4 %	23,6 %	6,4 %	3,9 %
Палескае ваяводства	1133	2,2 %	0,09 %	5,0 %	17,8 %	38,4 %	21,2 %	15,3 %

Нягледзячы на такую зацікаўленасць польскага ўрада ў справе насаджэння вайсковага асадніцтва і вялікую ім дапамогу, не ўсе асаднікі змаглі паспяхова асвоіцца на новым месцы. Да 1 студзеня 1923 г., напрыклад, у Палескім ваяводстве расселены 991 асаднік, але не ўсе вайсковыя асаднікі змаглі арганізаваць сваю гаспадарку, таму некаторыя з іх прадалі зямлю і выехалі назад у Польшчу, і на 1929 г. тут налічвалася каля 900 асаднікаў, якія валодалі 128 тыс. га зямлі [8, с. 161].

Аб сярэдняй вартасці вайсковых асадніцкіх гаспадарак на 1929 г. сведчаць даныя табл. 5.

Некаторыя асаднікі не маглі своечасова выплаціць патрабуемыя сродкі: так, у 1930 г. асаднік маёнтка Варацэвічы Іванаўскай гміны Драгічынскага павета Ісідор Ласковіч не здолеў своечасова выплаціць узятую ім пазыку з працэнтамі ў памеры 1073,33 злотых (№ пазыкі 232454). Банк абавязаў асадніка выплаціць гэтую суму на працягу двух наступных гадоў [9, арк. 5].

Табліца 5. **Вартасць асадніцкай маёмасці, 1929 г. [3, s. 146]**

Вартасць маёнтка (без зямлі)	Тысяч злотых
Будынкі	36 991
Пасевы	20 861
Жывы інвентар	16 257
Нежывы інвентар	10 406
Сады і хмельнікі	1 206
Доля ў кааператывах	566
Сродкі па крэдыту	554
Разам	**86 841**

Для таго, каб папярэдзіць нерацыянальнае выкарыстанне грошай, выдзеленых на крэдыты, польскім урадам устанаўліваліся праверкі асадніцкіх гаспадарак. Пры выкарыстанні пазык не па прызначэнні асадніку пагражалі такія меры пакарання, як датэрміновае вяртанне грошай у банк, ці, у выключных выпадках, канфіскацыя асады. У выніку праведзеных уладамі праверак (люстрацый) за 1930 г. сваіх надзелаў пазбаўлены 36 асаднікаў Брэст-Бужскага (Брэсцкага) павета [10, с. 97]. Агульная колькасць асаднікаў Палескага ваяводства, якія мелі запазычанасць па крэдытах, на сярэдзіну лістапада 1932 г. складала 1000 чалавек: Драгічынскі павет – 182, Косаўскі – 116 чалавек і г. д. Займацца крэдытамі асаднікаў і затрымкай выплат па іх польскі ўрад прымушаў сусветны эканамічны крызіс 1929–1933 гг. [11, с. 27].

У Цэнтральным вайсковым архіве (Варшава) захаваўся непадпісаны вопіс асадніцкай гаспадаркі ў 16 га (прыкладна за 1932 г.), які сведчыць аб складаным сацыяльна-эканамічным становішчы вайсковых асаднікаў на «занядбаных Крэсах Усходніх» (табл. 6).

Неабходна падкрэсліць, што галоўнай прычынай такой сітуацыі і цяжкасцей вайсковых асаднікаў пры вядзенні на новым месцы

Табліца 6. **Прыбыткі і затраты асадніцкай гаспадаркі (1932 г.?) [3, s. 154]**

Прыбытак з гаспадаркі пасля продажу	У злотых
Збожжа	200
Малако	150
Статак жывёлы	360
Разам	**710**
Затраты гаспадаркі	У злотых
Падаткі	200
Падкаванне коней	40
Рамонт будынкаў	50
Рамонт інвентару	50
Закупка солі	60
Вопратка і абутак	170
Рознае	60
Разам	**620**
Агульны рахунак (у ідэальным выпадку)	**90**

сваёй асабістай гаспадаркі стала нізкая ўраджайнасць атрыманай зямлі і цяжкія наступствы Першай сусветнай і савецка-польскай (1919–1920 гг.) войн.

Праблема рэнтабельнасці асадніцкіх гаспадарак стала настолькі вострай, што выклікала наведванне Палесся ў 1935 г. Дзяржаўнай камісіяй па люстрацыі вайсковых асадніцкіх гаспадарак, якая павінна была вызначыць крытэрыі якасці зямлі і прыняць радыкальныя меры па канчатковым вырашэнні праблемы. Пасля правядзення такой праверкі Цэнтральны Саюз асаднікаў прыняў пастанову, паводле якой надаўчыя акты на нерэнтабельныя гаспадаркіануляваліся, а асаднікаў з іх альбо перасялялі з афармленнем адпаведных дакументаў у іншую асаду ці пераарыентавалі на іншы від дзейнасці. Напрыклад, асаднік Мышковіч з Пінскага павета з-за нерэнтабельнасці асабістай сельскай гаспадаркі не мог пракарміць сям'ю і таму пераарыентаваўся на апрацоўку скур [11, с. 27].

Колькі ўсяго асаднікаў атрымала на тэрыторыі Заходняй Беларусі зямлю, дакладна невядома, бо гэтая інфармацыя адносілася да кампетэнцыі вайсковага ведамства і мела надзвычай высокую ступень сакрэтнасці. Многія архіўныя дакументы па гісторыі вайсковага асадніцтва на беларускіх землях згінулі падчас Другой сусветнай вайны, але, як мяркуюць некаторыя даследчыкі, за 1921–1939 гг. усяго на землі Заходняй Беларусі пераселена ад 6 да 10 тысяч вайсковых асаднікаў.

Падводзячы вынікі, трэба адзначыць, што гаспадарка асаднікаў Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг. характарызавалася высокім узроўнем развіцця капіталістычных адносін – яны пасляхова выкарыстоўвалі сельскагаспадарчыя інструменты і машыны, угнаенні і таму атрымлівалі на сваіх землях значна больш высокія ўраджаі, чым мясцовыя сяляне. Гаспадаркі асаднікаў выступалі для навакольных сялян узорам вядзення асабістай гаспадаркі.

Крыніцы і літаратура

1. Зялінскі, П. І. Аграрная рэформа ў Заходняй Беларусі (1919–1939 гг.) / П. І. Зялінскі // Праблемы ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР: гісторыя і сучаснасць: матэрыялы навук.-тэарэт. канф. Мінск, БДУ, 17–18 верас. 1999 г. – Мінск, 2000. – С. 24–30.

2. Сорокин, А. А. Аграрный вопрос в Западной Белоруссии (1920–1939 гг.) / А. А. Сорокин. – Минск, 1968. – 204 с.

3. Stobniak-Smogorzewska, J. Kresowe osadnictwo wojskowe 1920–1945 / J. Stobniak-Smogorzewska. – W-wa, 2003. – 420 s.

4. Кухарев, Б. Е. Сельское хозяйство Западной Белоруссии (1919–1939 гг.) / Б. Е. Кухарев. – Минск, 1975. – 112 с.

5. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці (далей – ДАБВ). – Фонд 60. – Воп. 1. – Спр. 6: Заявления военных осадников о выдаче ссуды.

6. Тамсама. – Спр. 127: Дело о выдаче ссуды военному осаднику Бальцеру Анджею.

7. Тамсама. – Спр. 77: Заявления военных осадников о выдаче ссуд.

8. Лазіцкая, К. Сацыяльна-эканамічнае развіццё Століншчыны пад уладай Полышчы / К. Лазіцкая // Назаўсёды разам: гісторыя нацыянальна-дзяржаўнага станаўлення Беларусі – да 65-годдзя ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР. – Мінск, 2004. – С. 160–164.

9. ДАБВ. – Фонд 60. – Воп. 1. – Спр. 158: Дело о наделении землёй военного осадника Ласковича Исидора 1930 г. имение Вороцевичи гмина Яновская повет Дрогичинский.

10. Калеснiковiч, Т. А. Памешчыцкая гаспадарка на тэрыторыі Камянецкага раёна ў міжваенны перыяд (1921–1939) / Т. А. Калеснiковiч // Моладзь Берасцейшчыны. – Брэст, 2006. – С. 94–99.

11. Выростка, Е. Ф. Основные направления деятельности «Союза осадников» на территории Полесского воеводства (1921–1939 гг.) / Е. Ф. Выростка // Вести ИСЗ. – 2008. – № 1. – С. 26–29.

І. У. Гетман

Галоўнае ўпраўленне ідэалагічнай работы Брэсцкага аблвыканкама

«ШКОЛА ЯК ШКОЛА»: ВІЛЕНСКАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГІМНАЗІЯ ВАЧЫМА СВАІХ ВУЧНЯЎ

З пачаткам Першай сусветнай вайны Беларусь закранулі змены самага рознага зместу. Адной з падзей той пары стала даволі хуткае адраджэнне беларускай школы на тэрыторыях, што былі акупаваныя кайзераўскім войскам. За кароткі прамежак часу, да моманту заключэння Рыжскага міру, на тэрыторыі Віленшчыны і Гродзеншчыны было адчынена каля 500 беларускіх школ, у тым ліку 8 – у самой Вільні [1, с. 6].

Беларуская школьная адукацыя пазначаных тэрыторый пасля ўсталявання пасляваенных межаў дасталася ў спадчыну Другой Рэчы Паспалітай. Польшча згодна з міжнароднымі абавязацельствамі павінна была рупіцца пра забеспячэнне нацыянальных правоў сваіх меншасцей. На справе ім вельмі часта даводзілася мець справу з асіміляцыйнай палітыкай. Наступленне на беларускую адукацыю ў Польскай рэспубліцы вялося планамерна і паспяхова. У 1920–1930-х гадах была знішчана ўся беларуская пачатковая школа. Былі закрытыя гімназіі ў Навагрудку, Нясвіжы, Будславе, Радашковічах. Перажыла польскую дзяржаву толькі адна беларуская навучальная установа – Віленская беларуская гімназія.

Дазвол на яе адкрыццё быў атрыманы ў час нямецкай акупацыі Вільні, восенню 1918 г., незадоўга да адступлення нямецкага войска ў сувязі з Лістападаўскай рэвалюцыяй і капітуляцыяй Нямеччыны. Аднак заняткі пачаліся толькі з 1 лютага 1919 г., ужо ў савецкай Вільні, якая тады была цэнтрам Літоўска-Беларускай ССР. Гімназія праіснавала 25 год, з'яўляючыся ўсю гэту пару цэнтрам узгадавання моладзі ў нацыянальным духу.

Успамінамі пра яе ў свой час дзяліліся два былыя вучні, якія жылі ў Брэсце – Аляксандр Засім і Мікалай Шопік. Выхадцы з вёсак пад Пружанамі – Шанёў і Харавы – яны рознымі шляхамі трапілі ў Базыльянскія муры, дзе знаходзілася Віленская беларуская гімназія. Вучыліся ў розныя гады, што дае магчымасць параўнаць гэтую навучальную ўстанову ў розныя часы яе існавання. Пасля заканчэння гімназіі абодва працягвалі навуку ва універсітэце імя Стэфана Баторыя ў Вільні. А. Засім доўгі час працаваў урачом, М. Шопік – настаўнікам.

Па розных прычынах дабіраліся да далёкай незнаёмай Вільні дзеці з усіх куткоў Заходняй Беларусі. Вось як гэта адбывалася ў дадзеным выпадку.

Расказвае А. Засім: «Чаму я паехаў у Вільню? Вельмі проста: у сваёй вёсцы Шані я скончыў пачатковую школу і паехаў здаваць экзамены ў Пружаны ў гімназію. Не ведаю, як здаваў, але факт фактам: у гімназію мяне не прынялі. Толькі цераз працяглы час нябожчык бацька расказаў, як я здаваў. Яго спаткаў дырэктар Пружанскай гімназіі і спытаў, дзе сын. Ён адказаў, што

сын будзе паступаць у Вільню, у беларускую гімназію. На гэта дырэктар адказаў, што «зарэзаў» мяне настаўнік-паланіст, які не любіў беларусаў (ды і хто нас там занадта любіў).

Дапамог мне добра Рыгор Раманавіч Шырма. Ён жыў у Шакунах, за кіламетр ад нашага хутара. Цэлае лета я рыхтаваўся, а потым з ім паехаў. Ён у гімназіі выкладаў спевы і музыку. Заяву падаў, экзамены здаў. Было гэта ў 1927 годзе. Відаць, той польскі дырэктар праўду гаварыў, таму што мяне прынялі адразу ў другі клас беларускай гімназіі. Хаця за першае паўгоддзе па беларускай мове меў двойку» [2].

Расказвае М. Шопік: «Віленскую гімназію я і сёння ўспамінаю добра. Трапіў я туды такім спосабам. У час уступных экзаменаў у Пружанскую гімназію я праявіў добрыя веды ў матэматыцы. А ў Пружанах была гімназія гуманітарная, гэта значыць, больш было на мовы напрамку. Таму я быў залічаны на матэматычны аддзел Брэсцкай гімназіі імя Траўгута. Але гэта мяне не задавальняла, я меў мэту перайсці потым у Пружаны, бо я сам пружанскі. Пабыўшы месяц ці трохі болей, я пайшоў з гэтай гімназіі. І тут сустракаюць мяне знаёмыя хлопцы з Пружаншчыны, якія вучыліся ў Віленскай гімназіі. Яны кажуць: «Слухай, едзь да нас у Вільню!» А малому хлопцу ехаць у такі горад як Вільня было не зусім проста, а нават і цяжкавата, бо трэба ж грошы. Але я паехаў. Здаў экзамены і мяне прынялі.

Гімназія знаходзілася ў так званых Базыльянскіх мурах. У тых мурах было дзве навучальныя ўстановы: беларуская гімназія і духоўная семінарыя, дзе вучылі праваслаўных святароў. На плошчы перад будынкам (ён пабудаваны Г-падобна) стаяла Траецкая царква. На яе сцяне была прымацавана металічная дошка, на якой было напісана, што тут, у дубовым гаі, дзе цяпер стаіць царква, былі пакараныя смерцю тры віленскія пакутнікі за праваслаўную веру. У той царкве кожны дзень адпраўлялася служба, спявалі навучэнцы семінарыі. Кантактаў непасрэдных у гімназістаў з імі не было. Так, спатыкаліся. Гэта быў 1933 год» [3].

Гімназія пачынала сваё існаванне ў вельмі цяжкіх матэрыяльных умовах. Бракавала беларускіх падручнікаў, не было сродкаў на ежу і г. д. Такое становішча цягнулася не адзін год.

Расказвае А. Засім: «У нас там кожны дзень – грэцкая каша, грэцкая каша, грэцкая каша... Гэта, вядома, разумна, бо грэчка вельмі карысная для арганізма і вельмі танная была. Але і цяпер, як жонка наварыць, – не магу есці.

У памяшканнях, дзе спалі, было холадна. Накрываліся тымі посцілкамі, што прывезлі з дому.

Усе мы прыехалі з вёскі, не прывыкшыя да чысціні. Па прапанове пані Алены Лекант-Сакаловай, якая выкладала беларускую мову, аднаго разу дырэктар на вялікім перапынку сабраў усю гімназію ў гімнастычнай зале. Фізрук даў каманду: «Сядай! Разбувайся! Знімай шкарпэткі!»... Настаўнікі не крычалі, не сварыліся, але парадзілі, як усё гэта памыць, прывесці ў парадак. Гэта пані Алёна нам дапамагла. Ёй мы кланяцца павінны. Такіх настаўніцпатрыётак рэдка дзе сустрэнеш. Яна нам была як маці» [2].

У 1930-я гады матэрыяльнае становішча гімназіі палепшылася. Яна набыла звычайны выгляд гімназіі даваеннай Польшчы.

Расказвае М. Шопік: «У гімназіі была свая сталовая, кармілі нас някепска. У лазню вадзілі на Пагулянку. У гімназіі ў штодзённым абутку мы не хадзілі. Унізе было памяшканне, дзе мы распраналіся, ставілі чаравікі і абувалі тапкі, таму ў гімназіі была чысціня. Была ў нас свая форма. На шэрай плюшавай шапачцы, якія паўсюль у гімназіях насілі, мацавалася эмблема «ВБГ» – Віленская беларуская гімназія.

Кожную раніцу збіралі нас у зале на малітву. Спявалі «Ойча наш», яшчэ нешта, а потым разыходзіліся па класах.

Быў у нас гурток танцавальны, вучылі «Лявоніху», іншыя беларускія танцы. Мяне таксама ўключылі ў гурток. Неяк прыехалі да нас гімназісты з Варшавы і папрасілі, каб мы выканалі ім некалькі беларускіх танцаў. Нам далі касцюмы, і мы тую «Лявоніху» шпарылі... А потым выканалі некалькі беларускіх песень. Звычайная гімназія была – школа як школа» [3].

Становішча гімназіі залежала ад ласкі польскіх улад. Навучэнцы не маглі ў поўнай меры аплачваць сваё знаходжанне ў ёй. Асноўная маса вучняў – дзеці беларускіх сялян, якія ледзь-ледзь зводзілі канцы з канцамі. Таму кіраўніцтва навучальнай установы мусіла рабіць розныя дыпламатычныя крокі.

Расказвае А. Засім: «Неяк выклікае мяне настаўніца польскай мовы і кажа: «Засім, заўтра прыедзе маршалак Пілсудскі. Ты будзеш сустракаць». Я тады адкрыта сказаў: «Я буду сустракаць гэтага ката беларускага народа? Не!»

Пасля гэтага да нас у інтэрнат прыйшоў дырэктар (у той час Радаслаў Астроўскі. – *І. Г.*). Заглянуў у нашу спальню. А там нас спіць чалавек сорак. Прасціна ў каго ёсць, у каго няма. Ён падышоў тады да мяне і кажа: «Паглядзі, хіба вы не заслужылі як людзі жыць і як людзі спаць? А з чаго, дзе я вазьму грошы? Зразумей мяне. Схадзі, прывітай Пілсудскага...»

Ну што ж, пайшоў я з настаўнікам, панеслі ў падарунак госцю перакладзеную кніжку аб яго дзейнасці ў Беларусі ў перыяд савецка-польскай вайны. Пілсудскага мы не ўбачылі, кніжку ад імя беларускай гімназіі ўручылі ад'ютанту. Гэтым усё і скончылася. Але ў хуткім часе карміць сталі лепш, выдалі ўсім прасціны і г. д.» [2].

Сярод настаўнікаў і навучэнцаў гімназіі былі прадстаўнікі ўсіх заходнебеларускіх палітычных напрамкаў. Вялікі ўплыў на яе аказвала нелегальная Камуністычная партыя Заходняй Беларусі. Яна і камсамол мелі ў гімназіі свае арганізацыі. Таму польская тайная паліцыя лічыла навучальную ўстанову «нацыяналістычна-камуністычным гняздом» і трымала яе пад пільным наглядам.

Расказвае М. Шопік: «Раз было ў шостым класе: падчас урока беларускай мовы прыйшоў дырэктар, а з ім разам два шпікі тайнай паліцыі. Забралі вучня Мікалая Чылевіча, павялі на Лукішкі. Настаўніца беларускай мовы Алена Лекант-Сакалова, убачыўшы наш прыбіты настрой, толькі сказала: «За Бацькаўшчыну хлопца забралі...» Як там далей было, не ведаю, але ўсё ж такі яго выпусцілі, і потым я яго спатыкаў на медыцынскім факультэце» [3].

У 1928 г. Віленская гімназія атрымала права выдаваць вучням атэстат сталасці, які даваў магчымасць паступаць у ВНУ. Частка былых гімназістаў ехала ў Прагу, дзе ўрад адроджанай чэхаславацкай дзяржавы сваім коштам вучыў беларускіх, украінскіх, расійскіх студэнтаў. Паказальны ў гэтым кантэксце прыклад вядомага дзеяча беларускай эміграцыі В. Жук-Грышкевіча,

які пачаў вучобу ў Віленскай беларускай гімназіі, пасля вучыўся ў Пражскім універсітэце, а затым вярнуўся ў Базыльянскія муры настаўнікам [4, с. 52–56].

Аднак большасць тых, хто хацеў працягваць вучобу, паступалі ў Віленскі універсітэт імя Стэфана Баторыя. Пра гады, звязаныя з навучаннем ва універсітэце, абодва аўтары ўспомнілі таксама шэраг яркіх эпізодаў.

М. Шопік, у прыватнасці, прыгадаў пра сярэднявечнае «права лавковэ», якое існавала ва універсітэтах даваеннай Польшчы, згодна з якім іўдзеі займалі ў студэнцкіх аўдыторыях месцы, асобныя ад хрысціян. Гэта было прычынай хваляванняў у студэнцкім асяроддзі. Адзін з падобных канфліктаў завяршыўся забойствам студэнта-паляка, што выклікала чарговую хвалю гвалту. Каб хваляванні не перакінуліся на горад, універсітэт быў акружаны коннай паліцыяй, якая, аднак, згодна з іншым старадаўнім правілам, у сцены універсітэта доступу не мела. Правіла не было парушана і на гэты раз.

А. Засім згадаў пра свае прыяцельскія стасункі з «беларускім Мальерам», Францішкам Аляхновічам, які вярнуўся ў Вільню пасля некалькігадовага знаходжання ў Салавецкім лагеры. Жыў Аляхновіч, паводле слоў А. Засіма, даволі сціпла, адносіны яго з беларускай грамадскасцю Вільні былі ў гэты час не самыя лепшыя, пэўных кантактаў ён сам пачаў унікаць. Шмат хто не верыў словам Аляхновіча пра гады, праведзеныя ім у Савецкім Саюзе, які меў досыць прывабныя характарыстыкі ў значнай частцы заходніх беларусаў.

Значэнне Віленскай беларускай гімназіі як цэнтра ўгадавання беларускай моладзі ў патрыятычным духу было адзначана яшчэ прадстаўнікамі польскай адміністрацыі як у Вільні, так і ў правінцыі.

Прыкладам могуць быць тыя ж Пружаны, у якіх актывісты беларускага руху трымалі пастаянныя кантакты з землякамі, што працавалі або вучыліся ў Вільні. Сярод астатніх варта згадаць Рыгора Шырму, братоў Ільяшэвічаў, якія развівалі і падтрымлівалі нацыянальныя памкненні моладзі Пружанскага павета. Прыкладам, што «нацыяналістычна-камуністычная» работа не была

марнай, з'яўляецца факт сустрэчы ў верасні 1939 г. жыхарамі Пружан Чырвонай Арміі. Калона пружанцаў, якія віталі чырвонаармейцаў, па ўспамінах сведкаў, мела ў галаве два сцягі – чырвоны і бел-чырвона-белы, які неслі вучні Пружанскай гімназіі імя Адама Міцкевіча.

Літаратура

1. Гетман, І. Легенда беларускага школьніцтва / І. Гетман // Настаўн. газ. – 1998. – 14 снеж. – С. 6.
2. Аўдыёзапіс размовы з А. А. Засімам. – 1997 [Захоўваецца ў аўтара].
3. Аўдыёзапіс размовы з М. М. Шопікам. – 1997 [Захоўваецца ў аўтара].
4. Жук-Грышкевіч, Р. Жыццё Вінцэнта Жук-Грышкевіча / Р. Жук-Грышкевіч. – Таронта, 1993.

Г. Г. Дедурин

Харьковский национальный университет внутренних дел

О НЕКОТОРЫХ ОСОБЕННОСТЯХ ПРАВОВОГО ПОЛОЖЕНИЯ НАЦИОНАЛЬНЫХ МЕНЬШИНСТВ В МЕЖВОЕННОЙ ПОЛЬШЕ (НА ПРИМЕРЕ БЕЛОРУСОВ)

Рижский договор завершил, в целом, формирование восточных границ возрожденного польского государства. Одной из главных проблем, с которой было суждено столкнуться правительствам II Речи Посполитой, являлся исключительно пестрый национальный состав Польши. Ведь даже согласно официальным данным переписи 1921 г., более 30 % населения составляли не поляки, в том числе около 4 % белорусы [1, с. 51]. Естественно, их положение требовало правового урегулирования.

Первым значимым правовым актом такого рода стал так называемый Малый Версальский Трактат, заключенный державами-победительницами с Польшей 28 июня 1919 г. [2, с. 115]. И хотя в это время белорусские и украинские земли еще не были включены в состав Польской республики, впоследствии его условия

распространились и на них. Согласно статьям трактата, посвященным положению национальных меньшинств, поляки обязывались защищать жизнь, свободу и имущество всех граждан без различия национальности, соблюдать свободу религиозных убеждений, употребления родного языка в суде, право занимать представителям национальных меньшинств государственные посты. Поляки были обязаны открывать национальные школы в городах и округах с преобладанием населения непольской национальности [3, s. 242]. Правящие круги страны крайне отрицательно восприняли данный трактат, рассматривая его как ограничение национального суверенитета. Поэтому неудивительно, что уже изначально выполнение Польшей положений Малого Версальского Трактата выглядело проблематично.

Конституция II Речи Посполитой, принятая 17 марта 1921 г., гарантировала не только равенство всех граждан перед законом и их государственную защиту, невзирая на различия в происхождении, языке, расе и вероисповедании, но и права национальных меньшинств. Статья 109 гарантировала меньшинствам охрану их народности, языка и национальных особенностей. В 110 статье говорилось о свободном праве представителей национальных меньшинств организовывать религиозные, общественные учреждения, учебные заведения и праве пользоваться в них своим языком и религией. Несмотря на первенствующее положение римско-католического вероисповедания, Конституция в статьях 111 и 114 предоставляла широкие свободы и другим вероисповеданиям, в частности, невмешательство государства в их внутренние дела [4, с. 73–77].

На следующий день после принятия Конституции был подписан и Рижский договор. Помимо пунктов, касавшихся установления границы, характера межгосударственных связей РСФСР и УССР с Польшей, 7 статья гарантировала «...лицам русской, украинской и белорусской национальности, находящимся в Польше, на основе равноправия национальностей, все права, обеспечивающие свободное развитие культуры, языка и выполнение религиозных обрядов...» [5, с. 527]. И хотя ни одним из этих правовых актов не предусматривалось предоставление национальным

меньшинствам территориальной автономии, четкое соблюдение задекларированных в них принципов давало бы довольно обширную культурную автономию в рамках II Речи Посполитой. К сожалению, на практике национальная политика польских правительств, а в особенности действия местной администрации, ставили под сомнение дееспособность положений, гарантировавших права представителям нетитульной нации. Достаточно непростым было положение белорусов, уже в течение 1920-х годов ощутивших серьезные ограничения в национально-культурной сфере. В этом контексте показательной являлась ситуация, сложившаяся вокруг употребления белорусского языка.

Во время пребывания в премьерском кресле В. Грабского был разработан ряд законодательных актов, предусматривавших возможность использования в административных и судебных органах белорусского и украинского языков. Однако основным стал закон, принятый сеймом 31 июля 1924 г., «Об организации школьного дела для национальных меньшинств в Польше». Он предусматривал открытие белорусских школ там, где белорусы составляли более 25 % населения и родители не менее 40 детей потребуют открытия национальной школы. Если же найдется хотя бы 20 детей, родители которых будут выступать за польскую школу, обучение должно вестись на двух языках [6, с. 68]. Естественно, данный закон ни в коей мере не преследовал цели увеличения белорусских либо украинских школ. Его целью являлось создание учебных заведений, где бы обучались дети разных национальностей, что привело бы к сближению народов, проживавших на национально смешанных землях. Утраквизация, т. е. создание польско-белорусских школ, должна была служить интеграции общества на восточных кресах. Не стоит забывать и о том, что, принимая данный закон, поляки хотели произвести благоприятное впечатление на международную общественность, убедить ее в существовании действенной законодательной базы для защиты прав национальных меньшинств.

Однако из-за недостатка законодательных основ, средств, обеспечивавших соблюдение данного закона, он не оправдал возлагавшихся на него надежд как со стороны национальных мень-

шинств, так и либерально настроенных польских политиков, в частности, его остро критиковали члены ППС и ПСЛ «Вызваленне». Несовершенство закона проявилось в том, что в утраквистичных школах в большинстве своем преподавали учителя-поляки, слабо знающие язык местного населения. В таких условиях двуязычное обучение часто становилось фикцией, прикрывавшей продолжавшееся вытеснение национальных языков из всех возможных сфер употребления.

Еще более проблематичной реализация данного закона стала выглядеть после принятия в январе 1925 г. дополнений к нему. Оговаривалось, что даже при соблюдении всех указанных в законе условий, открытие школы с национальным языком обучения требовало разрешения местных польских административных органов власти. Это ставило фактически непреодолимые препятствия на пути местного населения, желавшего обучать детей на родном языке. Другое дополнение предусматривало преимущества для польского языка в семиклассных утраквистичных школах, где ему отводилось 109 часов в неделю (во всех классах в сумме), а на другие языки – 97 [7, s. 610]. Результатом внедрения законов о языке преподавания стало то, что в 1925/26 учебном году польские школы в Белостокском воеводстве составляли 99 %, Виленском – 94,7, Новогрудском – 99,5, Полесском – 98,6 % [8, с. 21]. Аналогично неутешительной для белорусов была практическая сторона и многих других законодательных актов, которые на первый взгляд, якобы, гарантировали достаточно широкие национально-культурные права меньшинствам.

С конца 1920-х годов в руководстве польского государства все более четкие очертания приобретают авторитарные тенденции. Это, безусловно, наложило свой отпечаток и на положение национальных меньшинств. В связи с чем стоит отметить демарш польской дипломатии на заседании Лиги Наций 18 сентября 1934 г. Министр иностранных дел Польши Л. Бек заявил, что до введения в жизнь общей и унифицированной системы защиты прав национальных меньшинств польская сторона в одностороннем порядке отказывается от соблюдения положений Малого Версальского Трактата 1919 г. Интересы же меньшинств будут

регулироваться только внутригосударственными правовыми актами [9, л. 16]. Нельзя сказать, что это коренным образом изменило положение национальных меньшинств в Польше. Условия трактата, по существу, никогда и не соблюдались. Скорее, данное решение в очередной раз продемонстрировало декларативный характер деятельности Лиги Наций в решении национальных проблем. Она и во времена «действия» трактата даже не рассматривала многочисленные жалобы, посылавшиеся Белорусским парламентским клубом и другими национальными организациями, на несоблюдение поляками положений указанного документа [10, с. 76].

Важным этапом превращения Польши в авторитарное государство стало принятие в апреле 1935 г. новой редакции конституции. Она значительно расширяла полномочия исполнительной власти за счет законодательной. Что касается регулирования положения национальных меньшинств, то конституция формально не отменяла соответствующих положений, принятых в 1921 г. [11, s. 299]. Наибольшее же возмущение представителей национальных меньшинств вызвали предусматривавшиеся конституцией изменения в порядке проведения выборов в сейм и сенат. Согласно им, часть депутатов в многомандатных округах должны были избираться от народности, находившейся в меньшинстве. Например, в двухмандатном округе один посол избирался от народности, составлявшей меньшинство, а другой – от большинства. Таким образом, исключение пропорциональной системы позволяло значительно сократить процент представительства в сейме и сенате депутатов от национальных меньшинств [12, s. 729]. В результате этих изменений белорусы оказались существенно ограничены в праве избирать своих представителей в законодательные органы власти, что повлияло на организацию бойкота белорусскими национальными силами избирательной кампании 1935 г. Во второй половине 1930-х годов правовое положение славянских меньшинств, в частности белорусов, формально существенно не изменилось, хотя фактически их права продолжали ограничиваться.

В межвоенной Польше существовал целый ряд нормативно-правовых актов, которые должны были регулировать положение

национальных меньшинств. Следование провозглашенным правовым нормам могло помочь избежать Польскому государству конфронтации с представителями нетитульной нации. Однако на практике политика польских правительств не соответствовала тем демократическим принципам, что были положены в основу Конституции 1921 г. и других базовых законодательных актов государства. Декларативный характер многих польских законов в полной мере ощутили на себе белорусы, которые к концу 1930-х годов уже практически не имели собственных учебных заведений, периодической печати, а какие-либо проявления их национальной жизни жестко преследовались и подавлялись государством.

Источники и литература

1. Ротшильд, Дж. Східно-Центральна Європа між двома світовими війнами / Дж. Ротшильд. – К., 2001. – 496 с.
2. История Польши / под ред. Ф. Зуева, А. Манусевича [и др.]. – М., 1958. – Т. 3. – 668 с.
3. Kumaniecki, K. Odbudowa państwowości polskiej. Najważniejsze dokumenty (1912 –styczeń 1924) / K. Kumaniecki. – W-wa; Kraków, 1924. – 784 s.
4. Конституция Польши 1921 года // Дурденевский, В. Н. Послевоенные конституции Запада. – Л., 1924. – Ч. I. – С. 59–79.
5. Документы и материалы по истории советско-польских отношений. – М., 1965. – Т. 3. – 608 с.
6. Борьба трудящихся Западной Белоруссии за социальное и национальное освобождение и воссоединение с БССР: сб. документов и материалов. – Минск, 1962. – Т. 1. – 620 с.
7. Chojnowski, A. Mniejszości narodowe w polityce rzadów polskich w latach 1921–1926 / A. Chojnowski // Przegląd Historyczny. – 1976. – N 4. – S. 593–615.
8. Вабішчэвіч, А. Асвета ў Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) / А. Вабішчэвіч. – Брэст, 2004. – 115 с.
9. Отдел редкой книги и рукописей НАН Беларуси. – Фонд 1. – Оп. 1. – Д. 275.
10. Цынкевіч, В. Пытанне становішча беларускай нацыянальнай меншасці ў Польшчы на міжнароднай арэне ў 1921–1939 гг. / В. Цынкевіч // Весн. БДУ. – Сер. 3: Гісторыя. – 2002. – № 1. – С. 74–81.
11. Michowicz, W. Problemy mniejszości narodowych / W. Michowicz // Polska odrodzona 1918–1939. – W-wa, 1988. – S. 285–321.
12. Zarnowski, J. «Lewica sanacyina» w latach 1935–39 / J. Zarnowski // Przegląd Historyczny. – 1958. – N 4. – S. 714–737.

А. М. Загідулін

Гродненскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы

ПОЛЬСКАЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЯ ПАЛІТЫКА Ў ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ 30-х ГАДОЎ ХХ ст.

Спробы вырашэння нацыянальнага і канфесійнага пытанняў урадамі нацыянальных дэмакратаў (1918–1926 гг.) і пілсудчыкаў у айчыннай і асабліва ў польскай гістарыяграфіі даследаваны досыць някепска [1; 2]. Радзей прадметам навуковага даследавання станавілася нацыянальная і канфесійная палітыка польскіх улад пасля смерці Ю. Пілсудскага ў 1935 г. да пачатку Другой сусветнай вайны.

У сярэдзіне 1930-х гадоў з паступовым адыходам ад спраў Ю. Пілсудскага для яго пераемнікаў узнікае неабходнасць выпрацоўкі планаў далейшых дзеянняў. Узрастае ўвага і да этнаканфесійных праблем. Нацыянальнае і канфесійнае пытанні ўяўлялі з сябе адну з самых важных і складаных праблем унутранай і знешняй палітыкі міжваеннай Польшчы. Каля трэці насельніцтва краіны адрознівалася ад тытульнага этнасу нацыянальнасцю і веравызнаннем, і гэта быў адзін з самых высокіх паказчыкаў у Еўропе.

У сакавіку 1934 г. пры Савеце Міністраў быў створаны Нацыянальны Камітэт, які ў снежні 1935 г. быў пераўтвораны ў Камітэт па нацыянальных справах. У склад Камітэта ўвайшлі, апрача прэм'ер-міністра, міністры ўнутраных, замежных спраў, ваенны міністр, міністр веравызнанняў і публічнай асветы, а таксама міністр сельскай гаспадаркі. Задачай Камітэта была распрацоўка прапаноў наконт дзеянняў урада ў нацыянальнай палітыцы, каардынацыя работы розных дзяржаўных органаў, што павінны былі ажыццяўляць нацыянальную палітыку [3, s. 329]. Пры Камітэце пастаянным выканаўчым органам было Бюро нацыянальнай палітыкі. У гэтым Бюро была распрацавана «Нататка па справе польскай унутранай нацыянальнай палітыкі», якая была 22 чэрвеня 1936 г. пададзена ў МУС. На фоне агульнага разгулу

рэакцыі «Нататка...» здзіўляе сваім лібералізмам і здаровым сэнсам. Мэтай нацыянальнай палітыкі называецца яднанне грамадзян з дзяржавай. Задачы палітыкі акрэсліваліся як дзейнасць у кірунку звязвання грамадзян няпольскіх нацыянальнасцей з польскай дзяржаўнасцю. Для вырашэння гэтай задачы патрэбна, каб прадстаўнікі меншасцей не проста пасіўна прыхільна ставіліся да польскай дзяржаўнасці, але і займалі актыўную грамадскую пазіцыю, а крытэрыем сваіх дзеянняў абіралі дзяржаўную выгаду. Гэта мэта не магла быць рэалізавана праз палітыку дэнацыяналізацыі, такая палітыка дае адваротныя вынікі: абвастрае міжнацыянальную барацьбу, таму што нацыянальныя меншасці лагічна пачынаюць абараняцца перад наступленнем на іх правы і свабоды. Станоўчыя вынікі даць можа толькі палітыка, якая забяспечвае свабоднае культурна-гаспадарчае развіццё пры адначасовым моцным культываванні польскіх культурных каштоўнасцей [4, арк. 1, 6].

Канец 1930-х гадоў пазначаны паваротам да адкрытай і адназначнай паланізацыі беларусаў, што адлюстроўваецца і ў шэрагу складзеных польскімі дзяржаўнымі функцыянерамі планаў. На фарміраванне нацыянальнай палітыкі ў гэты час уплыў аказваюць нарастанне міжнароднай напружанасці ў Еўропе. Погляды на нацыянальную праблему палітычных спадчыннікаў Пілсудскага, што знаходзіліся ва ўладзе і былі аб'яднаны ў Лагер Нацыянальнага Адзінства (Obóz Zjednoczenia Narodowego), даўно эвалюцыянавалі ад федэралістычнай канцэпцыі ў канцэпцыю, блізкую эндэкам, якая прапагандуе так званы інтэгральны нацыяналізм [5, s. 138]. У дадзенай сітуацыі прадстаўнікі мясцовых улад заходнебеларускіх ваяводстваў палічылі неабходным выказаць свае меркаванні па актуальнай тэме вырашэння нацыянальнага пытання на ўсходзе дзяржавы.

25 красавіка 1938 г. палескі ваявода Вацлаў Костэк-Бернацкі выдаў распараджэнне для ўсіх функцыянераў самакіравання і дзяржаўнай паліцыі ваяводства, у якім фактычна заклікаў да адкрытага падзелу па нацыянальнай прыкмеце і паланізацыі. Шмат у чым ён рэалізоўваў прынцыпы, выкладзеныя яго папярэднікам Ст. Даўнаровічам яшчэ ў 1923 г. у «Нарысе Праграмы дзяржаўных

работ і задач на Палессі», аб правядзенні так званай выбарачнай паланізацыі, пачынаючы яе з найменш актыўных і свядомых у нацыянальным плане палешукоў-«тутэйшых» [6, арк. 2]. Згодна з загадам В. Костэк-Бернацкага, палешукоў, якія не адносяць сябе з упэўненасцю да ўкраінцаў, беларусаў або рускіх, неабходна лічыць **палякамі**, не звяртаючы ўвагі на веравызнанне і народную гаворку. Ваявода крытыкаваў сваіх падначаленых за недапушчальнае трактаванне мясцовага насельніцтва, карыстаючыся іх пасіўнасцю і нізкім узроўнем свядомасці. У прыватнасці, некаторыя прадстаўнікі органаў мясцовай адміністрацыі і паліцыі асмельваюцца праводзіць дамарошчаную ўласную нацыянальную палітыку і адносяцца да палешукоў як да непрыязнага і варожага элемента. Костэк-Бернацкі назваў падобную практыку шкоднай для польскасці Палесся. Да палешукоў і іншых грамадзян, спакойных і схільных да польскай культуры або пасіўных у гэтым сэнсе трэба адносіцца з вялікай прыязнасцю. Нельга звяртацца да іх на «ты» і любымі спосабамі прыніжаць іх. Нельга ўскладняць ім вырашэнне пытанняў у дзяржаўных установах. Наадварот, неабходна акружаць іх апекай і такім чынам набліжаць да польскасці, якую рэпрэзентуюць усе дзяржаўныя інстытуты на Палессі. Больш таго, ваявода загадваў абараняць недасведчаных палешукоў ад ашуканства з боку несумленных прадаўцоў, купцоў, млынароў, прыватных наймальнікаў і г. д. Неабходна добра разумець мясцовую гаворку палешукоў, але звяртацца да іх, зрэшты як і да ўсіх, выключна па-польску. Усведамленне мясцовымі жыхарамі сябе ў якасці палякаў, нягледзячы на веравызнанне і мову, трэба вітаць. Невыкананне распараджэння ваявода загадваў разглядаць як службовае злачынства [7, арк. 7, 8].

У маі 1939 г. віленскім ваяводскім упраўленнем для віленскага ваяводы быў падрыхтаваны цікавы дакумент «Манаграфія польскага ўладарнага становішча ў Віленскім ваяводстве». У ім больш чым на ста старонках апісвалася эканамічная, грамадска-палітычная і культурная сітуацыя, што склалася ў ваяводстве. Але найбольшую цікавасць выклікае Частка II «Прапановы», дзе фактычна змешчаны план дзяржаўных дзеянняў, у тым ліку па

нацыянальным і канфесійным пытаннях. Аўтар дакумента лічыў, што асновай узмацнення і распаўсюджання польскага ўладарнага становішча на тэрыторыі Віленскага ваяводства з'яўляецца, з аднаго боку, колькаснае павелічэнне польскага элемента як у цэлым, так і ў асобных прафесійных групах, з другога – актывізацыя ўжо існуючага тут польскага грамадства, каб яно стала на чале ўсіх акцый, што праводзяцца ў інтарэсах дзяржавы. У дакуменце крытыкуюцца працэсы парцэляцыі і з'ява асадніцтва. Сцвярджаецца, што вясковае насельніцтва карэннай Польшчы не імкнецца ехаць у Віленскае ваяводства, ды і гэта зменіць толькі нацыянальную структуру, але не ўзмоцніць эканамічна польскага элемента. Змяніць сітуацыю можа толькі парцэляцыя ў польскія рукі земляў, што знаходзяцца ў валоданні непалякаў, але тэрыторыя такіх земляў зусім невялікая.

Прырост лічбы палякаў будзе магчымым толькі пры ўмове прыцягнення значных інвестыцый у гэты край, правядзення індустрыялізацыі, урбанізацыі і да т. п. Але дадзены план патрабуе наяўнасці прыродных багаццяў і спрыяльных геаграфічных умоў, без якіх эканамічны эфект фінансавых укладанняў будзе абмежаваны.

Па гэтай прычыне ў нацыянальным пытанні на першы план выходзіць праблема асіміляцыі тых грамадскіх груп, якія псіхалагічна найбольш да гэтага схільны. На тэрыторыі Віленскага ваяводства такой групай таксама з'яўляліся так званыя тутэйшыя – насельніцтва пасіўнае і маласвядомае ў нацыянальным плане. На дадзеным узроўні нацыянальнай свядомасці насельніцтву ўсё роўна, хто задавальняе іх патрэбы, галоўнае, каб яны былі задаволены. Дзяржава з дапамогай сваіх адміністрацыйных органаў і органаў самакіравання павінна апекавацца насельніцтвам і супрацоўнічаць з ім, каб выклікаць давер. У выніку, дэмагогія разнастайных партый, якія не могуць нічога прапанаваць, апрача абстрактных дактрын, не можа канкурыраваць з рэальнымі дасягненнямі дзяржаўных органаў. Такім чынам, насельніцтва праз прыхільнасць да дзяржавы праходзіць працэс **дзяржаўнай асіміляцыі** і далей усё больш паглыбляецца ў формы і змест польскага жыцця, а значыць – адпаведна знаходзіцца на шляху да **асіміляцыі нацыянальнай** [8, арк. 51].

Сукупнасць грамадскіх, культурных і гаспадарчых мерапрыемстваў, што поўнасцю ахопліваюць жыццё грамадзяніна, пры адначасовым усведамленні мяжы свабоды, за якой пачынаецца справядлівае пакаранне за антыдзяржаўную дзейнасць, называецца ў дакуменце **выхаваўчай канцэпцыяй**. Згодна з ёй вялікае значэнне мае фарміраванне светапогляду маладога пакалення, што ажыццяўляецца ў трох кірунках: школа, войска, грамадскія арганізацыі.

Аўтар «Манаграфіі» адзначае, што асіміляцыя з'яўляецца вынікам двухбаковых адносін, і досыць слушна перасцерагае ад замыкання асіміляванай групы насельніцтва ў так званыя гета, дзе гэтая група не паддаецца знешнім уплывам. Гэты момант падкрэсліваецца як асабліва небяспечны ў адносінах на ніжэйшым мясцовым узроўні, таму што з боку польскага насельніцтва і прадстаўнікоў дзяржаўнага апарату назіралася імкненне да пазбягання кантактаў з нацыянальнымі меншасцямі. На тэрыторыях са змешаным у нацыянальным плане насельніцтвам неабходна дапусціць удзел у польскіх асяродках і арганізацыях тых груп непольскага насельніцтва, асіміляцыя якіх плануецца ў першую чаргу. У польскім асяроддзі яны зведаюць культурны ўплыў і, асімілюючыся самі, стануць своеасаблівым мостам для польскага ўплыву на астатняе насельніцтва.

Вышэйзгаданыя заўвагі датычылі толькі славянскіх меншасцей і літоўцаў. У адносінах да **яўрэйскага** насельніцтва кіраўніцтву Віленскага ваяводства прапаноўваліся больш радыкальныя меры. Калі беларусаў, рускіх, украінцаў і літоўцаў можна было рознымі метадамі асіміляваць, то з яўрэямі неабходна было змагацца да іх поўнага знікнення з польскай дзяржавы. Прычым, лозунг антысемітызму павінен быў стаць аб'яднаўчым фактарам не толькі для розных палітычных груповак II Рэчы Паспалітай, але і для славянскіх нацыянальных меншасцей з тытульным этнасам. Праз змаганне з яўрэйскім насельніцтвам аўтар «Манаграфіі» планаваў вырашыць гаспадарчае пытанне, у прыватнасці, вырашыць праблему польскага ўладарнага становішча ў гарадах і мястэчках. Урбанізацыя, выкліканая заменай палякамі яўрэйскага насельніцтва, створыць магчымасці для ліквідацыі вясковага

малазямелля і беспрацоўя праз пераезд у горад найбольш прадпрымальнай і інтэлектуальнай часткі вясковага насельніцтва, прыпыніць таксама эканамічную эміграцыю.

Праблема нацыянальнай асіміляцыі непарыўна звязана з культурным развіццём. Па меркаванні аўтара «Манаграфіі», усе няпольскія нацыянальныя групы, якія пражываюць на тэрыторыі Віленскага ваяводства, маюць значна ніжэйшы культурны ўзровень, чым палякі, і іх нацыянальная інтэлігенцыя вельмі нешматлікая. У культурнае развіццё нацыянальных меншасцей неабходны інвестыцыі: пашырэнне сеткі агульнаадукацыйных і прафесійных навучальных устаноў, развіццё газет для вяскоўцаў, прычым даступных для незаможных, павелічэнне колькасці бібліятэк, распаўсюджванне радыёпрыёмнікаў. Патрэбна аблегчыць знаёмства нацыянальных меншасцей з асяродкамі польскай культуры праз арганізацыю экскурсій, тэатральных гастроляў, дэманстрацыю кінафільмаў [8, арк. 51адв., 52, 52адв., 53, 53адв., 54, 54адв.].

Адной з апошніх, калі не самай апошняй, спробай вырашэння нацыянальнай праблемы ў адносінах да беларусаў была дакладная запіска ў МУС беластоцкага ваяводы Г. Асташэўскага «Праблемы ўмацавання польскага ўладарнага становішча ў Беластоцкім ваяводстве», што датуецца 23 чэрвеня 1939 г. У дакуменце яскрава адлюстроўваецца канцэпцыя нацыянальнай асіміляцыі. Ваявода лічыў, што на землях, дзе жывуць беларусы, польскі ўплыў усё яшчэ занадта слабы і патрабуе ўзмацнення. У прыватнасці, у гарадах неабходна падтрымаць польскую інтэлігенцыю. У сельскай мясцовасці прынцыповай умовай польскай экспансіі называецца пад'ём матэрыяльнага ўзроўню польскага насельніцтва, зямля павінна трапляць у рукі толькі тых беларусаў, што схільны да апалячвання. Вялікую ролю ў апалячванні беларускага насельніцтва ваявода адводзіць дробнай польскай шляхце, але тут жа адзначае яе нізкі культурны ўзровень і сумняваецца ў выканальнасці такой задачы [9, арк. 5, 8]. Асташэўскі падводзіць вынік шматгадовай польскай палітыкі адносна беларусаў і адзначае, што працэс асіміляцыі не меў тут значных поспехаў, таму што паланізацыя праводзілася хаатычна, не абапіраючыся на канкрэтныя распрацаваныя планы дзеянняў, а кіруючыся

асабістымі матывамі і эмоцыямі [9, арк. 13]. Аўтар дакумента прыводзіць прыклад двух поглядаў, што сфарміраваліся ў польскім грамадстве, на беларускую праблему. Згодна з першым, беларускай праблемы не існуе ўвогуле, як і беларусаў, а існуе праблема насельніцтва былой Чорнай Русі, што цяжка, але ўсё-такі паддаецца асіміляцыі. Прыхільнікі другога погляду лічаць, што беларусы як этнас крышталізуюцца, і гэты працэс у будучым можа набыць больш рэальны характар.

Планаў жорсткай і бескампраміснай паланізацыі беларусаў, аб якой гаворыць Асташэўскі, не было распрацавана на дзяржаўным узроўні. На думку беластоцкага ваяводы, беларускае насельніцтва, якое ўяўляе з сябе пасіўную масу, без выражанай нацыянальнай свядомасці, без сваёй дзяржавы, рана ці позна ўсё роўна падлягае каланізацыі. Памылкай улад з'яўляецца тое, што яны пакінулі свядомую частку беларускага насельніцтва ў ідэалагічным вакууме [9, арк. 15]. Вакуум гэты ўтварыўся пасля ліквідацыі камуністычнай і беларускай нацыянальнай ідэй. Умовай, што спрыяе распаўсюджванню прапаганды камуністычных ідэй і пранікнення лозунгаў сепаратызму, з'яўляецца пустата грамадскага жыцця ў беларускай вёсцы. Польскія элементы не паспелі да гэтага часу не толькі ўхапіць і павесці за сабой, але нават звязацца з беларускай вёскай шляхам уключэння яе ва ўсеагульную грамадска-палітычную і гаспадарчую арганізацыю. «Мы настойліва патрабуем, – піша ваявода, – каб гэта нацыянальная меншасць думала па-польску, але нічога ўзамен не даём і не робім у гэтым накірунку» [9, арк. 15]. Асташэўскі не меў сумненняў у тым, што беларускае насельніцтва не мае шырокай народнай свядомасці і ўласных дзяржаўных традыцый, таму рана ці позна будзе каланізавана. Але для таго, каб «адолець старажытную беларускую культуру», гэтаму насельніцтву неабходна нешта прапанаваць і чым-небудзь яго зацікавіць. А менавіта, зрабіць неабходныя ўкладанні ў народную асвету, транспарт, ахову здароўя і да т. п. [9, арк. 15].

Такім чынам, нават Г. Асташэўскі, аўтар аднаго з самых радыкальных планаў адносна беларусаў як нацыянальнай меншасці ў II Рэчы Паспалітай, разумеў заганнасць і безвыніковасць

выключна дэструктыўных метадаў нацыянальнай палітыкі і прапаноўваў адмову ад адназначнай дэнацыяналізацыі, але ўзамен не мог прапанаваць нічога канструктыўнага.

Прааналізаваўшы планы кіраўніцтва заходнебеларускіх ваяводстваў па вырашэнні нацыянальнага пытання, можна прыйсці да высновы, што ўсе аўтары адзначалі безвыніковасць праведзенай нацыянальнай палітыкі ў Заходняй Беларусі. Сістэма беларускай адукацыі знішчана, дзейнасць беларускіх грамадска-палітычных і культурных арганізацый зведзена да мінімуму, уплыў духоўных інстытутаў на фарміраванне нацыянальных каштоўнасцей нівеліраваны. Тым не менш, задачы па асіміляцыі беларусаў, дзяржаўнай ці нацыянальнай, выкананы не былі.

Важнай праблемай усходніх ваяводстваў ІІ Рэчы Паспалітай і дзяржаўнай этнаканфесійнай палітыкі было тое, што кожная нацыянальная меншасць пражывала кампактна адасобленым культурным асяродкам і з тытульнай нацыяй узаемадзейнічала слаба. Мэтай дзеянняў польскай адміністрацыі было прывіць меншасцям польскія дзяржаўныя і нацыянальныя каштоўнасці, якія для іх былі не тое, што варожымі, а проста чужымі і непатрэбнымі, каб дасягнуць у нейкай ступені адзінства грамадства ІІ Рэчы Паспалітай. Для дасягнення гэтай мэты неабходна было інтэграваць беларускае, украінскае, літоўскае, рускае і яўрэйскае насельніцтва ў грамадска-культурнае жыццё дзяржавы. Пры пэўнай закрытасці нацыянальных і канфесійных меншасцей зрабіць гэта было няпроста і патрабавала часу, а таксама паэтапнай вытанчанай праграмы. Такіх праграм прадстаўнікамі розных палітычных плыняў быў створаны цэлы шэраг.

Адзінай узгодненай праграмы нацыянальнай палітыкі, якая б паслядоўна выконвалася, польскім урадам не было выпрацавана на працягу ўсяго міжваеннага перыяду. Большасць планаў, створаных прадстаўнікамі ўлады, зводзілася да канцэпцыі дзяржаўнай асіміляцыі беларускага насельніцтва ІІ Рэчы Паспалітай. Мэтай такой асіміляцыі былоператварэнне беларусаў у паўнавартасных грамадзян Польшчы з дапамогай розных комплексных мерапрыемстваў па прышчапленні ім ідэалаў польскай дзяржаўнасці. Праграмы адрозніваліся толькі ступенню жорсткасці прапанаваных

метадаў. Канчатковы паварот да нацыянальнай асіміляцыі назіраецца ў сярэдзіне – другой палове 1930-х гадоў, калі змяняецца грамадска-палітычная сітуацыя ў Польшчы і яе становішча на міжнароднай арэне. Польскія ўлады прыходзяць да высновы, што папярэдняя палітыка жаданых змен у нацыянальным пытанні не прынесла. У гэты час з'яўляецца шэраг прапаноў, што хоць і былі накіраваны на поўную і канчатковую паланізацыю славянскіх нацыянальных меншасцей, але тым не менш прапаноўваюць ажыццяўляць гэта адносна памяркоўнымі метадамі.

Крыніцы і літаратура

1. Загідулін, А. М. Этнаканфесійная палітыка ўлад ІІ Рэчы Паспалітай у адносінах да беларусаў у польскай гістарычнай літаратуры / А. М. Загідулін // Актуальныя праблемы гісторыі Беларусі: стан, здабыткі і супярэчнасці, перспектывы развіцця: матэрыялы рэсп. навук. канф.: у 4 ч. / пад рэд. І. П. Крэня, У. І. Навіцкага, І. А. Змітровіча. – Гродна, 2003. – Ч. 4. – С. 248–252.
2. Загідулін, А. М. Этнаканфесійная палітыка ўрада ІІ Рэчы Паспалітай адносна беларусаў у айчыннай гістарыяграфіі / А. М. Загідулін // Подготовка педагогических и научных кадров историков и развитие исторической науки в Беларуси: материалы респ. науч.-практ. конф., 30 сент. 2004 г. / под ред. Е. А. Ровбы, А. Н. Нечухрина, И. П. Креня. – Гродно, 2005. – С. 206–211.
3. Polska odrodzona (1918–1939): państwo, społeczeństwo, kultura / pod red. J. Tomickiego. W-wa, 1982. – 680 s.
4. Archiwum Akt Nowych. Ministerstwo Spraw Wewnętrznych (dalej – AAN). – Спр. 936.
5. Wapiński, R. Historia polskiej myśli politycznej XIX i XX wieku / R. Wapiński. – Gdańsk, 1997. – 326 s.
6. AAN. – Спр. 938.
7. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці (далей – ДАБВ). – Фонд. 1. – Воп. 8. – Спр. 1089.
8. Тамсама. – Спр. 1092.
9. Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Гродзенскай вобласці. – Фонд 6195. – Воп. 1. – Спр. 28.

М. А. Коршак, М. В. Стрелец

Брестский государственный технологический университет

БЕЛОРУССКИЕ НАЦИОНАЛЬНО-ДЕМОКРАТИЧЕСКИЕ ПАРТИИ В ЗАПАДНОЙ БЕЛАРУСИ (1921–1939 гг.): ПОПЫТКА СИСТЕМНОЙ РЕКОНСТРУКЦИИ

Цель настоящего доклада – дать комплексный анализ белорусских национально-демократических партий, действовавших в Западной Беларуси в 1921–1939 гг., т. е. в тот период, когда этот регион входил в состав Польши. Известно, что И. И. Ковкель, В. Ф. Ладысев, И. Р. Кулевич и А. Н. Чернякевич изучали деятельность данных партий. Объём работы, проделанный этими учёными, достаточно большой. Вместе с тем до сих пор не осуществлена системная реконструкция истории указанных партий, попытка которой предпринимается авторами доклада.

В результате заключения Рижского мирного договора от 18 марта 1921 г. жители западнобелорусского региона стали заложниками принципиально новых реальностей. «Социально-экономическая и национальная политика польских властей на «восточных крессах» вызывала недовольство большинства населения Западной Беларуси, которое непрерывно вело борьбу за свои социальные и национальные интересы. Во главе этой борьбы стояли политические партии и организации, которые делились на два лагеря: национально-демократический и революционно-демократический.

Партии национально-демократического лагеря часто не оформлялись официально, а существовали в виде мелких политических и культурных организаций и товариществ. В Вильно в 1921–1939 гг. существовал представительный орган белорусских партий и общественных организаций – Белорусский Национальный комитет (БНК). Наиболее влиятельной национально-демократической партией была Белорусская христианская демократия (БХД), которая охватывала своим влиянием определенную часть белорусов – католиков. Ее лидеры – ксендзы А. Станкевич, В. Годлевский, И. Позняк и др. Центральным органом партии была газета «Белорусская криница» [1]. Важно отметить, что настоящая партия

дважды меняла своё название. Поэтому в зависимости от конкретных периодов встречаются следующие названия партии: Белорусская христианская демократия (БХД), Христианская демократическая злучность (ХДЗ), Белорусское национальное объединение (БНО).

При анализе программных установок БХД следует иметь в виду ее «эволюцию от организации клерикально-демократического направления до светско-клерикальной политической партии» [2, с. 418]; связь идейно-политической платформы этой партии с реалиями тех государств, в которых она действовала; специфику положения белорусских земель в этих государствах. БХД начинала свою деятельность в анализируемый период, базируясь на ее первой программе. Данная программа получила статус партийной на форуме БХД, проходившем в первой половине 1920 г. в Минске, оккупированном буржуазно-помещичьей Польшей. Настоящая программа – самая радикальная из всех партийных программ БХД. Об этом свидетельствовал следующий пассаж: «христианская демократия борется прежде всего с капитализмом, в котором видит одну из важнейших причин бедности и нищеты трудящихся масс и хочет завести такой строй, чтобы каждому человеку можно было своим трудом добыть себе хлеб насущный и пользоваться со всего культурного богатства. Все 5 программ БХД, начиная с 1920 г., отстаивали основы демократического строя, в том числе частную собственность. Наиболее принципиальные изменения касались национального и религиозного вопросов. Если на I съезде ХДЗ (февраль 1918 г., Петроград) невыразительно говорилось, что в отношении к таким народам, как литовцы, латыши, белорусы и украинцы следует стоять на основе полного их самоопределения, то 2-я программа (1927 г.) декларировала, что «БХД стремится к самостоятельности белорусского народа на всех его землях, объединенных в независимую демократическую республику». В первых программах еще допускалась возможность отделения костела (церкви) от государства, в 4-й программе (1932 г.) подчеркивалось, что «БХД принципиально против отделения костела (церкви) от государства и борется с политикой, которая использует религию для политических

целей, или поддерживает одну религию против другой». Отмечалась также обязательность изучения религии «как в школах правительственных, так и в школах частных». Более выразительно последние программы БХД ставили социальные вопросы, как результат процесса радикализации, который охватил низовые кружки партии. Так, в § 34 обновленной 4-й программы отмечено, что «все земли, превышающие трудовую норму, передаются в собственность и без выкупа безземельным и малоземельным крестьянам». Содержались требования 8-часового рабочего дня, права на забастовку, создания рабочих комитетов с правом надсмотра за производством и прибылью и др., чего не было в первой программе. Со 2-й половины 1920-х годов БХД берет курс на превращение партии в общественно-политическую организацию на основе общехристианской идеологии, что нашло отражение в 5-й программе (1936 г.), смене названия на БНО [2, с. 418].

«В 1925 г. послы сейма В. Рагуля и Ф. Яремич организовали национально-крестьянскую партию – Белорусский крестьянский союз, которая просуществовала до 1929 г. В своей программе она выдвигала демократические требования, выступала за создание Белорусской буржуазной республики» [1]. «По земельному вопросу в программе было записано, что все земли... должны перейти в руки безземельных и малоземельных крестьян» [3].

Закономерно возникает вопрос: «Почему эта партия оказалась недолговечной?»

«К БКС враждебно относились БКРГ, «Змаганне» и другие организации, которые находились под влиянием КПЗБ. Массированные нападки на союз с их стороны, а также со стороны польских властей явились главными препятствиями распространения среди крестьянских масс Западной Беларуси влияния БКС, который оставался немногочисленной общественно-политической организацией и в начале 1929 г. распался» [3].

«В 1929–1930 гг. оформилась национальная группа А. Луцкевича и Р. Островского. В своем органе «Наперад» («Вперед») группа подчеркивала, что «не будет служить ни Москве, ни Варшаве». Главной задачей она видела работу на культурном поприще, в области национального возрождения. В 1930 г. эта группа создала

«Центросоюз» (Центральный союз культурных и хозяйственных организаций). В 1926 г. был создан Белорусский институт хозяйства и культуры как национально-просветительная организация. Она создавала клубы, библиотеки, кооперативы. Была запрещена польскими властями в 1936 г.» [1].

До 1930 г. все национально-демократические партии на деле демонстрировали единство действий. «В результате выборов в сейм и сенат 1922 г. от блока национальных меньшинств, который создали национально-демократические партии, в сейм было избрано 11, а в сенат 3 депутата-белоруса, которые создали в сейме свою фракцию – **Белорусский посольский (депутатский) клуб»** [1]. Эта структура, конечно, была едина в своей оппозиции к властям. Ее постоянно цементировало истинное национал-демократическое ядро, которое выкристаллизовалось после того, как «в июне 1925 г. группа левых депутатов Белорусского посольского клуба вышла из него и создала Посольский клуб белорусской крестьянско-рабочей громады (БКРГ)» [1]. На счету белорусских национально-демократических партий было немало общих антиправительственных акций. Однако к концу 1920-х годов в белорусском национальном движении разногласия стали постепенно преобладать над моментами согласия. Его «окончательный раскол (маркировало. – *М. К., М. С.*) создание Центрального союза культурных и хозяйственных организаций... Лидеры союза... считали единственно возможным путем культурно-национального развития поиск компромиссов с правительством Пилсудского. В направленном на имя президента Польши И. Мосьцицкого мемориале было заявлено о необходимости «морального разоружения с обеих сторон, достижения согласия и рассмотрения совокупности белорусско-польских проблем. В качестве первого практического шага вносилось предложение выделить 3 северо-восточные воеводства (Виленское, Новогрудское, Полесское) в отдельную административную единицу» [4]. Несмотря на то что Центросоюз в 1934 г. распался, стремление к далеко идущим компромиссам с властями было характерно для значительной части национально-демократического лагеря и в последующий период.

Безусловно, один из важнейших аспектов анализируемой проблематики – личностный. История белорусских национально-демократических партий – это прежде всего история ярких индивидуальностей. Многие из них были объектами как нецивилизованного отношения санационного режима, так и сталинских репрессий. Известно, например, что после вхождения Западной Беларуси в состав БССР были арестованы такие деятели этих партий, как «Вячеслав Богданович, Феликс Головач, отец Геннадий Шимановский, Алексей Назаревский, Фабиан Яремич, Винцент Жук-Гришкевич, Пётр Сыч, Владимир Самойло, Виктор Островский.... В советских застенках погибли Антон Луцкевич и Франтишек Уместовский» [5, с. 264].

Таким образом, белорусские национально-демократические партии, действовавшие в Западной Беларуси в 1921–1939 гг., представляли собой умеренную оппозицию польским властям, цивилизованно отстаивали интересы белорусского народа.

Литература

1. Национально-освободительное движение в Западной Беларуси // История Беларуси (XX – начало XXI в.) [Содержание пособия «История Беларуси (XX – начало XXI в.)»] [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://slovo.ws/urok/historyofbelarus/20/024.html.

2. Ладысеў, У. Беларуская хрысціянская дэмакратыя (БХД) / У. Ладысеў // Энцыкл. гісторыі Беларусі: У 6 т. – Мінск, 1993. – Т. 1. – С. 417–419.

3. Ладысеў, У. Беларускі сялянскі саюз / У. Ладысеў // Энцыкл. гісторыі Беларусі: У 6 т. – Мінск, 1993. – Т. 1. – С. 454.

4. Ладысеў, У. Цэнтральны саюз культурных і гаспадарчых арганізацый / У. Ладысеў // Энцыкл. гісторыі Беларусі: У 6 т. – Мінск, 2003. – Т. 6, кн. 2. – С. 124.

5. Грыбоўскі, Ю. Сталінскія рэпрэсіі ў Заходняй Беларусі / Ю. Грыбоўскі // Репрессивная политика советской власти в Беларуси: сб. науч. работ. – Минск, 2007. – Вып. 2 – С. 261–268.

У. Ф. Красюк

Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў, Мінск

ІДЭІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА ВЫЗВАЛЕННЯ, ГУМАНІЗМУ І АСВЕТНІЦТВА Ў ТВОРЧАСЦІ І. ДВАРЧАНІНА

Антыбеларуская палітыка польскіх улад выклікала супраціўленне розных колаў насельніцтва Заходняй Беларусі, вынікам чаго быў шырокі нацыянальна-вызваленчы рух у міжваенны перыяд. Словы польскага міністра Скульскага ў пачатку 1920-х гадоў аб тым, што праз дзесяць год ужо не знойдзецца ніводнага беларуса ў «крэсах усходніх» толькі актывізавалі ў беларускай інтэлегенцыі імкненне паслужыць свайму народу, развіваць яго культуру і свядомасць. Для таго каб змагацца за правы роднай мовы, за беларускую школу, асветніцтва і духоўную свабоду трэба было набыць неабходныя веды, атрымаць адукацыю, стварыць пазітыўны інтэлектуальны капітал, каб з веданнем справы весці барацьбу за сацыяльнае, нацыянальнае і культурнае вызваленне.

У абставінах тагачаснай рэчаіснасці неабходна было выкарыстоўваць усе магчымыя сродкі, якія спрыялі б агульнай справе. Адным з іх быў выхад на чэхаславацкі напрамак. Чэхаславацкая рэспубліка была абвешчана ў кастрычніку 1918 г., яе лідэры добра разумелі абставіны жыцця народаў, пазбаўленых сваёй дзяржаўнасці і ў адносінах да якіх праводзіцца дыскрымінацыйная палітыка. Прэзідэнт Чэхаславакіі Тамаш Гарыг Масарык прыхільна ставіўся да беларусаў, выдзяляў для беларускай моладзі штогадовыя вакансіі ў чэхаславацкіх ВНУ, прызначаў стыпендыі на час студыяў, у прыватнасці ў Карлавым універсітэце. У чэхаславацкіх навучальных установах «...у 1922 годзе павышалі сваю адукацыю і набывалі прафесіі больш за шэсць тысяч эмігрантаў з былой Расійскай імперыі, у тым ліку 48 беларусаў» [1, с. 24]. Сярод іх быў і будучы доктар філасофіі Ігнат Дварчанін, які восенню 1921 г. на падставе згоды Міністэрства школ і народнай асветы быў залічаны на філасофскі факультэт Карлава універсітэта. На адным факультэце з ім вучыліся Тамаш Граб, Уладзімір Жылка,

з якімі ён быў знаёмы. Брат Ігната Дварчаніна – Іларыён быў студэнтам тэхналагічнага інстытута ў Празе. На кожны навучальны год для беларускіх юнакоў былі зарэзерціраваны месцы ў чэхаславацкіх установах асветы.

23 чэрвеня 1926 г. І. Дварчанін абараняе доктарскую дысертацыю на тэму «Францішак Скарына як культурны дзеяч і гуманіст на беларускай ніве». Гэтаму поспеху, акрамя таленавітасці і працавітасці суіскальніка, спрыялі таксама і «...палітычныя абставіны ва ўніверсітэце, перш за ўсё дэмакратызм і тое, што многія з прафесароў у мінулым бралі чынны ўдзел у нацыянальна-вызваленчым руху» [2, с. 57]. З гэтага часу разгортваецца актыўная і плённая навукова-культурная дзейнасць самага Дварчаніна, якая была непарыўна звязана з грамадска-вызваленчай барацьбой у Заходняй Беларусі.

Лёсы Скарыны і Дварчаніна дастаткова падобныя. Абодва рэалізавалі сябе ў Празе, абодва вярнуліся на Радзіму весці асветніцкую дзейнасць, тут ім давялося пераадолець вялікія цяжкасці на шляху да сваёй мэты. І той і другі пакінулі пасля сябе багатыя вынікі сваёй дзейнасці.

Навуковая, мастацка-публіцыстычная, прапагандысцкая, эпісталярная спадчына выдатнага дзеяча беларускай культуры І. Дварчаніна (1895–1937) прасякнута пачуццём нястомнай веры ў магчымасці свабоднага чалавека, яна насычана глыбокім філасофскім сэнсам.

Яшчэ будучы студэнтам Карлава ўніверсітэта ён праявіў зацікаўленасць да гуманітарных навук, старанна вывучаў філасофію, гісторыю, чэшскую, польскую, украінскую, балгарскую, сербскую літаратуры, добра ведаў працы Я. Карскага і іншых вучоных. Жаданне працаваць на карысць свайму народу, удзельнічаць у справе асветніцтва, адкрыць багацце гістарычных пластоў айчыннай культуры знайшло адлюстраванне ў доктарскай дысертацыі.

Разгортваючы светапоглядныя рысы шматграннай дзейнасці Ф. Скарыны, І. Дварчанін развівае тыя ідэйныя ўстаноўкі, якія па сутнасці адлюстроўваюць і яго асабістыя погляды. Перш за ўсё гэта датычыць гуманістычнага асэнсавання асветніцтва, позірка на чалавечую істоту як на найвышэйшую каштоўнасць. Выяў-

ляецца адна з асноў скарынавага вольнадумства – свецкасць яго перакананняў, індыферэнтнасць у дачыненні да канфесійных адрозненняў, імкненне іх пераадолець і адзначыць адзінства хрысціянскай веры, барацьба з дагматызмам. Гэта спрыяла таму, што гуманізм Скарыны быў надкласавы, узвышаны над саслоўямі, тады як у Еўропе гуманістычны рух быў па сваёй сутнасці арыстакратычным. Дварчанін з разуменнем адзначае, што гуманістычныя думкі і дзеянні першадрукара былі ўзорам не схаластычнай вучонасці, а былі накіраваны на асвету свайго народа, ён выступаў як яго настаўнік. Аналізуючы фактары, інспіруючыя яго дзейнасць, галоўны з іх – любоў да свайго народа, жаданне «послужити посполитому люду». Аўтар, гаворачы пра Скарыну, раскрывае сваё разуменне асветніцкай дзейнасці – сваёй галоўнай мэтай лічыць навучанне простых людзей дзеля цяперашняга, зямнога, паўсядзённага жыцця, якое не павінна быць юдоллю плачу. Трэба навучыць глядзець на свет у яго рэальным праяўленні, хібы якога неабходна выпраўляць.

У дысертацыі даюцца дэфініцыі гуманізму ў гістарычным разрэзе, вызначаюцца ўласцівыя яму праяўленні. Раскрываючы гістарычны кантэкст гуманізму, аўтар бачыць у ім агульначалавечыя рысы, якія маюць пазачасавы характар. Выдзяляюцца наступныя агульныя аспекты гуманізму, які аказаў уздзеянне на Скарыну і быў у той ці іншай меры яму ўласцівы: разумны індывідуалізм, які характарызуецца цікавасцю чалавека да самога сябе, свайго ўнутранага свету і вылучэннем на першы план уласнага «я»; высокі ўзровень самасвядомасці; глыбокая цікавасць да навакольнага свету, найперш – да чалавека; антыаскетызм; стварэнне новай, секулярызаванай этыкі, новай педагогікі, новай навукі, новай палітыкі, новай публіцыстыкі і грамадскай думкі; любоў да прыроды і да падарожжаў; шырокія, энцыклапедычнага ўзроўню веды; цікавасць да антычнасці. Падкрэсліваюцца такія рысы, уласцівыя менталітэту прадстаўнікоў гуманізму, як рацыяналізм, эмансіпацыя ад фанатычнай веры, крытыцызм. Дварчанін у заслугу вялікаму сыну Айчыны ставіць рознабаковую гуманістычную дзейнасць, якая была надзвычай змястоўнай, гаворачы што Скарына быў адзін з самых прагрэсіўных мужоў та-

гачаснай Беларусі, які пасля сябе пакінуў сапраўдную энцыклапедыю свайго часу, напісаную народнай мовай.

Як сведчыць шматбаковая дзейнасць І. Дварчаніна, сам ён разумеў гуманізм не як канкрэтную гістарычную з'яву, а як сучасны сродак барацьбы за чалавека, яго годнасць, свабоду і правы. У якасці пасла ад пасольскага клуба «Змаганне» ў 1928 г. у сваіх прамовах у польскім Сейме ён выступае супраць удушэння нацыянальна-вызваленчага руху беларускага народа, насілля над яго правамі, супраць сацыяльнага прыгнёту. Адначасова заклікае змагацца ў абарону інтарэсаў працоўных, за эканамічныя і палітычныя свабоды, за поўнае самавызначэнне прыгнечаных народаў, за раўнапраўе іх моў з польскай мовай, за агульнае «дзяржаўнае абучэнне» для дзяцей простых людзей, за адзіную свецкую працоўную школу на роднай мове. Там жа гучыць яго голас у абарону беларускага друку, ТБШ, культурна-асветніцкіх устаноў. Свае погляды на развіццё сацыяльнай і нацыянальнай свядомасці мас, станаўленне іх культурнага жыцця Дварчанін раскрывае ў артыкуле «Змаганне» – паслядоўнік «Грамады». Там даецца агляд, акрамя палітычных, падзей культурна-асветніцкага напрамку: дзейнасці ТБШ, стварэння саматужных тэатральных труп, чытання лекцый, згуртавання беларускіх літаратурных сіл, дзейнасці выдавецкіх устаноў, правядзення прапагандысцкай работы, хаця яна была небяспечнай.

Дварчанін выступае вестуном дружбы народаў, крыніцу яе, у ліку іншых, бачыць у агульнасці асветніцкіх і адукацыйных працэсаў. У сваім артыкуле «Беларусы на Праскім універсітэце» паказвае з'яўленне ў перыяд гусіцкага руху «новых культурна-грамадскіх форм», да якіх актыўна далучалася тагачасная перадавая беларуская моладзь. Па яго падліку, за XV – першую палову XVI ст. толькі філасофскі факультэт Карлава універсітэта скончыла каля 17 беларусаў, і «гэта, безумоўна, не ўсе» [1, с. 239].

Яскрава гуманістычныя перакананні мысліцеля праявіліся ў літаратурнай творчасці. Доктар філасофіі быў і цікавым паэтам. У сваіх вершах ён славіць родную Беларусь, яе працавіты, годны лепшай долі народ. Глыбокі смутак ахоплівае яго, калі адлюстроўваецца жыццё простага селяніна, беспрацоўнага, рабочага,

студэнта. Паэт горача заклікае людзей не цярпець здзекі, глум, а стаць гаспадарамі сваёй «судзьбіны». Яго непакоіць пасіўнасць беларусаў да нацыянальна-вызваленчага руху, іх нерашучасць у справе вырашэння свайго лёсу. У вершы «Не спі!» выразна абвяшчаецца заклік да барацьбы, каб «вольным стаць без ланцугоў». Важкая роля ў справе вызвалення народа адводзіцца беларусам-інтэлігентам, святы абавязак якіх – «даваць свет» люду, які просіць дапамогі ў сваім жаданні скінуць цемру. Высока ацэньваюцца магчымасці чалавека, яго творчыя здольнасці, якія змаглі раскрыцца.

Глыбока чалавечыя адчуванні, лірычныя і філасофскія разважанні змешчаны ў вершах «Песня сэрца», «Вечнасць» і інш.

Такія ж пачуцці і разважанні маюць месца ў лістах І. Дварчаніна сваім сябрам, родным, дзе яскрава праступаюць яго высокія чалавечыя якасці. Пра іх гавораць у сваіх успамінах і тыя, хто былі яго вучнямі, таварышамі, хто яго ведаў.

Такім ён і застаўся ў памяці людзей – гуманістам і асветнікам, які шчыра нёс святло новага жыцця свайму народу.

Літаратура

1. Місарэвіч, Я. А. І. С. Дварчанін. Гісторыка-бібліяграфічны нарыс / Я. А. Місарэвіч, М. Д. Каралёў. – Гродна, 1995. – 303 с.

2. На зямлі Дзятлаўскай: матэрыялы гісторыка-краязнаўчай канферэнцыі, Дзятлава, 16 чэрв. 1995 г. / рэдкал.: А. У. Богуш (навук. рэд.) [і інш.]. – Ліда, 1998. – 228 с.

Д. А. Крывашэй

Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Мінск

НЯМЕЦКАЯ СУПОЛЬНАСЦЬ БЕЛАСТОЧЧЫНЫ Ў 1930-я ГАДЫ

Тэма гісторыі нацыянальных супольнасцей Заходняй Беларусі дастаткова добра распрацавана ў беларускай гістарыяграфіі. Аднак, на наш погляд, значным недахопам прац гісторыкаў з'яўляецца недастатковае ўключэнне ў навуковы абарот комплексу

архіўных крыніц, якія знаходзяцца ў фондах Дзяржаўнага ваяводскага архіва ў Беластоку.

Па даных перапісу 1931 г., на тэрыторыі Беластоцкага ваяводства пражывала 2968 асоб нямецкай нацыянальнасці. Гэта складала каля 2,6 % усяго насельніцтва. Пры гэтым непасрэдна ў Беластоку пражывала 1948 немцаў (у 1921 г. – 1529 чал.). У павеце – 642 чалавекі. Адносна іншых паветаў ваяводства лічбы выглядаюць наступным чынам: Бельск-Падляскі – 85, Гродзенскі – 153, Ваўкавыскі – 59 немцаў [1, s. 26–27]. Для параўнання, у іншых «усходніх» ваяводствах колькасць нямецкага насельніцтва была нязначнай. У Навагрудскім яно складала 379 чалавек, Палескім – 863, Віленскім – 1357 [1, s. 29, 33].

Неабходна канстатаваць той факт, што гісторыя нямецкай супольнасці на Беласточчыне да гэтага часу застаецца па-за ўвагай не толькі беларускіх, але і польскіх даследчыкаў пры наяўнасці дастатковай базы крыніц. Цікавасць у даследчыка павінны выклікаць калекцыя дакументаў евангельска-аўгсбургскай парафіі ў Беластоку, а таксама фонд дакументаў Беластоцкай ваяводскай управы.

Евангельска-аўгсбургская парафія існавала ў Беластоку з 1865 па 1940 г. У сваёй дзейнасці царква гэтай веры карысталася нарматыўнымі дакументамі Расійскай імперыі адносна іншаверных. У 1922 г. у незалежнай Польшчы былі ўнесены некаторыя змены ў існуючыя палажэнні, а ў 1936 г. адбылося поўнае юрыдычнае афармленне дзейнасці евангельска-аўгсбургскай царквы.

У адміністрацыйным плане царква падзялялася на дыяцэзіі, якія адначасова з'яўляліся выбарчымі акругамі старэйшых царкоўных улад. У склад дыяцэзіі ўваходзілі парафіі і філіялы, якія ўзначальвалі выбарныя парафіяльныя ўлады. На чале царквы стаяў сінод (заканадаўчая ўлада) і кансісторыя (выканаўчая ўлада).

У 30-х гадах XIX ст. на тэрыторыю Беластоцкай акругі пачалі перасяляцца людзі евангельска-аўгсбургскага веравызнання з тэрыторыі Каралеўства Польскага. На гэтых землях яны знаходзілі працу ў асноўным у тэкстыльнай прамысловасці. Пасля падаўлення паўстання 1830–1831 гг. і ўвядзення высокіх мытных пошлін на тавары, якія імпартаваліся з Каралеўства Польскага ў Расій-

скую імперыю, тэкстыльная вытворчасць пачала канцэнтраваць свае капіталы на тэрыторыі Беластоцкай акругі. Першыя евангельска-аўгсбургскія абшчыны былі арганізаваны ў ваколіцах Беластоку – Харошчы, Супраслі, Васількове, Міхалове, Кнышыне. У той час яны адносіліся да Ковенскага прыходу. Пасля заснавання Беластоцкай парафіі вернікі сталі абслугоўвацца пастарамі з Беластоку. У 1939 г. Беластоцкай парафіі падпарадкоўваліся філіялы ў Супраслі, Цеханаўцы, Хайнуўцы, Лапах, Семятычах, Кнышыне і Бельску-Падляскім. Беластоцкая парафія была падпарадкавана суперінтэнданту ў Варшаве.

Сярод дакументаў, якія захаваліся, знаходзяцца пратаколы парафіяльнай рады евангельска-аўгсбургскай царквы ў Беластоку за перыяд з 1865 па 1940 г., алфавітны спіс членаў абшчыны ў Харошчы і Супраслі за 1940 г., пратаколы евангельска-аўгсбургскай царкоўнай рады ў Супраслі за 1925–1939 гг., а таксама маёмасныя дакументы гэтай царквы за 1923–1938 гг.

Дадзеныя матэрыялы з'яўляюцца каштоўнымі крыніцамі па гісторыі дзейнасці нямецкай супольнасці на дадзенай тэрыторыі, арганізацыі рэлігійнага жыцця, адносін да дзяржавы і т. п. Значнай перашкодай для даследчыка з'яўляецца рукапісная нямецкая мова дакументаў.

Разнастайную інфармацыю па гісторыі грамадска-палітычнай, культурнай і рэлігійнай дзейнасці ўтрымліваюць дакументы Беластоцкай ваяводскай управы за 1920–1939 гг. Сярод іх штомесячныя справаздачы аб становішчы грамадска-палітычных і нацыянальных спраў. Дадзеныя справаздачы вызначаюцца шырокім ахопам падзей і дакладнасцю ў прывядзенні фактаў. Справаздачы ўтрымліваюць зводныя табліцы, у якіх пазначаны назвы арганізацый нацыянальных меншасцей, па кожнай з іх прыводзяцца лічбы колькасці сходаў, розных прадстаўленняў (напрыклад, тэатральных пастановак), забаваў (напрыклад, танцавальных вечарын), лекцый, агульная колькасць удзельнікаў, суадносіны паміж найменшай і найбольшай колькасцю ўдзельнікаў у адным мерапрыемстве, атрыманы прыбытак.

Першыя звесткі аб захадах па стварэнні на тэрыторыі Беластоцкага ваяводства арганізацыйных структур ***Нямецкага нацыя-***

нальнага таварыства (Deutsches Volksverband) адносяцца да лістапада 1934 г. [2, k. 208]. Аднак яно было зарэгістравана толькі праз два гады – у кастрычніку 1936 г. [3, k. 28; 4, k. 49 odwrót]. На чале Таварыства стаяў пастар Б. Крётэр.

У чэрвені 1937 г. аддзел Таварыства ў Беластоку налічваў 95 чалавек. Дзякуючы агітацыі, якая праводзілася, у яго склад ўступала моладзь. Але былі і выпадкі выхаду ў першую чаргу прадстаўнікоў старшага пакалення. Апошнія тлумачылі гэта сваёй нязгодай з узрастаючым шавінізмам моладзі, а таксама боязззю магчымых наступстваў у адносінах да іх з боку яўрэяў, у якіх ці з якімі яны працавалі [4, k. 73 odwrót].

У красавіку 1937 г. пастар Крётэр сярод бацькоў-немцаў праводзіў агітацыю за тое, каб яны запісвалі сваіх дзяцей толькі да агульнаадукацыйнай школы № 10, дзе выкладаецца нямецкая мова, а таксама «навука рэлігіі» на той жа мове. Акрамя гэтага, ён заклікаў бацькоў да адпраўкі сваіх дзяцей у летнія лагеры ў Рэйх і ў ваколіцы Познані [4, k. 50].

У снежні 1937 г. Крётэр збіраў подпісы пад заявай да школьных улад аб дазволе сабраць дзяцей немцаў у адной школе побач з евангельскім зборам. Ён жа праводзіў рэлігійныя заняткі «паралельна на польскай і нямецкай мовах, прысвячаючы па палове гадзіны кожнай нацыянальнасці». Школьныя ўлады рэкамендавалі яму па чарзе па гадзіне весці выкладанне «евангелісцкай рэлігіі» па-польску і па-нямецку. Аднак святар «імкнуўся частку гадзіны, адрасаваную лекцыі на польскай мове, змяншаць на карысць нямецкай лекцыі». «Германізатарская дзейнасць» пастара ў гэты ж перыяд праявілася ў арганізацыі ў нядзелі прадстаўленняў для дзяцей-евангелістаў з сярэдніх школ. Удзельнікаў вучылі нямецкім гульням і песням «з мэтай прабуджэння нацыянальнага нямецкага пачуцця» [4, k. 156].

Нямецкае нацыянальнае таварыства было зацікаўлена ў пашырэнні кола сяброў. Аднак гэтая справа не давала значных станоўчых вынікаў па прычыне «стаўлення арганізацыі да яўрэяў, ад якіх мясцовыя немцы ў значнай ступені былі эканамічна залежнымі» [4, k. 37 odwrót]. Шмат намаганняў было прыкладзена ў справе агітацыі на ўступленне ў Таварыства нямецкай моладзі.

Актыўнасцю ў гэтым напрамку вызначаўся дырыжор хору таварыства евангельска-лютэранскай моладзі «Jugend – Bund» Х. Бартэль [4, k. 127 odwrót].

Як адзначалася ў справаздачы за студзень 1938 г., «не слабеючую актыўнасць працягваюць дэманстраваць немцы ў Беластоку, якіх імкнецца падпарадкаваць сваім уплывам мясцовы аддзел Нямецкага нацыянальнага таварыства на чале з пастарам Б. Крётэрам» [5, k. 12 odwrót]. Адной з праяў такой актыўнасці быў сумесны сход у пачатку 1938 г. сяброў Таварыства і мясцовага Таварыства евангельска-лютэранскай моладзі «Jugend – Bund». На ім пастар Крётэр заклікаў уваходзіць у нямецкія арганізацыі, праводзіць актыўную працу ў гэтым напрамку і ўзмацняць нацыянальныя пачуцці. Пры гэтым ён звярнуў увагу на той факт, што немцы ў Польшчы фактычна маюць сваю царкву, аднак яна не з'яўляецца «чыста нямецкай» і немцы павінны імкнуцца да таго, каб яна стала «сапраўднай нямецкай царквою ў поўным значэнні гэтага слова». Імкненне пастара да ўвядзення рэлігійных момантаў у дзейнасць Нямецкага нацыянальнага таварыства крытыкавалася асобнымі яго сябрамі [5, k. 12 odwrót – 13] і прывяла ў хуткім часе да канфлікту. У лютым 1938 г. маладзёжнаму таварыству, якое месцілася ў адным будынку з іншымі нямецкімі арганізацыямі, было адмоўлена ў памяшканні, а пазней была выказана прапанова памяшкання за плату. Сам жа пастар Крётэр на сходзе маладзёжнага таварыства «Jugend – Bund» 20 лютага быў абраны старшынёй (кіраўніком стаў пастар З. Клінер) [5, k. 25]. Вынікам спрэчак стала перасяленне Таварыства евангельска-лютэранскай моладзі ў памяшканне евангельскай гміны, якое было вызвалена пачатковай школай. Нягледзячы на гэта сутыкненне на рэлігійнай глебе, «дзейнасць Нямецкага нацыянальнага таварыства і пастара Б. Крётэра надалей ішла ў адным напрамку – прабуджэнне вяліка624нямецкага духу – і не дэманстравала тэндэнцый да аслаблення». У сядзібе нацыянальнага таварыства была адчынена бібліятэка, паслугамі якой за мінімальную плату карысталіся сябры таварыства. У гэтым таварыстве была створана асобная маладзёжная секцыя, а яго кіраўніцтва прыняло рашэнне аб эканамічным байкоце яўрэяў. У дзень нараджэння

Гітлера планавалася правесці ўрачысты сход. Дзеці сяброў Таварыства рэгулярна выязджалі ў летнія лагеры ў Германіі [5, k. 41]. Значныя намаганні нямецкая абшчына прыкладала ў справе арганізацыі ў Беластоку прыватнай нямецкай школы ў памяшканні пры евангельскай кірсе [5, k. 13].

Аднак пастар Крётэр і далей працягваў агітацыю супраць Нямецкага нацыянальнага таварыства. 19 чэрвеня 1938 г. на штогадовым сходзе Спеўнага таварыства збору святога Яна «Concordia» звярнуў увагу прысутных на тое, што ў апошні час дадзенае таварыства не развіваецца паспяхова. Прычыну выступоўца бачыў у тым, што шэраг сяброў Спеўнага таварыства належаць да Нямецкага нацыянальнага таварыства, «якое непрыхільна адносіцца да евангельскага духавенства і рэлігійных аб'яднанняў» і тармозіць развіццё «Concordia». Канфлікт разгараўся і пад уздзеяннем знешніх фактараў. У гэты перыяд Галоўнае упраўленне Нямецкага нацыянальнага таварыства праводзіла жорсткую кампанію супраць суперінтэнданта Бурхема і значнага кола пастараў [5, k. 75 odwrót]. Зразумела, што гэта не магло не аказаць уздзеяння на рост варожасці з боку беластоцкага таварыства да мясцовых евангельскіх святароў.

У сакавіку 1938 г. у якасці вікарыя ў беластоцкую парафію быў дэлегаваны пастар Ж. Клінер, што выклікала незадавальненне прыхаджан, якія ўбачылі ў гэтым толькі павелічэнне выдаткаў. Імі згадваўся пастар Зірквітц, які доўгі час, «пакуль быў малодшы, быў здольны самастойна абслугоўваць парафію і не быў працаю змучаны». Па меркаванні прыхаджан, «цяперашні пастар Крётэр павінен сам выконваць усе абавязкі пробаша і не абцяжарваць бюджэту парафіі ўтрыманнем вікарыя». Акрамя гэтага, выкладанне прысланым вікарыем катэхізіса ў школах сутыкнулася з пратэстам з боку настаўнікаў, якія, баючыся яго дзейнасці па германізацыі, запатрабавалі ад школьнага інспектара яго адхілення [5, k. 39].

Жыццё нямецкай абшчыны ў Беластоку знаходзілася пад пільнай увагай цэнтральнай сядзібы Нямецкага нацыянальнага таварыства ў Лодзі. Напрыклад, 2 мая 1938 г. у горад прыехалі два прадстаўнікі з цэнтру, якія на сходзе сябраў таварыства прапагандавалі

ідэі нацыянальнай еднасці, устанаўлення сталых кантактаў з аддзеламі Таварыства ў іншых мясцовасцях, арганізацыю святкаванняў і сходаў, на якіх «праз песні і танцы можна культываваць нямецкі дух» [5, k. 68 odwrót]. На наступны дзень быў арганізаваны паход на вайсковыя могілкі, закладзеныя немцамі ў час акупацыі ў перыяд Першай сусветнай вайны. Была аддадзена пашана загінуўшым салдатам. А вечарам таго ж дня госці ў памяшканні Таварыства вучылі прысутных нямецкім песням і танцам.

Прапаганда, якая праводзілася прадстаўнікамі цэнтральнай сядзібы, аказвала моцнае ўздзеянне на мясцовую нямецкую супольнасць. Так, ужо праз два тыдні, 15 мая, на святкаванні Дня маці дакладчыца Г. Мітцнер гаварыла аб неабходнасці выхавання дзяцей у нямецкім духу з мэтай пазбегнуць паланізацыі і таксама заклікала не заключаць змешаных шлюбаў, якія прыводзяць да страты нацыянальнай прыналежнасці дзяцей [5, k. 68 odwrót].

18 студзеня 1939 г. на сходзе сяброў таварыства ў Беластоку была праведзена яго рэарганізацыя шляхам выдзялення жанчын у асобую жаночую секцыю. 20 студзеня ў горад прыбыў новы арганізацыйны інструктар Нямецкага нацыянальнага таварыства В. Грэт. На сяброўскім сходзе ён «адзначыў, што прыбыў для ажыўлення нямецкага палітычнага жыцця, падкрэсліваючы пры гэтым, што Гітлер вызначыў шляхі нямецкаму народу, па якіх ён павядзе і беластоцкіх немцаў». Папярэдні кіраўнік таварыства Тышкоўскі быў накіраваны ў Германію для знаёмства з метадамі працы гітлераўскіх маладзёжных арганізацый [6, k. 14 odwrót].

За дзейнасцю таварыства пільна сачылі ўлады, асабліва ў 1939 г. Гэта нават прымусіла ўдзельнікаў таварыства на сходзе 7 мая звярнуцца да сваіх сяброў з заклікам аб тым, каб «не аказвалі паслугі паліцыі і не інфармавалі аб тым, што адбываецца ў Таварыстве» [6, k. 67]. Справы ж непасрэдна Таварыства ў гэты перыяд ішлі паспяхова. Колькасць яго сяброў толькі за некалькі месяцаў 1939 г. павялічылася на 100 чалавек і кіраўніцтва разлічвала на тое, што ў хуткім часе аддзел Таварыства ў Беластоку стане самым вялікім і зможа паспяхова змагацца за «справы нямецкай меншасці, а перад усім за адкрыццё нямецкай школы». На згаданым сходзе адзначалася, што «палякі ў Германіі маюць

разнастайныя свабоды, могуць аб'ядноўвацца і падкрэсліваць сваю польскасць, у той час, як немцы ў Польшчы падвяргаюцца ўціску, звальняюцца з працы, і нават здараюцца выпадкі іх збіцця» [6, k. 67].

Эпізадычныя звесткі захаваліся аб дзейнасці евангельскага прыхода ў Гродна, якая не вызначалася сваёй актыўнасцю. Вядома, што ў снежні 1936 г. гродзенскі пастар А. Плямш прыняў удзел у акцыі супраць урэгулявання адносін дзяржавы з евангельска-аўгсбургскай царквой [3, k. 141]. У далейшым адсутнасць актыўных дзеянняў паслужыла падставай для крытыкі з боку некаторых прыхаджан. 18 чэрвеня 1939 г. на сходзе рады прыходу Генрых Саваліч крытыкаваў дзейнасць рады і прыводзіў у якасці прыкладу мерапрыемствы Рускага Дабрачыннага таварыства, сябрам якога ён быў раней. Крытыка мела наступствы – па прапанове пастара Мессершміта Саваліч быў выключаны са спіса сяброў рады, таму што на думку апошняй быў «рускім шавіністам і праводзіў філа-рускія мерапрыемствы» [6, k. 67 odwrót].

У хуткім часе пацярпеў сам старшыня рады. 19 ліпеня 1939 г. на сходзе рады прыхода прыхаджанка Эма Хольман звярнулася з ініцыятывай накіравання ў Вільню просьбы прыслаць у Гродна пастаяннага пастара, бо пастар Мессершміт слаба выконвае свае абавязкі. Замест пастара абавязкі выконвае арганіст Роберт Вегнер. Акрамя гэтага, Мессершміт быў абвінавачаны ў тым, што «набажэнствы і пропаведзі праходзяць на польскай мове, у той час, як нямецкая калонія жадае іх правядзення на нямецкай». Было прынята рашэнне даручыць Э. Хольман заняцца падрыхтоўкай звароту і высылкай яго ў Вільню [6, k. 96–97].

Такім чынам, у другой палове 1930-х гадоў назіралася значнае ўзмацненне грамадска-культурнай дзейнасці нямецкай супольнасці на Беласточчыне. Толькі ў Беластоку былі створаны і дзейнічалі Нямецкае нацыянальнае таварыства, таварыства евангельска-лютэранскай моладзі, спеўнае таварыства евангельскага збору. Нягледзячы на канфлікты, якія ўзнікалі паміж імі, таварыствы праводзілі актыўную дзейнасць па ўзмацненні нацыянальных пачуццяў, выхаванні дзяцей у нямецкім духу.

Крыніцы і літаратура

1. Bevölkerungsstatistik Weissrutheniens: Verzeichnis der kleineren und kleinsten Verwaltungseinheiten der Weissruthenischen SSR einschl. der 1939 eingegliederten Ostgebiete Polens sowie der Gouvernements Brjanssk und Ssmolenssk: Mit statistischen Angaben uber ihre Bevolkerung auf Grund der sowjetamtlichen Volkszahlung vom 17.12.1926 und der amtlichen polnischen Volkszahlungen vom 30.9.1921 und 9.12.1931 / Ausgearb. u. hrsg. von der Publikationsstelle Berlin-Dahlem. – Berlin: Selbstverl. der Publikationsstelle, 1942. – VI, 202 S. – (Schr. der Publikationsstelle fur den Dienstgebrauch).
2. Wojewódzkie Archiwum Państwowe w Białymstoku, akta Urzędu Wojewódzkiego Białostockiego. – Sygn. 77.
3. Тамсама. – Sygn. 91.
4. Тамсама. – Sygn. 98.
5. Тамсама. – Sygn. 101.
6. Тамсама. – Sygn. 107.

В. І. Крывуць

Баранавіцкі дзяржаўны універсітэт

НАЦЫЯНАЛЬНЫЯ МАЛАДЗЁЖНЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ І ПОЛЬСКІЯ ЎЛАДЫ НА ТЭРЫТОРЫІ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ (1926–1939 гг.)

Шматнацыянальны характар насельніцтва Заходняй Беларусі аказваў значны ўплыў на развіццё маладзёжнага руху на яе тэрыторыі. На працягу ўсяго міжваеннага перыяду ў рэгіёне дзейнічаў шэраг груповак і арганізацый, якія імкнуліся распаўсюдзіць свой уплыў на моладзь розных нацыянальнасцей – беларусаў, яўрэяў, украінцаў і г. д. Польскія ўлады павінны былі ўлічваць гэта пры правядзенні сваёй маладзёжнай палітыкі, паколькі нацыянальныя маладзёжныя аб'яднанні маглі стварыць сур'ёзныя перашкоды для яе ажыццяўлення і стаць канкурэнтамі праўрадавым саюзам моладзі (Саюзу Вясковай Моладзі «Сеў» – Саюзу Маладой Вёскі, Стралецкаму Саюзу, Арганізацыі Працуючай Моладзі і інш.).

Неабходна заўважыць, што ўлады імкнуліся да таго, каб мясцовыя структуры вышэйназваных санацыйных саюзаў моладзі

ўзначальвалі менавіта палякі. Так, у адным з дакументаў аддзела грамадскай бяспекі Палескага ваяводства адзначалася, што «стварэнне змешаных (у нацыянальных адносінах. – *В. К.*) арганізацый з'яўляецца пажаданым пры ўмове, што кіраўніцтва такіх арганізацый павінна знаходзіцца ў польскіх руках і ў праўленнях павінен мець перавагу польскі элемент». Адначасова ў тым жа дакументе павятовым старастам давалася распаражэнне даведацца «ці не з'яўляецца наплыў няпольскай моладзі ў гурткі сельскай моладзі планавай працай антыдзяржаўных элементаў з мэтай разгрому польскіх арганізацый на вёсцы» [1, арк. 12].

Яшчэ больш насцярожана і нават варожа польскія ўлады адносіліся да актыўнасці няпольскай моладзі па-за межамі афіцыйных структур. Асабліва яскрава гэта праявілася ў выпадку з развіццём беларускага маладзёжнага нацыянальна-дэмакратычнага руху, які ў міжваенны перыяд знаходзіўся ў асноўным пад уплывам БХД–БНА. Трэба адразу адзначыць, што адзінага масавага беларускага маладзёжнага саюза нацыянальна-дэмакратычнай арыентацыі не існавала. На мяжы 1920–1930-х гадоў была зроблена спроба яго стварэння. Ініцыятарам стварэння Таварыства Беларускай Моладзі «Будучыня» выступіла рэдакцыйная калегія часопіса «Шлях моладзі». Мэтамі арганізацыі павінны былі стаць культурная, нацыянальная, грамадская і прафесійная самаадукацыя; распаўсюджванне асветы сярод маладога пакалення; развіццё народнай культуры і творчасці; развіццё спорту і фізічнага выхавання; арганізацыя самадапамогі [2, с. 7]. Можна сказаць, што такая праграма была даволі падобнай да так званага польскага пазітывізму другой паловы XIX ст., характэрнымі рысамі якога было адмаўленне ад узброенай барацьбы за нацыянальную незалежнасць і засяроджанасць на эканамічных, сацыяльных і культурных праблемах.

Першапачаткова старэйшае пакаленне беларускіх нацыянал-дэмакратаў было супраць стварэння «Будучыні». Напрыклад, А. Станкевіч заяўляў, што дастаткова тых арганізацый, якія ўжо існуюць. Другі кіраўнік БХД, Я. Пазьняк, сцвярджаў, што стварэнне новай беларускай арганізацыі прывядзе да далейшага раздраблення беларускіх культурна-асветніцкіх сіл [3, s. 175].

Тым не менш, маладыя дзеячы БХД падалі статут арганізацыі на зацвярджэнне віленскаму ваяводзе, які адмовіўся гэта зрабіць. Сваю адмову ён аргументаваў тым, што членамі Таварыства могуць быць толькі асобы, якія дасягнулі 21 году, у той час як статут прадугледжваў паўнапраўнае членства з 16 год, а ў выключных выпадках з 14 год. Аднак вядома, што, напрыклад, у афіцыйныя Саюз Вясковай Моладзі «Сеў» і Арганізацыю Працуючай Моладзі прымаліся падлеткі з 14 год. Пасля таго, як заснавальнікі Таварыства звярнулі на гэта ўвагу улад, тыя ў другі раз адхілілі іх прашэнне, растлумачыў гэта правамі ваяводы [2, с. 7].

Адмовілася зацвердзіць статут «Будучыні» і Міністэрства ўнутраных спраў. Начальнік аддзела бяспекі Віленскага ваяводства лістом ад 23 лютага 1932 г. паведаміў, што МУС пакінула «без разгляду» пратэст заснавальнікаў Таварыства супраць пастановы ваяводы [4, с. 10]. Няўдачай скончылася і спроба стварэння беларускага спартыўнага таварыства «Гайсак» – ваяводскія ўлады таксама не далі дазволу на яго рэгістрацыю [5, с. 92].

Фактычна, адзінай маладзёжнай арганізацыяй, якая знаходзілася пад частковым уплывам БХД–БНА, з'яўляўся Саюз Студэнтаў Беларусаў, які існаваў у Віленскім універсітэце ў 1920–1939 гг. Галоўнымі мэтамі Саюза былі аб'яднанне сваіх членаў на глебе навуковага пазнання Беларусі і выхавання нацыянальнай свядомасці народа. ССБ вёў асветна-прапагандысцкую працу, у аснове якой было чытанне лекцый сярод насельніцтва. Таксама арганізоўваліся вечары, экскурсіі, тэатральныя пастаноўкі, канцэрты.

Весці якую-небудзь іншую дзейнасць, акрамя культурна-асветніцкай, ССБ не мог з-за пастаяннага ціску універсітэцкіх і ваяводскіх улад. Так, калі ў лютым 1933 г. сход ССБ пастанавіў выразіць пратэст супраць уціску беларускай школы і беларускіх асветных арганізацый, куратар Саюза прафесар Э. Кашмідэр не даў на гэта свайго дазволу па прычыне «няпраўдападобнасці прыведзеных фактаў і завостранасці акцэнтаў» [6, арк. 104]. У тым жа годзе ў сувязі з новым законам аб студэнцкіх аб'яднаннях Саюз быў вымушаны выйсці з Аб'яднання Беларускіх Студэнцкіх Арганізацый, якое каардынавала дзейнасць студэнцкіх арганізацый у ВНУ Еўропы і Амерыкі [7, с. 26]. У далейшым ССБ было заба-

ронена арганізоўваць лекцыі ў правінцыі, а яго членам насіць значкі сваёй арганізацыі [8, с. 193]. Такім чынам улады імкнуліся абмежаваць дзейнасць саюза тэрыторыяй Вільні і асяроддзем беларускага студэнцтва мясцовага універсітэта.

Аднак польскія ўлады не абмяжоўваліся толькі адкрытым ціскам і забаронамі. У сваіх мэтах яны выкарыстоўвалі і ўнутраныя канфлікты ў асяроддзі беларускіх нацыянал-дэмакратаў. У якасці прыкладу можна прывесці падзеі, якія адбываліся ў першай палове 1930-х гадоў вакол ССБ. У гэты перыяд у Саюзе разгарнуўся канфлікт паміж прыхільнікамі БХД і так званай «белсанацыі», якія выступалі за больш цеснае супрацоўніцтва з польскімі ўладамі. У выніку ў арганізацыі адбыўся раскол. Пасля таго, як паланафілы былі выключаны з ССБ, яны стварылі сваю арганізацыю – студэнцкую карпарацыю «Скарынія». Першапачаткова гэтая арганізацыя карысталася падтрымкай улад. Напрыклад, для афіцыйнай рэгістрацыі было патрэбна прадставіць не менш 50 подпісаў студэнтаў. Арганізатары «Скарыніі» былі вымушаны збіраць подпісы для стварэння беларускай студэнцкай арганізацыі сярод студэнтаў-палякаў, паколькі сярод студэнтаў-беларусаў дастаковай колькасці подпісаў сабраць не ўдалося [9, арк. 71]. Тым не менш, 12 чэрвеня 1931 г. універсітэцкі сенат зацвердзіў статут карпарацыі. Польскія ўлады разглядалі «Скарынію» ў якасці супрацьвагі ССБ і таму на яе ўтрыманне выдаткоўваліся значныя сродкі з дзяржаўнага бюджэту. Так, на першапачатковым этапе (1931–1932 гг.) яе штомесячны бюджэт складаў 1500 злотых. Для параўнання: на Віленскую беларускую гімназію выдзялялася 2500 злотых штомесяц, а ўвесь штомесячны бюджэт «белсанацыі» складаў 8000 злотых. За адну толькі арэнду памяшкання карпарацыя выплочвала 200 злотых. Шэраговыя члены «Скарыніі» атрымлівалі 15–25 злотых, а кіраўнікі аб'яднання – 160–200 злотых у месяц [9, арк. 18–19]. Але менавіта фінансавыя пытанні вельмі хутка прывялі да крызісу карпарацыі. Гэты крызіс быў цесна звязаны з канфліктам унутры «белсанацыі» паміж А. Луцкевічам і Р. Астроўскім, якога абвінавацілі ў фінансавых махінацыях. Пасля таго, як прыхільнікі гэтых дзеячаў пачалі выключаць адзін аднаго з карпарацыі, універсітэцкія

ўлады ў пачатку 1934/1935 навучальнага года былі вымушаны распусціць «Скарынію» [10, с. 11]. У далейшым былыя члены карпарацыі стварылі, таксама ў якасці супрацьвагі ССБ, Беларускае Студэнцкае Таварыства імя Ф. Скарыны. Такім чынам, раскол сярод студэнтаў-беларусаў захаваўся. Гэта поўнасцю адпавядала інтарэсам польскіх улад, паколькі ў канцы 1930-х гадоў абедзве беларускія студэнцкія арганізацыі большую частку энергіі накіроўвалі на ўзаемную барацьбу [11, s. 91].

Больш прадуктыўную дзейнасць вёў калектыў часопіса «Шлях моладзі», які пасля няўдалай спробы стварэння таварыства «Будучыня» стаў фактычным цэнтрам беларускага маладзёжнага нацыянальна-дэмакратычнага руху. Часопіс быў створаны ў пачатку 1929 г. і выходзіў да канца міжваеннага перыяду. У склад яго рэдакцыйнай калегіі ўвайшлі Я. Найдзюк, І. Тумаш, А. Шутовіч. Рэдактарам быў М. Пецюкевіч (пазней яго змяніў Я. Найдзюк), выдаўцом – Я. Багдановіч [12, с. 95].

Мэтай сваёй працы рэдакцыя абвясціла «змаганне за незалежнасць Беларусі і паляпшэнне народнай беларускай долі шляхам буджэння моладзі да нацыянальнай свядомасці, пашырэнне асветы і культуры, узгадаванне моладзі ў самастойна-незалежніцкім духу, азнаямленне з гісторыяй і літаратурай беларускай, беларускім адраджэнскім рухам, з падзеямі ў свеце». За падставу яна ўзяла «народную ідэалогію, апёртую на хрысціянскай этыцы» [4, с. 8].

Акрамя значнай культурна-асветніцкай працы часопіс вёў барацьбу супраць рознага кшталту афіцыйных маладзёжных саюзаў. Пастаянна адзначалася, што гэтыя арганізацыі «пад плашчом культуры ці хрысціянства фактычна жадаюць спаланізаваць беларускую моладзь» [2, с. 8]. На думку рэдакцыі, беларуская моладзь павінна «працаваць самастойна для беларускай справы, без ніякіх надзей на працвеража́нне чужога хворага нацыяналізму, як на захадзе, так і на ўсходзе. Беларусам ёсць толькі адзіны шлях – арганізацыя сваіх сіл у сваіх жа арганізацыях» [13, с. 8].

Дзейнасць часопіса «Шлях моладзі» выклікала рэпрэсіі з боку польскіх улад. Выдаўцы «Шляха моладзі» неаднаразова падвяргаліся штрафам, некаторыя нумары выдання былі канфіскаваны

па цэнзурных меркаваннях. Мясцовая адміністрацыя імкнулася спыніць распаўсюджванне беларускай прэсы, паколькі лічылася, што прысутнасць яе «супярэчыць польскім дзяржаўным інтарэсам» [11, s. 104]. Так, кіраўнік адной са школ у лісце да школьнага інспектара ў Пружанах выказваў занепакоенасць, што мясцовая моладзь, якая вучыцца ў Вільні, прывозіць на тэрыторыю павета беларускую «нацыяналістычна-камуністычную» прэсу, пераважна часопіс «Шлях моладзі»: «Гэтая прэса пападае ў рукі старэйшай моладзі, што перашкаджае правядзенню выхаваўчай і навучальнай працы ў школе». Аўтар нават папярэджвае, што калі становішча не зменіцца, то існуе небяспека, што «мясцовая тэрыторыя, якая ніколі не была беларускай, а мусіць і павінна стаць польскай», «збеларусізуецца» [11, s. 106]. Зразумела, што гэта было значным перабольшваннем, але распаўсюджванне «Шляха моладзі» сустракала значныя перашкоды – за адну толькі падпіску на часопіс паліцыя складала пратакол. Летам жа 1939 г. «Шлях моладзі» быў зачынены, а выдаўцы і члены рэдкалегіі былі адпраўлены ў канцлагер у Бярозе Картузскай [8, с. 401].

Такім чынам, дзякуючы палітыцы польскіх улад, беларускі нацыянальна-дэмакратычны маладзёжны рух так і не здолеў арганізацыйна афарміцца і стаць масавым. Зусім інакш складвалася сітуацыя з маладзёжнымі аб'яднаннямі іншай нацыянальнай меншасці Другой Рэчы Паспалітай, з сіяніцкім рухам.

На міжваенны перыяд прыпадае пік грамадска-палітычнай актыўнасці яўрэйскага насельніцтва Заходняй Беларусі, у тым ліку і яго маладога пакалення. Як адзначае амерыканскі гісторык Е. Мендэльсон, «для маладога польскага яўрэя, асабліва ў 30-я гады, удзел у маладзёжным палітычным руху ці партыі быў нормай» [14, s. 77].

У гарадах і мястэчках Заходняй Беларусі актыўна дзейнічалі сіяніцкія маладзёжныя саюзы «Фрайгайт», «Хехалуц», «Хашамер Хацаір», якія былі так ці інакш звязаныя сіяністамі-сацыялістамі з партыі Паалей Цыён. Галоўнай сваёй задачай гэтыя аб'яднанні лічылі «хахшару» – падрыхтоўку моладзі да эміграцыі і актыўнага жыцця ў Палесціне. Хаця трэба адзначыць, што многія лідэры сіянізму, у тым ліку і Бен-Гурыён, сумняваліся

ў эфектыўнасці «хахшары» за межамі Палесціны, паколькі ўмовы ў Еўропе вельмі адрозніваліся ад умоў Палесціны [15, с. 469–470].

Яшчэ адной масавай сіяніцкай маладзёжнай арганізацыяй быў «Бейтар», які знаходзіўся пад кантролем сіяніста-рэвізіяніста Уладзіміра (Зеева) Жабацінскага. У адрозненні ад вышэйназваных арганізацый «Бейтар» выступаў за «неразбаўлены» сіянізм і адмаўляў элементы сацыялістычнай ідэалогіі. Мэтай Жабацінскага і яго паплечнікаў было «прыцягненне максімальнай колькасці яўрэяў у кароткі перыяд часу ў Палесціну» і неадкладнае стварэнне дзяржавы Ізраіль. Вялікае значэнне для гэтага мела «мілітарызацыя яўрэйскай моладзі ў Эрэц-Ізраіле і дыяспары» [15, с. 504]. Гэтым і займаўся «Бейтар», цэнтрамі якога на тэрыторыі Заходняй Беларусі сталі Вільня, Беласток, Брэст і Сувалкі [16, арк. 92]. Пры гэтым, пашыраючы свой уплыў, рэвізіяністы не выбіралі сродкаў. Так, у пачатку верасня 1938 г. іх баявікі ажыццявілі шэраг нападаў на мясцовыя аддзяленні іншых сіяніцкіх арганізацый у Брэсце і Пінску [17, s. 236].

Менавіта сваёй ваяўнічасцю і мілітарызаванасцю «Бейтар» адрозніваўся ад іншых яўрэйскіх маладзёжных аб'яднанняў. Характэрнымі яго асаблівасцямі былі ўніформа, ваенная арганізацыя і дысцыпліна, а таксама навучанне валоданню зброяй. Што тычыцца ваеннай падрыхтоўкі «Бейтара», то яна ажыццяўлялася пры непасрэдным удзеле прадстаўнікоў польскай арміі. Так, ваенным інструктарам «Бейтара» ў Беластоку быў афіцэр 42 пяхотнага палка Войска Польскага [18, арк. 163].

Прыхільная пазіцыя польскіх улад у адносінах да рэвізіяністаў тлумачылася тым, што правячыя колы Другой Рэчы Паспалітай падтрымлівалі планы Жабацінскага, якія б маглі пазбавіць краіну ад «лішніх» яўрэяў. Польскі ўрад карыстаўся любой магчымасцю, каб павялічыць яўрэйскую эміграцыю, у тым ліку і нелегальную. Дзеля гэтага і патрэбны былі кантакты з Жабацінскім і яго маладзёжнай арганізацыяй. Вядома, што рэвізіяністы павялічвалі свой уплыў дзякуючы тайнай падтрымцы дзяржаўнай адміністрацыі. Пасля таго, як у 1936 г. Жабацінскі абвясціў план эміграцыі 750 тыс. яўрэяў на працягу 10 год, кіраўнікі рэвізіяністаў сустракаліся з вышэйшымі польскімі чыноўнікамі, атрымлі-

валі фінансавую і арганізацыйную дапамогу пры навучанні баявых атрадаў [17, s. 234]. Характэрна, што амерыканскі гісторык Е. Мендэльсон казаў пра адносіны польскага ўрада да яўрэйскай эміграцыі: «...і калі сіянізм азначае яўрэйскую эміграцыю ў гэтую краіну (Палесціну. – *В. К.*), ніхто не быў большым сіяністам, чым польскія кіраўнікі канца 30-х гадоў» [14, s. 108].

Такім чынам, трэба прызнаць, што польскія ўлады вымушаны былі ўлічваць факт існавання на тэрыторыі Заходняй Беларусі шматлікіх нацыянальных маладзёжных груповак і аб'яднанняў. Пры гэтым санацыйны рэжым імкнуўся не дапусціць развіцця арганізацый, якія б маглі ўяўляць хаця б патэнцыйную пагрозу тэрытарыяльнаму адзінству Другой Рэчы Паспалітай. У гэтых адносінах характэрна практыка паслядоўнага падаўлення беларускага нацыянальна-дэмакратычнага маладзёжнага руху. Менавіта дзякуючы пазіцыі польскіх улад ён нават не быў арганізацыйна афармлены.

У супрацьлеглым выпадку, пры адсутнасці «антыдзяржаўных» тэндэнцый, улады займалі нейтральную ці нават прыхільную пазіцыю. Гэта магчыма прасачыць на прыкладзе развіцця і дзейнасці сіяніцкіх маладзёжных арганізацый. Фактычна ўся дзейнасць сіяністаў стала магчымай толькі таму, што яны рыхтаваліся ствараць сваю незалежную дзяржаву ў Палесціне, а не на тэрыторыі Польшы. Акрамя таго, санацыйны рэжым аказваў дапамогу такім арганізацыям, як «Бейтар», паколькі менавіта праз яўрэйскую эміграцыю ён імкнуўся вырашыць «яўрэйскае пытанне» ў Другой Рэчы Паспалітай.

Крыніцы і літаратура

1. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці. – Фонд 1: Палескае ваяводскае ўпраўленне. – Воп. 9. – Спр. 483.

2. Пяць гадоў працы «Шляху моладзі» (16.II.1929 – 16.II.1934) // Шлях моладзі. – 1934. – № 2. – С. 4–9.

3. Moroz, M. «Krynica». Ideologia i przywódcy białoruskiego katolicyzmu / M. Moroz. – Białystok, 2001. – 230 s.

4. Цыпрыяновіч, С. Беларуская друкарня імя Францішка Скарыны ў Вільні (1926–1940) / С. Цыпрыяновіч. – Лёндан, 1991. – 32 с.

5. Пецюкевіч, М. У пошуках зачараваных скарбаў / М. Пецюкевіч. – Вільня, 1998. – 182 с.
6. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (далей – НАРБ). – Фонд 242п: Прадстаўніцтва ЦК КПЗБ. – Воп. 1. – Спр. 229.
7. Летапіс Беларускага Студэнцкага Саюзу пры Ўнівэрсытэце Сцяпана Батуры ў Вільні // Студэнцкая Думка. – 1935. – № 1. – С. 24–31.
8. Найдзюк, Я. Беларусь учора і сяньня / Я. Найдзюк, І. Касяк. – Мінск, 1993. – 414 с.
9. НАРБ. – Фонд 242п: Прадстаўніцтва ЦК КПЗБ. – Воп. 1. – Спр. 435.
10. Малецкі, Я. Праўда пераможа / Я. Малецкі // Шлях моладзі. – 1934. – № 7–8. – С. 10–11.
11. Mironowicz, E. Białorusini i Ukraińcy w polityce obozu piłsudczykowskiego / E. Mironowicz. – Białystok, 2007. – 294 s.
12. Багдановіч, Я. На жыццёвым шляху: Успаміны / Я. Багдановіч. – Мінск, 1992. – 144 с.
13. Найдзюк, Я. Ці змянілася што? / Я. Найдзюк // Шлях моладзі. – 1935. – № 6. – С. 7–8.
14. Mendelsohn, E. Żydzi Europy Środkowo-Wschodniej w okresie międzywojennym / E. Mendelsohn. – W-wa, 1992. – 356 s.
15. Лакер, В. История сионизма / В. Лакер. – М., 2000. – 846 с.
16. НАРБ. – Ф. 242п: Прадстаўніцтва ЦК КПЗБ. – Воп. 1. – Спр. 299.
17. Najnowsze dzieje żydów w Polsce (w zarysie do 1950 roku) / J. Adelson [i in.]; pod red. J. Tomaszewskiego. – W-wa, 1993. – 500 s.
18. НАРБ. – Фонд 242п: Прадстаўніцтва ЦК КПЗБ. – Воп. 1. – Спр. 445.

Т. В. Лисовская

Брестский государственный технологический университет

ПОЛИТИЧЕСКАЯ ПОЗИЦИЯ НЕОПРОТЕСТАНТСКИХ ОРГАНИЗАЦИЙ ЗАПАДНОЙ БЕЛАРУСИ И ИХ СОТРУДНИЧЕСТВО С БЕЛОРУССКИМ НАЦИОНАЛЬНЫМ ДВИЖЕНИЕМ В 20–30-х ГОДАХ XX в.

Официальная политическая позиция и концепция взаимоотношений евангельско-баптистских организаций с государственными властями была задекларирована в резолюции Всемирного Конгресса баптистов в 1923 г. в Стокгольме, в котором участвовали представители белорусских общин Л. Дзекуц-Малей, П. Городищ

и др. Резолюция провозглашала обязательство евангельских христиан-баптистов соблюдать полную лояльность к государству и его законам [1, s. 86].

Белорусские общины баптистов и евангельских христиан приняли положения данной резолюции и их политическая позиция заключалась в полной поддержке польских государственных властей. Лояльность в отношении государства подчеркивалась в проповедях и учениях, во время проведения конференций и съездов руководители организаций приглашали представителей местных властей к участию в мероприятиях, направляли приветственные телеграммы в адрес президента, правительства, воеводских управлений. Так, на съезде Объединения Церквей Христовых евангельского вероисповедания в 1934 г. в Кобрине с приветственным словом выступил представитель городского управления [2, л. 19].

Одним из конфликтных вопросов в отношениях протестантских организаций и государства были антимилитаристские принципы протестантских движений. Отказ от службы в армии с оружием в руках призывников-протестантов [3, л. 46], антимилитаристская пропаганда классифицировались органами государственной власти как антигосударственная деятельность. В соответствии с резолюцией Стокгольмского конгресса, Всероссийский съезд баптистов в декабре 1923 г. принял резолюцию, в которой была выражена официальная позиция по данному вопросу: «Съезд, в соответствии с единодушным мнением участников, принимает обязательство исполнять гражданские обязанности». Но при этом съездом было оставлено право каждому члену общины определять свое отношение к военной службе в соответствии со своей совестью [1, s. 186]. Баптистские организации полностью поддержали прогосударственную позицию и на съезде Союза славянских общин евангельских христиан и баптистов в сентябре 1924 г. выступили с заявлением, в котором указывалось: «Ни один враг не принес нашим общинам столько вреда, сколько привилегии, которые притягивают нежелательные элементы, компрометируя истинно верующих. Имеем же отвагу обратиться к нашим верующим с верой, что можем и должны служить в армии с оружием в руках» [4, л. 75].

Евангельские христиане во главе с Л. Шендеровским придерживались более консервативных позиций в данном вопросе, однако и они шли по пути сглаживания конфликтов с государственными властями. В 1924 г. Л. Шендеровский подписал обязательство не принимать в общины солдат действительной службы и отказывался от антимилитаристской пропаганды в армии [5, s. 48].

Другие направления неопротестантского движения Западной Беларуси также шли по пути ликвидации конфликтов с государственными властями в вопросе исполнения воинской повинности: так, пресвитер общины христиан веры евангельской Д. Пугач подписал декларацию, обязывающую не агитировать против исполнения гражданских обязанностей [6, л. 4]. Религиозная концепция адвентистов седьмого дня изначально предполагала службу в армии с оружием в руках.

В связи с концепцией лояльности к государству политическая активность неопротестантского движения Западной Беларуси была очень низкой, члены общин, за редким исключением, не вступали в политические партии. Наблюдения органов полиции за протестантским движением показали аполитичность членов общин. В отчете госполиции Белостоцкого округа за ноябрь 1924 г. отмечается, что члены баптистских общин «...к большевистской агитации относятся враждебно, отношение к польской государственности, наоборот, лояльное... Руководители на хорошем счету» [4, л. 49, 61]. Во время выборов 1931 г. Союз славянских общин евангельских христиан и баптистов распространял пасторское воззвание Л. Шендеровского, в котором он призывал голосовать за правящую партию (список № 1) [7, л. 56]. Хотелось бы тут отметить, что в то же время Б. Тарашкевич в своем воззвании призывал «Ни одного голоса за список № 1 – фашистский список, под которым идут правые силы, притеснители рабочих!» [4, л. 101].

Были выявлены только единичные случаи агитации членами общин пятидесятников и евангельских христиан в духе-«малеванцев» против вступления в «Союз стрельцов» [8, л. 42] и «Союз сельской молодежи»: пресвитер общины евангельских христиан-

баптистов д. Турно Слонимского повета М. Абрамчук в январе 1935 г. выступал с высказываниями, депопуляризующими данные организации; на собрании баптистов в д. Завидчицы Пинского повета член общины А. Сахарчук негативно высказывался о деятельности правительства и об общественном строе Польского государства [9, л. 1]. Действующие в Пинском повете миссионеры христиан веры евангельской в 1939 г. настраивали молодежь против службы в армии с оружием в руках и выступали против вступления в прогосударственный «Кружок сельской молодежи», за что были подвергнуты административному наказанию [10, л. 10].

Несмотря на официальную прогосударственную позицию неопротестантских организаций, в течение межвоенного периода наблюдается тенденция к сближению некоторых направлений неопротестантизма с белорусским национальным движением. Активные связи с белорусским национальным движением поддерживали методисты и отдельные представители евангельских христиан-баптистов – П. Крашенин и Л. Дзекуц-Малей, который в 1918–1921 гг. сотрудничал с белорусскими национальными организациями: участвовал в создании «Грамады беларускай моладзі» в Гродно, в 1919 г. возглавлял Гродненскую школьную раду, был членом Варшавского отдела Белорусского национального комитета [11, s. 58], входил в Президиум Товарищества белорусских школ. В связи со своим участием в деятельности белорусских национальных организаций, Л. Дзекуц-Малей в 1921 г. был лишен права проведения религиозной деятельности, кандидатура П. Крашенина на место пресвитера баптистской общины в Гродно в 1923 г. по той же причине была отклонена [11, s. 49]. В то же время отдельные руководители национального движения были сторонниками протестантизма: в руководство БСРГ входили баптисты С. Рак-Михайловский и П. Мётла, методист Р. Островский и др. [12, с. 70].

С середины 1920-х годов начинается активное сотрудничество представителей национально-освободительного движения с методистами. При этом необходимо отметить, что деятельность методистов на западнобелорусских землях началась с подачи

Г. Левковича, который в начале 1920-х годов был секретарем Американского комитета методистов в Варшаве [12, с. 70]. По его инициативе некоторые белорусские деятели в 1925 г. вступили в переговоры с миссией в Варшаве по вопросу начала миссионерской деятельности в Западной Беларуси [13, s. 35]. Миссия методистов стала тесно сотрудничать с представителями белорусского национального движения: в состав Виленского американского комитета методистов вошли сенатор А. Власов, посол Б. Тарашкевич и В. Тарашкевич, председатели Варшавского Белорусского национального комитета А. Бильдзюкевич, пастор Недзведзкий и другие, с которыми поддерживал активную связь суперинтендант Виленской округи Э. Чемберс [14, л. 8]. Сторонниками методизма были также Р. Островский, К. Езавитов, С. Краневский [15, s. 36].

Основное внимание методисты уделяли распространению вероучения в среде национально ориентированной молодёжи. Миссия сотрудничала с Товариществом белорусских школ и взяла на себя финансирование интернатов для слушателей белорусских гимназий в Вильно, Клецке, Радошковичах и Слониме. Для руководства интернатом при открытой в 1922 г. гимназии в Радошковичах сенатор А. Власов пригласил из Познаньского воеводства методистку Е. Шахманову (E. Szachmanowa) в качестве инструктора методистской молодежи [16, s. 69]. По согласованию с директором Клецкой гимназии Г. Якубёнком пастор Д. Витт периодически проводил богослужения и молитвенные собрания для слушателей гимназии [17, л. 45]. После выхода распоряжения о закрытии Миссии методистов в 1924 г. обсуждался вопрос о переносе школы в Кларысеве на территорию Западной Беларуси. В ноябре 1924 г. сенатор А. Власов с двумя американскими учителями-методистами посетил свое имение Миговка в Радошковичской гмине, где предлагал разместить школу, для чего планировал передать часть своей земли [18, s. 352]. Данный проект не был реализован.

Для привлечения белорусской молодежи богослужения немногочисленных общин методистов проходили в основном на белорусском языке [19, л. 39]. Использованию белорусского языка

в богослужениях придавал особое значение Г. Левкович, который неоднократно выступал с предложениями об организации религиозных лекций на белорусском языке [20, s. 474]. Методисты издавали религиозную литературу на белорусском языке («Светач хрыстовае навукі» и др.). При поддержке Миссии методистов Л. Дзекуц-Малей совместно с А. Луцкевичем занялся переводом Нового Завета на белорусский язык. В 1931 г. при финансовой поддержке Британского и заграничного библейского общества были изданы белорусскоязычные Новый Завет и Псалтирь [21, с. 172]. Методисты организовывали религиозное обучение для членов белорусских организаций. Так, в 1927 г. Э. Чемберс и Д. Витт провели в Вильно «Курсы религиозного воспитания для кандидатов белорусской национальности», в которых участвовал 21 слушатель, большинство сторонников Громады [18, s. 501]. Сенатор А. Власов, А. Луцкевич и П. Волошин окончили методистские курсы в Варшаве [14, л. 8].

С методистами сотрудничали отдельные представители БХД и БСРГ. Редактор методистского журнала «Светач хрыстовае навукі» Я. Петровский был активным сторонником Громады, хадецкая «Белорусская Крыница» со статьями методиста Берняковича активно распространялась в общинах методистов [18, s. 552–553].

Сотрудничество Миссии методистов с представителями белорусского национального движения преследовало цель распространения вероучения при их поддержке в среде национально ориентированной белорусской молодежи и не преследовало каких-либо политических целей. Однако ставка методистов на развитие вероучения с чертами национального движения в Западной Беларуси не сработала, численность адептов методизма даже в центральных общинах при белорусских гимназиях в Радошковичах и Клецке не превышала нескольких десятков человек.

Полький историк О. Латышонок, анализируя сотрудничество методистов с лидерами белорусского национального движения, высказал предложение о вероятности выдвижения ими неопротестантизма как национальной церкви. Однако учитывая аполитичность методизма как религиозной организации, немногочисленность общин методистов, отсутствие даже разработок

общей политической платформы, сотрудничество с методистами характеризовалось скорее как взаимодействие на личностном уровне, через отдельных представителей, чем как целенаправленная стратегия по выдвижению новой религиозной «белорусской» идеологии. Немаловажное значение в сотрудничестве имел так же финансовый потенциал Миссии, с помощью которого появилась возможность проводить образовательные и культурно-просветительские программы.

Таким образом, новые протестантские организации Западной Беларуси стояли на позиции лояльности к государству, что было обусловлено идеологическими установками (подчинением государственным властям), а также необходимостью правового урегулирования своего положения и стремлением к закреплению на данной территории. Кроме того, после переворота 1926 г. протестантские организации рассчитывали, что санационные правительства смогут лучше обеспечить права религиозных меньшинств, нежели национально-католические правительства. Стремясь к урегулированию своего правового положения в польском государстве, протестантские организации, в особенности ССОЕХ, проводили проправительственную политику. Связи с белорусским национальным движением поддерживали только отдельные члены общин и Миссия методистов.

Крыніцы і літаратура

1. Archiwum Akt Nowych w Warszawie (dalej – AAN). – Ministerstwo Wyznań Religijnych i Oświecenia Publicznego. Referat wyznań ewangielickich. – Sygn. 1444: Sekty – ewangieliczni chrześcianie i baptyści. Różne. – Cz. II. – T. III.

2. Государственный архив Брестской области (далее – ГАБО). – Фонд 1. – Оп. 2. – Д. 2353: Переписка с камень-коширским старостой о религиозной секте евангелистских зеленопраздных крестьян и списки членов сект (май 1927 г.).

3. ГАБО. – Фонд 67. – Оп. 1. – Д. 1824: Отчеты полесского воеводы об общественно-политическом движении за май–декабрь 1931 г.

4. Там же. – Д. 1570: Отчеты новогрудского воеводы об общественно-политическом движении за март–апрель 1930 г.

5. AAN. – Ministerstwo Wyznań Religijnych i Oświecenia Publicznego. Referat wyznań ewangielickich. – Sygn. 1413: Sprawy ogólne: wykazy sekt, ruch sektancki, sprawozdania wojewódzkie (1924–1938).

6. ГАБО. – Фонд 1. – Оп. 2. – Д. 2340: Дело о ликвидации американской методистской миссии в Польше.

7. Там же. – Фонд 67. – Оп. 1. – Д. 951: Отчеты белостоцкого воеводы об общественно-политическом движении за сентябрь–декабрь 1928 г.

8. Там же. – Фонд 1. – Оп. 10. – Д. 2539: Информация об агитации баптистов против вступления в Союз стрельцов (3 июня 1935 г.).

9. Там же. – Фонд 2003. – Оп. 2. – Д. 1200: Руководящие указания ПВУ об учете церквей, религиозных союзов и списки последних (1929 г.).

10. Там же. – Фонд 1. – Оп. 10. – Д. 2282: Циркуляры и информации полесского воеводы о деятельности Английской Барбиканской миссии.

11. AAN. – Ministerstwo Wyznań Religijnych i Oświecenia Publicznego. Referat wyznań ewangielickich. – Sygn. 1443: Sekty – ewangieliczni chrześcianie i baptyści – sprawy różne w układzie chronologicznym. – Cz. 1. – T. III.

12. Латышонок, О. Беларускія палітыкі й пратэстанты. Ад «Гомана» да Грамады / О. Латышонок // Спадчына. – 2003. – № 1. – С. 69–71.

13. Borowiak, J. Kościół Ewangelicko-Metodystyczny w Polsce / J. Borowiak. – W-wa, 1999. – 168 s.

14. ГАБО. – Фонд 95. – Оп. 1. – Д. 378: Информационные сообщения о гражданах, заподозренных в коммунистической деятельности (1938 г.).

15. Latyszonok, O. Białoruski ruch narodowy a protestantyzm w II Rzeczypospolitej / O. Latyszonok // Społeczeństwo Białoruskie, Litewskie i Polskie na Ziemiach Północno-Wschodnich II Rzeczypospolitej; pod red. M. Gizewskiej. – W-wa, 1995. – S. 33–40.

16. AAN. – Ministerstwo Wyznań Religijnych i Oświecenia Publicznego. Referat wyznań ewangielickich. – Sygn. 1412: Sekty, sprawy ogólne – wykazy sekt, ruch sektancki, sprawozdania wojewodskie.

17. ГАБО. – Фонд 2. – Оп. 1. – Д. 752: Отчеты брестского поветового старосты о деятельности религиозных сект и списки последних.

18. AAN. – Ministerstwo Wyznań Religijnych i Oświecenia Publicznego. Referat wyznań ewangielickich. – Sygn. 1453: Misje i stowarzyszenia zagraniczne w Polsce.

19. ГАБО. – Фонд 67. – Оп. 1. – Д. 859: Отчеты ДОК IX и воинских частей об общественно-политическом движении на территории корпуса.

20. AAN. – Urzód Wojewódzki Wilenski. – Sygn. 1: Sprawozdania miesięczne i tygodniowe z legalnego ruchu społeczno-politycznego i mniejszości narodowych od 02.12.1929 do 09.12.1930 r.

21. Пікарда, Г. Нябеснае полымя. Досьлед пачаткаў беларускага перакладу Новага Запавету і Псальмаў (1931) / Г. Пікарда // Спадчына. – 1995. – № 4. – С. 152–175.

Т. А. Лугачева

Гродненский государственный университет им. Янки Купалы

ИНТЕРНАЦИОНАЛЬНЫЕ СВЯЗИ МЕЖДУНАРОДНОЙ ОРГАНИЗАЦИИ ПОМОЩИ РЕВОЛЮЦИОНЕРАМ ЗАПАДНОЙ БЕЛАРУСИ В 1924–1939 гг.

В деятельности Международной организации помощи революционерам (далее – МОПР), в том числе и Западной Беларуси, большое значение имела солидарность.

На заседаниях ЦК, конференции МОПРа Западной Беларуси в марте 1928 г. и других неоднократно ставилась задача знакомить рабочих и крестьян с борьбой трудящихся за рубежом, международным мопровским движением, говорилось о необходимости поднятия в прессе и сеймовой трибуне вопроса об издевательствах над политзаключенными в других странах. Важную роль в решении этой задачи сыграла печать МОПРа Западной Беларуси.

Мопровцы Западной Беларуси приняли участие в кампании солидарности с бастующими английскими горняками в 1926 г. Шахтеры продолжали забастовку в течение восьми месяцев. Мопровские организации Западной Беларуси посылали письма к английским горнякам, собирали денежные средства, политзаключенные делали пожертвования из мопровских средств для оказания помощи бастующим шахтерам.

Трудящиеся Польши и Западной Беларуси приняли участие в международной мопровской кампании в защиту профсоюзных активистов Н. Сакко и Б. Ванцэтти, приговоренных американским судом по ложному обвинению в убийстве к смертной казни. Организовывались забастовки, демонстрации. Мопровские организации посылали телеграммы по поводу суда над Сакко и Ванцэтти. Голос протеста подняли и политзаключенные ряда тюрем [1].

Большое значение в истории МОПРа имела международная мопровская кампания за спасение 9 негритянских юношей из Скотт-

сборо (США), продолжавшаяся несколько лет. Кампания нашла отклик и в печати МОПРа Западной Беларуси [2].

Мопровские организации сыграли важную роль и в проводимой под руководством Коминтерна международной кампании в защиту жертв германского фашизма. Наиболее значительным проявлением ее была борьба против Лейпцигского процесса и за освобождение Э. Тельмана и тысяч немецких революционеров.

Летом 1933 г. МОПР провел неделю интернациональной солидарности с жертвами германского фашизма. ЦК МОПРа Западной Беларуси в своей листовке напечатал обращение Клары Цеткин к мопровцам всего мира, в котором она охарактеризовала разгул террора в Германии [3, л. 43]. Повсеместно прошли многолюдные демонстрации и митинги протеста против зверств нацистов, сборы средств в пользу жертв фашистского террора. Мопровские организации широко пропагандировали героическую борьбу Г. Димитрова с немецким фашизмом на Лейпцигском процессе. Наивысшего размаха кампания в защиту жертв фашистского террора в Германии достигла в 1934–1935 гг. Важным пунктом в ней было проведение международных тельмановских дней в июле в 1934 и 1935 г. при активном участии мопровских секций. ЦК МОПРа Западной Беларуси выпустил на польском языке в июле 1934 г. специальный номер газеты «Czerwona Pomoc» [4]. Под лозунгом освобождения Э. Тельмана состоялись сотни и тысячи массовок, митингов, демонстраций и забастовок. Создавались комитеты защиты Э. Тельмана.

В августе 1934 г. состоялась демонстрация около 500 крестьян Берестовицкой гмины. На митинге крестьяне решительно протестовали против режима оккупации, национального гнета, требовали ликвидации концлагерей, освобождения Э. Тельмана и всех антифашистов. Жители деревень Огородники и Туполы Новогрудского повета, собравшись на митинг, единодушно осудили политику террора и потребовали освобождения Э. Тельмана. Затем они с красными флагами и пением «Интернационала» направились в соседние деревни [5, с. 358]. В Вильно в 1934 г. по инициативе окружкома МОПРа состоялась массовка транспортников, на которой был избран комитет защиты Тельмана и принята резолюция с требованием его освобождения [6, с. 282].

Для объединения трудящихся в борьбе с террором в Польше и Германии ЦК МОПРа Западной Беларуси использовал приезд в 1935 г. Международной антифашистской делегации, издал воззвание [7, с. 337].

Кампания за освобождение Тельмана и других антифашистов приобретала все более широкие размеры. Трудящиеся вывешивали плакаты, расклеивали и разбрасывали листовки с требованием освободить Э. Тельмана и всех политзаключенных. Резолюции с требованием освобождения Э. Тельмана посылались в немецкое консульство [8]. На Новогрудчине только на протяжении четырех месяцев 1935 г. было проведено 130 собраний и митингов с участием 2 тыс. человек [5, с. 335].

МОПР Западной Беларуси активно выступил в защиту республиканской Испании. Международное движение солидарности с республиканской Испанией возглавил Коминтерн. Были определены важнейшие формы помощи: посылка добровольцев, сбор средств, политическая работа в массах, привлечение к делу помощи международных демократических организаций. Под руководством МОПРа была проведена кампания новогоднего (елочного) подарка испанским детям. Мопровцы собирали также детскую одежду и отправляли в Испанию [9, л. 33].

По всей Западной Беларуси прокатилась волна митингов, собраний, демонстраций солидарности с испанским народом. На рабочих, крестьянских собраниях, в профессиональных союзах принимались резолюции солидарности и протеста. 10 января 1937 г. в Вильно состоялось рабочее собрание, созванное окружным советом 333. Присутствовало 650 человек. На собрании была принята резолюция солидарности с народом Испании, борющимся против фашизма. Требования поддержки республиканской Испании звучали и на первомайских демонстрациях 1937 г. Из поляков-добровольцев в Испании была создана интернациональная бригада им. Ярослава Домбровского.

Важное значение имела деятельность МОПРа Западной Беларуси по вовлечению трудящихся в антивоенное движение в защиту СССР. МОПР проводил значительную работу по пропаганде внешней политики СССР, осуждению политики II Речи Посполи-

той, военных приготовлений. Призывы КПЗБ, МОПРа находили живой отклик у трудящихся. Особенно активно антивоенные выступления проходили в Международный день борьбы против войны 1 августа (праздновался с 1929 г.). Трудящиеся отказывались платить налоги на военные цели, выступали против шарварок, росли антивоенные настроения среди солдат.

МОПР стремился вовлечь в антивоенное движение как можно более широкие слои. В отчете ЦК МОПРа Польши за период с 01.10 по 31.12.1936 г. указывалось, что по инициативе КПП, МОПРа были созданы комитеты борьбы за мир, в которые пытались привлечь и ППС. Указывалось на целесообразность вовлечения в эту работу хадеков и католических элементов [10, л. 1, 2]. В 1937 г. в Белостоке, Гродно, Вильно, Слониме, Барановичах, Лиде, Бресте и других местах состоялись крупные единофронтовые первомайские демонстрации, которые проходили под лозунгами борьбы против антинародной внешней и внутренней политики «санации» [5, с. 333–341, 368].

Деятельность по привлечению трудящихся к участию в международных мопровских кампаниях в защиту жертв террора в разных странах, организации антивоенного движения в защиту СССР стала важным средством укрепления солидарности в борьбе за демократию, сыграла большую роль в формировании традиций общедемократического и антивоенного движения, явилась вкладом в достижение сдерживания фашизации режимов, в формирование реформистских тенденций в политике правительств.

Одним из важнейших средств укрепления интернациональной солидарности была помощь со стороны мопровских организаций зарубежных стран, в первую очередь СССР, МОПРу Западной Беларуси в деле борьбы с антидемократическим режимом и помощи его жертвам. Эта помощь осуществлялась по следующим направлениям: международные мопровские кампании, шефство над политзаключенными Западной Беларуси, патронатское движение, помощь политическим эмигрантам из Западной Беларуси.

Жестокие расправы польского правительства над рабоче-крестьянским движением в Западной Беларуси, тяжелое положение политзаключенных в польских тюрьмах вызывали протест

у прогрессивных людей всех стран. Летом 1926 г. мопровские секции многих стран организовали кампанию протеста против террора правительства Пилсудского. Так, Анри Барбюс, французский писатель, издал гневное воззвание протеста. 2 октября 1926 г. в Чикаго состоялся массовый митинг против террора в Польше [11, л. 53]. Большого размаха достигла в 1926 г. кампания за амнистию политзаключенных в Польше. Был создан французский комитет борьбы за амнистию в Польше, в котором принимали участие Северин, Анри Барбюс, госпожа де Сен-При, Магдалена Маркс, Леон Базальтет, Анри Торрес и др. Издавались воззвания, в которых отмечалось истинное положение политических заключенных [12, л. 316]. 6 августа 1926 г. протест против террора в Польше выразили выдающиеся германские ученые, литераторы, художники и политические деятели Эйнштейн, Кольвиц, Курт, Розенфельд, Эгон, Эрвин, Киш и др. [13, л. 33].

В 1927 г. была проведена широкая международная кампания против разгрома рабоче-крестьянских организаций в Польше и Западной Беларуси. Особенно активно она проходила в Советском Союзе, в том числе Советской Беларуси. Здесь одновременно была организована и кампания помощи политзаключенным и голодающим в Западной Беларуси. Волна протестов против политики польских властей в Западной Беларуси докатилась до самых глухих уголков Советской Беларуси. Трудящимися Советской Беларуси во время кампании было собрано 68000 рублей [14, л. 585, 586; 1].

Во многих городах Европы происходили рабочие митинги, на которых выносились резолюции протеста против террора в Польше. Протестовали рабочие в Канаде, белорусские организации в Чехословакии, Латвии и Литве. Коммунистические фракции в Германии, Франции, Бельгии послали польскому правительству протест против массовых арестов, арестов послов и разгрома рабоче-крестьянских организаций. Так, по данным газеты «Бальшавік», только в Канаде в 1927 г. состоялось свыше 35 митингов протеста против репрессий в Западной Беларуси, под резолюциями протеста были собраны десятки тысяч подписей. В Англии депутаты парламента, «друзья» рабочей партии под-

няли широкую кампанию против погромной политики правительства в Польше.

Особый размах приобрела эта кампания в связи с процессом над послами и ЦК Белорусской крестьянско-рабочей Громады. В январе 1928 г. Исполком МОПРа издал воззвание по поводу процесса над Белорусской Громадой в Польше. Мощная волна солидарности в защиту Громады, против жестокого террора, царившего в Западной Беларуси, прокатилась в городах и селах СССР, и в первую очередь, в БССР. Везде созывались собрания и выносились резолюции протеста, а также проводился сбор денег. Возглавлял эту кампанию в БССР комитет защиты Громады. Председателем комитета был народный поэт Белоруссии Янка Купала, членами – народный поэт Белоруссии Якуб Колас, ректор БГУ В. И. Пичета и другие видные общественные деятели БССР. В ходе процесса над Громадой (февраль–май) газеты «Звязда» и «Советская Белоруссия» опубликовали сотни резолюций протеста [15].

Секция МОПРа в США (международная защита труда) создала комитет борьбы с польской реакцией, провела демонстрации у зданий польских консульств. Видный участник революционного движения в Польше Д. Боген побывал в 28 городах США, выступал с информацией о репрессиях в Польше, о процессе над Громадой. В Париже по инициативе Красной помощи 1 июня 1928 г. состоялся массовый митинг, на котором была избрана делегация для вручения польскому посольству протеста против процесса над членами Громады и послана телеграмма протеста Пилсудскому [16].

Канстытуцыя Польшчы 1921 г. фармальна абвяшчала прынцыпы свабоднай эміграцыі. Аднак да 1927 г. дзяржаўная эміграцыйная палітыка дзяржавы не была заканадаўча аформлена, а на практыцы выкарыстоўваліся прававыя нормы нямецкага закону аб эміграцыі ад 09.06.1897 г., аўстыйскага права ад 21.01.1897 г., параграфы крымінальнага кодэксу Расіі ад 1903 г., якія вызначалі меры пакаранняў за нелегальную эміграцыю і яе спрыянню [4, с. 6].

Працэсы эміграцыі рэгламентавалі розныя дзяржаўныя ўстановы: Дзяржаўнае ўпраўленне па справах палонных, бежанцаў і работнікаў, Дзяржаўнае ўпраўленне пасрэдніцтва і апекі над эмігрантамі, Эміграцыйнае ўпраўленне і Дзяржаўная эміграцыйная рада.

11 кастрычніка 1927 г. прэзідэнт Польшчы І. Масціцкі падпісаў указ аб эміграцыі, які набыў статус эміграцыйнага закону. Гэты дакумент даў польскім уладам афіцыйную падставу для ўтварэння разгалінаванага эміграцыйнага апарату. Для ажыццяўлення пастаўленай мэты Міністэрства працы і сацыяльнай апекі 28 верасня 1928 г. выдала загад на адкрыццё экспазітуры Эміграцыйнага ўпраўлення ў Кракаве, Варшаве, Брэсце і Беластоку. Восенню 1929 г. быў утвораны Эміграцыйны сіндыкат, які сканцэнтраваў у сваіх руках адпаведную структурную сетку. У чэрвені 1932 г. прэзідэнт Польшы выдаў распараджэнне аб ліквідацыі Эміграцыйнага ўпраўлення і Дзяржаўнай эміграцыйнай рады. Быў таксама праведзены перадзел эміграцыйных функцый паміж Міністэрствам працы і сацыяльнай апекі і Міністэрствам замежных спраў. Міжміністэрская камісія, якая была ўтворана ў 1930 г. і загадвала эміграцыйным фондам, у 1932 г. пераўтварылася ў міжведамасную эміграцыйную камісію на чале з міністрам замежных спраў Польшчы. Рэарганізацыя эміграцыйнага апарату 1930-х гадоў дала польскім уладам магчымасць цалкам кантраляваць эміграцыйны рух на тэрыторыі Польшчы. Эміграцыйныя структуры, якія былі ўтвораны ў гэты перыяд, праіснавалі да пачатку Другой сусветнай вайны.

Улічваючы асаблівасці заходнебеларускага рэгіёна, урадавыя колы Польшчы надалі асаблівую ўвагу фарміраванню эміграцыйнага апарату на дадзенай тэрыторыі. Распараджэннем Рады міністраў Польшчы ад 20.06.1921 г. было створана Упраўленне пасрэдніцтва працы і апекі над эмігрантамі ў Брэсце. У Палескім ваяводстве кантроль за працэсамі эміграцыі ажыццяўляла Эміграцыйнае ўпраўленне пры дапамозе дзяржаўных упраўленняў пасрэдніцтва працы. У верасні 1928 г. распараджэннем міністра працы і сацыяльнай апекі была заснавана экспазітура эміграцыйнага ўпраўлення ў Брэсце, яна ажыццяўляла непасрэдны кантроль за эміграцыйным рухам на Палессі.

У структуры польскіх эміграцыйных органаў асаблівую ролю выконваў Варшаўскі эміграцыйны сіндыкат. У канцы 1930 г. Эміграцыйны сіндыкат меў 11 агентур у Валынскім ваяводстве, 7 – у Палескім, 5 – у Львоўскім.

У выніку дзейнасці польскіх афіцыйных улад і сусветных мараходных таварыстваў сотні тысяч беларусаў выехалі з Заходняй Беларусі на амерыканскі кантынент і ў еўрапейскія краіны. У эміграцыйных колах перавагу аддавалі краінам Паўднёвай Амерыкі, ЗША, Канадзе, Францыі, Бельгіі, Латвіі, Эстоніі і інш.

Асаблівасцю эміграцыі з тэрыторыі Заходняй Беларусі быў яе пераважна амерыканскі (пазаеўрапейскі) напрамак: Аргенціна, Бразілія, Уругвай, Парагвай, Мексіка, ЗША, Канада і інш. Калі па ўсёй Польшчы пазаеўрапейскі выезд складаў 29,3 % ад агульнай колькасці эмігрантаў, то па чатырох паўночна-ўсходніх ваяводствах гэты паказчык вагаўся ад 60 да 80 %. Для Заходняй Беларусі эміграцыя ў амерыканскія краіны была практычна адзінай формай эміграцыі, складаючы на працягу ўсяго міжваеннага перыяду не менш 85 % ад агульнай колькасці (у 1935 г. – 99,9 %) [5, s. 145].

У краінах пазаеўрапейскага напрамку ўмовы працаўладкавання і сацыяльнай адаптацыі былі даволі складанымі. Нярэдка здаралася так, што частка перасяленцаў доўгі час не магла знайсці працу, вынікам чаго было папаўненне маргінальных сацыяльных слаёў.

Найбольшую распаўсюджанасць сярод краін Паўднёвай Амерыкі набыла працоўная эміграцыя ў Аргенціну. У сувязі з гэтым для актыўнага ажыццяўлення падрыхтоўкі і транспарціроўкі беларускіх эмігрантаў у Баранавічах існавала аргенцінскае консульства.

Эміграцыя з Заходняй Беларусі была пераважна рабоча-сялянскай і насіла масавы характар. Вербавалі ў асноўным з ліку неадукаваных, фізічна моцных мужчын ва ўзросце ад 16 да 40 гадоў. Такі прафесійны склад беларускіх перасяленцаў сфарміраваў сферы дзейнасці эмігрантаў, якія ахоплівалі сельскую гаспадарку, вугальныя шахты, залатыя прыіскі і будаўніцтва чыгункі. Умовы жыцця і працы былі складанымі, заработная плата – ніжэй, чым у мясцовага насельніцтва. Як правіла, такая эканамічная міграцыя была масавай, таму нярэдка за мяжу выязджалі цэлымі сем'ямі.

У 20–30-я гады ХХ ст. пачынае распаўсюджвацца сезонная эміграцыя ў Латвію і Эстонію, дзе з другой паловы 1930-х гадоў

у сувязі з аграрнай рэформай узнік вялікі недахоп сельскагаспадарчых рабочых [6, арк. 14].

Як асобную з'яву патрэбна разглядаць эміграцыю яўрэйскага насельніцтва, значная частка прадстаўнікоў якога накіроўвалася на гістарычную радзіму – Палесціну. Эміграцыйныя працэсы ў Палесціну рэгламентаваў Палесцінскі аддзел у Варшаве, які быў утвораны сіяністамі і прадастаўляў дапамогу эмігрантам.

Вызначальнымі этапамі эміграцыі яўрэяў у Палесціну былі 1924–1925 і 1933–1937 гг. У першым выпадку павелічэнне хвалі перасяленцаў было выклікана фінансавымі рэформамі 1924 г. польскага ўрада. Цяжкае матэрыяльнае становішча яўрэйскага насельніцтва, сацыяльная і нацыянальная палітыка польскай дзяржавы прымусіла пакінуць Польшчу ў 1924 г. 5 695 яўрэяў, а ў 1925 г. – ўжо 16 983. Другая эміграцыйная хваля назіралася ў першай палове 1930-х гадоў, што было вынікам сусветнага эканамічнага крызісу і ўзмацнення ролі польскіх нацыяналістычных груповак.

Для паслуг эмігрантаў існаваў цэлы шэраг прадстаўніцтваў вядучых кампаній свету, якія ажыццяўлялі марскія пасажырскія перавозкі. З дазволу польскага ўраду на тэрыторыі Заходняй Беларусі дзейнічалі мараходныя таварыствы. Найбольш распаўсюджанымі былі прадстаўніцтвы англійскіх кампаній «Cunard Line», «White Star Line», «Royal Mail Line», «Nelson Line», галандскіх «Holland Amerika Lines», «Koninklijke Hollandsche Lloyd», французскіх «Chargeurs Reunis», «French Line», а таксама італьянскіх, канадскіх «Canadian Pasific Railway», дацкіх, бельгійскіх і польскіх «Linja Gdynia–Ameryka» [7, арк. 7]. Гэтыя таварыствы стварылі на заходнебеларускіх землях шырокую разгалінаваную сістэму эміграцыйнага апарату, які не меў аналагаў у еўрапейскіх краінах.

Нягледзячы на станоўчыя адносіны польскіх улад да працэсаў эміграцыі, не ўсе катэгорыі насельніцтва маглі свабодна выехаць за мяжу. Консульствам кожнай краіны ўезду вызначаліся адпаведныя крытэрыі для імігрантаў. Самым распаўсюджаным патрабаваннем было наяўнасць працоўнага кантракту і эміграцыйнага запрашэння. Сацыяльная адаптацыя эмігрантаў з Заходняй Беларусі была складанай на працягу ўсяго міжваеннага

перыяду. У большасці выпадкаў эмігрантам прыходзілася неаднаразова мяняць месца працы ці пасялення. Эміграцыя нават у далёкія краіны не заўсёды планавалася як пастаянная. Аднак на практыцы гэта не заўжды ўдавалася, і большасць тых, хто выехаў за мяжу, звычайна заставаліся там назаўсёды. Паводле афіцыйных даных польскіх улад, з 1927 да 1938 г. з Віленскага, Навагрудскага, Палескага і Беластоцкага ваяводстваў выехалі на сталае жыхарства ў іншыя краіны 97,6 тыс. чал. [1, с. 376].

Такім чынам, эміграцыя з тэрыторыі Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд насіла пераважна амерыканскі характар. Асноўнымі краінамі, куды накіроўваліся перасяленцы, былі Аргенціна, Бразілія, Уругвай, Парагвай, ЗША, Канада і інш. Аднак асобным напрамкам эміграцыйнага руху была Палесціна. У 1924–1925 і 1933–1936 гг. назіралася найбольшая колькасць эмігрантаў, што накіроўваліся ў гэтую краіну. Польскія эміграцыйныя ўлады арганізавалі сістэму сертыфікатаў і запрашэнняў для асоб, якія выязджалі ў Палесціну. Асноўнымі прычынамі эміграцыі яўрэйскага насельніцтва ў Палесціну былі наступныя: нацыянальная палітыка польскіх улад, цяжкае сацыяльна-эканамічнае становішча і ідэалагічная аснова – сіянізм. Пры афармленні эміграцыйных віз кожная краіна ўезду мела ўласныя патрабаванні. Акрамя таго, кожны эмігрант павінен быў у эміграцыйныя службы прадастаўляць медыцынскае пасведчанне, нярэдка такое пасведчанне мог выдаваць толькі ўрач Эміграцыйнага сіндыкату. Транспарціроўку эмігрантаў ажыццяўлялі прадстаўніцтвы сусветных мараходных кампаній.

Крыніцы і літаратура

1. Гісторыя Беларусі: у 6 т. – Мінск, 2006. – Т. 5: Беларусь у 1917–1945 гг. / А. Вабішчэвіч [і інш.]; рэдкал. М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – 613 с.
2. Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Брэста: у 2 кн. – Мінск, 1997. – Кн. 1. – 576 с.
3. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Фонд 242. – Воп. 2. – Спр. 620: Брашура Левіна «Рэвалюцыйны рух у Заходняй Беларусі. 1924–1925 гг.».
4. Кіпель, В. Беларусы ў ЗША / В. Кіпель. – Мінск, 1993. – 135 с.
5. Tomaszewski, J. Z dziejów Polesia. 1921–1939: Zarys stosunków społeczno-ekonomicznych. – W-wa, 1963. – 208 s.

6. Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці. – Фонд 551. – Воп. 1. – Спр. 756: Перапіска з павятовым старастай аб выездзе рабочых на сезонную працу ў Латвію і Эстонію. 13 сакавіка 1931 г. – 16 верасня 1939 г.
7. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці. – Фонд 2082. – Воп. 1. – Спр. 8: Цыркуляры Эміграцыйнага сіндыкату аб эміграцыі ў розныя краіны Паўднёвай Амерыкі.

Н. Б. Нестерович

Институт истории Национальной академии наук Беларуси, Минск

ОСОБЕННОСТИ РАЗВИТИЯ ЭКОНОМИКИ ЗАПАДНОБЕЛОРУССКОГО РЕГИОНА В СОСТАВЕ ПОЛЬШИ В 1920–1930-е ГОДЫ

В 1913 г. накануне Первой мировой войны в Беларуси, которая являлась частью территории России, примерно 59 % национального дохода производилось в капиталистическом секторе экономики. Остальная часть произведенного национального дохода приходилась на мелкотоварный и патриархальный (натуральный) уклады [1, с. 10–11]. В период нахождения западнобелорусских земель в составе Польши в 1921–1939 гг. ведущая роль капиталистического уклада в их экономике, как и всей польской экономики, продолжала возрастать. На это, по сути, были направлены все хозяйственные преобразования, проводимые польским правительством прежде всего в сельском хозяйстве, где развитие капитализма тормозилось наличием крупного помещичьего землевладения, стимулировавшего в определенной мере развитие феодальных производственных отношений. Экономическая организация помещичьего хозяйства в Западной Беларуси характеризовалась соединением капиталистической и отработочной систем. Последняя применялась еще довольно широко, поскольку вынужденные идти работать к помещику малоземельные и безземельные крестьяне объективно были фактически полностью экономически зависимы от него.

Проведенные аграрные реформы уменьшили помещичье землевладение. В белорусских воеводствах Польши – Белостокском,

Виленском, Новогрудском и Полесском оно за 1921–1929 гг. сократилось примерно на 13 %, а в 1930-е годы – еще на 3,7 % [2, с. 252]. В результате некоторого его уменьшения и существенного увеличения землевладения сельской буржуазии были созданы условия для более быстрого развития капитализма в сельском хозяйстве. Однако оно по-прежнему тормозилось хотя и сократившимся, но остававшимся весьма значительным помещичьим землевладением, порождающим, как и ранее, земельный голод в бедняцких хозяйствах, число которых еще больше возросло. Если в 1921 г. бедняки составляли примерно 62 %, середняки – 30, зажиточные хозяева – 8 % западнобелорусского крестьянства, то к середине 1930-х годов – соответственно 79, 16 и 5 % [2, с. 254]. Кроме помещичьего землевладения отрицательно влияли на положение крестьянства, сдерживали прогрессивный процесс развития капитализма в сельском хозяйстве и такие сильно укоренившиеся пережитки феодализма, как чересполосица, сервитуты, шарварки.

Нараставшее обеднение западнобелорусской деревни негативно сказывалось не только на развитии производительных сил в сельском хозяйстве, но и на общеэкономическом развитии западнобелорусского региона, поскольку около 90 % населения (в Польше 63 %) было занято в аграрном секторе экономики [3, с. 474]. Промышленность занимала небольшое место в структуре экономики края. Составляя 24 % территории и 13 % населения Польши, край давал лишь около 3 % всей промышленной продукции страны [2, с. 243].

По мировым меркам, Вторая Речь Посполитая являлась государством со средним уровнем развития капитализма. Однако в 1921–1939 гг. существенно изменились внешние условия развития польской экономики. В результате усиления конкурентной борьбы большинство экономических связей с землями бывшей Австро-Венгрии и Германии, объявившей Польше таможенную войну, было разорвано. По политическим мотивам фактически полностью потерян рынок бывшей Российской империи (в 1938 г. доля СССР во внешнеторговом обороте Польши составляла менее 0,5 %). Данные обстоятельства значительно ограничивали воз-

можности ориентированных на экспорт отраслей польской экономики. К этому добавлялись узость внутреннего рынка, вытекавшая из аграрного характера региона, сложность процесса формирования единого хозяйственного механизма страны из экономики территорий, входивших на протяжении длительного времени в состав различных государств [4, с. 162–163, 170–171, 248–249, 264, 375; 5, с. 263; 6, с. 79–80]. Все это в значительной мере определило неравномерность, цикличность развития как западнобелорусской, так и всей польской экономики: на смену периодам некоторого подъема приходили периоды спада, депрессии, кризиса. В итоге к началу Второй мировой войны общий объем промышленного производства в западнобелорусских землях, как и в Польше в целом, так и не достиг уровня 1913 г., а сельскохозяйственного – лишь незначительно превзошел его [4, с. 163, 352, 367; 7, с. 13; 2, с. 244–249, 255–256]. В течение 1921–1939 гг. польская экономика топталась на месте, тогда как, например, Англия в 1937 г. увеличила производство промышленной продукции по сравнению с 1913 г. на 22 %, Германия – на 29, США – на 57 % [8, с. 10].

Особенно разительным было отставание Польши и входившей в ее состав Западной Беларуси по темпам развития экономики от советской Беларуси. Если общий объем продукции сельского хозяйства БССР к 1940 г. возрос по сравнению с 1913 г. также незначительно (на 1,7 %) [3, с. 474], то общий объем продукции промышленности – во много раз. В течение рассматриваемого периода республика из аграрной превратилась в индустриальную. В 1926–1927 гг. удельный вес промышленной продукции в валовой продукции всей экономики советской Беларуси составлял 24,4 %, а в 1937 г. – 73 %. В 1940 г. промышленная продукция БССР превысила уровень 1913 г. в 8,1 раза [9, с. 202; 10, с. 564], при этом промышленная продукция бывших белорусских воеводств Польши составляла лишь 10,3 %, в то время как население этих областей – примерно 39 % населения республики [11, с. 35]. В 1938 г. в БССР на душу населения было выпущено (в неизменных ценах 1926/27 г.) валовой продукции промышленности на сумму 400 руб., а в Западной Беларуси – 48 руб. [12, с. 99].

Польская экономика так и не смогла подняться выше среднего уровня развития. В 1935 г. свыше 90 % рабочих в Польше зарабатывали меньше установленного правительством прожиточного минимума, составлявшего для рабочей семьи около 60 злотых в неделю. Это средние для всей Польши цифры. Положение западнобелорусских рабочих было еще хуже, поскольку заработная плата их была значительно меньшей, чем в экономически более развитых центральных (этнических) районах Польши. В августе 1937 г. средний недельный заработок рабочего Варшавского воеводства составлял 32,8 злотого, Полесского – 17,8, Новогрудского – 13,3 злотого. Разница в заработной плате доходила до 64 %. Уровень потребления в Польше был невысоким, а в западнобелорусских землях еще ниже. Если в 1934 г. потребление сахара во всей Польше составило 8,94 кг, а в центральных воеводствах 10,2, то в западнобелорусских – 4,31 кг, металла – 5,17, 4,05, 1,59 кг соответственно, угля – 383,1, 340,9, 21,8 кг [13].

Таким образом, развиваясь в 1921–1939 гг. по капиталистическому пути, экономика западнобелорусского региона сохраняла существенные остатки феодально-крепостнических отношений, являлась преимущественно аграрной, что вместе с неблагоприятной для всей польской экономики внешней и внутренней коньюнктурой обусловливало крайне медленные темпы, застойно-депрессивный тип развития, существенное отставание от среднеразвитой экономики Польши и, тем более, высокоразвитых капиталистических стран, низкий уровень жизни большей части проживающего здесь населения. Другими словами, западнобелорусская экономика в течение всего этого периода имела черты, характерные для отсталых, зависимых государств. Сегодня историки попрежнему единодушны в этом. Спорным остается лишь вопрос насколько низким был уровень развития слаборазвитой западнобелорусской экономики.

Часть исследователей пытаются разрушить взгляды о колониальном или полуколониальном положении западнобелорусского региона в период его нахождения в составе Польши. В частности, стремится доказать, что «польское правительство не имело в отношении промышленности Западной Беларуси, как и страны

в целом, продуманной экономической политики и придерживалось принципов свободного предпринимательства, реагируя только финансовой политикой на изменение рынка». Элементы государственного вмешательства в развитие промышленности, планирования этого развития имели место только в 1936 г. (так называемый план Э. Квятковского).

Слабость западнобелорусской промышленности и сельского хозяйства являлась следствием отсутствия на территории региона денежных средств, достаточных для их развития. Не было денег и у польского правительства «по причинам в первую очередь экономическим: необходимость развития центральных промышленных районов, где существовали лучшие условия – сложившаяся инфраструктура, наличие денежных средств, близость к внутренним и внешним рынкам» [6, с. 79–80].

Частично с такими утверждениями можно согласиться, однако главную роль в тяжелом экономическом положении «восточных кресов», отставании их экономики от экономики этнической Польши, на наш взгляд, играли не объективные законы рынка и конкуренции, а вполне «продуманная» политика польских властей, которые рассматривали аннексированные западнобелорусские земли прежде всего и в основном как колониально-сырьевой придаток экономически более развитой Центральной Польши и сознательно ограничивали их развитие.

Именно сознательно, о чем свидетельствуют многочисленные конкретные ограничительные мероприятия польского правительства в отношении западнобелорусской промышленности. Например, в 1930 г. сумма государственных кредитов, выданных Польским банком в среднем на одно предприятие Виленского и Новогрудского воеводств, была в 4,1 раза меньше, чем на одно предприятие в самой Польше [2, с. 249]. Польское правительство преднамеренно сворачивало те отрасли промышленности западнобелорусского региона, которые могли подорвать монопольное положение польских производителей на местном рынке. В этих целях оно, например, запретило строить здесь какие-либо промышленные предприятия без специального на то разрешения, установило на государственных железных дорогах, с одной стороны, льготные тарифы

на вывоз из западнобелорусских воеводств сырья и ввоз промышленных товаров, а с другой – высокие тарифы на вывоз готовых изделий и ввоз сырья и топлива [14, с. 13; 15, с. 198]. В немалой степени поэтому тяжелая промышленность не получила в Западной Беларуси развития и фактически отсутствовала. Западнобелорусская экономика была сориентирована польскими властями преимущественно на добычу и переработку сырья и сельхозпродукции, а не на производство промышленных товаров. Основными отраслями промышленности Западной Беларуси являлись спичечная, бумажная, деревообрабатывающая, дрожжевая и стекольная.

На протяжении всего межвоенного периода польские официальные лица сами признавали, что правительственная политика нацелена на ограничение экономики западнобелорусского края. В 1929 г. директор департамента промышленности и торговли Виленского округа, характеризуя политику правящих кругов в Западной Беларуси, констатировал, что «властными структурами государства не сделано ничего, чтобы оживить хозяйственную деятельность «восточных кресов», наоборот, делается все для того, чтобы окончательно ее разрушить» [16, с. 19].

Даже когда 5 декабря 1935 г. вице-премьер польского правительства Э. Квятковский заявил о необходимости оживления западнобелорусской экономики для подъема польской промышленности, несерьезность этих намерений и формальность данного заявления были настолько очевидны, что сразу же вызвали иронические отзывы официальной прессы. Например, «Варшаўскі дзённік народовы» 10 декабря 1935 г. писал: «Мы сделали открытие, что в наших границах существуют две Польши – «А» и «Б», городская и деревенская, западная и восточная, сильно отличающиеся одна от другой в смысле капиталовложений, потребления, структуры всей жизни и т. д. Эти две части при некоторых условиях могли бы прекрасно дополнять одна другую, нужно только в Польше «Б» соответствующим образом похозяйничать. Это повлечет за собой инвестиционные расходы, но ведь каждая колония требует вложений раньше, чем она начнет давать прибыль» [17, с. 4]. Комментарии, как говорится, излишни. Тогда вещи и явления назывались своими именами.

Литература

1. Социально-экономические преобразования в Белорусской ССР за годы Советской власти. – Минск, 1970.

2. Экономическая история Беларуси. – Минск, 2004.

3. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. – Мінск, 2001. – Т. 6, кн. 1.

4. История Польши: в 3 т. – М., 1958. – Т. 3.

5. Краткая история Польши. – М., 1993.

6. Нечухрын, А. М. Этнасацыяльныя і палітычныя працэсы ў заходнім рэгіёне Беларусі ў 1921–1939 гг. / А. М. Нечухрын, Г. У. Васюк, М. М. Ганчароў [і інш.] // Этнасацыяльныя і культурныя працэсы ў заходнім рэгіёне Беларусі: гісторыя і сучаснасць: Матэрыялы рэсп. навук. канф., 5–6 снеж. 1997 г., Гродна. Гродна, 1998.

7. Наркевич, С. И. Промышленность Западной Белоруссии в период белопольской оккупации (1920–1939 гг.): автореф. дис. ... канд. экон. наук / С. И. Наркевич. – Минск, 1965.

8. Большая Советская Энциклопедия. – М., 1952. – Т. 11.

9. Игнатенко, И. М. Великий Октябрь в судьбах белорусского народа / И. М. Игнатенко. – Минск, 1987.

10. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. – Мінск, 1999. – Т. 5.

11. Малинин, С. Н. Экономика Белорусской ССР и перспективы ее развития / С. Н. Малинин, М. М. Иппа. – М., 1960.

12. Назаўсёды разам: Да 60-годдзя ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР. – Мінск, 1999.

13. Несцяровіч, М. Б. Заходняя Беларусь: жыццё без прыхарошвання / М. Б. Несцяровіч // Звязда. 2003. 17 верас.

14. Егоров, Г. Западная Белоруссия / Г. Егоров. – М., 1939.

15. Экономика Советской Белоруссии. 1917–1967. – Минск, 1967.

16. Коўкель, І. І. Эканамічнае становішча Заходняй Беларусі ў складзе Польшчы (1921–1939 гг.) / І. І. Коўкель // Праблемы ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР: Гісторыя і сучаснасць: Матэрыялы міжнар. навук.-тэарэт. канф., 17–18 верас. 1999 г., Мінск. – Мінск, 2000.

17. Информационный бюллетень по изучению Западной Белоруссии / АН БССР. – Минск, 1936.

А. І. Пашковіч

Брэсцкі дзяржаўны універсітэт імя А. С. Пушкіна

САЦЫЯЛЬНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ НАСЕЛЬНІЦТВА ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ Ў 20–30-я ГАДЫ XX ст. НА ПРЫКЛАДЗЕ КОСАЎСКАГА ПАВЕТА ПАЛЕСКАГА ВАЯВОДСТВА

У адпаведнасці з пастановамі Рыжскага мірнага дагавора ад 18 сакавіка 1921 г., тэрыторыя сучаснага Івацэвіцкага раёна, як і ўся Заходняя Беларусь, увайшлі ў склад польскай дзяржавы і ўтварылі Косаўскі павет, які 4 лютага 1921 г. быў далучаны да Палескага ваяводства. Згодна са статыстычнымі данымі, у 1921 г. на тэрыторыі Косаўскага павета пражывала 48 853 чал., з іх у гарадах (Косава, Ружаны) – 6 055 чал. (12,4 %), у сельскай мясцовасці – 42 798 чал. [1, s. 7–8]. За перыяд 1921–1924 гг. прыбыло з рэпатрыяцыі 12 911 чал. (большасць у 1921 і 1922 гг.), і такім чынам колькасць насельніцтва ў павеце вырасла на 26,5 % [2]. Паводле перапісу 1931 г., плошча Косаўскага павета складала 3561,4 км^2, на якой пражывала 83 696 чал. Нацыянальны склад насельніцтва быў наступным: беларусаў – 68 083 чал., палякаў – 8 456, украінцаў – 132, рускіх – 686, яўрэяў – 6 300, жыхароў іншых нацыянальнасцей – 39 [3, с. 86–87].

У першыя пасляваенныя гады ў Косаўскім павеце была цяжкая сацыяльна-эканамічная сітуацыя: гаспадарка была зруйнавана, адсутнічала элементарная інфраструктура, а вяртанне бежанцаў яшчэ больш пагоршыла санітарнае і харчовае пытанні. Стан, у якім знаходзіўся павет дакладна характарызуе пратакол пасяджэння гміннай рады ў Целяханах ад 27 чэрвеня 1920 г.: «Гмінная рада ў Целяханах у складзе старшыні, войта гміны А. Дулка, і 9 радных, у тым ліку намесніка войта К. Барысевіча і лаўніка С. Купрыянчыка, адзінагалосна пастанавіла: 1) прасіць сучасную ўладу аб адкрыцці ў мястэчку Целяханы як мага хутчэй фельчарскага пункта, які так патрэбны жыхарам гміны. У сувязі з недахопам прадуктаў харчавання, выкліканым ваеннымі разбурэннямі, насельніцтва гміны галадае, а ½ яго частка ахоплена рознымі

хваробамі. 2) На пасаду фельчара прызначыць Канстанціны Багдановіча, якому плаціць з гмінных сродкаў» [4].

На працягу ўсяго міжваеннага перыяду адчуваліся наступствы мінулай вайны. Сітуацыю не ўдалося выправіць і праз 10 год мірнага жыцця, тым больш, што ў першай палове 1930-х гадоў Польшча перажыла эканамічны крызіс. Стан аховы здароўя ў Косаўскім павеце заставаўся ўвесь час нізкі. Павет падзяляўся на чатыры ўрачэбныя раёны з цэнтрамі ў Святой Волі, Косаве, Івацэвічах і Целяханах, дзе знаходзіліся амбулаторыі. За наведванне іх бралася плата ў 1 злоты. Раённыя ўрачы вялі барацьбу з інфекцыйнымі захворваннямі, ажыццяўлялі санітарны агляд у школах, вялі прыём хворых у амбулаторыях. У 1932 г. урачэбнай практыкай у павеце займаліся 20 урачоў, з якіх 2 стаматолагі, 6 акушэрак, 1 ветэрынар [5, s. 197, 201, 203, 206]. У павеце дзейнічалі 2 бальніцы. Бальніца ў Косаве, пабудаваная ў 1922 г. Камітэтам па барацьбе з эпідэміямі, знаходзілася на ўтрыманні Косаўскага сейміка і была разлічана на 30 ложкаў. За лячэнне ў бальніцы бралася ў суткі ад 2 да 4,5 злотых. Бальніца ў Ружанах была разлічана на 19 ложкаў, а лячэнне каштавала яшчэ больш – 5–6 злотых у суткі. Бальніца была пабудавана ў 1872 г. яўрэйскай абшчынай, а ў 1923 г. перададзена Таварыству аховы здароўя [3, с. 92–93]. У павеце дзейнічалі толькі 3 паліклінікі і 3 аптэкі (у Косаве, Ружанах і Целяханах) [5, s. 190, 193].

Антысанітарныя ўмовы працы і быту, нізкі ўзровень аховы здароўя, матэрыяльная незабяспечанасць былі прычынамі высокай смяротнасці: у 1935 г. – 1 095 чал., з іх 274 немаўляты. Частымі былі эпідэміі інфекцыйных захворванняў: сыпнога тыфу, туберкулёзу і інш. [3, с. 92–93].

Становішча пагаршалі перыядычныя неўраджаі. Так, у канцы зімы – пачатку вясны 1932 г. у Косаўскім павеце, як і ў цэлым у ваяводстве, склалася цяжкая сітуацыя – у сувязі з неўраджаем папярэдняга года насельніцтва пачало галадаць. Згодна з пісьмом палескага ваяводы Яна Крахельскага да міністра ўнутраных спраў, дзеля аказання дапамогі галадаючаму насельніцтву Косаўскага павета ў сакавіку 1932 г. патрабавалася 21 т збожжа, якім ні павятовыя, ні ваяводскія ўлады не маглі забяспечыць [6].

Балючай праблемай усяго міжваеннага часу для павятовых улад было беспрацоўе. З кожным годам колькасць беспрацоўных павялічвалася, асабліва гэты працэс паскорыўся ў гады эканамічнага крызісу. Згодна з пастановамі Закона аб забеспячэнні на выпадак беспрацоўя, прынятага 18 ліпеня 1924 г., беспрацоўны павінен быў зарэгістравацца ў Дзяржаўным бюро пасрэдніцтва працы, дзе яму павінны былі запрапанаваць новае месца працы, а ў выпадку яго адсутнасці – прызначыць грашовую дапамогу. Умовай атрымання беспрацоўным дапамогі была яго праца на прадпрыемстве на працягу не менш чым 20 тыдняў перад звальненнем (у 1932 г. гэты тэрмін быў падоўжаны да 26 тыдняў), што значна памяншала колькасць забяспечаных – шмат людзей уладкоўваліся на сезонныя работы ці былі часткова занятыя. Сацыяльнае забеспячэнне па беспрацоўі распаўсюджвалася толькі на прадпрыемствы з колькасцю працоўных не менш за 5 чалавек. Беспрацоўны атрымліваў 30 % (адзінокі), 35–50 % (сямейны, у залежнасці ад колькасці членаў сям'і) папярэдняга заробку на працягу 13 тыдняў [7]. Дзеля аказання дапамогі беспрацоўным паўсюдна ў Польшчы, у тым ліку і ў Косаўскім павеце, пачалі ствараца мясцовыя камітэты Фонда працы[1]. У 1932/33 г. косаўскім камітэтам Фонда працы, які ўзначальваў павятовы стараста Станіслаў Воўк, беспрацоўным было раздадзена харчавання і грашовых дапамог на агульную суму 10 425 злотых. Норма мукі, якую магла атрымаць сям'я беспрацоўнага, складала 10 кг [8]. Адначасова пад кіраўніцтвам жонкі старасты Ірмы Воўк, якая была

[1] Фонд працы быў створаны, згодна з пастановай ад 16 сакавіка 1933 г., замест Фонда дапамогі беспрацоўным, які дзейнічаў з 23 жніўня 1932 г., дзеля аказання дапамогі асобам, якія не атрымлівалі дзяржаўных выплат па беспрацоўі. На чале Фонда працы стаяў міністр сацыяльнага забеспячэння. На месцах дзейнічалі ваяводскія і павятовыя камітэты Фонда працы, у склад якіх уваходзілі прадстаўнікі дзяржаўнай адміністрацыі, самакіравання, працадаўцы, прадстаўнікі грамадскіх арганізацый. Сродкі паступалі ад выплат камунальных саюзаў, дзяржаўных датацый, грамадскіх ахвяраванняў. У рамках дапамогі з Фонда працы беспрацоўны ў Палескім ваяводстве ў 1937/38 г. мог атрымаць 1,5–3 злотых. Аднак у большасці выпадкаў безадкладная індывідуальная дапамога выдавалася ў форме прадуктаў харчавання і трактавалася як пазыка, якую беспрацоўны павінен быў адпрацаваць на грамадскіх работах.

старшынёй павятовага аддзела Саюза жанчын грамадзянскай працы, праводзілася акцыя дапамогі дзецям.

Згодна з афіцыйнымі данымі, у сакавіку 1934 г. у павеце колькасць беспрацоўных складала 70 чал., з якіх 7 атрымлівалі сталую дапамогу з Фонда беспрацоўя[1], а пазасталыя карысталіся аднаразовай дапамогай з мясцовых камітэтаў Фонда працы [9]. У 1935 г. у павеце было зарэгістравана 125 беспрацоўных, з якіх толькі 78 атрымлівалі дапамогу, у 1936 г. налічвалася 200 беспрацоўных [3, с. 89].

Нягледзячы на разнастайнасць дзяржаўных мер, пераадолець беспрацоўе не ўдавалася. Польскі ўрад быў вымушаны звяртацца да шырокіх колаў грамадскасці. З 1936 г. пачалі стварацца ваяводскія, павятовыя і гмінныя камітэты зімовай дапамогі беспрацоўным. Як правіла, у склад камітэтаў уваходзілі ўплывовыя асобы, а на чале агульнапольскага камітэта стаяў міністр сацыяльнага забеспячэння Мар'ян Жындрам-Касцялкоўскі [10]. У Косаве дзейнічаў гарадскі камітэт зімовай дапамогі беспрацоўным. Старшынёй камітэта з'яўляўся бурмістр Адольф Сідаровіч. Акрамя яго ў склад праўлення камітэта ўваходзілі 18 чалавек, у тым ліку прадстаўнік таварыства «Caritas» ксёндз А. Ройша, праваслаўны свяшчэннік Б. Сямашка, а таксама чыноўнікі, гандляры і дробныя прамыслоўцы – яўрэі, заможныя мясцовыя сяляне [11]. У задачы камітэтаў зімовай дапамогі ўваходзілі збор сродкаў і размеркаванне іх сярод беспрацоўных.

Становішча тых, хто страціў працу было складаным, але і працаўладкаванне не гарантавала матэрыяльнага дабрабыту. Вялікая працягласць працоўнага дня, дрэнныя ўмовы працы, нізкая зарплата (у сярэднім 1,5 злотых у дзень для мужчын) выклікалі

[1] Фонд беспрацоўя быў створаны пры Міністэрстве працы і сацыяльнага забеспячэння дзеля выканання абавязку забеспячэння на выпадак беспрацоўя і пакрыцця звязаных з гэтым выдаткаў у адпаведнасці з Законам ад 18 ліпеня 1924 г. На месцах утвараліся акруговыя праўленні Фонда беспрацоўя, у склад якіх уваходзілі прадстаўнікі ад працоўных і працадаўцаў, органаў самакіравання на чале з кіраўнікамі дзяржаўных бюро пасрэдніцтва працы. Выкананнем абавязкаў, сталымі выплатамі па беспрацоўі займаліся акруговыя бюро Фонда беспрацоўя альбо гмінныя праўленні, ці бюро пасрэдніцтва працы.

сярод рабочых абурэнне, якое з цягам часу атрымала арганізаваную форму – забастоўкі. Забастовачны рух асабліва пашырыўся ў 1929–1934 гг. падчас эканамічнага крызісу. У 1934 г. з 9 чэрвеня па 17 ліпеня толькі ў Івацэвічах баставала 306 рабочых лесапільных заводаў, іх падтрымала 150 рабочых, якія працавалі на ўрэгуляванні ракі Грыўда [3, с. 89–90].

З мэтай аказання дапамогі непрацаздольным колам насельніцтва ў Касаўскім павеце быў створаны шэраг устаноў сацыяльнай апекі. У пачатку кастрычніка 1932 г. у павеце дзейнічала 8 апякунскіх арганізацый: Таварыства сяброў дзяцей у Косаве, Станцыя апекі над маці і дзіцём у Косаве, Станцыя апекі над маці і дзіцём у Івацэвічах, «Лінас-Хацэдэк» у Целяханах, павятовы аддзел Саюза ваенных інвалідаў у Косаве, Апякунская бацькоўская рада, аддзел Таварыства аховы здароўя яўрэйскага насельніцтва ў Ружанах, аддзел Таварыства апекі над яўрэйскімі дзецьмі-сіротамі ў Косаве, на ўтрыманні якога быў прытулак (у 1929 г. там знаходзілася 30 дзяцей) [12; 13]. У Нівах гміны Пескі косаўскім соймікам была створана спецыяльная ўстанова апекі над дзецьмі хворымі на туберкулёз і дзецьмі з аслабленым здароўем ва ўзросце 3–14 гадоў [14]. Відавочна, у 1930 г. ва ўстанове выхоўвалася 35 дзяцей (10 хлопчыкаў і 15 дзяўчынак) [15]. Станцыя апекі над маці і дзіцём у Івацэвічах займалася рэгістрацыяй дзяцей ва ўзросце да 2 год (у выключных выпадках – да 5 год), правядзеннем перыядычных медаглядаў немаўлят, прыгатаваннем і раздачай для іх малочных смесяў (платных і бясплатных), прадастаўленнем лекаў. Аплата паслуг станцыі складала 1 злоты ў месяц. Ад аплат вызваляліся незаможныя жанчыны, а таксама жанчыны, якія з'яўляліся членамі мясцовай Касы хворых [16]. У 1932/33 г. пад апекай станцыі знаходзілася 179 дзяцей, было выдадзена малочнага дзіцячага харчавання 25 364 л, у тым ліку 3 257 л бясплатна [16].

Сацыяльнае забеспячэнне ў Косаўскім павеце не адрознівалася ад сітуацыі ў іншых паветах ўсходніх ваяводстваў [17]. У першыя гады існавання незалежнай польскай дзяржавы дзейнасць па аказанні дапамогі насельніцтву была нескаардынаванай і мела выратавальніцкі характар. З часам наладжвалася адзіная дзяржаўна-

адміністрацыйная сістэма кіравання, выпрацоўваліся агульныя прынцыпы ў сферы сацыяльнага забеспячэння. Згодна з дэкрэтам Рэгенцыйнай рады, 3 студзеня 1918 г. было створана Міністэрства сацыяльнага забеспячэння і аховы працы. На працягу міжваеннага часу міністэрства некалькі разоў мяняла сваю назву, арганізацыйную структуру і кампетэнцыі. У 1932 г., пасля чарговых арганізацыйных змяненняў, міністэрства стала называцца Міністэрствам сацыяльнага забеспячэння. У канцы 1919 – пачатку 1920 г. пачалася арганізацыя ваяводскіх і павятовых інспектаратаў сацыяльнага забеспячэння, пераўтвораных пазней у аддзелы і рэфераты працы і сацыяльнага забеспячэння пры ваяводскіх упраўленнях і павятовых стараствах [18]. Ніжэйшым выканаўчым органам у сферы сацыяльнага забеспячэння былі сельскія гміны. Грамадзянін Рэчы Паспалітай набываў права на пастаяннае сацыяльнае забеспячэнне за кошт гміны ў тым выпадку, калі пражыў на яе тэрыторыі мінімум год. Калі грамадзянін такога права не меў, то гміна не магла яму адмовіць у сацыяльным забеспячэнні, аднак магла патрабаваць зварот коштаў ад той гміны, дзе раней пражываў гэты чалавек. Абавязкі гміны абмяжоўваліся індывідуальнай пазаўстаноўчай апекай. Наступным структурным элементам у рэалізацыі сацыяльнага забеспячэння з'яўляліся павятовыя камунальныя саюзы, якія былі абавязаны дапаўняць паслугі гмін дадзенага павета праз арганізацыю выхаваўча-апякунскіх устаноў (прытулкаў, сталовых, паліклінік і да т. п.).

Паводле Закона ад 16 жніўня 1923 г., сацыяльнае забеспячэнне акрэслівалася як «дзяржаўнае забеспячэнне элементарных жыццёвых патрэб асоб, якія пастаянна альбо часова ўласнымі матэрыяльнымі сродкамі ці ўласнай працай задаволіць іх не могуць, а таксама меры, накіраваныя на недапушчэнне вышэй акрэсленага становішча» [19]. Такім чынам, дзяржава гарантавала сацыяльнае забеспячэнне ўсім грамадзянам Польшчы, незалежна ад нацыянальнальнасці і сацыяльнага статуса. Пад паняццем «элементарных жыццёвых патрэб» разумелася: элементарныя харчовыя сродкі, бялізна, вопратка, абутак; адпаведнае жыллёвае памяшканне з ацяпленнем і святлом; неабходныя прылады і інструменты для прафесійнай працы; санітарна-гігіенічнае забеспячэнне;

аднаўленне страчанай здольнасці да працы, альбо яе паляпшэнне. Акрамя таго, паняцце «элементарных жыццёвых патрэб» уключала права на рэлігійна-маральнае, разумовае і фізічнае выхаванне дзяцей, а таксама дапамогу ў падрыхтоўцы моладзі да прафесійнай працы.

Непасрэдна за кошт дзяржавы ажыццяўлялася сацыяльнае забеспячэнне вузкага кола асоб, «у дачыненні да якіх дзяржава мела спецыяльныя абавязацельствы, і выкананне якіх выходзіла за рамкі магчымасцяў камунальных саюзаў» [20, s. 298]. А менавіта, права на сацыяльнае забеспячэнне з боку дзяржавы мелі толькі тыя асобы, якія трапілі ў стан, што патрабаваў апекі, у выніку дзеяння на карысць дзяржавы, у прыватнасці, ваенныя інваліды, ветэраны нацыянальных паўстанняў, асобы, якія змагаліся за незалежнасць Польшчы і былі рэпрэсіраваны царскім урадам, дзеці-сіроты, бацькі якіх загінулі падчас службы ў войску [21, s. 30–33].

Аднак рэалізаваць на практыцы задэклараваныя абавязацельствы было складана. Асноўны цяжар у выкананні сацыяльнага забеспячэння ўскладаўся на плечы мясцовых органаў самакіравання, фінансавыя магчымасці якіх былі абмежаваны. Трэба ўлічваць і тое, што фінансавыя выдаткі органаў самакіравання ўсходніх ваяводстваў на сацыяльнае забеспячэнне насельніцтва былі меншымі ў параўнанні з цэнтральнымі і заходнімі ваяводствамі. Напрыклад, у 1935/36 г. органы самакіравання ўсходніх ваяводстваў на сацыяльнае забеспячэнне прызначылі 2 811 тыс. злотых, у той час як у заходніх – 18 638 тыс. злотых [22, s. 219]. Суадносіны фінансавых выдаткаў на сацыяльнае забеспячэнне да агульных выдаткаў у асобных камунальных саюзаў былі розныя і ў залежнасці ад мясцовых патрэб складалі ад 3 да 13 % [20, s. 302]. У сувязі з недахопам фінансавых сродкаў органы самакіравання шырока выкарыстоўвалі дабрачыннасць насельніцтва і грамадскіх арганізацый, якія з'яўляліся элементам сістэмы сацыяльнага забеспячэння. Асабліва важную ролю грамадская ініцыятыва мела ў сацыяльнай апецы над дзецьмі. Большасць апякунска-выхаваўчых устаноў для дзяцей праводзіліся грамадскімі арганізацыямі.

Крыніцы і літаратура

1. Rocznik statystyki Rzeczypospolitej Polskiej. – W-wa, 1927.

2. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці (далей – ДАБВ). – Фонд 1. – Воп. 2. – Спр. 2001: Статыстычныя звесткі аб колькасці рэпатрыніраванага насельніцтва. – Арк. 1.

3. Памяць: Івацэвіцкі раён: гіст.-дак. хронікі гарадоў і р-наў Беларусі / рэдкал.: В. П. Касько [і інш.]. – Мінск, 1997. – 496 с.

4. ДАБВ. – Фонд 318. – Воп. 1. – Спр. 39: Пратакол пасяджэння гміннай рады аб адкрыцці фельчарскага пункта ў Целяханах, 1920 г. – Арк. 1.

5. Pierwszy informator województwa Poleskiego. Rok 1932. – Brześć nad Bugiem, 1932. – 534 s.

6. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 1. – Спр. 820: Перапіска са старостамі Касоўскага, Лунінецкага і Столінскага паветаў аб забеспячэнні галадаючага насельніцтва зернем, 1932 г. – Арк. 19.

7. Ustawa z dnia 18 lipca 1924 r. o zabiespiaczeniu na wypadek bezrobocia // Dziennik Ustaw Rzeczypospolitej Polskiej. – 1924. – N 67. – Poz. 650.

8. ДАБВ.– Фонд 1. – Воп. 5. – Спр. 364: Пратаколы пасяджэння Камітэта Фонда працы Косаўскага павета. – Арк. 2.

9. Тамсама. – Фонд 605. – Воп. 1. – Спр. 1: Дакладныя Косаўскага павятовага староства аб палітычным і грамадскім жыцці павета, 1934–1938 гг. – Арк. 31.

10. Пашковіч, А. Формы дапамогі беспрацоўным на заходнебеларускіх тэрыторыях Польшчы ў 1921–1939 гг. / А. Пашковіч // Filozoficzno-kulturowe i prawno-gospodarcze aspekty procesów integracyjnych w Europie Środkowo-Wschodniej / pod red. Z. Tomczonek. – Białystok, 2007. – S. 357.

11. ДАБВ. – Фонд 605. – Воп. 1. – Спр. 7: Спісы членаў гарадскога камітэта зімовай дапамогі беспрацоўным, 1937 г. – Арк. 1.

12. Тамсама. – Фонд. 1. – Воп. 5. – Спр. 261: Справаздача аб дзейнасці Таварыства апекі над яўрэйскімі дзецьмі-сіротамі і спіс устаноў Палескага ваяводства па апецы над непаўналетнімі і непрацаздольнымі (27.08.1931 – 31.01.1933 гг.). – Арк. 92.

13. Тамсама. – Воп. 1. – Спр. 111: Цыркуляр Міністэрства працы і сацыяльнага забеспячэння, штатны расклад Палескага ваяводскага ўпраўлення і перапіска з упаўнаважанымі Мінстэрства і павятовымі старостамі аб размеркаванні крэдытаў, 1929 г. – Арк. 10.

14. Тамсама. – Воп. 9. – Спр. 2659: Звесткі аб установах апекі над дзецьмі і моладдзю Палескага ваяводства за 1927 г. – Арк. 1.

15. Тамсама. – Воп. 5. – Спр. 511: Спісы дзяцей, якія знаходзіліся на ўтрыманні Кобрынскага сеймiка, перапіска з павятовымі аддзеламі сеймікаў аб коштах ўтрымання дзяцей у прытулках, 1928 г. – Арк. 23.

16. Тамсама. – Воп. 4. – Спр. 1240: Распараджэнні палескага ваяводы, статуты і справаздачы аб рэвізіі і дзейнасці ўстаноў апекі над маці і дзіцём (31.01.1931 – 1.12.1933 гг.). – Арк. 3.

17. Пашковіч, А. І. Сістэма сацыяльнага забеспячэння насельніцтва на далучаных да Польшчы заходнебеларускіх тэрыторыях (1921–1939 гг.) / А. І. Пашковіч // Вестн. Полоцкого гос. ун-та. Сер. А. Гуманитарные науки. – 2008. – № 1. – С. 34–42.

18. Archiwum Akt Nowych w Warszawie. Ministerstwo Opieki Społecznej. 1918–1939. Kompetencje i organizacja. Wstęp do inwentarza zespołu akt Ministerstwa Opeki Spolecznej z lat 1918–1939. – S. 1–10.

19. Ustawa z dnia 16 sierpnia 1923 r. o opiece społecznej // Dziennik Ustaw II Rzeczypospolitej Polskiej. – 1923. – N 92. – Poz. 726.

20. Polityka społeczna Państwa Polskiego (1918–1935). – W-wa, 1935. – 323 s.

21. Pomoc społeczna w Polsce / pod red. J. Staręgi-Piasek. – W-wa, 1985. – Cz. II. – 230 s.

22. Balcerek, M. Rozwój opieki nad dzieckiem w Polsce w latach 1918–1939 / M. Balcerek. – W-wa, 1978. – 391 s.

И. В. Полуян

Белорусский государственный технологический университет, Минск

СОЦИАЛЬНО-ЭКОНОМИЧЕСКОЕ ПОЛОЖЕНИЕ ЗАПАДНОЙ БЕЛАРУСИ В 1920–1930-е ГОДЫ

Исполняется 70 лет со времени воссоединения Западной Беларуси и Белорусской ССР. Это событие стало одним из важнейших в истории белорусского народа. Оно оставило неизгладимый след в памяти миллионов белорусов – живых свидетелей тех незабываемых дней. Территориальная и социальная консолидация открыли перед республикой новые возможности разностороннего прогресса.

Некоторые наши историки и политики вслед за своими западными единомышленниками пытаются всячески извратить подлинную суть этого исторического акта, поставив под сомнение его правомерность. Той же направленностью характеризуется пропагандистская кампания, развернутая в последнее время в Польше под лозунгом «За восстановление исторической справедливости».

При этом игнорируется та очевидная истина, что воссоединены были исконно белорусские земли (за исключением Белостока с прилегающим районом), абсолютное большинство населения которых составляли белорусы, силой оторванные в 1920 г. от своих

кровных братьев. Пренебрегается и тот непреложный факт, что воссоединение отвечало жизненным интересам и сокровенным чаяниям миллионов трудящихся Западной Беларуси, что оно явилось логическим следствием их мужественной борьбы за свое социальное и национальное освобождение.

В современных условиях, когда неизмеримо возрос интерес наших людей к своей истории, назрела необходимость в более полном осмыслении как самого факта воссоединения белорусских земель, так и предшествовавших ему событий. Мы внимательно вглядываемся в свое историческое прошлое, чтобы лучше разглядеть будущее.

В общественных кругах того времени под «Западной Беларусью» подразумевалась территория, охватывающая Виленское, Новогрудское, Полесское и частично Белостокское воеводства с преобладающим белорусским населением общей площадью около 112 тыс. км^2, на котором проживало в 1931 г. 4,6 млн, а в сентябре 1939 г. примерно 5 млн чел.

В условиях буржуазной Польши трудящиеся Западной Беларуси испытывали тяжелый социальный и национальный гнет, политическое бесправие, а также необузданный произвол чиновничества и полиции. Всячески сдерживалось экономическое и культурное развитие края. В промышленности преобладало мелкое полукустарное производство, занятое переработкой продуктов сельского и лесного хозяйства. Крупной промышленности практически не было. В 1928 г. на долю Виленского, Новогрудского и Полесского воеводств, составлявших 11 % населения и 24 % территории всей Польши, приходилось лишь 2 % общего объема промышленного производства. В 1931 г. здесь было занято только 1,5 % рабочих. На предприятиях с числом занятых свыше 20 чел. в 1937 г. насчитывалось лишь 15 тыс. рабочих. Постоянным явлением были недогрузки производственных мощностей и массовая безработица. Губительной для экономики края стала хищническая эксплуатация его природных ресурсов не только польским, но и иностранным капиталом.

В 1929–1933 гг. капиталистический мир поразил невиданный по своей остроте и масштабам экономический кризис. Экономика

большинства стран была отброшена на десятки лет назад. Кризис обнажил и еще более обострил все присущие капитализму противоречия.

Тяжелым прессом обрушился кризис на буржуазную Польшу. Он поразил все стороны не только хозяйственной, но и общественно-политической и духовной жизни страны. Вследствие общей отсталости польского государства, аграрного перенаселения, экономической и политической зависимости от иностранного капитала кризис сказался здесь с большей силой и был продолжительнее, чем в более развитых странах.

Если в капиталистическом мире в целом падение уровня производства достигло низшей точки в 1932 г., то в Польше «дно» было достигнуто только в марте 1933 г., когда производство составило 46,5 % от уровня 1929 г. Кризисное состояние польской экономики продолжилось фактически до 1935 г., что в значительной мере объяснялось затянувшимся аграрным кризисом. Уровень предкризисного 1928 г. промышленность перешагнула лишь в 1938 г.

В еще более тяжелом положении оказалась в годы кризиса экономика Западной Беларуси, что в известной мере стало следствием ее исторического прошлого. Еще в дооктябрьский период весь уклад ее хозяйственной жизни носил печать глубокой отсталости. Экономика, особенно сельское хозяйство, была опутана густой сетью пережитков феодализма. Доминировало натуральное хозяйство, затруднявшее капиталистическое развитие края.

Царское самодержавие сделало немало, чтобы затормозить экономический и социальный прогресс белорусских губерний. В системе общероссийского капитализма Беларусь была низведена до положения рынка сбыта промышленных товаров, поставщика сырья и дешевой рабочей силы для промышленных центров империи. Подобная политика, притом в ее худшем варианте, была продолжена новыми правителями края – правящими кругами буржуазной Польши.

Тяжелый урон нанесла народному хозяйству Беларуси, особенно ее западной части, Первая мировая война. Территория Западной Беларуси стала ареной опустошительных военных действий.

усугубили положение разрушения, вызванные гражданской войной. Из войны Западная Беларусь вышла израненной, разоренной. Требовались большие экономические усилия, действенная помощь, чтобы восстановить разрушенное, залечить раны войны и обеспечить дальнейшее развитие края.

Однако решение этих жизненно важных задач не входило в планы новых правителей Западной Беларуси. Правящие круги буржуазной Польши преследовали на захваченных землях иные цели. Они сделали немало, чтобы не только сохранить, но и еще более усилить экономическую и культурную отсталость так называемых восточных «кресов» (окраин). Экономическое участие государства в хозяйственном восстановлении Западной Беларуси почти целиком исчерпывалось строительством недостающих домов и подсобных помещений для нужд администрации, полиции и войск.

Незначительными были здесь и частные капиталовложения. Чувствуя непрочность польского господства, частные предприниматели не решались вкладывать свои капиталы на длительные сроки. А краткосрочные инвестиции, к тому же незначительные, не могли решить стоявшие перед краем серьезные экономические проблемы. Что касается местной буржуазии, то она была экономически слабой и не располагала сколько-нибудь значительным капиталом. Ее мизерные капиталовложения не могли оказать заметного влияния на хозяйственное развитие края.

В результате многие разрушенные войной предприятия и промышленные центры так и не были восстановлены. Накануне Первой мировой войны в Сморгони на 30 тыс. населения приходилось 40 промышленных предприятий, включая крупную кожевенную фабрику, на которых работало несколько тысяч человек. В 1932 г. здесь проживало лишь 5 тыс. человек, из 40 промышленных предприятий не осталось ни одного. Сморгонь, как и многие другие окрестные поселения, в ходе Первой мировой войны подверглась сильному разрушению, а польские власти ничего не сделали для ее восстановления. Кризис лишь усугубил положение.

В 1928 г. в Пинске действовали 3 фанерные и спичечная фабрика, 2 лесопильных завода, 2 стеклозавода, работали 500 портовых

рабочих. К лету 1932 г. прекратили существование 2 фанерные фабрики, оба стеклозавода, на 60 % сократилась численность портовых рабочих. Уцелевшие предприятия в два-три раза сократили производство. В Слониме были закрыты 2 лесопильных, 2 кирпичных завода, 4 мельницы; в Волковыске – 4 кирпичных и 2 лесопильных завода. К осени 1933 г. в Гродно из 3 спиртзаводов действовал лишь 1, из 6 лесопильных заводов продолжали работать только 2, из 7 кожевенных предприятий – 3. Не работали кирпичные заводы, стеклозавод и т. д.

Рабочий класс подвергался жестокой эксплуатации. Несмотря на 10–12-часовой рабочий день, рабочие Западной Беларуси получали в полтора-два раза меньше, чем их собратья в этнической Польше.

гаспадаркай. Беларусы з'яўляюцца дробнымі сялянамі, тады як буйныя і сярэднія землеўладанні знаходзяцца ў руках палякаў», – пісаў у 1936 г. А. Станкевіч [5, с. 117]. У 1931 г. у Віленскім, Навагрудскім і Палескім ваяводствах буйным землеўладальнікам з плошчай маёнткаў больш за 100 га (0,5 % гаспадарак), дзяржаве і царкве належала каля 4 млн га зямлі (48 % усіх зямель), 610 тыс. сялянскіх гаспадарак – 4,3 млн га (52 % усёй зямлі). 56 % сялянскіх гаспадарак мелі менш за 5 га зямлі кожная. Скрытым беспрацоўем было ахоплена каля 40 % рабочых рук [6, с. 217, 219]. Сяляне-беларусы пакутавалі ад малазямелля і беззямелля, падатковага ўціску і самавольства ўрадоўцаў, ад натуральных працоўных павіннасцей на карысць дзяржавы (шарваркаў), што забіралі ад 60 да 110 дзён у год на адну сялянскую гаспадарку, ад частых неўраджаяў, галадовак і эпідэмій інфекцыйных захворванняў, ад грабежніцкіх «нажніц цэнаў» (у 1935 г. селянін быў вымушаны плаціць за тыя ж прамысловыя тавары ў 2–3 разы больш, чым у 1928 г.). «Толькі радыкальная зямельная рэформа магла б палепшыць гаспадарчае становішча беларускага насельніцтва. Аднак ні пра адну з такіх рэформ не магла ісці нават гаворка», – зазначаў А. Станкевіч [5, с. 118]. Аграрныя пераўтварэнні польскіх улад у Заходняй Беларусі праводзіліся на карысць паноў-абшарнікаў і сельскай буржуазіі і мелі выразна каланізатарскія мэты. «Распаўсюджваўся такі пункт гледжання, што зямельныя надзелы палякаў нельга ўшчамляць ні пры якіх абставінах, трэба толькі пашыраць буйныя надзелы за кошт сярэдніх і дробных» [5, с. 118]. У рэшце, аграрныя рэформы 1920-х гадоў спрыялі далейшаму збядненню заходнебеларускай вёскі. Калі ў 1921 г. беднякі складалі 62 %, серадзнякі – 30 %, заможныя сяляне – 8 % заходнебеларускага сялянства, то ў 1935 г. гэтыя паказчыкі, пры абсалютным росце сельскага насельніцтва, складалі адпаведна 75–80, 15–17 і 5 % [7]. Да 1938 г. ад 120 да 150 тыс. чалавек, у асноўным сялян, у пошуках лепшай долі вымушаны былі з'ехаць за мяжу.

Скарачэнне прамысловай вытворчасці, хранічны застой у сельскай гаспадарцы, каланізатарская палітыка польскіх улад паставілі значную частку насельніцтва ва ўмовы бясконцых нястач і паўгалоднага існавання. Цяжкім грузам на плечы працоўнага

насельніцтва лягла падатковая сістэма, якая мела выразна класавы характар. Існавалі дзесяткі прамых і ўскосных падаткаў і збораў, прычым сума толькі прамых дзяржаўных падаткаў была ў 4 разы вышэйшай, чым у царскай Расіі. У 1924 г., у мэтах стабілізацыі фінансавага становішча краіны, польскі ўрад павысіў акцызныя зборы на спіртныя напоі – у 2 разы, на цукар – у 10 разоў, на запалкі – у 20 разоў. За 1 га зямлі малазямельны селянін плаціў у 2–4 разы большы пазямельны падатак, чым памешчык-абшарнік. Арэндная плата за зямлю нярэдка з'ядала больш за палову ўраджаю. Запазычанасць па падатках вісела на сялянскай гаспадарцы непад'емным цяжарам. На 1 студзеня 1934 г. толькі па Віленскім і Навагрудскім ваяводствах яна дасягала ў сярэднім 460 злотых на адну гаспадарку [6, с. 220]. Пры спагнанні недаімак улады шырока практыкавалі так званыя экзекуцыі і ліцытацыі – продаж маёмасці недаімшчыка з малатка. Сярэдні кошт 1 га зямлі складаў 610–830 злотых, рабочы конь у сярэдзіне 1920-х гадоў каштаваў 150–200 злотых, дойная карова – 100–120 злотых, плуг – 36–37 злотых. Калі ў 1928 г. для набыцця аднаго плуга трэба было прадаць 100 кг жыта або 28 кг свініны, то ў 1935 г. – 270 кг жыта або 41,5 кг свініны. Гандаль унутры самой вёскі меў пераважна менавы характар. Становішча сельскагаспадарчых рабочых было надзвычай цяжкое. Звыш 90 % свайго заробку яны атрымоўвалі выключна натурай. Батракі і падзёншчыкі, якія гублялі работу, рэгістрацыі як беспрацоўныя не падлягалі і ніякай дапамогі не атрымоўвалі.

Становішча гарадскіх рабочых таксама было далёкім ад працвітання. Сярэдні тыднёвы заробак «чыстымі» (пасля выліку падаткаў, збораў і штрафаў) складаў у сярэдзіне 1920-х гадоў 12–15 злотых, а ў сярэдзіне 1930-х – 5–6 злотых на работніка. У той жа час у сярэдзіне 1920-х гадоў 1 кг жытняга хлеба каштаваў 45 грошаў, мукі пшанічнай – 90 грошаў, масла – 6,3 злотых, цукру – 1,4 злотых, мыла – 1,7 злотых, солі – 35 грошаў, 1 л газы каштаваў 60 грошаў, 1 м шарсцяной тканіны – 33,18 злотых. У сярэдзіне 1930-х гадоў кошт 1 кг сітнага хлеба складаў 34 грошы, мукі пшанічнай – 53 грошы, масла – 3,4 злотага, солі – 20 грошаў, 1 л газы – 35 грошаў, 1 скрынка запалак – 10 грошаў, 10 кілават-гадзін элект-

раэнергіі – 7,3 злотага. Зразумела, што пасля ўзносу квартплаты грошай у сямейным бюджэце заставалася ў самы абрэз. Беспрацоўныя былі ў куды горшым становішчы. У 1927 г. толькі 13,6 % зарэгістраваных беспрацоўных штомесяц атрымоўвалі грашовую дапамогу ў памеры тыднёвага заробка пры ўмове абавязковай яе адпрацоўкі на грамадскіх работах.

Вёска вярталася да прымітыўных метадаў апрацоўкі зямлі і прымітыўных прылад працы. Польская газета «Кур'ер Паранны» ў нумары ад 27 жніўня 1939 г. паведамляла сваім чытачам: «Паляшук жыве, нараджаецца і памірае на адным з самых найніжэйшых узроўняў існавання. Палессе галадае, на Палессі самы высокі працэнт непісьменных. Палессе мае ніштожную колькасць школ, грамадскіх, гаспадарчых і кааператыўных арганізацый. Паляшук апрацоўвае багністую, неўрадлівую зямлю, карыстаючыся драўлянай сахой, драўлянымі рыдлёўкамі... Святло і цяпло (і гэта дарэчы з'яўляецца самай характэрнай з'явай) атрымоўвае ад лучын, што ўжываюцца без выключэння ва ўсіх хатах». З сялянскімі ўспамінамі і паведамленнямі польскай прэсы пераклікаюцца непасрэдныя ўражанні ад паездкі ў Заходнюю Беларусь сакратара ЦК КП(б)Б члена Ваеннага Савета Беларускага фронту П. К. Панамарэнкі, якімі ён дзяліўся 25 верасня 1939 г. з І. В. Сталіным: «Беларускі селянін-бядняк, часта і серадняк, голы і раздзеты. Цукру ў вёсках ніколі не куплялі, нягледзячы на ўяўную таннасць – паўтары злотых кілаграм...» Панамарэнка зазначаў, што запалак, солі і газы «насельніцтва... не мае ўжо даўно і па гэтых таварах зглададалася», а таксама непасільнасць для рабочых у Заходняй Беларусі набываць харчовыя тавары і тавары першага попыту па ўнутраных цэнах савецкага дзяржаўнага і кааператыўнага гандлю – яны «выбілі рабочых з бюджэту» [8, с. 173, 174].

Народная памяць пра жыццё пад Польшчай і ўз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР вельмі шматпланавая і неадназначная. Міжваенная Польшча так і не стала для заходніх беларусаў краінай-маці. Але і новая ўлада, якая прыйшла на заходнія землі Беларусі ў верасні 1939 г., у нечым спраўдзіла, а ў нечым і падманула народныя надзеі. Вось толькі два сведчанні пра тыповыя лёсы тыповых насельнікаў Заходняй Беларусі. «У маёй мамы бы-

ло тры хлопцы, дзве дзяўчыны. Аднаго брата пасля вайны зрабілі кулаком, выслалі. Другі працаваў старшынёй калгаса. Трэці ездзіў у Амерыку, на заработкі, назад прыехаў і памёр, багаты, напрывозіў усяго, піў зазра – чаго прыехаў». «Калі мы жылі пры Польшчы, то ў мяне з 12–13 год было імкненне хутчэй стаць дарослай, паехаць у Латвію на заробкі да заможных сялян, апрануць сябе і паставіць на ногі нашу сям'ю, якая існавала ў жабрацтве. Але маёй мары ажыццявіцца было не суджана, прыйшоў верасень 1939 года, а з ім змянілася ўсё. Я змагла вучыцца, атрымала сярэднюю спецыяльную адукацыю, 25 год працавала галоўным бухгалтарам саўгаса» [4, с. 370].

Літаратура

1. Наленч, Д. Юзеф Пилсудский: Легенды и факты / Д. Наленч, Т. Наленч. – М., 1990.

2. Беларусь на мяжы тысячагоддзяў. – Мінск, 2000.

3. Tomaszewski, J. Robotnicy Białorusini w latach 1919–1939 w Polsce / J. Tomaszewski // Acta Baltico-Slavica. – 1967. – R. 5. – S. 104–105.

4. Беларусы. – Мінск, 2001. – Т. 4: Вытокі і этнічнае развіццё.

5. Вабішчэвіч, А. «...Беларусы маюць законы толькі на паперы...» / А. Вабішчэвіч // Беларус. гіст. часоп. – 1995. – № 2. – С. 107–119.

6. Нарысы гісторыі Беларусі: у 2 ч. – Мінск, 1995. – Ч. 2.

7. Экономическая история Беларуси. – Минск, 2001. – С. 254.

8. Назаўсёды разам: Да 60-годдзя ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР. – Мінск, 1999.

А. Г. Цымбал

Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка, Мінск

БЕЛАРУСІЗАЦЫЯ ПРАВАСЛАЎНАЙ ЦАРКВЫ Ў ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ (1921–1939 гг.)

У Другой Рэчы Паспалітай рух за беларускае нацыянальнае адраджэнне, які выспяваў на працягу XIX і ў пачатку XX ст. набыў даволі масавы характар. Яго мэтай з'яўлялася самасцвярджэнне беларусаў як самастойнай нацыі ў межах этнічнага рассялення,

прызнанне факта яе існавання іншымі народамі і дзяржавамі, а разам з тым і права беларусаў на нацыянальную дзяржаўнасць. Для дасягнення пастаўленай мэты неабходна было вырашыць шэраг складаных праблем. Адной з найбольш істотных з'яўлялася пераадоленне адмоўнага ўплыву на фарміраванне і развіццё беларускай нацыі канфесіянальнага падзелу этнасу на праваслаўных і католікаў. Падзел гэты шырока выкарыстоўваўся праваслаўным духавенствам у мэтах русіфікацыі, а каталіцкім – паланізацыі беларусаў [1, с. 124]. У польскай дзяржаве апынулася шмат беларускіх нацыянальных дзеячаў, якія працягвалі барацьбу за адраджэнне і ўз'яднанне Беларусі. Разумеючы ўплыў царквы на свядомасць людзей і яе ролю ў грамадскім жыцці, яны распачалі актыўную працу, накіраваную на беларусізацыю праваслаўнай царквы як магчымасць супрацьстаяць гвалтоўнай паланізацыі.

Другая Рэч Паспалітая атрымала ў спадчыну ад Расіі праваслаўную царкву амаль цалкам зрусіфікаванай. Духавенства ад іерархаў да прыходскіх святароў выхавана ў руска-манархічным духу. Такое становішча было вынікам палітыкі расійскай дзяржаўнай адміністрацыі, накіраванай на абмежаванне доступу да царкоўных пасад, асабліва вышэйшага ўзроўню, прадстаўнікам іншых нацыянальнасцей. Выхаванне, адукацыя, навыкі шматгадовай, у тым ліку палітычнай, дзейнасці на карысць расійскага самадзяржаўя перашкаджалі ўспрыняццю духавенствам палітычных змен, якія адбыліся пасля знікнення Расійскай імперыі. З цяжкасцю прымаўся святарамі факт узнікнення польскай дзяржавы, і цалкам адсутнічала разуменне працэсаў, якія адбываліся ў беларускім і ўкраінскім грамадстве і былі звязаны з абуджэннем нацыянальнай свядомасці. Нягледзячы на тое, што пераважную частку вернікаў праваслаўнай царквы ў Польшчы складалі беларусы і ўкраінцы, клір праводзіў набажэнствы на царкоўнаславянскай мове з рускім вымаўленнем, карыстаўся рускай мовай у пропаведзях, царкоўнай адміністрацыі, навучанні рэлігіі і ў кантактах з вернікамі. Змены становішча царквы ў савецкім саюзе, узнікненне «аднаўленцкага» руху, які вылучаў патрабаванні рэфармавання і збліжэння царквы са свецкай уладай і ўвя-

дзення сучаснай рускай мовы ў царкву, таксама ставілі пытанне аб трансфармацыі царкоўных інстытутаў у польскай дзяржаве.

Неабходна адзначыць, што ў праваслаўнай царкве беларускі рух, напрыклад, у параўнанні з украінскім, развіты вельмі слаба. Беларусы былі прадстаўлены ў асноўным сялянствам з нізка развітай нацыянальнай самасвядомасцю. Носьбітам ідэй нацыянальнага адраджэння з'яўлялася нешматлікая інтэлігенцыя, крыніцы папаўнення якой з беларускага асяроддзя амаль адсутнічалі. Польскія ўлады рабілі ўсё магчымае для абмежавання і ліквідацыі беларускамоўнай адукацыі і недапушчэння пашырэння беларускага руху. Беларускія арганізацыі пераважна цікавіліся сацыяльна-эканамічнымі і палітычнымі пытаннямі, звяртаючы менш увагі на рэлігійныя праблемы. Частка інтэлігенцыі была звязана з каталіцкай царквой і праяўляла значную грамадскую і рэлігійную актыўнасць. У міжваенны перыяд у Заходняй Беларусі, акрамя партый сацыялістычных поглядаў, адным з найбольш стабільных быў хрысціянска-дэмакратычны кірунак.

Першыя патрабаванні адносна беларусізацыі царквы ў Другой Рэчы Паспалітай адносяцца да чэрвеня 1919 г., калі адбыўся з'езд прадстаўнікоў беларускага насельніцтва Віленшчыны і Гродзеншчыны. Дэлегаты дамагаліся ўвядзення беларускай мовы ў пропаведзі і навучанне рэлігіі. Акрамя таго, было прапанавана прызначыць епіскапам святара беларускай нацыянальнасці. Арганізаваць навучанне ў Віленскай семінарыі таксама прапанавалі ў нацыянальным духу [2, с. 87].

27 студзеня 1922 г. урад Беларускай Народнай Рэспублікі даслаў маскоўскаму патрыярху Ціхану мемарандум, у якім прадстаўлялася цяжкае становішча праваслаўнай царквы ў Заходняй Беларусі пад польскай акупацыяй. У ім выказвалася неабходнасць беларусізацыі рэлігійнага жыцця. Падкрэслівалася, што такі крок спрыяў бы росту свядомасці беларусаў, узмацніў пазіцыі праваслаўнай царквы і стаў перашкодай на шляху экспансіі каталіцызму і паланізацыйнай палітыкі польскіх улад. Сцвярджалася, што беларусізацыя царкоўнага жыцця дазволіць змяніць меркаванне аб русіфікатарскай ролі царквы, якое актыўна выкарыстоўвае польская прапаганда [3, арк. 37–40]. Сінодам было дазво-

лена выкарыстоўваць беларускую мову ў дадатковых набажэнствах, пропаведзях і навучанні рэлігіі. Маскоўскія царкоўныя ўлады звярнуліся таксама да епіскапаў беларускіх епархій з прапановай выдаць зборнікі пропаведзяў, малітоўнікаў і новы запавет на мове вернікаў. Што датычыцца патрабавання прызначэння на епіскапскія пасады святароў, якія валодалі беларускай мовай, то сінод палічыў яго справядлівым, аднак неадкладнае яго вырашэнне было немагчымым, бо патрабавала беспадстаўнага адхілення епіскапаў, прызначаных раней. Патрыярх Ціхан абяцаў лічыцца з вылучанымі прапановамі беларусаў пры будучых прызначэннях [3, арк. 67–68]. Пераважная большасць праваслаўнага епіскапата ў Другой Рэчы Паспалітай была рускай і ўкраінскай нацыянальнасці. Беларусам па паходжанні быў епіскап пінска-навагрудскі Панцеляймон [4, s. 99].

Намаганні ўкраінцаў прывялі да таго, што сінодам 16 чэрвеня 1922 г. было дазволена выкарыстанне ўкраінскай мовы на тэрыторыі валынскай епархіі. Пастанову гэтую польскія ўлады скарысталі для ўвядзення польскай мовы ў царкву, дзеля чаго міністр РВ і ПА звярнуўся да царкоўнай іерархіі. 14 снежня 1922 г. царкоўныя ўлады пашырылі пастанову ад 16 чэрвеня на польскую і беларускую мовы [5, арк. 36].

У 1924 г. кіраўніцтвам Віленскага ваяводства для МЗС і МРВ і ПА была падрыхтавана аналітычная запіска аб праваслаўным духавенстве і беларускім руху на Віленшчыне. У ёй адзначалася, што духавенства можна ўмоўна падзяліць на дзве плыні, якія рэпрэзентавалі асобныя палітычныя погляды і кірункі. Да першай адносіліся мясцовыя святары, а да другой – духоўныя асобы, якія прыбылі сюды з Расіі і не ведалі звычаяў, побыту і культуры мясцовага насельніцтва. Мясцовае духавенства, асабліва тыя, хто пабываў у Савецкім Саюзе і зведаў асаблівасці бальшавіцкай рэлігійнай палітыкі, не мелі сімпатый да СССР. У Польшчы яны бачылі прытулак і сховішча і не дапускалі ў сваіх прыходах антыпольскіх выступленняў. У той жа час духавенства, што прыбыло сюды яшчэ да вайны і не пазнала бальшавіцкага ўціску, свой ідэал бачыла ў «адзінай і непадзельнай Расіі». Адносіны да беларускага руху ў большай часткі гэтага духавенства былі непры-

хільныя. Беларусаў яны ўвогуле не прызнавалі за нацыю. Аднак назіралася актыўнае супрацоўніцтва гэтых святароў з беларускімі арганізацыямі, калі размова вялася аб палітычных справах. Тут іх аб'ядноўвала агульная непрыязь да польскай дзяржавы [6, арк. 146]. Што тычыцца мясцовага духавенства, то яно ў пераважнай большасці спрыяла беларускаму нацыянальнаму руху, асабліва культурна-асветніцкай працы. Аднак іх адштурхоўвала дзейнасць Віленскага беларускага нацыянальнага камітэта, які, па іх меркаванні, супрацоўнічаў з эсэрамі і бальшавікамі, а яго дзеячаў яны лічылі палітычнымі авантурыстамі. Прыхільнікамі эсэраў лічыліся члены віленскай кансісторыі Рак-Міхайлоўскі і Красінскі, якія праводзілі палітыку ВБНК і былі пазбаўлены пасад пасля выдалення архіепіскапа Еляферыя. Антыдзяржаўныя абвінавачванні гучалі ў адрас кіраўніка Віленскай семінарыі В. Багдановіча, які актыўна ўдзельнічаў у ВБНК. Падчас выбараў ён звальняў з заняткаў семінарыстаў, якія выязджалі ў вёскі агітаваць за блок нацыянальных меншасцей. Пад уплывам ВБНК у Віленскай семінарыі пачаў дзейнічаць Саюз камуністычнай моладзі. Адзначаліся толькі сем духоўных асоб, якія супрацоўнічалі з ВБНК [6, арк. 148].

Патрабаванні беларусізацыі царквы вылучала першае беларускамоўнае праваслаўнае выданне ў Другой Рэчы Паспалітай – «Праваслаўны беларус». Часопіс сімвалізаваў пэўны пералом у развіцці праваслаўнага беларускага руху. Праваслаўе ўсё часцей станавілася сінонімам беларускасці. Яшчэ большаму збліжэнню праваслаўя з беларускім народам павінен быў служыць штомесячны дадатак «Царкоўныя казанні», які выходзіў па ініцыятыве і са згоды мітрапаліта Дыянісія з чэрвеня 1925 г. У ім змяшчаліся тэксты беларускамоўных пропаведзяў. Крытыка нацыянальна-рэлігійнай палітыкі ўрада стала прычынай ліквідацыі выдання ў снежні 1925 г. [7, s. 628].

Адзінай партыяй, якая ўзнікла ў Заходняй Беларусі і вылучала патрабаванні надання праваслаўнай царкве беларускіх нацыянальных рысаў, было створанае па ініцыятыве В. Багдановіча ў 1927 г. Праваслаўнае беларускае дэмакратычнае аб'яднанне. Друкаваным органам яго было выданне «Праваслаўная Беларусь» (выдавалася ў 1927–1928 гг.). У першым нумары адзначалася на-

спелая патрэба функцыянавання праваслаўнай палітычнай партыі ў заходнебеларускім грамадстве кшталту каталіцкай Беларускай хрысціянскай дэмакратыі. Адзначалася, што падзел беларускага народа на дзве рэлігійныя плыні стаў прычынай узнікнення двух «культурна-гістарычных тыпаў беларусаў». Партыя ставіла перад сабой за мэту нівеліраванне гэтых адрозненняў і аб'яднанне ўсіх беларусаў у адзіную «нацыянальную беларускую сям'ю» [8].

У 1930 г. назіралася ажыўленне руху па беларусізацыі царквы, што было звязана са спробамі склікання Сабора праваслаўнай царквы ў Польшчы. Беларускія арганізацыі спрабавалі паўплываць на яго рашэнні. 12 лютага 1930 г. да дзяржаўных і царкоўных улад з патрабаваннямі надання праваслаўнай царкве беларускага нацыянальнага характару звярнулася таварыства «Прасвета». У мемарыяле да варшаўскага мітрапаліта Дыянісія адзначалася, што святары да мовы беларускай як да мовы простай, мужыцкай адносіліся з пагардай і карысталіся выключна рускай. У час рэвалюцыі разам з іншымі народамі ўзняўся і беларускі народ, але праваслаўнае духавенства з народам не пайшло і засталося верным традыцыям ужо не існуючай Расійскай імперыі. У польскай дзяржаве ўсё засталося па-ранейшаму. Аўтары мемарыяла падкрэслівалі, што праваслаўная царква павінна стаць нацыянальна блізкай да свайго народа і прапаноўвалі: 1) правесці рэформу кансісторыі; 2) ажыццявіць беларусізацыю духоўнай семінарыі і надаць ёй рысы духоўнай школы, якая з'яўлялася звычайнай сярэдняй школай; 3) увесці беларускую мову як абавязковую ва ўсіх адміністрацыйных зносінах; 4) прамаўляць пропаведзі на беларускай мове; 5) прызначаць на пасады вайсковых капеланаў святароў-беларусаў, якія б прамаўлялі пропаведзі па-беларуску; 6) выкладаць закон божы на беларускай мове; 7) утварыць прыхадскія рады, якія б дапамагалі настаяцелю ў кіраванні духоўным жыццём прыхода; 8) дамагчыся склікання прадсаборных епархіяльных сходаў са свецкіх і духоўных прадстаўнікоў ад прыходаў, а таксама з праваслаўных прадстаўнікоў ад культурных і асветніцкіх беларускіх арганізацый; 9) дамагчыся склікання праваслаўнага сабора ў Польшчы з прадстаўнікоў як духавенства, так і прыхаджан, абраных дэмакратычным шляхам [9, арк. 6–6адв].

14 сакавіка 1930 г. быў створаны Беларускі праваслаўны камітэт, які першапачаткова меў назву Цэнтральны беларускі праваслаўны камітэт па беларусізацыі царквы. На ўстаноўчую канферэнцыю павінны былі прыехаць і праваслаўныя святары. Старшыня камітэта т. Вернікоўскі сустракаўся з архіепіскапам Феадосіем, які благаславіў канферэнцыю і тых, хто збіраўся на ёй прысутнічаць, уключаючы духавенства, але потым змяніў рашэнне. Такім чынам, дэлегацыя святароў, якія прыехалі ў Вільню, на канферэнцыю не патрапіла. Але святар а. Коўш, адзін з прыхільнікаў беларусізацыі царквы, быў завочна абраны першым віцэ-старшынёй прэзідыума [10, арк. 10].

Акрамя камітэта, патрабаванні беларусізацыі царквы вылучалі шматлікія дробныя арганізацыі, якія не мелі шырокай грамадскай падтрымкі: Беларускі нацыянальны камітэт, Беларуская праваслаўная група студэнтаў Віленскага універсітэта, Беларуская праваслаўная працоўная арганізацыя, Саюз беларускай праваслаўнай моладзі ў Вільні, Аб'яднанне праваслаўных прыхадскіх груп беларусаў Віленскай епархіі, Беларускі цэнтрасаюз [11, s. 225–226].

Віленскі ваявода У. Рачкевіч, ацэньваючы актыўнасць БПК, рэкамендаваў асцярожна адносіцца да праблемы, аднак выказваўся супраць беларусізацыі царкоўнага жыцця [12, арк. 10]. Неабходна адзначыць, што патрабаванні камітэта не знайшлі водгуку як у праваслаўнага духавенства, так і сярод вернікаў. Яны адлюстроўвалі хутчэй погляды маладой беларускай палітычнай эліты, чым шырокіх мас сельскага насельніцтва [12, арк. 6]. Уся дзейнасць Беларускага праваслаўнага камітэта абмяжоўвалася складаннем мемарыялаў да царкоўных і дзяржаўных улад. Адзінае дасягненне – выданне беларускамоўных падручнікаў па рэлігіі пад рэдакцыяй С. Паўловіча.

У хуткім часе скончылася і супрацоўніцтва лідэраў руху. Р. Астроўскі пачаў выдаваць газету «Голас праваслаўнага беларуса», дзе крытыкавалася дзейнасць камітэта і святара а. Каўша. Кіраўнікі БПК Вернікоўскі і Більдзюкевіч у сваю чаргу скардзіліся на Р. Астроўскага архіепіскапу Феадосію. Сярод беларускіх дзеячаў гучалі ўзаемныя паклёпы, даносы і абвінавачванні ў сектанцтве, атэізме, камунізме і масонстве [13; 14].

Такім чынам, акрамя канфлікту беларускіх арганізацый з архіпастырам Віленскай епархіі Феадосіем, не было адзінства і ў самім руху па беларусізацыі праваслаўнай царквы. 17 студзеня 1933 г. Сінод епіскапаў па прапанове архіепіскапа Феадосія пастанавіў спыніць выступленні беларусаў, якія толькі пашыралі «смуту і расстройства» ў царкоўным жыцці [4, s. 183].

Віленскі архіепіскап актыўна выконваў даручэнні дзяржаўных улад. Начальнік грамадска-палітычнага аддзела Віленскай ваяводскай управы паведамляў у 1939 г., што, ліквідуючы беларусізацыю і русіфікацыю царквы, мясцовы епіскап выдаў загад аб правядзенні навучання рэлігіі на польскай мове. Па-польску адбываліся заняткі па асновах рэлігіі і ў Беларускай гімназіі ў Вільні [4, s. 184]. Тым не менш, улады адзначалі, што адукацыя ўсё роўна становіцца фактарам русіфікацыі ці беларусізацыі, бо духавенства працягвае карыстаецца беларускімі ці рускімі падручнікамі [15, арк. 504].

Такім чынам беларускія дзеячы, якія апынуліся ў польскай дзяржаве пасля Першай сусветнай вайны, спрабавалі скарыстаць магчымасці ўплыву праваслаўнай царквы на грамадства для справы абуджэння беларускай нацыянальнай свядомасці сярод пераважна сельскага беларускага насельніцтва і супрацьстаяння гвалтоўнай паланізацыі. Царква ў іх планах – мабілізуючы фактар этнічнай кансалідацыі беларусаў, носьбіт беларускай мовы і культуры.

Праграма беларусізацыі праваслаўнай царквы была даволі сціплай і ў асноўным зводзілася да ўвядзення пропаведзей і навучання рэлігіі на беларускай мове, а таксама прызначэння ў Віленскую кансісторыю і на пасады вайсковых капеланаў святароў-беларусаў. Патрабаванні беларусізацыі царквы адлюстроўвалі хутчэй погляды беларускай палітычнай эліты, чым шырокіх мас сельскага насельніцтва. Істотнай перашкодай з'яўляліся пастаянныя расколы, падзелы і ўзаемныя абвінавачванні кіраўнікоў беларускіх арганізацый. Па розных прычынах негатыўна аднеслася да спроб увядзення беларускай мовы ў царкву і праваслаўнае духавенства, частка якога ўвогуле не прызнавала беларусаў за нацыю, а іншыя, хоць і спрыялі беларускай культурна-асветніцкай справе, з недаверам ставіліся да лідэраў руху па беларусізацыі

царквы. Супрацьстаяў зменам у царкве і віленскі архіепіскап, якога дзяржаўная адміністрацыя выкарыстоўвала для барацьбы з беларускім рухам. Польскія ўлады таксама адмоўна ставіліся да патрабаванняў беларусаў, але імкнуліся скарыстаць беларусізацыю царкоўнага жыцця з мэтай паслаблення рускіх пазіцый у праваслаўнай царкве і далейшай яе паланізацыі.

Крыніца і літаратура

1. Канфесіі на Беларусі (к. XVIII – XX ст.) / В. В. Грыгор'ева [і інш.]; навук. рэд. У. І. Навіцкі. – Мінск, 1998. – 340 с.

2. Давідзюк, М. Справа беларусізацыі праваслаўнай царквы ў святле палітыкі польскіх дзяржаўных улад 1918–1939 / М. Давідзюк // Беларус. каляндар. – 1990. – С. 67–92.

3. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Фонд 325. – Воп. 1. – Спр. 128: Рэлігійныя пытанні 1921–1922 гг.

4. Mironowicz, A. Kościół prawosławny na ziemiach polskich w XIX i XX wieku / A. Mironowicz. – Białystok, 2005. – 379 s.

5. Archiwum Akt Nowych w Warszawie. Ministerstwo Wyznań Religijnych i Oświecenia Publicznego (далей – AAN). – Sygn. 975.

6. AAN. – Sygn. 1065.

7. Mironowicz, A. Kościół prawosławny w Polsce / A. Mironowicz. – Białystok, 2006. – 917 s.

8. Праваслаўная Беларусь. – 1927. – 1 кастр.

9. Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва. – Фонд 3. – Воп. 1. – Спр. 22: Дакументы беларускага культурна-асветніцкага таварыства «Прасвета» г. Вільня (мемарандумы аб адкрыцці беларускіх школ і аб рэформе праваслаўнай царквы ў Польшчы) за 1926–1930 гг.

10. Тамсама. – Спр. 198: Дакументы Цэнтральнага беларускага праваслаўнага камітэта ў г. Вільня (статут, пратакол, рэзалюцыя канферэнцыі інш.) за 1930 г.

11. Papierzyńska-Turek, M. Między tradycją a rzeczywistością. Państwo wobec prawosławia w 1918–1939 / M. Papierzyńska-Turek. – W-wa, 1989. – 482 s.

12. AAN. – Sygn. 989.

13. Prawosławne Archiwum Metropolitalne. – 6d. Diecezja poleska.

14. Тамсама. – 8a. Diecezja wileńska.

15. AAN. – Sygn. 1264.

2. УЗ'ЯДНАННЕ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ З БССР. ЭКАНАМІЧНЫЯ І ПАЛІТЫЧНЫЯ ПЕРАЎТВАРЭННІ Ў ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ

Л. С. Адзінец

Баранавіцкі дзяржаўны універсітэт

ВЫЗВАЛЕННЕ БАРАНАВІЧ І ПЕРШЫЯ КРОКІ НОВАЙ УЛАДЫ (ВЕРАСЕНЬ 1939 г.)

Актуальнасць тэмы навуковага даследавання вызначаецца шэрагам фактараў.

Па-першае, яна адносіцца да адной з лёсавызначальных падзей гісторыі навейшага часу – вызвалення з-пад польскай улады Заходняй Беларусі і ўз'яднання яе з БССР, 70-годдзе якой будзе адзначацца ў верасні 2009 г.

Па-другое, недастатковай навуковай распрацаванасцю краязнаўчага аспекта дадзенай падзеі. Між тым Баранавічы быў першым з заходнебеларускіх гарадоў, які 17 верасня 1939 г. войскі Чырвонай Арміі вызвалілі з-пад польскага панавання і ў якім пачаў сваю дзейнасць новы орган улады – Часовае ўпраўленне горада Баранавічы і Баранавіцкага павета (далей – Часовае ўпраўленне).

Баранавічы былі тыповым «крэсавым» горадам, у якім жыло каля 27 тыс. чалавек: чыноўнікі, саматужнікі, гандляры, чыгуначнікі і інш. [1, с. 82]. Гэта без уліку польскіх вайскоўцаў, якіх было тут нямала. На тэрыторыі Баранавіч знаходзіліся два ваенныя гарадкі [2, с. 177].

Між тым у дзень вызвалення горада польскія войскі не аказалі істотнага супраціўлення чырвонаармейцам. «Трусы афіцеры ўцякалі, не знаходзячы ні адкуль падтрымання. У памяшканнях афіцераў у Баранавічах і цяпер яшчэ раскіданы пагоны і мэбля», –

пісала пасля вызвалення горада газета новай улады «Голас Рабочага» [3].

Паводле ўспамінаў удзельніка тых падзей былога члена Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі (КПЗБ) А. Ф. Рубінчыка, у дзень вызвалення горад выглядаў прыгожа і святочна. Старыя са слязьмі на вачах абдымалі камандзіраў і байцоў. Моладзь пела рэвалюцыйныя песні. На гандлёвай плошчы ў цэнтры горада адбыўся мітынг, на якім прадстаўнікі рабочых, сялян, інтэлігенцыі горача віталі сваіх вызваліцеляў і выражалі рашучасць аддаць усе свае сілы ўсталяванню Савецкай улады [4, арк. 13].

Пасля вызвалення Баранавіч характар і змест першых пераўтварэнняў вызначаліся пастановай Ваеннага савета Беларускага фронту ад 16 верасня і загадам камандуючага Беларускім фронтам ад 19 верасня 1939 г., а таксама шэрагам прынятых на іх аснове мясцовых рашэнняў. Паводле іх, у Баранавічах, як і «ва ўсіх гарадах на тэрыторыі, занятай Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміяй» замест старой польскай улады была створана новая – Часовае ўпраўленне [5]. У склад Часовага ўпраўлення ўвайшлі па аднаму прадстаўніку ад Чырвонай Арміі (у асобе палітработніка), Наркамата ўнутраных спраў, а таксама прадстаўнікі рабочых, гарадской беднаты, інтэлігенцыі, сялянскіх камітэтаў, былыя члены КПЗБ. У ліку апошніх быў, напрыклад, былы сакратар Баранавіцкага падпольнага гаркома КПЗБ шавец М. М. Шэўц, якога чырвонаармейцы вызвалілі з польскай турмы. Ён неаднаразова арыштоўваўся польскімі ўладамі, а ў верасні 1937 г. быў прыгавораны да 10 гадоў турэмнага зняволення строгага рэжыму [2, с. 188].

Як паведамляла газета «Голас Рабочага», Часовае ўпраўленне было створана пад старшынствам прадстаўніка «нашай доблеснай Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі» [5].

Часовае ўпраўленне было органам улады, які выконваў функцыі часовай адміністрацыі. На Часовае ўпраўленне ўскладалася кіраўніцтва адміністрацыйнай, гаспадарчай і культурна-асветнай дзейнасцю. Дзеля гэтага былі ўтвораны адпаведныя аддзелы: кадраў, прадуктовы, прамыслова-транспартны, аховы здароўя, народнай асветы і інш. Вызначалася таксама вядучая роля Часовага ўпраўлення ў адносінах да сялянскіх камітэтаў на вёсцы. Таму адным

з першых крокаў новай улады стаў зварот Часовага ўпраўлення ад 20 верасня да ўсіх працоўных сялян і сялянак Баранавіцкага павета. У звароце адзначалася, што з вызваленнем Заходняй Беларусі панская ўлада ўжо знішчана, таму «ў кожнай вёсцы павінны быць абавязкова арганізаваны сялянскія камітэты. Праз іх будзе праводзіцца ўся работа па раздзелу памешчыцкіх і казённых зямель» [5].

ЦК КП(б) Беларусі надаваў вялікую ўвагу рабоце часовых упраўленняў, накіроўваў іх дзейнасць.

20 верасня арганізацыйна-інструктарскі адзел ЦК КП(б)Б склаў спісы работнікаў для часовых упраўленняў. Паводле спісаў, старшынямі часовых упраўленняў буйных павятовых цэнтраў, да якіх былі аднесены і Баранавічы, прызначаліся партыйныя і савецкія работнікі, прысланыя з БССР. Адным з іх быў С. С. Касцюк, якога ЦК КП(б)Б зацвердзіў старшынёй Часовага ўпраўлення Баранавіч [6, с. 156].

Трэба адзначыць, што Першы сакратар ЦК КП(б)Б, член Ваеннага савета Беларускага фронту П. К. Панамарэнка быў добра інфармаваны аб падзеях у Баранавічах у першыя дні пасля вызвалення. Аб гэтым сведчыць, напрыклад, наступны факт, да якога ён аднёсся вельмі сур'ёзна. Панамарэнка нават палічыў неабходным даць адпаведную інфармацыю на самы «верх». У лісце І. В. Сталіну аб становішчы на тэрыторыі Польшчы, занятай савецкімі войскамі, ад 25 верасня, у прыватнасці, паведамлялася: «В Барановичах появились два «члена ЦК Коммунистической партии Западной Белоруссии» – Райский и Штирер. Они, помимо Временного управления, попытались развернуть организационную работу – сбор оружия, производство обысков. Райский в рассылаемых записках называл себя председателем Революционного военного комитета. Причем оба заявляют представителю Временного управления, что представители Красной Армии либеральничают с хозяйчиками, мало забирают, даже некоторых выпускают. Требуют больше репрессий». І далей у лісце адзначалася: «Всех этих лиц берем на учет, от общественной работы не отталкиваем и тщательно проверяем» [7, с. 502–503].

З прыведзенага фрагмента ліста можна зрабіць некалькі вывадаў: 1) вышэйшая партыйная ўлада ўважліва сачыла за падзеямі

на вызваленай тэрыторыі і своечасова на іх рэагавала; 2) Чырвоная Армія ў першыя дні пасля вызвалення праводзіла памяркоўную палітыку ў дачыненні да заможнай часткі насельніцтва; 3) відавочна незадаволенасць пэўнай часткі былых членаў КПЗБ гэтай палітыкай, іх імкненне да хутчэйшых рэвалюцыйных пераўтварэнняў рэпрэсіўнымі метадамі; 4) ужо с першых дзён вызвалення вышэйшая партыйная ўлада выказвала недавер да былых членаў КПЗБ. Аднак пры гэтым трэба прызнаць, што тыя з іх, хто праходзіў «тщательную» праверку, працягваў актыўна ўдзельнічаць у грамадскім жыцці. Так, газета «Голас Рабочага» ад 1 кастрычніка паведамляла аб тым, што на сходзе «рабочых і служачых будаўнікоў горада» тав. Райскі, пра якога паведамлялася ў лісце Сталіну, быў выбраны ў рабочы камітэт [3]; 5) адзіным паўнамоцным органам улады на вызваленай тэрыторыі прызнавалася толькі Часовае ўпраўленне.

Часовае ўпраўленне як адзіны паўнамоцны орган улады з дапамогай камуністаў, прысланых ЦК КП(б), пачало работу па наладжванні нармальных умоў жыцця, усталяванні новага, як тады называлі, рэвалюцыйнага парадку.

Часовае ўпраўленне выдала загад аб стварэнні Рабочай гвардыі для аховы грамадскага парадку ў горадзе. Загадам прадпісвалася «ў рабочую гвардыю прымаць людзей чэсных..., толькі такіх рабочых, якія будуць... добрасумленна выконваць усе загады і распараджэнні Часовага ўпраўлення» [5]. Рабочую гвардыю ўзначаліў сталяр, былы член КПЗБ Абрам Рубінчык, які каля шасці гадоў правёў у польскіх турмах. Намеснікам стаў Стэфан Патоцкі – у мінулым селянін, які за некалькі гадоў да вызвалення прыйшоў у горад у пошуках работы [2, с. 200]. Паводле ўспамінаў А. Рубінчыка, у радах рабочай гвардыі налічвалася больш за 300 байцоў [4, арк. 14].

У першыя дні пасля вызвалення горада Часовае ўпраўленне прыняло пастанову аб устанаўленні кантроля працоўных «ва ўсіх быўшых дзяржаўных і ва ўсіх прыватных прадпрыемствах, на фабрыках, заводах, у гандлёвых установах, бальніцах і г. д.» [5]. Рабочыя кантралёры ажыццяўлялі кантроль за выкананнем загадаў і распараджэнняў Часовага ўпраўлення. Сачылі за тым, каб

бесперапынна працавалі ўсе прадпрыемствы, каб працоўныя горада былі забяспечаны прадуктамі харчавання і прадметамі першай неабходнасці. Асаблівая ўвага надавалася нагляду за тым, каб прадпрымальнікі і гандляры не дапускалі павышэння цэн, а рабочым і служачым своечасова выдавалася заработная плата і ні ў якім выпадку не дапускалася яе зніжэнне.

Рашэнні Часовага ўпраўлення былі даведзены да ведама насельніцтва праз друкаваны орган новай улады – газету «Голас Рабочага». Яна пачала выходзіць з 21 верасня з перыядычнасцю выдання – 15 разоў у месяц [3].

Паводле загаду камандуючага Беларускім фронтам ад 19 верасня 1939 г., у першую чаргу Часовае ўпраўленне абавязана было «неадкладна прывесці ў дзеянне ўсе прадпрыемствы і ўстановы, закліканыя абслугоўваць насельніцтва» [2, с. 197]. Дзеля гэтага Часовае ўпраўленне ўзяло на ўлік прамысловыя прадпрыемствы, у тым ліку пакінутыя іх уладальнікамі. Паводле архіўных даных, у Баранавіцкім павеце налічвалася 292 прадпрыемствы, з якіх 33 знаходзіліся ў Баранавічах [8, арк. 3]. Большасць з іх былі дробнымі і займаліся ў асноўным перапрацоўкай прадуктаў сельскай гаспадаркі і некаторых відаў мясцовай сыравіны. Так, у Баранавічах амаль чвэрць ад агульнай колькасці прадпрыемстваў складалі млыны. Сярод іх вылучаўся млын Рагузніцкага-Брука. Ён меў механічную майстэрню, у якой выраблялiся каменныя жорны і металічныя вырабы [9, арк. 4]. Было 2 півавараных завода, столькі ж – па вытворчасці сланечнікавага алею і макухі, а таксама фабрыкі вод газавых і канфет. У ліку іншых прадпрыемстаў – некалькі лесапільных заводаў, фабрыкі па вытворчасці папяровых мяшкоў, клёпак дубовых, соды для мыцця, свечак [8, арк. 11].

Былі таксама ўзяты на ўлік наяўныя запасы сыравіны і гатовай прадукцыі, якія на асобных прадпрыемствах былі даволі значныя. Напрыклад, толькі ад фірм варшаўскі «Лёнэкспарт» і віленскі «Лён» засталіся 61 280 кг льняной прадукцыі [8, арк. 21].

На прадпрыемствах наладжвалася вытворчасць. Аднаўлялася і работа чыгуначнага транспарту. Ужо да канца верасня ў горадзе бесперапынна працавалі прадпрыемствы мясцовай прамысловасці, паравознае дэпо і чыгуначны вузел.

Часовае ўпраўленне праяўляла клопат аб паляпшэнні дабрабыту працоўных. Па распараджэнні новай улады ўводзіўся 8-гадзінны рабочы дзень, адмянялася плата за навучанне і медыцынскае абслугоўванне. Часовае ўпраўленне прыступіла да перамеркавання жылога фонду. У горадзе пачалося перасяленне рабочых у кватэры багацеяў. Некалькі дамоў былі выдзелены пад дзіцячыя яслі пры лесапільных заводах, пад медыцынскія ўстановы. Выключна важнае значэнне мела аказанне разавай грашовай дапамогі насельніцтву. У першыя дні пасля вызвалення Часовае ўпраўленне выдзеліла тым, хто ў гэтым меў вострую патрэбу, 7 тыс. руб. [10, с. 73; 2, с. 201].

Працоўныя горада і навакольных вёсак, а таксама беспрацоўныя, бежанцы і бяздомныя звярталіся за дапамогай да Часовага ўпраўлення па розных пытаннях. Толькі 20 верасня члены Часовага ўпраўлення прынялі 1 500 чал., 21 верасня – каля 2 тыс. [10, с. 73]. Сярод іх было шмат хадакоў ад сялян, якім Часовае ўпраўленне аказвала дапамогу ў вырашэнні самых розных пытанняў: як арганізаваць сялянскі камітэт, як дзяліць памешчыцкую зямлю, што рабіць з маёмасцю, свойскай жывёлай, якія ёсць у памешчыкаў, з хлебам, які быў адабраны палякамі ў насельніцтва для арміі (па разліку 8 кг з гектара) і ляжаў на складах і млынах [7, с. 502]. Гэтыя пытанні вырашаліся аператыўна. На агульных сходах сялян-беднякоў, батракоў, серадмякоў адкрытым галасаваннем выбіраліся сялянскія камітэты ў складзе ад 3 да 18 чалавек. Яны ствараліся ў 12 валасцях і буйных вёсках Баранавіцкага павета [8, арк. 12]. Ужо ў першыя дні пасля вызвалення ўзнікла звыш 100 сялянскіх камітэтаў [10, с. 74].

Не чакаючы заканадаўчых актаў, яны бралі на ўлік маёмасць памешчыкаў і асаднікаў, якія ўцяклі, ахоўвалі яе ад раскрадання, арганізоўвалі падзел памешчыцкай, асадніцкай і царкоўнай зямлі, свойскай жывёлы, сельскагаспадарчага інвентара сярод беззямельных і малазямельных сялян. Архіўныя даныя сведчаць, што ў Баранавіцкім павеце памешчыцкай зямлёй было надзелена 3 987 сялянскіх гаспадарак, у тым ліку 375 – беззямельных, 3 612 – малазямельных. Сялянам было перададзена 2 987 коней і кароў [8, арк. 12].

Пасля вызвалення адной з неадкладных задач Часовага ўпраўлення і сялянскіх камітэтаў было забеспячэнне насельніцтва горада прадуктамі харчавання. Адным са спосабаў рашэння гэтай задачы было фарміраванне сялянскіх прадуктовых абозаў. Так, 29 верасня сяляне Сталовіцкай воласці прывезлі ў горад муку, мёд, сыр, бульбу, капусту, буракі, цыбулю, моркву, а таксама 5 кароў, 2 цялят, 3 свінні [3].

Сярод неадкладных задач была таксама ліквідацыя беспрацоўя. Займаліся гэтым спецыяльныя аддзелы пры ўпраўленні. Паводле афіцыйных даных польскіх улад, у Баранавічах налічвалася толькі 600 беспрацоўных. Пры праверцы іх аказалася больш за 4 тысячы. Сярод беспрацоўных былі кваліфікаваныя рабочыя, інжынеры, урачы, настаўнікі. Ліквідацыя беспрацоўя ажыццяўлялася за кошт увода ў строй дзеючых прадпрыемстваў і іх пашырэння. Частка беспрацоўных працаўладкоўвалася на прадпрыемствах гарадоў усходніх абласцей рэспублікі [10, с. 72].

Шмат рабілася для наладжвання і паляпшэння медыцынскага абслугоўвання насельніцтва горада і навакольных вёсак. Ужо да канца верасня дзейнічалі ўсе бальніцы і аптэкі, аказвалася бясплатная медыцынская дапамога [2, с. 201].

Пачалі працаваць школы, вырашаліся задачы забеспячэння іх настаўнікамі, якія б валодалі рускай і беларускай мовамі. Так, адзел народнай асветы Часовага ўпраўлення 30 верасня адкрыў пры мужчынскай гімназіі 3-месячныя курсы па перападрыхтоўцы настаўнікаў. Без адрыву ад працы 86 настаўнікаў польскіх школ горада пачалі вывучаць на курсах рускую мову і літаратуру «пры вялікай актыўнасці і зацікаўленасці». У хуткім часе такія ж курсы планавалася адкрыць і для сельскіх настаўнікаў [2, с. 202].

Неабходнасць авалодання ў першую чаргу рускай мовай тлумачылася тады тым, што, з аднаго боку, толькі пасля прыходу Чырвонай Арміі перад працоўнымі масамі «шырока раскрылася новае жыццё з багатай рускай мовай і культурай», да якога яны імкнуліся, з другога – гэта было адным з мерапрыемстваў новай улады па падрыхтоўцы да адкрыцця беларускіх школ [11; 2, с. 202].

Першыя крокі новай улады насілі не толькі станоўчы характар. З першых дзён вызвалення Часовым упраўленнем ствараліся

ўмовы для насаджэння культу асобы Сталіна. Арганізоўваліся шматлікія мітынгі і сходы, на якіх выступоўцы нібы спаборнічалі паміж сабой, усхваляючы і ўзвялічваючы Сталіна. На сходах і мітынгах працоўныя горада і вёскі прымалі прывітальныя лісты і тэлеграмы Сталіну. Напрыклад, у адным з іх, датаваным 28 верасня, настаўнікі ўсіх школ і гімназій Баранавіч «першае слова любві, адданасці і ўдзячнасці» накіроўвалі І. В. Сталіну, «роднаму і любімаму другу ўсіх працоўных, любімаму правадыру і бацьку» [3].

Пачыналася бязлітасная барацьба супраць класавых ворагаў, асабліва на вёсцы. Так, у разглядаемы перыяд дзялілася зямля і маёмасць не толькі тых памешчыкаў і асаднікаў, якія ўцяклі, але і тых, якія засталіся. Дакументы сведчаць, што многіх з іх сяляне знішчалі (вешалі, расстрэльвалі, забівалі), або здавалі Часоваму ўпраўленню [7, с. 502].

Аднак, нягледзячы на ўсе недахопы, трэба адзначыць, што за 2 тыдні верасня 1939 г. Часовае ўпраўленне шмат зрабіла для таго, каб у насельніцтва горада і павета пачаўся новы этап жыцця.

Асноўнымі кірункамі дзейнасці Часовага ўпраўлення былі: стварэнне выканаўчых органаў новай улады; арганізацыя гаспадарчага жыцця на вызваленай тэрыторыі; наладжванне сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва горада і павета; паляпшэнне матэрыяльнага становішча працоўных.

Галоўныя вынікі гэтай дзейнасці заключаліся ў тым, што за кароткі час у Баранавічах і Баранавіцкім павеце быў устаноўлены новы рэвалюцыйны парадак, наладжана нармальнае жыццё, ажыццёўлены першыя рэвалюцыйныя пераўтварэнні. Тым самым былі падрыхтаваны ўмовы для разгортвання палітычнай дзейнасці мас і правядзення выбараў у Народны сход Заходняй Беларусі.

Крыніцы і літаратура

1. Баранавічы // Беларусь: энцыкл. даведнік. – Мінск, 1995. – 800 с.
2. Памяць: гіст.-дакумент. хроніка г. Баранавічы і Баранавіцкага р-на. – Мінск, 2000. – 736 с.
3. Краязнаўчы музей у г. Баранавічы. – КП–10299.
4. Занальны дзяржаўны архіў у г. Баранавічы. – Фонд 131. – Воп. 7. – Спр. 1.

5. Краязнаўчы музей у г. Баранавічы. – КП–8126.
6. Ладысеў, У. Часовыя ўпраўленні // Энцыкл. гісторыі Беларусі: у 6 т. – Мінск, 2003. – Т. 6, кн. 2. – 616 с.
7. История Беларуси в документах и материалах / авт.-сост. И. Н. Кузнецов, В. Г. Мазец. – Минск, 2000. – 672 с.
8. Занальны дзяржаўны архіў у г. Баранавічы. – Фонд 192. – Воп. 1. – Спр. 1.
9. Тамсама. – Фонд 131. – Воп. 6. – Спр. 1.
10. Алексейчик, Я. Я. Очерки истории Брестской областной партийной организации / Я. Я. Алексейчик, Б. И. Камейша, В. П. Самович; под ред. В. А. Бобкова. – Минск, 1989. – 448 с.
11. Краязнаўчы музей у г. Баранавічы. – КП–67.

В. В. Барабаш

Гродненский государственный университет им. Янки Купалы

НАЦИОНАЛЬНО-ТЕРРИТОРИАЛЬНЫЕ ПРЕОБРАЗОВАНИЯ В ЗАПАДНОЙ БЕЛАРУСИ ПОСЛЕ ВОССОЕДИНЕНИЯ С БССР (1939–1940 гг.)

В результате заключения с Германией договора о ненападении от 23 августа 1939 г. и начала Второй мировой войны СССР предоставилась возможность осуществить ряд важнейших внешнеполитических целей: выйти из международной изоляции, расширить зону своего доминирования в Восточной Европе и выиграть время для подготовки к неизбежному участию в глобальном конфликте. Согласно договору от 23 августа 1939 г., устанавливались сферы влияния СССР и Германии в Восточной и Центральной Европе. Разделив вместе с Германией территорию Польши, Советский Союз возвращал себе Западную Украину и Западную Беларусь.

В сентябре 1939 г. Вильно уверенно рассматривался руководителями БССР как будущая столица Западной Беларуси. Началась подготовка к созыву в нем Народного собрания. В Вильно была размещена редакция главной советской газеты для Западной Беларуси «Свободная Беларусь» и налажен выпуск белорусскоязычной газеты «Віленская праўда». Вместе с развернутой широкомасштабной коммунистической пропагандой на белорусском

языке в прессе активно утверждалась идея об историческом праве белорусского народа на Вильно и Виленский край. Такая политика была направлена на то, чтобы привлечь деятелей белорусского движения на сторону советской власти и взять их под свой контроль. 24 сентября 1939 г. в Вильно состоялось собрание представителей белорусской общественности с участием И. Климова и других советских руководителей Западной Беларуси. Климов призвал белорусов к сотрудничеству с новыми властями и выразил уверенность, что Вильно будет присоединен к БССР [1].

Однако в Москве и Берлине были другие планы. По инициативе советского правительства наступило новое разграничение сфер влияния. 25 сентября 1939 г. германский посол Шуленбург был приглашен в Кремль. Ему было заявлено Сталиным, что при окончательном урегулировании польского вопроса нужно избежать всего, что в будущем может вызвать трения между Германией и Советским Союзом. С этой точки зрения, неправильно было создавать, как первоначально предполагалось, небольшое польское государство. Советская сторона решила отказаться от Люблинского и части Варшавского воеводства. Взамен Германия передавала СССР Литву [2, с. 112, 114]. Мотивы руководства СССР объяснялись тем, что в случае установления границ на Висле было бы трудно обосновать включение части центральной Польши в состав Украины и Беларуси. Польская проблема в виде сохранения «остаточного государства» могла стать предметом разногласий между Советским Союзом и Германией. Расчленение областей с польским населением неизбежно вызвало бы его стремление к национальному единству (как об этом свидетельствует вся история Польши) [3, с. 99]. С другой стороны, включив в свой состав Литву, СССР получал власть над всеми прибалтийскими республиками и значительно отодвигал на этом участке границу с Германией на юг.

Предложения советского правительства нашли воплощение в подписанном между СССР и Германией 28 сентября 1939 г. договоре «О дружбе и границе». Чтобы «задобрить» Литву в процессе интеграции в советскую державу ей решено было передать Вильно.

Вероятно, после того, как руководство БССР было поставлено об этом в известность, в начале октября на Виленщине начинаются аресты белорусской интеллектуальной и политической элиты. Если в Западной Беларуси с репрессиями против белорусского национального движения можно было подождать до выборов в Народное собрание и завершения процесса воссоединения с БССР, то на территории Виленщины чистку от «социально опасных» элементов стремились осуществить до передачи ее Литве [1, с. 36–37]. Сталинский режим претворял в жизнь в отношении белорусов (как и других этнических общностей) задачу их денационализации и преобразования в часть «нового исторического единства» – советского народа.

На переговорах в Москве в октябре 1939 г. с литовским министром иностранных дел Ю. Урбшисом Сталин сообщил о советско-германском соглашении относительно Литвы. Протест Урбшиса приглушался желанием получить Вильно, который советская сторона использовала как приманку в обмен на договор о взаимопомощи. Литовское правительство пыталось отказаться от размещения советских войск на своей территории. СССР настаивал на этом, намекая, что в противном случае Вильно может быть передан Белорусской ССР. В качестве дополнительного аргумента на границах Литвы была развернута 3-я армия Белорусского фронта. Под давлением литовское руководство приняло советское предложение. 10 октября 1939 г. был подписан советско-литовский договор, по которому Виленщина от Западной Беларуси передавалась Литве [4, с. 151].

Для решения вопросов по установлению новой государственной власти 22 октября 1939 г. были организованы выборы Народного собрания Западной Беларуси. Выборы проходили целиком под контролем органов компартии и НКВД. Кандидатуры депутатов прошли строгий отбор на лояльность новой власти. Естественно, весь ход и решения избранного Народного собрания соответствовали разработанному сценарию ЦК КП(б)Б. 29 октября 1939 г. в Белостоке Народное собрание приняло Декларацию о вхождении Западной Беларуси в состав БССР. 2 ноября 1939 г. Верховный Совет СССР, а 14 ноября 1939 г. Верховный Совет БССР законода-

тельно оформили включение Западной Беларуси в состав СССР и объединение с Белорусской ССР [5]. Указом Президиума Верховного Совета СССР от 29 ноября 1939 г. все граждане западных областей Украинской и Белорусской ССР, находившиеся на их территории к 1–2 ноября 1939 г., приобрели гражданство СССР [6].

Несмотря на принятые законодательные акты, процессы национально-территориальных преобразований продолжались. Очередной подарок Литве за счет Беларуси был сделан советским правительством в следующем году. По закону от 3 августа 1940 г. вместе с включением Литвы в состав СССР к новой советской республике присоединялись Свенцянский район и части территории с преобладающим литовским населением Видзовского, Годутишковского, Островецкого, Вороновского и Радуньского районов [7, с. 472]. Естественно, что главными причинами этой акции были не соображения учета национального состава населения, а вновь политико-стратегические цели сталинского руководства.

Аналогичный подход существовал в позиции правительства СССР по проблеме перемещения населения. В середине октября 1939 г. была создана советско-германская смешанная комиссия по переселению. В отличие от Германии власти СССР применяли жесткую селекцию желающих переселиться на его территорию. На заседании комиссии 7 ноября 1939 г. заместитель наркома внутренних дел И. Масленников заявил, что Советский Союз «не нуждается в состоятельных переселенцах белорусских и украинских, а лишь в пролетариате и широких народных массах» [3, с. 35–36].

16 ноября 1939 г. было подписано советско-германское межправительственное соглашение об эвакуации украинского, белорусского, русского, русинского и немецкого населения с территории бывшей Польши. Согласно соглашению, около 25 тыс. немцев выехали в Германию из Западной Беларуси, а из Польши в Беларусь вернулись около 15 тыс. белорусов. Советское правительство, однако, не проявило заинтересованности в переселении евреев из немецкой зоны оккупации в СССР [8].

Характерно, что германская сторона добивалась выезда из СССР не только немцев, но и лиц других национальностей, изъявивших на это желание. 9 января 1940 г. посол Ф. Шуленбург передал

Под ударами немецкой армии, которая 1 сентября 1939 г. ворвалась в Польшу, польская армия распалась, а ее правительство покинуло страну. С начала немецко-польской войны, несмотря на активные подходы со стороны руководства нацистской Германии втянуть в военные действия против Польши советские вооруженные силы, руководство СССР заняло выжидательную позицию. В то же время в газетах «Правда» и «Известия» начали печататься статьи, в которых подчеркивалась необходимость помощи белорусскому и украинскому населению. 6 сентября был проведен частичный призыв запасных, а еще 1 сентября был отдан приказ о создании Белорусского и Украинского фронтов [2, с. 121].

Белорусским фронтом командовал 42-летний командарм 2-го ранга Михаил Прокопович Ковалёв. Начальником штаба являлся бывший глава советской военной миссии в Берлине 45-летний комкор Максим Алексеевич Пуркав. Белорусский фронт состоял из четырех армий, Дзержинской конно-механизированной группы 23-го стрелкового корпуса. Он насчитывал 200 802 солдата и офицера [3, с. 104]. Большинство военнослужащих особого состава Белорусского фронта составляли уроженцы Восточной Беларуси, белорусы по национальности.

Войскам Белорусского фронта противостояли 45 тысяч польских солдат и офицеров, из которых примерно половина была не вооружена и не собрана в конкретные воинские части. Вдоль границы с БССР тонкой линией размещались польские соединения, которые входили в состав корпуса пограничной охраны в количестве 8 тыс. чел. и около 2 тыс. моряков «Пинской речной флотилии». Наиболее обороноспособной являлась самостоятельная

оперативная группа «Полесье» под командованием генерала Ф. Клеберга, которому удалось собрать около 17 тыс. солдат и офицеров. Однако только половина из них была объединена в боевые единицы и вооружена [4, s. 110].

17 сентября в 5-м часу утра войска Красной Армии двинулись навстречу немцам, которые уже вышли в некоторых районах далее обусловленной в секретном протоколе линии. Известие о переходе Красной Армией границы застало командующего польскими войсками Э. Рыдз-Смиглы в городе Владимир-Волынский. Как командующий он должен был принять решение, от которого зависела судьба тысяч его соотечественников – солдат и офицеров.

К его чести было принято разумное решение. Был отдан приказ: «Советы пришли. Приказываю общее отступление на Румынию и Венгрию самыми короткими путями. С Советами не воевать, только в случае наступления с их стороны, или попыток разоружения наших подразделений» [5, с. 278–279].

В оперативную задачу Белорусского фронта входило занятие северо-восточных земель Западной Беларуси до границы с Литвой и Латвией по линии рек Пина и Припять. Кроме основных в подчинении руководства фронта также находились особые военные единицы, которые выполняли для них разведовательные и иные специальные задания. На некоторых направлениях наступления фронтов действовали диверсионные группы, созданные заранее на территории Польши.

Военные действия Красной Армии начали войска НКВД, которые разработали планы по ликвидации особых группировок польской армии и приступили к их осуществлению.

В обращении военных советов фронтов говорилось о необходимости лояльного отношения к польским военнослужащим и госчиновникам, если они не оказывают вооруженного сопротивления. Авиации запрещалось подвергать бомбардировкам населенные пункты.

Почти повсеместно части регулярной польской армии складывали оружие. Наибольшие трудности для Красной Армии 17 сентября создали отделение полков Польского оборонного корпуса «Глубокое» и «Вилейка», которые были дополнительно укрепле-

ны военнослужащими-осадниками и полицейскими и оказывали ощутимое вооруженное сопротивление. Согласно польским источникам, зафиксировано около 40 случаев сопротивления пограничных патрулей, а также бои под Кобрином, Гродно, Вильнюсом и Белостоком. Наиболее упорные бои развернулись 20–21 сентября в Гродно, где 15 танковый корпус понес потери до 15 танков, было убито 47 человек и 156 ранено [2, с. 142].

Таким образом, из под польской власти в итоге военной операции были освобождены 17 сентября Молодечно, Воложин, Кареличи, Барановичи; 18 сентября – Новогрудок, Слоним, Лида; 19 – Вильнюс, Пружаны; 21 – Гродно, Пинск. 22 сентября 23-я танковая бригада под командованием С. М. Кривошеина вступила в Брест. На Кобринском мосту членами КПЗБ им была организована торжественная встреча, в которой приняли участие жители ближайших от города деревень: Ямно, Тришин, Вычулки, Волки и др.

23 сентября 1939 г. в Бресте состоялся совместный парад советских и немецких войск. Это был дипломатический жест, который официально закрепил право нахождения Красной Армии в Бресте. Сразу после окончания парада немецкие войска направились через Буг, по которому в соответствии с советско-германским договором от 28 сентября 1939 г. «О дружбе и границах» должна была пройти граница между СССР и Польшей по так называемой линии Керзона [5, с. 281].

Последними военными столкновениями были бои на южном крыле Белорусского фронта, где отделения четвертой армии вступили во взаимодействия с частями охранного отдела «Полесье». Столкновения продолжались до 29–30 сентября, но существенной роли уже не играли.

До 1 октября 1939 г. Красная Армия, не понеся больших потерь, полностью выполнила поставленные задачи и освободила территорию Западной Беларуси.

В итоге операции Советский Союз получил определенное время для укрепления своей обороноспособности накануне Великой Отечественной войны.

Литература

1. Энцыклапедыя гісторыя Беларусі: у 6 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 1996. – Т. 3. – 527 с.
2. Праблемы ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР: гісторыя і сучаснасць: матэр. міжнар. навук.-тэарэт. канф., Мінск, 17–18 верас. 1999 г. / БДУ; адказн. рэд. П. І. Брыгадзін, У. Ф. Ладысеў. – Мінск, 2000. – 333 с.
3. История второй мировой войны 1939–1945 гг.: в 12 т. / редкол. Р. Р. Бысюк, Г. К. Киселев, А. П. Кондак [и др.]. – М., 1974–1982. – Т. 2.
4. Lisewski, K. Wojna polsko-sowiecka 1939 / K. Lisewski. – Londyn, 1988.
5. Памяць: гіст.-дакум. хронікі градоў і раёнаў Беларусі: Брэст: у 2 кн. – Кн. 1. – Мінск, 1997.

А. Н. Кукса

Белорусский национальный технологический университет, Минск

ПРОЕКТЫ СОЦИАЛЬНО-ЭКОНОМИЧЕСКИХ ПРЕОБРАЗОВАНИЙ В ЗАПАДНЫХ ОБЛАСТЯХ БЕЛОРУССКОЙ И УКРАИНСКОЙ ССР (СЕНТЯБРЬ 1939 – ЯНВАРЬ 1940 г.)

Условия Рижского мирного договора сблизили судьбы населения Западной Беларуси и Западной Украины как восточных регионов Польши. Значительным образом изменяется положение этих регионов 17 сентября 1939 г., когда, войдя в состав БССР и УССР, они территориально находились в составе уже разных республик. Произошло воссоединение белорусского народа в пределах этнографического расселения. После восстановления территориальной целостности БССР и частично УССР на новые административные единицы начали распространяться и общие положения политического и социально-экономического уклада, выработанного республиками Советского Союза. Несмотря на всю последовательность проводимой советскими учреждениями политики, попытки стандартизации и унификации всех сфер жизнедеятельности новых административно-территориальных образований, сама специфика регионов Западной Беларуси и Западной Украины предполагала наличие отличий и особенностей в их развитии.

С введением подразделений Красной Армии появились и временные управления, которые проводили революционные преобразования: раздел помещичьей и церковной земли, национализацию промышленных предприятий и банков, создание учреждений образования, отрядов рабочей гвардии и крестьянской милиции. В организации этой работы им большую помощь оказывали советские республики. Уже в первые месяцы после освобождения в Западную Беларусь были завезены тысячи тонн соли, керосина и других товаров широкого потребления.

27 октября 1939 г. Народное собрание в Львове, а 30 октября в Белостоке приняли решения о воссоединении Западной Украины с УССР и Западной Беларуси с БССР. В этом же порядке проходило и принятие Верховным Советом СССР решений о включении этих территорий в состав Советского Союза. 1 ноября 1939 г. утвердили решение по Западной Украине, а 2 ноября постановили включить Западную Беларусь в состав СССР. Завершающим законодательным актом воссоединения белорусского народа стало Постановление Внеочередной III сессии Верховного Совета БССР от 12 ноября 1939 г. о принятии Западной Беларуси в состав БССР. 15 ноября подобное решение было принято и Верховным Советом УССР. Окончательно вопрос о территориальном оформлении Украины был решен только после того, как в августе 1940 г. в состав УССР вошли Бессарабия и Северная Буковина, а в июне 1945 г. – Закарпатье.

После решения правовых вопросов и включения Западной Беларуси и Западной Украины в состав СССР активно начали решаться и вопросы административно-территориального деления, экономического и социально-культурного характера. Уже 1 ноября Верховный Совет СССР обязал Верховные Советы БССР и УССР подготовить проекты разграничения западных районов и областей между УССР и БССР. Проект разграничения, присланный Н. Хрущевым, заставил П. Пономаренко обратиться за консультацией к историку В. Пичете, а позже проводились встречи и с И. Сталиным. 22 ноября П. Пономаренко вызван к И. Сталину, где был и Н. Хрущев. Однако 29 ноября 1939 г. по телефону секретарь Президиума Верховного Совета СССР Горкин сообщал П. Поно-

маренко следующее: «Я звонил Наталевичу, он не отвечает. Прошу ускорить высылку проекта Указа Президиума Верховного Совета БССР о разграничении областей между БССР и УССР и об образовании областей в составе БССР». Проект Указа Президиума Верховного Совета СССР политбюро ЦК ВКП(б) утвердило только 4 декабря 1939 г. [1, с. 240].

В сообщении Савкина, полученном по телефону 29 ноября 1939 г., был доведен до сведения проект постановления ЦК ВКП(б) и СНК СССР «О переходе на советскую валюту на территории Западной Украины и Западной Белоруссии». В соответствии с представленным проектом, предполагалось до 15 декабря обязать Государственный банк все расчеты государственных и кооперативных предприятий перевести на советскую валюту, запретить выплату зарплаты польскими злотыми, а их текущие счета в польских злотых выдавать в советской валюте из расчета один к одному. Для реализации этих мероприятий до 10 декабря предполагалось организовать областные конторы Государственного банка в следующих городах: Львове, Ровно, Тернополе, Станиславове, Дрогобыче, Белостоке, Барановичах, Бресте, Вилейке и Пинске. В целях обеспечения всех выплат постановили «разрешить Государственному Банку для выполнения указанных выше мероприятий выпустить в обращение (эмиссию) 700 млн руб., в том числе в западной Украине – 400 млн руб. и в западной Белоруссии – 300 млн руб.» [2, л. 25].

По результатам работы комиссии Швернина Экономическому совещанию при СНК БССР были представлены проекты о заготовке продуктов питания, зарплате, ценах и организации торговли. В соответствии с проектом «О зарплате и государственном социальном страховании рабочих и служащих предприятий и учреждений в западных областях Белоруссии и Украины» предполагалось с 16 января 1940 г. перейти на нормы, распространенные в СССР. Ставки зарплаты предлагали установить за 8-часовой рабочий день при 7-дневной рабочей неделе. Из социальных гарантий предполагались оплата очередного отпуска, оплата ученикам, за простой, за работу в ночное время и за сверхурочную работу.

Значительное внимание уделялось аграрному сектору экономики этих регионов и возможности проведения государственных закупок по тарифам, которые действовали внутри Союза. Закупочные цены на продукты, которых было недостаточно в БССР (рожь, пшеница, ячмень, просо) предполагалось установить выше, чем в УССР. В то же время картофель, который был в избытке в БССР, предполагалось закупать по 100 рублей за тонну, тогда как в УССР предельная цена устанавливалась в 120 рублей. Подорожание продуктов продовольствия, которое должно было произойти после перехода на единые закупочные цены, предполагалось компенсировать путем повышения зарплаты. «В западных областях УССР и БССР в настоящее время отсутствует единая система цен. Розничные цены государственной и кооперативной торговли по целому ряду важнейших товаров ниже единых розничных цен СССР. В условиях упорядочения торговли в западных областях УССР и БССР необходимо ввести устойчивые цены – в основном на уровне единых действующих в СССР розничных цен. Связанное с этим некоторое повышение общего уровня цен должно быть учтено при определении зарплат» [3, л. 15].

В целях решения задач по государственным закупкам составивший докладную записку в СНК СССР А. Зверев, предлагал ввести единые розничные цены. «Розничные цены на хлеб в Западной Украине примерно вдвое ниже единых цен (ржаной хлеб во Львове стоит на рынке 45 коп. за кг против 75 коп. в Киеве и 85 коп. в Минске и Москве). До тех пор, пока в западных областях УССР не будет введена определенная система заготовок зерна, обеспечивающих стабильность заготовительных цен, всякое значительное повышение розничной цены в государственной и кооперативной торговле приведет к повышению цен в частной торговле и на базарах, а тем самым затруднит заготовку зерна по приемлемым ценам и повлечет за собой необоснованное увеличение доходов деревни». Для перехода на единые закупочные цены предполагалось организовать областные и уездные союзы потребкооперации в западных областях Беларуси и Украины. «Существующие в западных областях УССР и БССР кооперативные центры, союзы, их отделения влить в систему Укркоопспилки

и Белкоопсоюза, с передачей торгово-технической базы и материально-имущественных ценностей организованным областным и уездным потребительским союзам. Обязать Центросоюз организовать областные хозрасчетные универсальные базы Облпотребсоюзов по УССР: в городах Львове, Дрогобыче, Станиславове, Тернополе, Ровно, Луцке; по БССР: в городах Пинске, Бресте, Барановичах, Молодечно» [3, л. 16].

Предполагаемые изменения в области экономики требовали внесения корректив и в управленческий аппарат. Из пределов восточных областей БССР на руководящие посты в западные области направлялись подобранные районными комитетами КП(б)Б специалисты. В январе 1940 г. по линии образования в западные области Витебский обком КП(б)Б рекомендовал 24 человека, Полесский – 6, Гомельский – 14, Минский – 27. В основном это были учителя, которых направляли на работу в качестве директоров школ. Подобные выдвижения проходили и в других структурных подразделениях БССР. Массовый отток в западные области партийных работников привел к появлению кадровой проблемы в восточных областях БССР. Партийное руководство вынуждено было говорить о слабом выдвижении беспартийных на руководящие должности и хозяйственную работу, чего ранее не замечалось. «В связи с ростом республики вдвое, вдвое больше потребовалось и кадров. Многих опытных работников направили для работы в новые области и районы Западной Белоруссии. В районах же и областях восточных и западных многие места остаются вакантными. В ряде мест руководящие товарищи выжидают присылки людей. Этого не должно быть. Все это происходит в результате того, что во многих наших партийных организациях и у их руководителей укоренился неправильный порядок замещения всех руководящих должностей в области и районе только членами или кандидатами партии» [4, л. 15].

Происходят изменения и в сфере образования. В виду увеличения территории вдвое, ведущие вузы республики – Горецкий сельскохозяйственный институт и Белорусский политехнический институт предлагали увеличить наборы студентов и открыть новые специальности. Эти предложения руководители вузов обос-

новывали и грядущими юбилейными датами. Поступившие в ЦК КП(б)Б предложения были поддержаны П. Пономаренко, который ходатайствовал перед ВКП(б) о присвоении Горецкому институту, ввиду 100-летнего юбилея, статуса академии и предлагал увеличить набор студентов за счет открытия нового факультета. Белорусский политехнический институт, как единственное и крупнейшее в республике индустриальное учебное заведение, П. Пономаренко, в виду 10-летнего юбилея, предлагал расширить путем открытия новых учебных корпусов, кабинетов и лабораторий.

Территориальные изменения привели и к необходимости изменения статуса Минска. В январе 1940 г. проектом постановления ЦК КП(б)Б «О выделении Минска в самостоятельную административно-территориальную единицу», который подписали секретарь ЦК КП(б)Б П. Пономаренко и председатель СНК БССР К. Киселев, предполагалось повысить статус белорусской столицы. В проекте предлагалось «1. Выделить Минск из состава Минской области в самостоятельную административно-территориальную единицу; 2. Поручить СНК БССР установить порядок отдельного выделения Минску капиталовложений и материальных фондов по всем отраслям хозяйства, культуры и управления, а также отдельного утверждения бюджета города; 3. Поручить Президиуму Верховного Совета БССР внести соответствующее изменение в Указ от 27 сентября 1937 г. «О классификации населенных пунктов БССР», установив, что Минск является городом не областного, а республиканского подчинения; 4. Просить ЦК ВКП(б) утвердить данное решение» [3, л. 1].

Таким образом, социально-экономические преобразования в западных областях Беларуси и Украины предполагалось проводить по общим схемам. Однако учитывая специфику регионов, предполагалось наличие и некоторых отличий. В изменениях активное участие принимали партийные работники, которые набирались в восточных областях БССР и УССР. Однако влияние было не односторонним. Включение западных областей в состав БССР и УССР оказало влияние на различные сферы жизнедеятельности белорусского общества. Проявилась нехватка в управ-

ленческих кадрах, изменилась структура заготовительных операций, наметились изменения в развитии высшей школы. Укрупнение республики привело к попыткам руководителей БССР повысить статус столицы.

Источники и литература

1. Хомич, С. Н. К проблеме установления границы между Белорусской ССР и Украинской ССР в 1939 г. / С. Н. Хомич // Молодежь в науке–2007: прилож. к журн. «Весці Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі»: в 4 ч. – Минск, 2008. – Ч. 2: Сер. гуманит. наук / редкол.: П. Г. Никитенко (гл. ред.), В. В. Гниломедов [и др.].

2. Национальный архив Республики Беларусь. – Фонд 4п. – Оп. 1. – Д. 14748: Копии входящих телеграмм серии.

3. Там же. – Д. 16718: Постановление ЦК КП(б)Б о выделении Минска в самостоятельную административно-территориальную единицу.

4. Там же. – Д. 14387: Переписка Всесоюзного комитета по делам высшей школы.

С. А. Лукашанец

Беларускі дзяржаўны універсітэт, Мінск

УЗ'ЯДНАННЕ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ І ЗАХОДНЯЙ УКРАІНЫ З БССР І УССР. ПРАБЛЕМА ЗАХОДНЯЙ МЯЖЫ ПОЛЬШЧЫ

У дадзеным дакладзе будзе разгледжана, як уз'яднанне Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны з БССР і УССР адпаведна прывяло да пасляваеннага пашырэння тэрыторыі Польшчы на Захадзе і садзейнічала ўсталяванню польска-германскай мяжы па лініі рэк Одэр–Ныса-Лужыцкая.

Як вядома, падзеі 1939 г. стварылі цалкам новую сітуацыю ва Усходняй Еўропе. Польшча, тэрыторыя якой была падзелена паміж яе суседзямі, знікла з палітычнай карты свету. Значная частка яе тэрыторыі (Заходняя Беларусь і Заходняя Украіна) апынуліся ў складзе СССР (БССР і УССР адпаведна). Па меркаванні, агучаным савецкім кіраўніцтвам, Польшча як суб'ект міжнародных

адносін перастала існаваць. Польскі ўрад, які пераехаў у Лондан, да ўвагі не прымаўся. Такая сітуацыя на працягу пэўнага перыяду цалкам задавальняла ўлады СССР. І хоць былі пэўныя прыкметы таго, што Савецкі Саюз усё ж задумваецца аб стварэнні ў той ці іншай форме нейкай польскай адзінкі на сваіх землях, але ніякіх канкрэтных крокаў у гэтым напрамку зроблена не было.

Зусім інакш усё стала пасля нападзення Германіі на Савецкі Саюз летам 1941 г. Супраць волі Масква апынулася ў адным ваенна-палітычным лагеры з Вялікабрытаніяй і Злучанымі Штатамі, стаўшы членам антыгітлераўскай кааліцыі. А значыць – на адным баку з эміграцыйным польскім урадам – фармальна законным прадстаўніком часова акупіраванай польскай дзяржавы. Іронія заключалася ў тым, што СССР якраз і быў адной з тых дзвюх краін, якія ў 1939 г. ажыццявілі падзел Польшчы. Так ці інакш, пасля ўзнаўлення адносін паміж Савецкім Саюзам і польскім эміграцыйным урадам у Лондане пытанню аб «крэсах усходніх» яшчэ прадстаяла паўстаць у будучыні.

І паставіў яго, натуральна, польскі ўрад на эміграцыі. Яшчэ ў лістападзе 1939 г. віцэ-прэм'ер С. Стронскі абвясціў аб неабходнасці аднаўлення Польшчы ў яе цэласці, у тым ліку тэрытарыяльнай [1, s. 300]. Лічылася, што Польшча не можа выйсці з вайны зменшанай тэрытарыяльна. Гэта азначала, што пасля заканчэння вайны ў Гродне, Брэсце, Вільні, Львове зноў залунае «чырвонабелы» сцяг. Але размова пра тэрытарыяльны status quo ante bellum не ішла. Варварская, здрадніцкая агрэсія Германіі ў верасні 1939 г. вымагала пакарання злачыннай дзяржавы. Германія мусіла расплаціцца землямі, і задачай польскіх ідэолагаў было вызначыць памер кампенсацый.

Тут улічваліся розныя акалічнасці: і наяўнасць «польскага» (славянскамоўнага) насельніцтва, і пытанні паляпшэння абараназдольнасці краіны. У першую чаргу размова ішла аб тых рэгіёнах, прэтэнзіі на якія польская палітычная эліта выказала яшчэ ў 1920-я гады – Верхняя Сілезія і Усходняя Прусія (Мазуры).

Так, у першую чаргу неабходна было, на думку большасці польскіх аналітыкаў, ліквідаваць Усходнюю Прусію [2, л. 46], якая ўвесь час стварала пагрозу для Польшчы, а таксама далучыць шэраг

тэрыторый на Памор'і (Гданьск) і Верхняй Сілезіі. Мемарандум польскага эміграцыйнага ўрада ад лістапада 1940 г. сцвярджаў неабходнасць далучэння Усходняй Прусіі і Гданьска, а таксама часткі «прускай» Сілезіі [1, s. 306]. Першапачаткова ўрад У. Сікорскага распрацаваў ідэю шчыльнай акупацыі ў яе максімальным варыянце, гэта значыць перадачу Польшчы пад акупацыю вялікай часткі германскай тэрыторыі пасля вайны як гарантыю ад новай агрэсіі. Існуе меркаванне, што такая акупацыя магла быць першым крокам да ўключэння іх у склад Польшчы [1, s. 316]. А 7 снежня 1943 г. польскі эміграцыйны ўрад ухваліў тэзісы аб інкарпарацыі ўсходніх нямецкіх земляў, а менавіта Усходняй Прусіі, Гданьска, Апольскай Сілезіі, а таксама перамяшчэнне мяжы на захад, каб забяспечыць бяспеку мяжы з Германіяй [1, s. 321]. У любым выпадку, у польскай палітычнай думцы замацавалася ўяўленне аб тым, што пасля вайны ў склад Польшчы ўвойдуць усходнія нямецкія землі. Але іх памер свядома абмяжоўваўся такім чынам, каб не дапусціць перадачу тэрыторый з пераважна нямецкім насельніцтвам, прысутнасць якога ў пасляваеннай Польшчы была ўвогуле недапушчальнай.

Ва ўсіх гэтых планах было адно слабае месца – СССР рашуча адвяргаў саму магчымасць адмовы ад «крэсаў усходніх». Адна справа – пэўная карэкцыя мяжы, а зусім іншая – вяртанне Польшчы Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны. Не ўдаючыся ў дакладны аналіз усяго комплексу гістарычных, палітычных, нацыянальных і стратэгічных аргументаў савецкага боку, адзначым, што пазіцыя Савецкага Саюза па гэтым пытанні была цвёрдай і няўступлівай на працягу ўсёй вайны.

А што засталося б ад перадваеннай Польшчы без «крэсаў усходніх»? Савецкія ўлады гэта разумелі, таму міласціва прапаноўвалі разлічыцца за кошт Германіі. Сталін так і сказаў міністру замежных спраў Вялікабрытаніі Э. Ідэну падчас перамоў у снежні 1941 г. – мяжа паміж СССР і Польшчай павінна праходзіць па так званай лініі Керзона, якая была прапанавана ў адпаведнай якасці яшчэ пасля Першай сусветнай вайны [3, с. 502]. Адначасова «Айцец народаў» акрэсліў памер польскіх тэрытарыяльных кампенсацый (Усходняя Прусія) і прапанаваў «эвакуіраваць» адтуль

нямецкае насельніцтва [4, с. 136–139]. Пры гэтым ён фактычна першы сярод лідэраў краін кааліцыі агучыў той «чароўны» спосаб, які дазволіць палякам пагадзіцца на далучэнне этнічна нямецкіх тэрыторый – дэпартацыя. Але Сікорскі таксама праяўляў цвёрдасць і на адмову ад «крэсаў усходніх» не пайшоў.

Канфлікт у кааліцыі набіраў моц. Як вядома, справа Катыні канчаткова «ўбіла палю» ў адносіны паміж польскім урадам у Лондане і савецкім кіраўніцтвам. Гэта не магло застацца без увагі іншых. Асаблівую заклапочанасць выказвалі ўлады Вялікабрытаніі. Для іх разрыў паміж палякамі і СССР быў надзвычай нязручнай справай. З аднаго боку, яны павінны былі падтрымліваць польскі ўрад (менавіта дзеля абароны гэтай краіны Англія ўступіла ў вайну), з іншага – без Савецкага Саюза вядзенне барацьбы з Германіяй было немагчымым [1, s. 300]. Таму пачаліся перамовы з мэтай улагодзіць польска-савецкія стасункі. Канешне, прыходзілася ўлічваць важнейшыя прыярытэты. De facto прызнанне Вялікабрытаніяй далучэння Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны да БССР і УССР адбылося ўжо ў першай палове 1942 г., хаця сама лінія Керзона як польска-савецкая мяжа яшчэ выклікала спрэчкі, а яе канчатковае ўсталяванне, відавочна, залежала ад размеркавання сіл у канцы вайны. У. Чэрчыль прыкладаў велізарныя намаганні, каб усталяваць добрыя адносіны паміж польскім эміграцыйным урадам і ўрадам Савецкага Саюза. Адпаведна ўзнікала пытанне, як пераканаць польскі эміграцыйны ўрад адмовіцца ад прэтэнзій на былыя «крэсы ўсходнія», каб англа-польскі саюз не стаў у супярэчнасць з англа-савецкім. Англічане (у першую чаргу міністр замежных спраў) цікавіліся, ці не лепей было б палякам адмовіцца ад «крэсаў усходніх», каб у рэшце ўсталяваць нармальныя адносіны з Савецкім Саюзам, тым больш, што аўтарства лініі Керзона належала менавіта англійскаму міністру замежных спраў яшчэ ў 1920-я гады [1, s. 303]. Навуковыя даследаванні, апублікаваныя ў час вайны ў Англіі, таксама сведчылі аб няпольскім характары «крэсаў усходніх» [2, л. 106]. І канешне, англічане адразу далі зразумець, што няма надзеі на выкарыстанне сілы супраць СССР з мэтай вяртання «крэсаў усходніх». Выхад бачыўся ў перадачы Польшчы пасля вайны пэўных кам-

пенсацый за страчаныя Заходнюю Беларусь і Заходнюю Украіну, і гэтыя кампенсацыі, натуральна, абяцаліся за кошт Германіі. Найбольш яскрава і непрыкрыта аб гэтым паведаміў у сваёй дэпешы да У. Чэрчыля Э. Ідэн, які ў той момант знаходзіўся з візітам у ЗША. Амерыканскі прэзідэнт пагадзіўся з думкай, нібыта далучэнне да Польшчы Усходняй Прусіі і часткі Сілезіі дазволіць палякам прызнаць лінію Керзона [1, s. 318].

У ходзе наступных перамоў паміж краінамі – удзельніцамі антыгітлераўскай кааліцыі памер польскіх кампенсацый павялічваўся, бо адна толькі Усходняя Прусія, далучэнне якой хаця і ліквідавала б пагрозу для польскай дзяржавы з поўначы, не кампенсавала б тэрытарыяльных страт на Усходзе. Падчас візіту У. Сікорскага ў Маскву 4 снежня 1941 г. яму было сказана, што пасля вайны Польшча ўсталюе сваю заходнюю мяжу па Одэры, атрымаўшы пры гэтым Усходнюю Прусію (тое ж самае было паўторана ў хуткім часе Э. Ідэну) [5, s. 34; 1, s. 311]. А ў 1943 г. у Маскве лічылася неабходным пасля заканчэння вайны адарваць ад Германіі Верхнюю (Апольскую) Сілезію, Памор'е на ўсход ад лініі, якая злучае Кашалін і польска-нямецкую мяжу 1939 г. [6, s. 269]. На працягу амаль усёй вайны падчас перамоў узгадваліся Верхняя Сілезія, Усходняя Прусія, Гданьск (Данцыг), але без дакладнага абрысу [4, с. 241, 264]. Да вясны 1943 г. удзельнікі антыгітлераўскай кааліцыі ў агульным пагадзіліся з думкай аб польскіх кампенсацыях на Захадзе [1, s. 318]. Па-сутнасці, У. Чэрчыль і Ф. Рузвельт падыгрывалі І. Сталіну і яго ініцыятывам, бо самі мелі ў гэтай справе толькі ўскосны інтарэс [4, с. 201–203].

Існавала спроба ўвесці ў размову аб польскіх кампенсацыях на Захадзе аб'ектыўны крытэрый – крытэрый нацыянальнасці. Кампенсацыі павінны былі ахапіць усе ўсходнія нямецкія землі, дзе пражывала (альбо мусіла пражываць) польскае насельніцтва. Падчас Тэгеранскай канферэнцыі польская заходняя мяжа не была вызначана, але У. Чэрчыль цьмяна гаварыў пра польскія этнічныя тэрыторыі паміж Бугам і Одэрам [7, с. 148]. Непасрэдна перад Крымскай канферэнцыяй Э. Ідэн у спецыяльнай нататцы Чэрчылю пісаў, што Вялікабрытанія і ЗША згодныя на далучэнне да Польшчы Усходняй Прусіі на поўдзень і захад ад Кёнігсберга,

Гданьска, усходняй ускраіны Памор'я і ўсёй Верхняй Сілезіі [6, s. 282]. Але па меры стварэння польскіх пракамуністычных груповак і павелічэння іх уплыву, савецкі варыянт польска-нямецкай мяжы стаў змяшчацца на Захад.

Савецкае кіраўніцтва лічыла мэтазгодным павялічыць тэрыторыю свайго будучага сатэліта. Цяжка сказаць, калі дакладна савецкае кіраўніцтва вырашыла выкарыстаць у якасці будучай польска-нямецкай мяжы лінію па р. Одэр і Ныса-Лужыцкая, якая ідзе амаль што дакладна з поўначы на поўдзень. Гэтая лінія ўжо паспела патрапіць у сферу ўвагі польскіх палітычных дзеячаў, але не атрымала падтрымкі. У сваім рэфераце, прадстаўленым польскаму эміграцыйнаму ўраду ў снежні 1942 г., М. Сейда назваў мяжу з Германіяй па лініі рэк Одэр і Ныса-Лужыцкая нічым не абгрунтаваным інкарпарацыйным запытам (мінімальнай мэтай абвяшчалася Усходняя Прусія, асноўнай – Апольская Сілезія). У гэтым праяўлялася асцярожнасць у набыцці тэрыторый на захадзе [4, с. 197–199]. Але ў рэфераце, які 1 снежня 1942 г. быў скіраваны польскім урадам да ўрада брытанскага, лінія р. Одэр і Ныса-Лужыцкая абвяшчалася лініяй бяспекі польскай дзяржавы, як, напрыклад, р. Рэйн для Францыі і Бельгіі (такой жа пазіцыі прытрымліваліся крайне правыя польскія арганізацыі) [1, s. 315; 8, s. 21]. Камандзір польскай дывізіі імя Касцюшкі З. Берлінг у сваіх мемуарах прыпісваў «аўтарства» рэферата сабе, адносячы яго да другой паловы 1942 г., але гэта ўяўляецца малаверагодным (што ўскосна пацвярджае адсутнасць узгадак аб гэтым у праграмных дакументах дывізіі) [9, s. 13; 11]. Па сведчанні асобных даследчыкаў, падчас візіту ў Вашынгтон у снежні 1942 г. – студзені 1943 г. прэм'ер-міністр У. Сікорскі прапанаваў р. Одэр і Нысу-Лужыцкую як будучую польска-нямецкую мяжу, але гэта таксама не адпавядае ісціне: у сваёй размове 2 снежня 1942 г. з прэзідэнтам Рузвельтам Сікорскі вёў гаворку аб далучэнні ўсё той жа Усходняй Прусіі і Гданьска (а вось у яго штабе разглядаўся і першы варыянт) [1, s. 316; 10, s. 26].

Прыняцце гэтай лініі савецкім кіраўніцтвам адбылося недзе ў 1944 г., калі ўзнікла ўпэўненасць у тым, што пасляваенная Польшча будзе савецкім саюзнікам, а астатнімі ўдзельнікамі кааліцыі –

і яшчэ пазней. Менавіта ў жніўні 1944 г. І. Сталін у сваіх размовах з польскімі эміграцыйнымі палітыкамі паабяцаў ім г. Вроцлаў (а значыць, і Ніжнюю Сілезію, пра далучэнне якой да Польшчы раней не гаварылася) [12, с. 74; 4, с. 286–305]. На больш высокім узроўні аб р. Одэр і Ныса-Лужыцкая было сказана непасрэдна перад Крымскай канферэнцыяй [5, s. 31]. Такі варыянт мяжы акрамя сваіх станоўчых рыс (мінімальная працягласць, аб'яднанне ўсіх тэрыторый старажытнапольскай дзяржавы Пястаў), меў яшчэ адну важную акалічнасць – уключэнне земляў з чыста нямецкамоўным насельніцтвам [13, с. 39]. Канчатковае рашэнне Крымскай канферэнцыі было вельмі расплывістым і дэкларатыўным («значныя кампенсацыі на Захадзе і Поўначы»), хаця лінія Керзона ў якасці савецка-польскай мяжы была акцэптавана [14, с. 214]. Канчатковае рашэнне па польскіх межах, у т. л. усталяванне мяжы з Германіяй па лініі рэк Одэр і Ныса-Лужыцкая, а з СССР – па «лініі Керзона» (з пэўнай карэкцыяй), адбылося падчас Патсдамскай канферэнцыі. Менавіта пазіцыя СССР у выніку прывяла да зацвярджэння гэтага варыянту мяжы (аб чым неаднаразова гаварылася ў пасляваенныя гады) [15, л. 4]. СССР быў больш за іншыя краіны зацікаўлены ў тым, каб Польшча задаволілася кампенсацыямі за кошт Германіі і канчаткова адмовілася ад былых «крэсаў усходніх».

Такім чынам, далучэнне да Польшчы ўсходніх германскіх земляў (якія пазней атрымалі ў польскай палітычнай думцы назву «Вернутых земляў») было цалкам абумоўлена неабходнасцю кампенсаваць ёй страты «крэсаў усходніх». Не было ніякіх іншых прычын, каб уключаць у склад польскай дзяржавы тэрыторыі, населеныя пераважна нямецкім насельніцтвам. У іншым выпадку размова б ішла аб невялікіх прырашчэннях ва Усходняй Прусіі і Верхняй Сілезіі. І толькі няўступлівасць Савецкага Саюза ў пытанні дзяржаўнай прыналежнасці Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны зрабілі далучэнне непазбежным.

Крыніцы і літаратура

1. Duraczyński, E. Granice Polski w polityce koalicji antyhitlerowkiej i w polityce polskiej / E. Duraczyński // Kompleks wypędzenia: pr. zbior. / W. Borodziej, A. Hajnicz. – Kraków, 1998. – S. 299–327.

2. Архив внешней политики Российской Федерации. – Фонд 122. – Оп. 26. – П. 76. – Д. 6: Обзоры прессы. 9.02.1944 – 9.12.1944.

3. Документы внешней политики / редкол: Е. П. Гусаров (председ.) [и др.]. – М., 2000. – Т. 24: 22.06.1941 – 1.01.1942.

4. СССР и германский вопрос. 1941–1949. Документы из Архива внешней политики РФ: в 3 т. / сост. Г. П. Кынин [и др.]; под ред. Г. П. Кынина, Й. Лауфера. – М., 1996. – Т. 1: 22 июня 1941 г. – 8 мая 1945 г. – 784 с.

5. Podlasek, M. Wypędzenie Niemców z terenów na wschod od Odry i Nysy Łużyckiej. Relacje świadków / M. Podlasek. – W-wa, 1995. – 294 s.

6. Kersten, K. II wojna światowa i podział Europy / K. Kersten // Kompleks wypędzenia: pr. zbior. / W. Borodziej, A. Hajnicz. – Kraków, 1998. – S. 252–286.

7. Советский Союз на международных конференциях периода Великой Отечественных войны. 1941–1945: в 6 т. / редкол.: А. А. Громыко (гл. ред.) [и др.] – М., 1984. – Т. 2: Тегеранская конференция руководителей трех союзных держав – СССР, США и Великобритании. 28 ноября – 1 декабря 1943 года. – 174 с.

8. Jankowiak, S. Wysiedlenie i emigracja ludności niemieckiej w polityce władz polskich w latach 1945–1970 / S. Jankowiak. – W-wa, 2005. – 555 s.

9. Marczak, T. Granica zachodnia w Polskiej polityce zagranicznej w latach 1944–1950 / T. Marczak. – Wrocław, 1995. – 571 s.

10. Mironowicz, E. Polityka narodowościowa PRL / E. Mironowicz. – Białystok, 2000. – 285 s.

11. Милякова, Л. Б. Польша на пути к моноэтническому государству / Л. Б. Милякова // Международный исторический журнал [Электронный ресурс]. – 2003. – Режим доступа: www.hrono.ru/statii/2003/1918_47polon.html. – Дата доступа: 14.01.2007.

12. Советский фактор в Восточной Европе 1944–1953: в 3 т. / сост., науч. коммент. Т. В. Волокитиной. – М., 1999. – Т. 1: 1944–1948. – 480 с.

13. Лукашанец, С. А. Фарміраванне ўяўленняў аб этнічнай структуры польскага грамадства (1939–1945): механізм прыняцця палітычнага рашэння аб высяленні немцаў з Польшчы / С. А. Лукашанец // Весн. БДУ. Сер. 3. Гісторыя. Філасофія. Псіхалогія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Права. – 2005. – № 2. – С. 37–40.

14. Советский Союз на международных конференциях периода Великой Отечественной войны. 1941–1945: в 6 т. / редкол.: А. А. Громыко (гл. ред.) [и др.] – М., 1984. – Т. 4: Крымская конференция руководителей трех союзных держав – СССР, США и Великобритании. 4–11 февраля 1945 года. – 301 с.

15. Государственный архив Российской Федерации. – Фонд 4459. – Оп. 16. – Ед. хр. 81: Международные обзоры. Январь 1946 – июнь 1946 г.

С. Я. Новікаў

Мінскі дзяржаўны лінгвістычны універсітэт

АБАРОНА БРЭСЦКАЙ КРЭПАСЦІ ЛЕТАМ 1941 г.: ПОГЛЯД У СВЯТЛЕ НОВЫХ ДАКУМЕНТАЛЬНЫХ ФАКТАЎ

Падставай для падрыхтоўкі дадзенага матэрыялу з'яўляецца з аднаго боку выхад 800-старонкавай кнігі «Штурм Брэсцкай крэпасці» [1], якая не мае аналагаў у айчыннай ваенна-гістарычнай літаратуры, а з другога – аналіз нямецкіх дакументальных фактаў, выяўленых у данясенні камандзіра 45-й нямецкай пяхотнай дывізіі «Аб баявых дзеяннях у ходзе ўзяцця Брэст-Літоўска» [2]. Акрамя таго, неабходнасць для крытычнага погляду на фактычныя вынікі баявых дзеянняў на брэсцкім рубяжы абароны летам 1941 г. як для нямецкага, так і савецкага бакоў створана апошнім часам дзякуючы ўвядзенню ў навуковы абарот шэрага прынцыпова важных дакументаў [3, с. 396–401; 4, с. 56–61; 5, с. 34–37, 222–234; 6, с. 53–76, 405–433] і інш.

Дзякуючы гэтаму ўзніклі больш спрыяльныя ўмовы для істотнага паглыблення гістарычных ведаў, напісання на новай дакументальнай аснове грунтоўных навуковых прац і ў рэшце цэльнага асэнсавання не толькі гераічных, але і трагічных старонак гісторыі абароны крэпасці ў Брэсце летам 1941 г.

Асноўныя палажэнні навуковай канцэпцыі абароны Брэсцкай крэпасці фарміруюцца ў пачатку 1960-х гадоў. Надзейны падмурак гісторыі гераічнай абароны закладваецца з выхадам калектыўнага зборніка ўспамінаў непасрэдных абаронцаў крэпасці пад назвай «Гераічная абарона» (Мінск, 1961, 1-е выд.). Пры адсутнасці дакументальных крыніц сабраныя ў адну кнігу сведчанні сталі практычна першаасновай для аднаўлення агульнай карціны баявых дзеянняў у ходзе легендарнай абароны крэпасці ў Брэсце.

У навуковым аспекце асаблівую значнасць зборніку надаваў уступны артыкул, падрыхтаваны маёрам А. Крупеннікавым – дырэктарам Музея абароны, адкрытым у лістападзе 1956 г. У прадмове да кнігі аўтар дае агульную характарыстыку абароны, вызначае

яе храналагічныя рамкі і паказвае колькасныя аспекты абароны на аснове матэрыялаў архіва Міністэрства абароны СССР. Цікавай нам падаецца аўтарская спроба агляду тагачаснай айчыннай і замежнай гістарыяграфіі, асабліва вывад аўтара аб неабходнасці выкарыстання розных дакументальных крыніц, у тым ліку нямецкага паходжання. «Трэба адзначыць, – падкрэслівае Крупеннікаў у прадмове, – што Гшопф (аўтар успамінаў пра 45-ю нямецкую пяхотную дывізію. – *С. Н.*) у шэрагу выпадкаў дае праўдзівую карціну баявых дзеянняў у Брэсцкай крэпасці» [7, с. 36].

Паводле матэрыялаў прадмовы, абарона Брэсцкай крэпасці падраздзялялася на два перыяды: першы – з 22 чэрвеня 1941 і да канца месяца, калі 29–30 чэрвеня гітлераўцы правялі генеральны штурм крэпасці; другі – з канца чэрвеня да сярэдзіны ліпеня 1941 г. Аўтар перакананы ў тым, што апошнія ачагі абароны знаходзіліся на Цэнтральным і Кобрынскім умацаваннях [7, с. 26]. Спроба праціўніка раптоўным ударам ашаламіць гарнізон крэпасці і з ходу захапіць яе была сарвана: 45-я нямецкая пяхотная дывізія не выканала сваю галоўную задачу – ёй не ўдалося адразу авалодаць крэпасцю і да зыходу дня 22 чэрвеня прасунуцца на рубеж на ўсходзе Брэста. На думку Крупеннікава, у абароне Брэсцкай крэпасці бралі ўдзел 7 стралковых батальёнаў 6-й і 42-й савецкіх стралковых дывізій агульнай колькасцю прыкладна 3,5 тыс. чал. [7, с. 17]. Апрача таго, у прадмове аўтар адзначае, што толькі «далейшае вывучэнне дакументаў праціўніка, без сумневу, дасць яшчэ больш поўныя і каштоўныя звесткі аб баях у крэпасці» [7, с. 29]. Аднак ідэалагізацыя савецкай гістарычнай навукі не дапускала поўнага выкарыстання інфармацыйнага патэнцыялу дакументальных крыніц, таму з'яўлялася галоўнай перашкодай для аб'ектыўнай распрацоўкі ваеннай тэматыкі. На той час аб рассакрэчванні дакументаў прынцыповага значэння, у тым ліку ўсіх матэрыялаў аб абароне Брэсцкай крэпасці, размова ісці не магла.

Аналагічныя высновы па гісторыі гераічнай абароны Брэсцкай крэпасці былі характэрны для акадэмічных выданняў пачатку 1960-х гадоў [8–10]. У тагачаснай беларускай гістарычнай навуцы інтэрпрэтацыя асобных фактаў зводзілася галоўным чынам да тэзы аб упартым супраціўленні гарнізона Брэсцкай крэпасці

нямецка-фашысцкім войскам: арганізаваная абарона крэпасці вялася да 14 ліпеня, у некаторых яе фартах супраціўленне асобных груп і байцоў не спынялася да 20 ліпеня 1941 г. [8, с. 423]. Асобныя групы абаронцаў працягвалі барацьбу практычна цэлы месяц. Толькі на 32-і дзень вайны, амаль страціўшы прытомнасць, маёр Гаўрылаў быў захоплены ў палон. Стойкая і мужная барацьба гарнізона Брэсцкай крэпасці на працяглы час скавала буйныя сілы нямецкіх войск, якія колькасна значна пераўзыходзілі сілы абаронцаў крэпасці [9, с. 20]. У аснову навуковай канцэпцыі абароны была пакладзена тэза аб 28-дзённай (з 22 чэрвеня па 20 ліпеня 1941 г.) абароне крэпасці Брэст асобнымі падраздзяленнямі савецкіх войск у пачатку Вялікай Айчыннай вайны. У самой крэпасці 45-й нямецкай пяхотнай дывізіі супрацьстаялі асобныя падраздзяленні 6-й і 42-й савецкіх стралковых дывізій, якія разам з пагранічнікамі складалі гарнізон абаронцаў агульнай колькасцю да 3,5 тыс. чал. [10, с. 717].

Але вядучую ролю ў зборы, літаратурнай апрацоўцы і выданні матэрыялаў аб абароне Брэсцкай крэпасці на той час адыграў савецкі пісьменнік С. С. Смірноў. Яго дакументальная кніга «Брэсцкая крэпасць», якая ўпершыню выйшла ў свет у 1965 г., знаёміла чытача з рэальнымі падзеямі гераічнай абароны крэпасці летам 1941 г. Гераічная абарона Брэсцкай крэпасці на рубяжы 1960/70-х гадоў была мемарыялізавана ў камні. На думку Р. Аліева, урачыстае адкрыццё на тэрыторыі крэпасці мемарыяльнага комплексу Брэсцкая крэпасць-герой паставіла кропку на вывучэнні гісторыі Брэсцкай крэпасці [1, с. 793].

Такім чынам, тры першых пасляваенных дзесяцігоддзя развіцця савецкай гістарыяграфіі з'яўляліся важным этапам станаўлення навуковай і грамадскай думкі аб гісторыі гераічнай абароны легендарнай Брэсцкай крэпасці. Асновай для адбудовы навуковай канцэпцыі з'яўляліся галоўным чынам факты з успамінаў удзельнікаў абароны. Ва ўмовах абмежаванасці дакументальных крыніц, закрытасці савецкіх і недаступнасці замежных архіўных фондаў менавіта ўспаміны і асабістыя дакументы складалі асноўны падмурак для рэканструкцыі баявых дзеянняў у ходзе гераічнай абароны Брэсцкай крэпасці летам 1941 г. Зазначым, што

на той час гісторыкі абыходзілі маўчаннем многія факты з данясення 45-й нямецкай пяхотнай дывізіі. Але звернем увагу чытача на наступны факт: у канцы 1970-х легендарны абаронца крэпасці Герой Савецкага Саюза П. М. Гаўрылаў, добра ведаючы калектыўныя працы, у тым ліку кнігу С. С. Смірнова, выказваў істотна важную думку аб тым, што для «поўнага і ўсебаковага раскрыцця падзей, звязаных з абаронай Брэсцкай крэпасці, шмат давядзецца зрабіць гісторыкам і навуковым даследчыкам» [11, с. 121].

У далейшых поглядах, падыходах і ацэнках у дачыненні да ходу абароны Брэсцкай крэпасці аўтары прац розных жанраў, у тым ліку гістарычных [12], выражалі адметнае адзінства. У канцэптуальным вывучэнні гэтай тэмы з 1960-х гадоў не назіралася практычна ніякіх змен: агульная схема баявых падзей укладвалася ў хрэстаматыйнае апісанне ўпартай і настойлівай абароны шматнацыянальнага гарнізона крэпасці. Да ліку канцэптуальных асноў былі аднесены тэзы аб «арганізаваным характары абароны Брэсцкай крэпасці», «месячнай абароне гарнізона крэпасці», «амаль поўнай гібелі абаронцаў крэпасці» і інш.

У канцы 1980-х гадоў у беларускай савецкай гістарыяграфіі з'явіліся некаторыя новыя акцэнты аб баявых дзеяннях у ходзе гераічнай абароны Брэсцкай крэпасці. Яны былі расстаўлены ў артыкуле «Абарона Брэсцкай крэпасці 1941», уключаным у энцыклапедыю «Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945 гг.». У матэрыяле сцвярджалася, што гераічная абарона крэпасці савецкімі войскамі ахоплівае перыяд ад пачатку вайны 22 чэрвеня па канец ліпеня 1941 г. [13, с. 95], калі гарнізон у складзе 3,5–4 тысяч абаронцаў мужна супрацьстаяў сілам 45-й нямецкай пяхотнай дывізіі агульнай колькасцю каля 17 тысяч салдат і афіцэраў, якая вяла штурм умацаванняў крэпасці ва ўзаемадзеянні з 31-й і 34-й пяхотнымі дывізіямі 12-га армейскага корпуса 4-й нямецкай арміі, 2-й танкавай дывізіяй танкавай групы Гудэрыяна, пры падтрымцы авіяцыі і часцей узмацнення, якія мелі на ўзбраенні цяжкія артылерыйскія сістэмы [13, с. 95]. Да ліку важных удакладненняў можна аднесці тэзу аб тым, што толькі за 9 дзён абаронцы крэпасці вывелі са строю каля 1,5 тысяч салдат і афіцэраў праціўніка. Канстатуецца, што да канца чэрвеня вораг захапіў большую част-

ку тэрыторыі крэпасці, а на працягу двух дзён – 29 і 30 чэрвеня – гітлераўцы вялі бесперапынны штурм з выкарыстаннем 500- і 1800-кілаграмовых авіябомб. У выніку кровапралітных баёў і вялікіх страт абарона распалася на шэраг ізаляваных ачагоў супраціўлення. Абарона крэпасці з'яўляецца прыкладам мужнасці і стойкасці савецкага народа ў барацьбе за свабоду і незалежнасць Радзімы [13, с. 97]. Адметна, што галоўнай крыніцай для падрыхтоўкі артыкула з'яўляліся матэрыялы фондаў і дакументы экспазіцыі мемарыяльнага комплексу Брэсцкая крэпасць-герой.

Іншая трактоўка ходу баявых дзеянняў пры ўзяцці Брэст-Літоўска давалася ў тагачаснай замежнай гістарыяграфіі (Аўстрыі, Германіі, ЗША), у якой аснову даследаванняў складала данясенне камандзіра 45-й нямецкай пяхотнай дывізіі аб ходзе баявых дзеянняў пры ўзяцці абарончага рубяжа Брэсцкай крэпасці [14–17]. Зразумела, што ў працах замежных даследчыкаў баявыя падзеі ў ходзе ўзяцця Брэст-Літоўска раскрываліся ў большай ступені з нямецкага, чым савецкага боку. Але замежныя працы ўтрымлівалі цікавыя звесткі па храналогіі нямецкага штурму, аб ходзе баявых дзеянняў на асноўным напрамку наступлення, колькасці патрапіўшых у палон савецкіх салдат і афіцэраў, як і страт з нямецкага і савецкага бакоў.

Зазначым, што «баявое данясенне аб заняцці Брэст-Літоўска», падрыхтаванае ў аператыўным аддзеле штаба 45-й дывізіі 8 ліпеня 1941 г., са значнымі купюрамі ўпершыню было апублікавана роўна праз год пасля пачатку штурму Брэсцкай крэпасці ў газеце «Красная звезда». Але практычна ўсе прыведзеныя вышэй публікацыі, якія ў савецкіх выданнях адлюстроўвалі ход баявых дзеянняў на тэрыторыі крэпасці, абыходзілі маўчаннем прыведзеныя ў ім факты, асабліва аб савецкіх ваеннапалонных, іх агульнай колькасці і дакладныя звесткі аб палоне савецкіх абаронцаў і інш.

Зварот да матэрыялаў данясення з'яўляецца адной з важных прыкмет навуковых пошукаў гісторыкаў суверэннай Беларусі [3; 18; 19]. Другой не менш важнай адметнасцю сучаснай беларускай гістарыяграфіі можна назваць тое, што ў аснову новых прац, прысвечаных гісторыі абароны Брэсцкай крэпасці летам 1941 г., пакладзены новыя факты, сведчанні і адкрыцці [19]. У першай па-

лове бягучага дзесяцігоддзя брэсцкія даследчыкі падрыхтавалі выданне, у якім упершыню прывялі лічбу аб савецкіх ваеннапалонных, патрапіўшых у нямецкі палон на другі дзень абароны Брэсцкай крэпасці [19, с. 111]. Але аўтары па незразумелых прычынах уводзяць гэты факт з пэўнымі агаворкамі, як быццам бы здача ў палон пярэчыла рэальнаму ходу баявых дзеянняў падчас абароны Брэсцкай крэпасці баявымі часцямі Чырвонай Арміі. Як цяпер вядома з данясення камандзіра 45-й дывізіі аб узяцці крэпасці ў Брэсце, агульная колькасць палонных, якія патрапілі ў нямецкі палон да канца чэрвеня 1941 г. толькі з тэрыторыі крэпасці складае лічбу амаль у 6 000 чал. [3, с. 396]. Аднак гэта лічба пакуль не знаходзіць навуковай ацэнкі ў найноўшых гістарычных даследаваннях [12; 18; 19]. У гэтым плане нам яшчэ больш не зразумела выснова, зробленая ў акадэмічным выданні «Беларусь в годы Великой Отечественной войны 1941–1945» (Мінск, 2005), у якім сцвярджаецца аб тым, што «амаль усе ўдзельнікі (не больш 3 тысяч байцоў) абароны загінулі...» [20, с. 62].

На наш погляд, аб'ектыўнае даследаванне ходу баявых дзеянняў падчас абароны Брэсцкай крэпасці можа весціся з выкарыстаннем максімальна поўнага кола дакументальных крыніц. Патрэбна як мага больш арыгінальных дакументаў для адпаведных высноў. Таму ў цяперашніх умовах з'яўляецца недапушчальным замоўчванне матэрыялаў, факт існавання якіх даказаны як айчыннай, так і замежнай гістарыяграфіяй. У нашым выпадку гэта данясенне камандзіра 45-й нямецкай пяхотнай дывізіі аб узяцці Брэст-Літоўска. Па сённяшні дзень яно не дайшло да беларускага чытача ў поўнай форме, без купюр, выняткаў ці скарачэнняў тэксту. Таму застаецца актуальнай задача па яго ўвядзенні ў шырокі абарот.

Дакумент носіць адметны характар, бо яго выкарыстанне дапамагае ўбачыць рэальную карціну не толькі гераічных, але і трагічных падзей першага месяца Вялікай Айчыннай вайны на Брэстчыне, у рэшце даведацца аб невядомых па сённяшні дзень фактычных «стратах войскаў, якія абаранялі Брэст» [3, с. 333]. Апрача таго, публікацыя дакумента можа наблізіць чытача да разумення сутнасці прычыны, чаму легендарны абаронца Брэсцкай крэпасці Герой Савецкага Саюза П. М. Гаўрылаў у канцы 1970-х гадоў

бачыў патрэбу ў неабходнасці «поўнага і ўсебаковага раскрыцця падзей абароны Брэсцкай крэпасці» [11, с. 121].

Сярод звестак, якія вынікаюць з дакумента, асабліва адметнай з'яўляецца храналогія разгортвання баявых дзеянняў у ходзе ўзяцця абарончага плацдарма крэпасці ў Брэст-Літоўску. Савецкі гарнізон упарта стрымліваў атакі нямецкай пяхоты, мужна трымаючы практычна кожны будынак, кожны каземат, кожны форт. Паводле дакументальных фактаў, амаль на кожным участку наступлення германскія часці сустрэлі эфектыўна дзеючую агнявую абарону. Разам з тым з данясення вынікае, што пачынаючы з 23 чэрвеня для немцаў сталі адметным фактам савецкія палонныя, агульная колькасць якіх праз 9 дзён баявых дзеянняў значна вырасла ў параўнанні з першай групай палонных чырвонаармейцаў, якія трапілі ў палон вечарам 23 чэрвеня 1941 г., калі з 18.30 на ўчастку наступлення 135-га пяхотнага палка (паўночны востраў) здалося ў палон прыкладна 1 900 абаронцаў. На трэці дзень абароны крэпасці 2-і батальён 133-га нямецкага пяхотнага палка заняў паўднёвы востраў, захапіўшы ў палон 1 250 савецкіх абаронцаў. Паводле дакумента, у апошні дзень нямецкага штурму 29 чэрвеня ў палон патрапілі 389 чырвонаармейцаў. Пры гэтым вечарам 28 чэрвеня на тэрыторыі крэпасці немцамі былі выяўлены «амаль 2 000 забітых рускіх» [21, Bl. 1]. Такім чынам, у ходзе гераічнай абароны Брэсцкай крэпасці пачала пісацца адна з трагічных старонак яе гісторыі, якая па цяперашні час застаецца «белай плямай» у айчыннай гістарыяграфіі. На момант заняцця крэпасці 30 чэрвеня 1941 г. агульную колькасць савецкіх ваеннапалонных (у тым ліку ўзятых у горадзе) складалі 101 савецкі афіцэр і 7 122 малодшыя камандзіры і радавыя [2, Bl. 11]. Падлікі савецкіх воінаў, хто да канца чэрвеня патрапіў у нямецкі палон і забітых на тэрыторыі крэпасці, праліваюць святло на агульную лічбу абаронцаў, якія заставаліся ў крэпасці ў ходзе яе шматдзённай абароны летам 1941 г.

Зазначым, што «Данясенне аб баявых дзеяннях у ходзе ўзяцця Брэст-Літоўска» [2] не замоўчвае тое, што чырвонай ніткай праходзіць праз даследаванні беларускіх навукоўцаў пра баявыя дзеянні абаронцаў Брэсцкай крэпасці летам 1941 г.: на сваім шляху

часці германскага вермахта фактычна з самага пачатку агрэсіі супраць СССР сустрэлі моцны рубеж супраціўлення, на якім мужна стаялі савецкія воіны розных нацыянальнасцей, выконваючы свой свяшчэнны абавязак па абароне савецкай Радзімы.

Крыніцы і літаратура

1. Алиев, Р. Штурм Брестской крепости / Р. Алиев. – М., 2008. – 800 с.
2. Федэральны ваенны архіў Германіі (далей – BA-MA). – RH 26–45/27: Gefechtsbericht über die Wegnahme von Brest-Litowsk v. 8.07.1941.
3. Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Брэста: у 2 кн. – Мінск, 1997. – Кн. 1.
4. Алиев, Р. Брестская крепость: взгляд с немецкой стороны / Р. Алиев // Фронтовая иллюстрация. – 2003. – № 5. – С. 1–74.
5. Иринархов, Р. С. Западный Особый... / Р. С. Иринархов. – Минск, 2002.
6. На земле Беларуси: канун и начало войны. – М., 2006.
7. Героическая оборона. – 2-е изд., доп. – Минск, 1963.
8. История Белорусской ССР: в 2 т. – Минск, 1961. – Т. 2.
9. История Великой Отечественной войны Советского Союза 1941–1945: в 6 т. – М., 1961. – Т. 2: Отражение советским народом вероломного нападения фашистской Германии на СССР. Создание условий для коренного перелома в войне (июнь 1941 – ноябрь 1942).
10. Советская историческая энциклопедия: в 12 т. – М., 1962. – Т. 2.
11. Гаврилов, П. М. Сражается крепость / П. М. Гаврилов. – Изд. 2-е, испр. и доп. – Краснодар, 1980.
12. Бешанов, В. В. Брестская крепость / В. В. Бешанов. – Минск, 2004, 2009.
13. Брэсцкай крэпасці абарона 1941 // Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне, 1941–1945: энцыкл. / рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 1990.
14. Gschöpf, R. Mein Weg mit der 45. Infanterie-Division / R. Gschöpf. – Linz, 1955.
15. Carell, P. The Foxes of the Desert / P. Carell. – New York, 1961.
16. Das Deutsche Reich und der Zweiter Weltkrieg. – Stuttgart, 1983. – Bd. 4: Der Angriff auf die Sowjetunion / hrsg. vom Militärgeschichtlichen Forschungsamt.
17. Карель, П. Восточный фронт. Кн. 1: Гитлер идет на восток. От «Барбароссы» до Сталинграда / П. Карель. – М., 2008.
18. Брестская крепость...= Brest fortress...: Факты, свидетельства, открытия / В. В. Губаренко и [др.]. – Брест, 2001.
19. Брестская крепость на ветрах истории / под ред. В. В. Губаренко, Л. А. Цуприка; авт. концепции и текста А. М. Суворов. – Брест, 2004.
20. Беларусь в годы Великой Отечественной войны 1941–1945 / А. А. Коваленя (рук. автор. коллектива), А. М. Литвин, В. И. Кузьменко [и др.]. – Минск, 2005.
21. BA-MA. RH 26-45/27: Bericht der 45. Division (Ia) an A. O. K.4/O. Qu. v. 29.06.1941.

В. М. Папко

Брэсцкі дзяржаўны тэхналагічны універсітэт

ЛЁСЫ ПАМЕШЧЫКАЎ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ ПАСЛЯ 1939 г. (НА ПРЫКЛАДЗЕ РОДАЎ ДЗЯКОНСКІХ, ТАРАСОВІЧАЎ І БЯРТОЛЬДЗІ)

Савецкая гістарыяграфія трактавала падзеі восені 1939 г. як адназначна станоўчыя для гісторыі Беларусі. Сапраўды, уз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР мела шмат добрых вынікаў для развіцця эканомікі, грамадства і адукацыйнай сістэмы «ўсходніх крэсаў». Аднак гэты год стаў трагедыяй для сацыяльнага слоя, прадстаўнікі якога спрадвеку жылі на гэтых землях. 1939 г. стаў годам знішчэння такой катэгорыі насельніцтва, як памешчыкі. Для многіх родаў гэта мела фатальныя вынікі – вынішчэнне мужчын прывяло да того, што з цягам часу іх шляхецкія, некалі ўвенчаныя гербам прозвішчы зніклі. Таму асаблівую цікавасць прадстаўляе інфармацыя аб лёсах канкрэтных людзей, якія давялося высветліць з дапамогай іх нашчадкаў, што зараз жывуць за мяжой. У гэтым сэнсе павучальнай з'яўляецца гісторыя рода памешчыкаў Дзяконскіх і іх родзічаў Тарасовічаў і Бяртольдзі.

Род Дзяконскіх з сярэдзіны XVIII ст. валодаў маёнткам Пятровічы ў Кобрынскім павеце. У XIX – пачатку XX ст. уладанні роду пашырыліся за кошт маёнткаў Чахец, Чадзель і Анапаль у Пружанскім павеце. Гаспадар Пятровіч Альбін Дзяконскі (1838–1918) меў пяцёра дзяцей. Ён мог разлічваць на працяг сваёйго прозвішча ва ўнуках і праўнуках. Аднак II Сусветная вайна моцна ўдарыла па пятровічскай галіне роду Дзяконскіх. Зараз дакладна вядома аб існаванні некалькіх нашчадкаў роду па жаночай лініі.

Адзіны сын Альбіна Дзяконскага ад першага шлюбу, Мар'ян-Тадэвуш, валодаў маёнткамі на Пружаншчыне, якія пасля яго смерці ў 1921 г. дасталіся яго сыну Янушу. У 1939 г. памеры маёнтка Чахец складалі каля 300 га. З прыходам савецкіх войск на тэрыторыю Заходняй Беларусі пачаліся арышты памешчыкаў. 22 верасня 1939 г. Януш Дзяконскі быў арыштаваны. Не вядома, у якой турме ён утрымліваўся. 21 мая 1941 г. яму быў вынесены прыгавор

па арт. 74 Крымінальнага Кодэкса БССР як сацыяльна-небяспечнаму элементу. Дзяконскі быў асуджаны на 5 гадоў лагераў, свой тэрмін адбываў у Паўночна-ўсходніх лагерах[1]. 15 чэрвеня 1989 г. Януш Дзяконскі (па дакументах Іван Мар'янавіч) быў рэабілітаваны ўпраўленнем КДБ і пракуратурай Брэсцкай вобласці[2].

Калі прыйшла Савецкая ўлада ў 1939 г., яго жонку Марыю Дзяконскую з Ордаў прымусілі капаць бульбу. Людзі ёй спачувалі, дапамагалі. Яна вельмі схуднела, хадзіла ўся ў чорным адзенні. У доме жылі савецкія вайскоўцы, а пані Марыі выдзелілі пакой, таму што ёй не было куды падзецца. Праз некаторы час Марыя знікла. Мясцовыя жыхары не ведалі, ці яе арыштавалі, ці яна з'ехала ў Варшаву[3].

Марыя Дзяконская разам з дачкой перажыла вайну ў Польшчы, аднак пасля заканчэння вайны пераехала ў Аргенціну, дзе працавала ў атэлі, карыстаючыся сваімі ведамі шматлікіх замежных моў. Марыя выйшла замуж за нейкага паляка высокага паходжання, ён меў тытул князя або графа. Імя гэтага чалавека было Рудольф, а прозвішча яго невядома. Марыя Дзяконская пражыла шчасліва апошнія свае гады, памерла ў Буэнас-Айрэсе (год не вядомы)[4].

Адзіная дачка Януша і Марыі Дзяконскіх, Яніна-Іаланта, нарадзілася ў Чахцы 14 лютага 1925 г. У 1949 г. яна скончыла Варшаўскі універсітэт з дыпломам інжынера аграноміі і магістра аграмамічных навук. У 1954–1957 гг. Дзяконская выкладала іхтыялогію ў Вышэйшых школах аграноміі Ольштына і Варшавы, а таксама на біялагічным факультэце Варшаўскага універсітэта.

У 1957 г. Яніна Дзяконская паехала ў Аргенціну, дзе пасля вайны пасялілася яе маці. Яніна не збіралася заставацца за мяжой, аднак у г. Мар-дэль-Плата яна пазнаёмілася з Хасэ (Юзафам) Ціхомскім, які паходзіў з Польшчы. Яніна Дзяконская выйшла

[1] З 1937 г. Паўночна-ўсходнія папраўча-працоўныя лагеры дыслацыраваліся ў Далёкаўсходнім краі, у бухце Нагаева.

[2] Згадваецца, што Януш Дзяконскі меў незаконачаную вышэйшую адукацыю. Гл.: http://lists.memo.ru/d11/f71.htm.

[3] Па ўспамінах Васіліны Ціханчук, пераказаных яе ўнучкай Зінаідай Пятроўнай Паляковай, жыхаркай г. Пружаны.

[4] Па ўспамінах аргенцінскай калегі Яніны, доктара біялогіі Рут Аксельман.

за яго замуж і засталася ў Аргенціне на ўсё жыццё. Там яе нязвыклае для іспанскай мовы імя перайначылі на свой манер і пачалі называць Хуанай. Яна насіла падвойнае прозвішча Дзяконска дэ Ціхомскі і так увайшла ў гісторыю.

Яніна Дзяконская зацікавілася вывучэннем рыб, што жывуць у Атлантычным акіяне. У 1960 г. у Мар-дэль-Плата быў створаны Інстытут марской біялогіі, дзе пачала працаваць Яніна. Гэты інстытут падпарадкоўваўся універсітэту Буэнас-Айрэса, таму Дзяконская пачала там выкладаць на факультэце дакладных і прыродазнаўчых навук. Назапашаны падчас сваіх даследаванняў матэрыял Яніна выклала ў доктарскай дысертацыі, якую абараніла ў 1970 г. у Вышэйшай аграрнай акадэміі Вроцлава (Польшча). Пасля гэтага кар'ера Дзяконскай у Аргенціне пайшла ўгору: яна ўзначальвала Біялагічную лабараторыю рыб і іхтыяпланктону, у 1961–1977 гг. працягвала працу ў Інстытуце марской біялогіі, а пасля сыходу адтуль да пенсіі ў 2001 г. працавала ў Нацыянальным інстытуце даследавання развіцця рыб (INIDEP).

Спецыялізацыяй доктара Дзяконскай-Ціхомскай была рэпрадукцыя рыб, развіццё іх эмбрыёнаў і лічынак. Неаднаразова яна ўзначальвала акіянскія экспедыцыі па даследаванні рыб, якія адбываліся на караблях Аргенціны і іншых краін. Яе навуковая дзейнасць была вельмі актыўная. Вынікі сваіх даследаванняў Дзяконская прадстаўляла на шматлікіх канферэнцыях і сімпозіумах за мяжой. Яніна цудоўна валодала некалькімі мовамі: польскай, іспанскай, нямецкай, ангельскай, французскай і рускай. Яна была аўтаркай шматлікіх публікацый, стала прафесарам у Буэнас-Айрэскім універсітэце. Дасягненні Яніны Дзяконскай-Ціхомскай былі высока ацэнены навуковай грамадскасцю. У 1991, 1995 і 1996 гг. Міжнародным біялагічным цэнтрам у Кембрыджы яна была названа Міжнароднай жанчынай года. 27 мая 2003 г. ва ўзросце 78 гадоў яна памерла ў Буэнас-Айрэсе, дзяцей не пакінула [1].

Не атрымалася высветліць лёс адзінага роднага пляменніка Януша – Збігнева Чэрнага. Хутчэй за ўсё, яго жыццё было звязана з Польшчай. Мы не выключаем, што Вацлаў Чэрны ў канцы 1930-х гадоў усыноўлены Янушам Дзяконскім. У верасні 1939 г. у Пружанах быў арыштаваны нейкі дваранін Дзяконскі, які трапіў

у адну з савецкіх турмаў, аднак выжыў. Вядома, існуе вельмі мала доказаў гэтай версіі. Аднак у Януша не было сына, а пляменнік, які не меў значных сродкаў для існавання – добрая кандыдатура на месца спадкаемцы маёнткаў.

У другім шлюбе з удавой Ядвігай Бяртольдзі з Ажэшкаў Альбін Дзяконскі меў чацвёра дзяцей. Старэйшы з іх Альбін-Міхал (1892–1940) валодаў маёнткам Магілёўцы ў Ваўкавыскім павеце (зараз вёска ў Пружанскім раёне). Пасля таго як Чырвоная армія заняла тэрыторыю Заходняй Беларусі, А. Дзяконскі быў арыштаваны разам з войтам лыскаўскай гміны С. Вічфінскім, які быў яго сябрам і таксама жыў у маёнтку [2, с. 4].

Такі лёс напаткаў усіх родзічаў-мужчын А. Дзяконскага. Пасля арышту Альбіна ўтрымлівалі ў Мінску. Вядома, што ў сакавіку 1940 г. ён яшчэ быў жывы, далейшы яго лёс невядомы. В. Церахава ў сваіх артыкулах прыводзіць успаміны старых людзей і чуткі пра лёс А. Дзяконскага пасля арышту. А. Л. Канькоўская ўспамінала, што адначасова з Дзяконскім арыштавалі яе прафесара латыні Адамоніса, якому яна дасылала пасылкі з правізіяй. Потым гэты прафесар згадваў пра Дзяконскага. Ена Брухальскі, які пасля вайны пераехаў у Ізраіль, сведчыў, што Дзяконскі служыў у арміі Андэрса і жыў у Ізраілі. Сын лакея Дзяконскага згадваў, што пан марыў пераехаць у Бразілію і хацеў узяць з сабой некаторых адданых людзей [3, с. 2]. Трагічны лёс паэт сам прадракаў сабе ў вершы «Ідылія», надрукаваным у яго апошнім зборніку [4, s. 10].

Жонка Дзяконскага, Соф'я, пераехала ў Польшчу, яна пражыла вельмі доўгае жыццё. Пасля вайны жыла ў Познані на вул. Грунвальдскай, 101, зарабляла на жыццё працай перакладчыка. Апошнія гады свайго жыцця Соф'я правяла ў доме апекі ў в. Бук каля Познані, дзе і памерла ў 1979 г. Яна завяшчала пакласці сабе ў труну некалькі старонак кніжкі яе мужа Альбіна, на якіх ён уласнаручна напісаў ёй прысвячэнне[1].

Малодшы брат Альбіна-Міхала, Вацлаў Дзяконскі (1897–1944?), атрымаў у спадчыну самы стары маёнтак роду – Пятровічы, дзе

[1] Па ўспамінах Ядвігі Хэлміняк.

займаўся гаспадаркай. У міжваенны перыяд Вацлаву Дзяконскаму належала 482 га сельскагаспадарчых угоддзяў (з іх 300 га добрых ворыўных земляў) і 1 100 га лесу [5, с. 158]. 28 красавіка 1925 г. Вацлаў ажаніўся з Марыяй Вэнжык [6, арк. 80адв.–81]. У Вацлава Дзяконскага была адзіная дачка Марыя-Ядвіга (1926–1983), якая нарадзілася і вырасла ў родавым маёнтку Пятровічы. Яна была апошняй прадстаўніцай гэтага роду, якая з'явілася на свет у Пятровічах.

Невядома, што адбывалася з членамі сям'і Вацлава ў 1939 г. Л. Несцярчук, спасылаючыся на звесткі польскага даследчыка Д. Гжэгарчука, сцвярджаў, што Вацлаў разам з жонкай загінулі падчас Варшаўскага паўстання ў 1944 г. [7, с. 128]. Даказаць гэты факт не атрымалася: у спісе загінуўшых удзельнікаў паўстання на сайце Музея Варшаўскага паўстання Дзяконскія не згадваюцца [8]. Аднак лёс Марыі быў трагічны. У гады вайны Марыя разам з дачкой Марыяй-Ядвігай апынулася ў нямецкім канцлагеры Штутгаф, які размяшчаўся за 34 км ад Гданьска. Пасля 25 студзеня 1945 г. вязняў пачалі эвакуіраваць у заходнім напрамку. Немцы гналі іх зімой, аслабленыя голадам людзі хварэлі. Падчас гэтага марша смерці Марыя Дзяконская памерла, яе цела было пакінута проста пры дарозе. Ёй было 48 гадоў. Марыя-Ядвіга выжыла ў гэтых жудасных умовах.

Першым мужам Марыі-Ядвігі быў Станіслаў Шыбальскі (1920–?). Другі раз Дзяконская выйшла замуж за Генрыка Гажэхоўскага, якому ў 1967 г. нарадзіла адзінага сына, таксама Генрыка. Генрык Гажэхоўскі-малодшы – унук Вацлава-Калікста, праўнук Альбіна і Ядвігі. Ён жыве ў Гдыні, недалёка ад Гданьска.

Складанымі былі лёсы і родных пляменнікаў Альбіна-Міхала і Вацлава, сыноў іх сястры. Ядвіга-Эмілія выйшла замуж за Эдварда Тарасовіча (? – пасля 1939). Сям'я Тарасовічаў валодала маёнткамі Зяльвяны, Воля і Сямашкаўшчына ў Ваўкавыскім павеце [9, s. 171]. У спадчыну Эдварду дасталіся маёнткі Воля (каля в. Луна Мастоўскага р-на Гродзенскай вобл.) і Сямашкаўшчына (плошчай 217 дзес.). У 1920–1930-я гады сям'я Тарасовічаў жыла ў Волі, дзе была вельмі прыгожая сядзіба, яе тагачасны выгляд захавалі старыя здымкі.

У Ядвігі-Эміліі і Эдварда Тарасовічаў былі сыны Казімір (1919–1988) і Станіслаў (1922–1992). Хлопчыкі вучыліся ў гімназіі айцоў-езуітаў у Вільні. На старых здымках тых часоў усе члены сям'і выглядаюць шчаслівымі. Вось сыны-падлеткі пазіруюць са стрэльбамі, абкружаныя паляўнічымі трафеямі. Яшчэ адзін здымак прадстаўляе Ядвігу-Эмілію, яе мужа і сына Казіміра каля матацыкла.

20 сакавіка 1939 г. Ядвіга-Эмілія памерла, яна была пахавана ў Варшаве на Павонжках. Пасля заняцця зямель Заходняй Беларусі савецкімі войскамі ў верасні 1939 г. Эдвард Тарасовіч разам з малодшым семнаццацігадовым сынам Станіславам быў арыштаваны. Эдварда вывезлі ў глыб Расіі, далейшы лёс яго невядомы. Станіслаў змог выжыць, трапіў на тэрыторыю адной з азіяцкіх рэспублік СССР, магчыма, у ваколіцы Ташкента. Невядома, якім чынам ён апынуўся ў арміі генерала Андэрса. Вайсковы шлях Станіслава быў падобны на большасць лёсаў салдат Андэрса: ён ваяваў пад Монтэ-Касіна. Пасля вайны трапіў у Англію, дзе сустрэў сваю будучую жонку Марыён Алан (нар. у 1932 г.)

Хутка маладая сям'я пераехала на пастаяннае пражыванне ў канадскі горад Манрэаль. Станіслаў Тарасовіч выкарыстоўваў занглізаваную форму свайго імя і прозвішча – Стэнлі Дэ Тэры. Працаваў графікам. У 1987 г. ён прыязджаў у Польшу, каб сустрэцца з братам, якога не бачыў цэлых 50 гадоў. Станіслаў памёр у Манрэалі 9 снежня 1992 г., дзе да гэтага часу жыве яго жонка Марыён і двое дзяцей. Дачка Джэнет у шлюбе з Лі Харысанам мае дзевятнаццацігадовую дачку Ізабэлу Доўн і сына Марка, якому 14 гадоў. Сын Станіслава Роджэр Дэ Тэры нарадзіўся ў 1963 г., жонкі і дзяцей не мае. Лі Харысан валодае ў Манрэалі фабрыкай шкла і люстэркаў, дзе працуе яго жонка Джэнет і яе брат.

Лёс Казіміра быў вельмі складаным. У 1939 г. ён не трапіў у савецкія турмы. З прыходам немцаў пасяліўся ў Лунна, таму што маёнтак на той час ужо быў разграблены. Пасля вызвалення Беларусі ў 1944 г. Казімір Тарасовіч быў арыштаваны, атрымаў 25 гадоў за супрацоўніцтва з Арміяй Краёвай. У 1953 г. яго саслалі ў Казахстан, куды да яго з Лунна прыехала жонка Людвіка Швед (1916–1989). Казімір меў адукацыю фельчара, працаваў разам з жонкай у шпіталі ў Акчатаў.

У 1955 г. у Казахстане нарадзілася адзіная дачка Казіміра, Ядвіга-Стэфанія. Праз год сям'я атрымала дазвол на пераезд у Польшчу на землі ў сучасным заходнепаморскім ваяводстве. Па дарозе туды у касцёле в. Каменка каля Скідзеля (зараз у Шчучынскім раёне) Казімір і Людвіка павянчаліся і пахрысцілі маленькую Ядвігу. Да пенсіі Казімір працаваў фельчарам, памёр у Гнезна праз месяц пасля спаткання з братам 17 лютага 1988 г. Ядвіга-Стэфанія скончыла філалагічны факультэт, выйшла замуж за Паўла Хэлміняка (нар. у 1956 г.), яна мае адзінага сына Міхала-Ежы, які нарадзіўся ў 1981 г. Ядвіга працуе настаўніцай польскай мовы і літаратуры ў Гнезна[1].

У Альбіна-Міхала, Вацлава і Ядвігі-Эміліі было два зводных брата, дзеці іх маці ад першага шлюбу з італьянцам А. Бяртольдзі. Відаць, старэйшым з братоў быў Юрый Бяртольдзі (1880–?), які атрымаў адукацыю інжынера. Яго жонкай была Ванда Стэбельская (1900–?), дзяцей не меў. У першай палове 1960-х гадоў Ю. Бяртольдзі жыў у Варшаве [10, s. 541–542].

Другі брат, Артур-Сяргей Бяртольдзі (1885–1963), валодаў маёнткам Азяты Каралеўскія ў Кобрынскім павеце. Меў за жонку Соф'ю Зялінскую (1896–1967) герба «Свінка». У Артура і Соф'і Бяртольдзі было двое дзяцей – дачка Эльжбета (1920–?) і сын Артур-Альбін (1924–1976)[2]. Хутчэй за ўсё, браты Бяртольдзі ў верасні 1939 г. знаходзіліся на тэрыторыі, занятай немцамі, таму не трапілі ў савецкія турмы.

Далучэнне Заходняй Беларусі да БССР і ІІ Сусветная вайна цяжка адбіліся на лёсах многіх прадстаўнікоў шляхецкіх родаў Заходняй Беларусі, асабліва тых, хто валодаў маёнткамі. Пытанне гэтае даследавана вельмі дрэнна. Прычына крыецца не ў адсутнасці цікавасці з боку гісторыкаў, а ў адсутнасці дакументаў. Няма статыстычных даных аб тым, колькі дакладна памешчыкаў і членаў іх сямей было рэпрэсавана. Частка іх трапіла на тэрыторыю Польшчы, пераехала ў Лацінскую Амерыку, ЗША і Канаду.

---

[1] Даныя прадстаўлены Ядвігай-Стэфаніяй Хэлміняк.

[2] Звесткі аб гісторыі роду Бяртольдзі прадстаўлены Ілонай Бяртольдзі-Маеўскай.

У Альбіна было пяцёра дзяцей, пяцёра ўнукаў, як мінімум шасцёра праўнукаў і трое праправнукаў. Нашчадкі гэтай галіны роду памешчыкаў Дзяконскіх пражываюць зараз у Польшчы і Канадзе. Ніхто з іх не носіць гэтага прозвішча.

Крыніцы і літаратура

1. www.inidep.gov.ar/publicaciones/revista/revista_16/yolanda16. htm.
2. Церахава, В. Пясняр зялёных Магілёўцаў / В. Церахава // Раённыя будні (Пружаны). – 2002. – 27 красав.
3. Церахава, В. «У запрэжцы коней у свае Магілёўцы» / В. Церахава // Сельская праўда (Жабінка). – 1995. – 16 жніўня.
4. Stankiewicz, Z. Poeta Kresów / Z. Stankiewicz // Głos znad Niemna. – 2003. – 14 lut.
5. Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Жабінкоўскага р-на / рэд.-укл. Р. Смірнова. – Мінск, 1999. – 510 с.
6. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. – Фонд 1781. – Воп. 46. – Спр. 39.
7. Несцярчук, Л. М. Замкі, палацы, паркі Берасцейшчыны X–XX стагоддзяў (гісторыя, стан, перспектывы). – Мінск, 2002. – 334 с.
8. www.1944. pl
9. Biblioteka Narodowa, zbiory specjalne: Ciszewska, C. Gawęda o tym, co było. Rękopis. 1961. – 429 s.
10. Wyka, K. Poeta z cienia wydobyty / K. Wyka // Rzecz wyobraźni. – Wyd. 2-e. – W-wa, 1977. – S. 539–544.

А. А. Савіч

Брэсцкі дзяржаўны універсітэт імя А. С. Пушкіна

СТВАРЭННЕ І ХАРАКТАР КПЗБ: НЯВЫРАШАНЫЯ ПЫТАННІ АЙЧЫННАЙ ГІСТАРЫЯГРАФІІ

Беларускімі савецкімі гісторыкамі ў другой палове 1950-х – 1980-я гады была праведзена значная навуковая праца па вывучэнні праблем гісторыі Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі. Асабліва актыўна разгарнулася яна пасля XX з'езда КПСС, які ажыццявіў палітычную і гістарычную рэабілітацыю ў адносінах да кампартый Польшчы, Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны. Недахопам метадалагічнага характару беларускай савецкай гіста-

рыяграфіі гісторыі КПЗБ з'яўлялася звужэнне падзей, іх асэнсаванне ў адрыве ад трансфармацый грамадска-палітычнага жыцця ў Польшчы, БССР і СССР, у тым ліку ігнараванне найважнейшых, выключных па сваім уплыве на развіццё падзей асобных аспектаў унутрыпалітычнага супрацьстаяння ў Камінтэрне, УКП(б), Кампартыі Польшчы, КПЗБ, іх узаемаадносін. Пры тым, што Кампартыі Заходняй Беларусі надавалася авангардная роля ў «барацьбе за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне», шмат якія бакі гісторыі дзейнасці КПЗБ не атрымалі дастатковага аб'ектыўнага асвятлення.

Гэта тычыцца, у тым ліку і пытання стварэння КПЗБ, вывучэнне якога ў савецкія гады залежала ад палітычнай сітуацыі ў БССР. Вядома, што пасля рэпрэсій у пачатку 1930-х гадоў у адносінах да ўдзельнікаў рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі ў беларускай гістарычнай літаратуры былі зроблены высновы пра тое, што КПЗБ, прымаючы ў свае шэрагі БРА цэлай арганізацыяй, зрабіла вялікую палітычную памылку, разам з часткай сапраўды па-камуністычнаму настроеных элементаў у КПЗБ пралезла група буржуазных нацыяналістаў, якія ўступілі ў кампартыю з мэтай узначалення рэвалюцыйнага руху і разгрома яго знутры [1; 2, с. 265–266]. Таму ў пачатку 1930-х гадоў з'явіўся тэзіс аб тым, што КПЗБ утварылася з арганізацый КПРП, якія праводзілі сваю працу ў буйных гарадах Заходняй Беларусі. Такім чынам, так званая тэорыя «двухкарэннасці» КПЗБ, згодна з якой КПЗБ утварылася з арганізацый КПРП, Беларускай рэвалюцыйнай арганізацыі і некаторых дробнабуржуазных нацыяналістычных арганізацый, абвяргалася [3]. У хуткім часе ўсе беларускія дзеячы, у тым ліку члены КПЗБ, сталі на старонках савецкага друку «ворагамі народа».

Аднак і пасля рэабілітацыі КПЗБ і БРА ў беларускай савецкай гістарыяграфіі стварэнне КПЗБ падавалася спрошчана, схематычна і павярхоўна: «Ажыццяўляючы рашэнні II з'езда, ЦК КПРП склікаў у канцы кастрычніка 1923 г. у Вільні нелегальную канферэнцыю з прадстаўнікоў усіх існаваўшых на тэрыторыі Заходняй Беларусі і Віленскай вобласці акруговых і гарадскіх партыйных камітэтаў, на якой і было прынята рашэнне аб стварэнні Ка-

муністычнай партыі Заходняй Беларусі і абраны яе Цэнтральны камітэт. Гэта і была першая ўстаноўчая канферэнцыя, якая афарміла стварэнне КПЗБ.... у КПЗБ у канцы 1923 г. улілася Беларуская рэвалюцыйная арганізацыя (БРА)». Пры гэтым, намякаючы на значнасць праблемы, аўтары гаварылі аб стане нацыянальнага руху – «агульная абстаноўка рэвалюцыйнага ўздыму ў Польшчы і абвастрэнне партызанскай барацьбы ў Заходняй Беларусі аказалі моцнае ўздзеянне на фарміраванне палітычных поглядаў беларускай інтэлігенцыі і дзеячаў дробнабуржуазных партый і арганізацый, якія групаваліся вакол Беларускага нацыянальнага камітэта ў Вільні» [4, с. 69–71]. Верагодна, эвалюцыя палітычных поглядаў беларускіх дзеячаў у пытанні стварэння КПЗБ мела вырашальнае значэнне.

Вядома, што дзейнасць камуністычных партый у Еўропе кантралявалася і накіроўвалася з Масквы Камінтэрнам, пра што пераканаўча сведчаць навейшыя публікацыі па гісторыі Камінтэрна [5, с. 8; 6; 7]. Стварэнне КПЗБ ў 1923 г. было выклікана жаданнем савецкага кіраўніцтва ўмацаваць сваю прысутнасць у Польшчы. Натуральна, становішча ў Заходняй Беларусі было зручнай падставай для бальшавіцкага кіраўніцтва выступаць у якасці абаронцы правоў прыгнечанага народа, а беларускі рух разглядаўся ў Маскве як сродак пралангацыі сваіх уплываў, пры дапамозе якога рэалізоўвалася бальшавіцка-камінтэрнаўская палітыка ў Польшчы. Менавіта ў такім кантэксце трэба разглядаць канчатковую рэалізацыю ідэі стварэння беларускай камуністычнай партыі ў Польшчы – КПЗБ, якая павінна была прыстасоўвацца да ўмоў грамадска-палітычнага жыцця ў Заходняй Беларусі, выкарыстоўваць існуючую сярод беларускага народа незадаволенасць, перацягваць на свой бок актыўныя элементы, навязваючы свае сацыяльна-класавыя каштоўнасці замест ідэй беларускага нацыянальна-вызваленчага характару. Стварэнне КПЗБ было тактычным крокам Камінтэрна для разгортвання больш шырокага і трывалага рэвалюцыйнага руху ў Польшчы ва ўмовах павелічэння ролі і месца беларускага фактара ва ўнутрыпалітычным жыцці Польшчы, відавочным сведчаннем чаго з'яўляліся вынікі выбараў у польскі сейм у 1922 г., у асобе сваіх выбраннікаў, дэпутатаў сейма,

беларускія сяляне бачылі абаронцаў нацыянальных і сацыяльных інтарэсаў беларускага народа ў складзе Польшчы [4, с. 54].

Відаць, КПЗБ стваралася ў спешцы ў кастрычніку 1923 г., у час узброенага паўстання ў Кракаве, калі кіраўніцтва Камінтэрна «патрабавала ад Кампартыі Польшчы ўзначаліць кіраўніцтва паўстаннем і пачаць стварэнне чырвонай гвардыі, каб трансфарміраваць паўстанне ў рэвалюцыю» [7, с. 271]. Таму бальшавіцкае кіраўніцтва пайшло на тактычны крок: каб перацягнуць на свой бок беларусаў, «замацавала» за КПЗБ тэрыторыю Віленшчыны, нягледзячы на тое, што 12.07.1920 г. у Маскве, як вядома, быў падпісаны савецка-літоўскі дагавор, па якім Вільня і Віленшчына абяцаліся бальшавікамі Літве – пакуль яшчэ не савецкай [8]. Такое прызнанне Віленшчыны за беларускую этнічную тэрыторыю канешне ж уздымала патрыятычны настрой беларускіх нацыянальных дзеячаў, якія спадзяваліся на канчатковае замацаванне з цягам часу Вільні і Віленшчыны за Беларуссю, больш лаяльна ўспрымалі камуністычную агітацыю. Гэтаму садзейнічала і палітыка беларусізацыі ў БССР.

Парадокс, але КПЗБ стваралася як складовая частка Кампартыі Польшчы, краіны, якая акупіравала этнічную беларускую тэрыторыю. Улічваючы вопыт 1920 г., калі спроба саветызацыі Польшчы толькі ўмацавала нацыянальнае адзінства ІІ Рэчы Паспалітай, ігнараваць патрыятызм польскіх камуністаў немагчыма. Так што спадзяванні беларусаў на «польскі інтэрнацыяналізм» членаў КПРП былі памылковымі, ён хутчэй за ўсё быў звычайнай маскіроўкай польскага шавінізму ў адносінах да беларусаў.

Напрыклад, у канцы 1924 – пачатку 1925 г., калі КПЗБ сіламі так званых сэцэсіянераў рыхтавалася да антыпольскага паўстання ў Заходняй Беларусі. Вядома, што з 1924 г. польскія камуністы дамагаліся спынення партызанскай барацьбы ў Заходняй Беларусі. На думку Ю. Стасевіча, удзельніка заходнебеларускай партызанкі, усе беларусы з ЦК КПЗБ, з акругоў, сельскіх ячэек адкрыта выступілі супраць «расейскага і польскага камандавання». Але ў гэтай спрэчцы атрымала перамогу «маскоўская лінія» на згортванне партызанскага руху [9]. Такім чынам, польскія камуністы праявілі сябе сапраўднымі патрыётамі, прыклаўшы нама-

ганні для арганізацыі зрыву антыпольскага па сутнасці выступлення КПЗБ.

Верагодна, камуністычная арганізацыя беларускага кшталту магла паўстаць у выніку адпаведных захадаў беларускіх дзеячаў. Напрыклад, адзін з лідэраў заходнебеларускіх камуністаў, а пазней беларускай нацыянальнай фракцыі ў КПЗБ так званай сэцэсіі «Стары» (Ясінскі, Тамашэўскі), пра якога ў літаратуры дзіўным чынам адсутнічае нават мінімальная інфармацыя біяграфічнага характару, яшчэ ў кастрычніку 1922 г. пратэставаў супраць перадачы Віленскай акруговай партыйнай арганізацыі, членам акруговага камітэта якой ён быў, у веданне КПРП. «Стары» настойліва выказваўся за стварэнне Камуністычнай партыі Сярэдняй Літвы на правах секцыі Камінтэрна, сувязь якой з КПРП павінна была быць заснавана на ўзгодненасці дзеянняў, а не на падпарадкаванні агульнаму цэнтральнаму кіраўніцтву [4, с. 50]. Магчыма «Стары» і яго паплечнікі мелі канспіратыўныя сувязі з камуністычнымі дзеячамі ў БССР і планавалі яшчэ ў 1922 г. стварыць на базе кампартыі Сярэдняй Літвы самастойную, незалежную ад польскай кампартыі Камуністычную партыю Заходняй Беларусі. Больш таго, вядома, што БРА эвалюцыяніравала ў камуністычны бок у выніку сувязей і супрацоўніцтва, якое ўсталявалася паміж ёй і менавіта Віленскім камітэтам КПРП [4, с. 72], а магчыма і беларусамі з ЦК КП(б)Б.

Беларускую камуністычную партыю ў Заходняй Беларусі лагічней было б арганізацыйна злучыць з КП(б)Б, яна мела вопыт арганізацыі антыпольскага змагання ў час польска-савецкай вайны, якое арганізоўвала разам з Беларускай партыяй сацыялістаў-рэвалюцыянераў. Вядомыя планы падрыхтоўкі і правядзення паўстання з мэтай аб'яднання Заходняй Беларусі з БССР (у першую чаргу трэба згадаць рашэнні II канферэнцыі КПЗБ [10] і дзейнасць у БССР так званага Камітэта чыну [11]) патрабавалі нацыянальна арыентаванай беларускай кампартыі ў Заходняй Беларусі, якая, выкарыстоўваючы магчымасці КП(б)Б, магла б ажыццявіць названыя планы. Лідэры БССР валодалі інтэлектуальнымі і інфармацыйнымі сродкамі, мелі значную фінансава-матэрыяльную базу інспірацыі і падтрымкі беларускага руху, сувязі з беларускімі

непралетарскімі партыямі і іх лідэрамі, напрыклад эсэрамі, былі зацікаўлены ва ўмацаванні і кансалідацыі незалежніцкага беларускага руху ў Заходняй Беларусі, праводзілі агітацыю і прапаганду сярод беларускіх сіл, накіраваную на іх «паляўненне». Таму напэўна існавалі планы па стварэнні нелегальнай беларускай камуністычнай арганізацыі ў Заходняй Беларусі на базе БРА. Беларускія эсэры пасля падпісання Рыжскай дамовы катэгарычна адмаўлялі яе, арганізоўвалі паўстанцкія атрады, абапіраліся на бэнээраўскія сілы ў Літве праз урад БНР, які ўзначальваў В. Ластоўскі [12, с. 19–21]. Гэта пэўным чынам тлумачыць лёгкасць, з якой заходнебеларуская партызанка, у тым ліку і эсэраўская, да сярэдзіны 1920-х гадоў перайшла пад кантроль камуністаў з КПЗБ–КПП–Камінтэрна. Нездарма праз пэўны час у КПЗБ праявіла сябе так званая сэцэсія, выхадцы з БРА, якія не хацелі падпарадкоўвацца Маскве.

Відаць, пры арганізацыі беларускай кампартыі ў Заходняй Беларусі бальшавіцка-камінтэрнаўскае кіраўніцтва апярэдзіла ў гэтым беларускіх дзеячаў, беларусам не давярала, таму КПЗБ першапачаткова паўстала як «жыдоўская». Аднак новастворанай аўтаномнай адзінцы кампартыі Польшчы не хапала нацыянальнага каларыту, не было ніводнага члена ЦК КПЗБ, які свабодна валодаў бы беларускай мовай, партыя не мела б падтрымкі сярод беларускага насельніцтва. Таму спатрэбілася прымаць у свае шэрагі былых эсэраў – членаў БРА, магчымую ініцыятыву якой па стварэнні камуністычнай партыі перахапіў Камінтэрн.

Разам з тым уліванне БРА ў КПЗБ – магчыма саступка беларускім камуністам у КП(б)Б, якія пагаджаліся на «беларускасць» новастворанай партыі ўзамен на кааптаванне ў склад ЦК КПЗБ сваіх надзейных людзей. Гэтая падзея садзейнічала кансалідацыі камуністычных беларускіх і польскіх сіл, якія павінны былі супольна вырашаць задачы арганізацыі барацьбы за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне, аднак мэты і накіраванасць беларускай фракцыі ў КПЗБ не супадалі з імкненнямі польскіх камуністаў, беларускія камуністы мелі свае нацыянальныя інтарэсы і праграмы.

Саперніцтва паміж КПП і беларускімі дзеячамі ў КПЗБ можна назіраць на падставе двух устаноў, якія пэўным чынам характа-

рызуюць адносіны паміж беларускім і польскім бакамі ў іх змаганні за КПЗБ, за Заходнюю Беларусь. Вядома, што ў хуткім часе пасля стварэння КПЗБ і ўваходжання ў яе склад БРА ў ліпені 1924 г. пры садзейнічанні прадстаўніцтва ЦК КПРП пры Выканкаме Камінтэрна з мэтай арганізацыі дапамогі КПЗБ было створана Бюро дапамогі Кампартыі Заходняй Беларусі пры ЦК КП(б)Б («Закардоннае бюро»). У яго склад увaходзілі вышэйшыя дзяржаўна-партыйныя дзеячы БССР, у тым ліку У. Ігнатоўскі, які да кастрычніка 1924 г. кіраваў тэхнічнай работай і арганізоўваў выкананне рашэнняў [13]. Асоба У. Ігнатоўскага і яго дзейнасць паказальныя, менавіта пад яго патранажам дзейнічаў М. Гурын-Маразоўскі (Ханевіч, «Ян», «Стах»), будучы правадыр «сэцэсіі», накіраваны рашэннем Бюро ЦК КП(б)Б ад 28 лютага 1924 г. у Заходнюю Беларусь і ўведзены ў склад ЦК КПЗБ, падтрымліваў сувязь з Замежным бюро ЦК КП(б)Б і асабіста з У. Ігнатоўскім, дасылаў туды лісты, атрымліваў дырэктывы, у канцы 1924 г. фактычна выконваў функцыі сакратара ЦК КПЗБ. М. Гурын-Маразоўскі і «сэцэсія», магчыма са згоды У. Ігнатоўскага, мелі прамое дачыненне да выпрацоўкі і прыняцця на II канферэнцыі курса КПЗБ на арганізацыйную і палітычную падрыхтоўку да ўзброенага паўстання з мэтай аб'яднання Заходняй Беларусі з БССР – вызваленне з-пад Польшчы.

Пасля ўзнікнення ў складзе КПЗБ беларускай нацыянальнай фракцыі – так званай сэцэсіі, у лютым 1925 г. Бюро дапамогі было скасавана. Замест яго было створана Прадстаўніцтва ЦК КПЗБ пры ЦК КП(б)Б, якое фактычна працавала пад кіраўніцтвам Прадстаўніцтва КПП пры Выканкаме Камінтэрна ў Маскве, гэта значыць, польскія камуністы, ліквідаваўшы так званую сэцэсію, змаглі пазбавіцца значнай, часам вырашальнай ролі камуністаўбеларусаў, навязаць КПЗБ свой кантроль, выводзячы яе з-пад уплыву КП(б)Б, якая дэманстравала сваю незадаволенасць і патрабавала своечасовага інфармавання па пытаннях палітычнай работы ў Заходняй Беларусі [14].

Стварэнне КПЗБ у тым выглядзе, у якім яно адбылося, было на карысць польскім камуністам, якія атрымалі пэўны кантроль над беларускім рухам, маглі аказваць на яго вырашальны ўплыў.

З другога боку, неабходна ўлічваць меркаванне Р. Р. Лазько, які абгрунтаваў думку аб тым, што ў Маскве глядзелі на КПЗБ і рэвалюцыйны рух у Польшчы як на сродак і своеасаблівы рычаг, з дапамогай якога пры неабходнасці можна было аказваць уплыў на Польшчу падчас савецка-польскіх дыпламатычных гульняў [15, с. 202–203].

Такім чынам, стварэнне КПЗБ, разгортванне ёй пад нацыянальнымі беларускімі сцягамі «барацьбы за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне» павінна разглядацца ў цеснай сувязі з дзейнасцю Камінтэрна па распаўсюджванні сусветнай рэвалюцыі, КП(б)Б, КПП, з арганізацыяй партызанскага руху, «сэцэсіяй». У гэтым кантэксце трэба больш пільна вывучаць гісторыю БПС-Р і БРА, іх дзейнасць па арганізацыі партызанскага руху, асэнсаванне пазіцыі іншых беларускіх нацыянальна-дэмакратычных партый і арганізацый, якія не падтрымлівалі камуністычную ідэалогію, але былі перакананымі прыхільнікамі незалежнасці Беларусі, яе тэрытарыяльнай цэласнасці, па прынцыпова важных для беларускага нацыянальна-вызваленчага руху пытаннях ішлі на супрацоўніцтва з КПЗБ.

Уважлівае знаёмства з айчыннай гістарыяграфіяй гісторыі КПЗБ патрабуе кваліфікаванага навуковага адказу на пытанне наколькі Камуністычная партыя Заходняй Беларусі была не па назве, а па сутнасці беларускай палітычнай арганізацыяй, ці былі накіраваны яе лозунгі барацьбы за беларускую мову, нацыянальную школу, самавызначэнне Заходняй Беларусі на карысць беларускага народа, а не з'яўляліся тактычным захадам для ўмацавання пракамінтэрнаўскіх пазіцый і нівеліравання нацыянальнага кампанента ў рэвалюцыйным руху ўвогуле.

Крыніцы і літаратура

1. Корчык, П. Нацыянал-апартунізм у КПЗБ і ідэалагічная спадчына «Беларускай рэвалюцыйнай арганізацыі» / П. Корчык // Бальшавік Беларусі. – 1934. – № 7. – С. 35–43.

2. Политические партии в Польше, Зап. Белоруссии и Зап. Украине. – Минск, 1935. – 335 с.

3. Валевіч, І. Р. Першыя гады Кампартыі Заходняй Беларусі. Успаміны падпольшчыка. 1921–1925 гг. / І. Р. Валевіч. – Менск, 1935. – 48 с.

4. Революционный путь Компартии Западной Белоруссии (1921–1939 гг.) / А. Н. Мацко, Н. С. Орехво, Т. И. Притыцкая [и др.]; под ред. А. Н. Мацко и В. Е. Самутина. – Минск, 1966. – 403 с.
5. Коминтерн против фашизма: Документы / Рос. акад. наук, Ин-т всеобщ. истории, Федер. арх. служба России, Рос. центр хранения и изучения док. новейшей истории. – М., 1999. – 505 с.
6. Политбюро ЦК РКП(б) – ВКП(б) и Коминтерн, 1919–1943: Документы / Федер. арх. служба России, Рос. гос. арх. соц.-полит. истории. – М., 2004. – 958 с.
7. Фирсов, Ф. Секретные коды истории Коминтерна, 1919–1943 / Ф. Фирсов; [Ассоциация исследователей российского общества (АИРО – XXI)]. – М., 2007. – 568 с.
8. Міхнюк, У. М. Расійска-літоўскі дагавор 12ліпеня 1920 г.: гістарыяграфія праблемы / У. М. Міхнюк // Беларус. гіст. часоп. – 2003. – № 8. – С. 3–11.
9. Стасевіч, Ю. Партызанка Заходняй Беларусі / Ю. Стасевіч // Пагоня. – 1995. – 17–23 сак., 24–30 сак.
10. Грамовіч, У. Гурын-Маразоўскі Міхаіл Іванавіч / У. Грамовіч, Т. Процька // Энцыкл. гісторыі Беларусі: у 6 т. – Мінск, 1996. – Т. 3. – С. 178.
11. Пашкевіч, А. Ф. Атаман Дзяргач: невядомыя старонкі біяграфіі, ці Да гісторыі палітычнага авантурызму ў беларускім нацыянальным руху / А. Ф. Пашкевіч, А. М. Чарнякевіч // Берасцейскі хранограф: зб. навук. прац. – Брэст, 2004. – Вып. 4. – С. 314–334.
12. Сорокин, А. А. Революционное и освободительное крестьянское движение в Западной Белоруссии (1920–1939 гг.) / А. А. Сорокин. – Минск, 1970. – 171 с.
13. Ладысеў, У. Бюро дапамогі Кампартыі Заходняй Беларусі пры ЦК КП(б)Б / У. Ладысеў // Энцыкл. гісторыі Беларусі: у 6 т. – Мінск, 1994. – Т. 2. – С. 154.
14. Ладысеў, У. Прадстаўніцтва ЦК КПЗБ пры ЦК КП(б)Б / У. Ладысеў // Энцыкл. гісторыі Беларусі: у 6 т. – Мінск, 1999. – Т. 5. – С. 559–560.
15. Лазько, Р. Р. Перад патопам (Еўрапейская палітыка Польшчы. 1932–1939 гг.) / Р. Р. Лазько. – Мінск, 2000. – 354 с.

І. А. Саракавік

Акадэмія кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, Мінск

ОРГАНЫ ЎНУТРАНЫХ СПРАЎ: АРГАНІЗАЦЫЯ І ДЗЕЙНАСЦЬ У ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ (1939–1941 гг.)

Праблема арганізацыі і дзейнасці органаў унутраных спраў у Заходняй Беларусі ў 1939–1941 гг. не знайшла значнага адлюстравання ў гістарычнай навуцы: не існуе спецыяльных даследаў. Аднак некаторыя аўтары звярталіся да гэтай праблемы, калі раз-

глядалі рэпрэсіі і дэпартацыі ў гэтым рэгіёне. Адным з першых гэты аспект закрануў прафесар А. Хацкевіч [1], а таксама акадэмік М. Касцюк [2, с. 195–212; 3, с. 463–467], прафесар Я. Міранові [4, с. 121–124], Г. Балашова, М. Мананка [5, с. 148–152], аўтар гэтых радкоў [6, с. 199–203]. Безумоўна, аспект арыштаў і дэпартацый, якія ажыццяўлялі органы НКУС, важны пры даследаванні адзначанай тэмы, але не вычэрпвае сябе. Іх структура была разгалінаванай. Яна складалася з упраўленняў дзяржаўнай бяспекі, пагранічнай і ўнутранай аховы, міліцыі, аддзелаў месцаў зняволення, пажарнай аховы, транспартнага, сакратарыята [7, арк. 31]. Нават гэты пералік структуры паказвае, што дыяпазон іх дзеянняў быў значна шырэйшы, чым рэпрэсіі.

Тэма арганізацыі і дзейнасці органаў унутраных спраў (ОУС) у Заходняй Беларусі шматгранная. Яны – матэрыяльны прыдатак механізму дзяржавы. Ні адна дзяржава з любым палітычным рэжымам не можа абыйсціся без іх, бо яны выконваюць адну з важнейшых унутраных функцый дзяржавы: падтрыманне правапарадку. Справа іншая, як палітычны рэжым выкарыстоўвае іх. Тым не менш, яны – пэўнае люстэрка дзяржавы. Менавіта ў такім кантэксце і патрэбна іх разглядаць.

Арганізацыя і дзейнасць ОУС у Заходняй Беларусі былі папярэдне сплaніраваны па заданні вышэйшага партыйнага кіраўніцтва СССР да ўвядзення Чырвонай Арміі ў гэты рэгіён II Рэчы Паспалітай 17 верасня 1939 г. Улічваючы адметнасці грамадска-палітычнага ладу, палітычнага рэжыму ў Польшчы, наяўнасці там прыватнай уласнасці, дзейнасці каталіцкага касцёлу, ЦК ВКП(б) 15 верасня 1939 г. сваёй пастановай зацвердзіў Палажэнне аб палітычным аддзеле Галоўнага ўпраўлення рабоча-сялянскай міліцыі НКУС СССР і Інструкцыю аб рабоце палітаддзелаў галоўных упраўленняў і аддзелаў НКУС СССР.

Асаблівая ўвага палітаддзелаў, адзначалася ў Палажэнні, павінна быць звернута на камуністычнае выхаванне асабовага складу, умацаванне яго маральна-палітычнага стану і службовай дысцыпліны. Абапіраючыся на палітаддзелы і партыйныя арганізацыі тэрытарыяльных органаў міліцыі, палітаддзел Галоўнага ўпраўлення міліцыі НКУС павінен быў мабілізаваць супрацоўнікаў на

паспяховае выкананне задач, якія стаялі перад імі, змагацца за ўмацаванне сацыялістычнай законнасці, усямерна падтрымліваць і развіваць сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва [8, с. 33].

З хуткім прасоўваннем Чырвонай Арміі аднвчасова ў тылу яе пачыналі дзейнічаць супрацоўнікі НКУС СССР. У адпаведнасці з загадам камандуючага войскамі Беларускага фронту М. П. Кавалёва ад 19 верасня наконт заклiку да насельніцтва фарміраваць мясцовыя органы савецкай улады – часовыя ўпраўленні, а ў сельскай мясцовасці – сялянскія камітэты, іх кіраўнікамі выступалі партыйныя і савецкія работнікі, а галоўнымі арганізатарамі – супрацоўнікі органаў унутраных спраў. Менавіта апошнія адсочвалі палітыка-маральнае становішча насельніцтва Заходняй Беларусі і інфарміравалі аб ім кампетэнтныя органы, падтрымлівалі адпаведны парадак, ізаліравалі «контррэвалюцыйныя элементы», узялі на сябе асноўную працу па падборы членаў мясцовых органаў улады з ліку мясцовага насельніцтва і арганізацыі Рабочай гвардыі. Не забываліся яны адсочваць і маральны стан партыйных, савецкіх, гаспадарчых работнікаў, накіраваных з БССР і іншых рэгіёнаў СССР дзеля ўстанаўлення савецкіх парадкаў, інфармуючы пра гэта кіраўніцтва ЦК КП(б)Б [3, с. 452, 454].

Аднак поўнасцю разгарнуць сваю дзейнасць ОУС у Заходняй Беларусі змаглі пасля прыняцця Народным сходам Заходняй Беларусі 28 кастрычніка 1939 г. рашэння аб уваходжанні гэтай беларускай тэрыторыі ў склад БССР і СССР. Ужо 2 лістапада 1939 г. загадам НКУС СССР згодна з рашэннем, прынятым пятай (нечарговай) сесіяй Вярхоўнага Савета СССР першага склікання, «Аб уключэнні Заходняй Беларусі ў склад Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік і ўз'яднанні яе з Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікай» былі ўтвораны ўпраўленні НКУС па Беластоцкай (уваходзілі Беластоцкі гараддзел, Высока-Мазавецкі, Бельскі, Сакольскі, Гродзенскі, Ломжанскі, Ваўкавыскі, Шчучынскі, Аўгустоўскі павятовыя аддзелы), Навагрудскай (Шчучынскі, Валожынскі, Стаўпецкі, Баранавіцкі, Нясвіжскі, Слонімскі, Лідскі павятовыя аддзелы), Пінскай (Камень-Кашырскі, Столінскі, Драгічынскі, Кобрынскі, Косаўскі, Лунінецкі, Брэст-Літоўскі, Пружанскі павятовыя аддзелы), Вілейскай (Свянцянскі, Дзісенскі,

Ашмянскі, Браслаўскі, Пастаўскі, Маладзечанскі павятовыя аддзелы) абласцях [9, арк. 109–111].

Але на гэтым станаўленне ОУС не завяршылася. У сувязі са змяненнямі ў адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзеле Беларусі адбываліся змены і мясцовых органаў унутраных спраў. 29 лістапада загадам НКУС СССР было арганізавана Упраўленне НКУС па Брэст-Літоўскай вобласці. Яму падпарадкоўваліся Пружанскі і Кобрынскі павятовыя аддзелы НКУС, якія адначасова выключаліся з падпарадкавання УНКУС па Пінскай вобласці. Брэст-Літоўскі павятовы аддзел УНКУС па Пінскай вобласці расфарміроўваўся. А загадам наркамата ўнутраных спраў БССР ад 13 снежня Упраўленне НКУС па Навагрудскай вобласці было перайменавана ў Баранавіцкае, Баранавіцкі павятовы аддзел НКУС – у Навагрудскі, Стаўпецкі павятовы аддзел НКУС – у Стаўбцоўскі. Камень-Кашырскі павятовы аддзел УНКУС па Пінскай вобласці скасоўваўся [9, арк. 113, 116–117].

20 снежня 1939 г. загадам НКУС БССР аб'яўлены назвы і дыслакацыя органаў НКУС у заходніх абласцях Беларусі (дзейнічалі да пачатку Вялікай Айчыннай вайны) у адпаведнасці з Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР аб іх адміністрацыйным падзеле:

УНКУС па **Беластоцкай вобласці** (Беласток): Беластоцкі гараддзел (Беласток), Гродзенскі павятовы аддзел (ПА) (Гродна), Ваўкавыскі ПА (Ваўкавыск), Аўгустоўскі ПА (Аўгустова), Сакольскі ПА (Сокал), Бельскі ПА (Бельск), Ломжанскі ПА (Ломжа), Высока-Мазавецкі ПА (Высокі Мазавец), Граеўскі ПА (Граеў);

УНКУС па **Баранавіцкай вобласці** (Баранавічы): Навагрудскі ПА (Навагрудак), Вілейскі ПА (Вілейка), Шчучынскі ПА (Шчучын), Стаўбцоўскі ПА (Стаўбцы), Слонімскі ПА (Слонім), Нясвіжскі ПА (Нясвіж), Лідскі ПА (Ліда);

УНКУС па **Вілейскай вобласці** (Вілейка): Ашмянскі ПА (Ашмяны), Свянцянскі ПА (Свянцяны), Браслаўскі ПА (Браслаў), Дзісенскі ПА (Глыбокае), Маладзечанскі ПА (Маладзечна), Пастаўскі ПА (Паставы);

УНКУС па **Пінскай вобласці** (Пінск): Столінскі ПА (Столін), Драгічынскі ПА (Драгічын), Лунінецкі ПА (Лунінец), Косаўскі ПА (Косава);

УНКУС па **Брэсцкай вобласці** (Брэст): Кобрынскі ПА (Кобрын), Пружанскі ПА (Пружаны). Брэсцкі ПА НКУС расфарміроўваўся, яго асабовы склад накіроўваўся на ўкамплектаванне УНКУС па Брэсцкай вобласці [10, арк. 95–96].

У сувязі з вялікім аб'ёмам працы, выкліканым далучэннем да Савецкага Саюза заходніх раёнаў Беларусі і Украіны, Літвы, Латвіі, Эстоніі, Паўднёвай Бесарабіі і Паўночнай Букавіны, Народны камісарыят унутраных спраў СССР 3 лютага 1941 г. быў падзелены на два наркаматы: НКУС СССР і НКДБ СССР. У складзе першага знаходзілася і Галоўнае ўпраўленне міліцыі [11, с. 26]. Аналагічныя змены адбыліся і ў саюзных рэспубліках. У прыватнасці, 4 сакавіка 1941 г. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР НКУС Беларускай ССР быў падзелены на Народны камісарыят дзяржаўнай бяспекі БССР і Народны камісарыят унутраных спраў БССР [12, с. 297].

З-за пагрозы вайны структура Наркамата ўнутраных спраў БССР патрабавала пэўных карэктыў. Таму, напрыклад, 23 мая 1941 г. загадам НКУС СССР аб'яўлена структура НКУС БССР. Яна ўключала кіраўніцтва (нарказм, 2 намеснікі: намеснік – начальнік Упраўлення міліцыі, намеснік – начальнік аддзела кадраў), а таксама кантрольна-інспектарскую групу пры наркаме, групу кадыфікацыі і архіва, шэраг упраўленняў, у тым ліку мясцовай супрацьпаветранай абароны, шэраг аддзелаў, у іх ліку кадраў спецыяльны; аддзяленні: сувязі «ВЧ», па абслугоўванні прызыву ў Чырвоную Армію, мабілізацыйную інспекцыю (на правах аддзялення). Усяго па НКУС БССР загадам прадугледжвалася 865 супрацоўнікаў. Упраўленне міліцыі акрамя традыцыйных падраздзяленняў уключала аператыўны аддзел з 3 аддзяленнямі – зброі, ядаў, узрыўных рэчываў, паліграфіі; арыштаў, вобыскаў, вонкавага назірання; навукова-тэхнічнае, і пашпартна-вышуковы аддзел з 4 аддзяленнямі– пашпартнае, выдачы дазволу ў пагранпаласу, уліку ваеннаабавязаных, вышуковае. Ва Упраўленні працавалі 253 супрацоўнікі.

Аналагічнай была структура, напрыклад, Упраўлення НКУС Баранавіцкай вобласці, толькі з меншымі штатамі: усяго налічвалася 302 супрацоўнікі. Ва Упраўленні НКУС Беластоцкай вобласці

служылі 353 супрацоўнікі. Структура і штаты райаддзелаў былі значна меншымі. Структура Нясвіжскага райаддзела НКУС Баранавіцкай вобласці складалася з кіраўніцтва – 3 чалавекі (начальнік, яго намеснік, палітрук), сакратарыята – 6, аддзялення крымінальнага вышуку – 10, пашпартна-вышуковага аддзялення – 5, апарата службы і баявой падрыхтоўкі, фінапарата, ААГС, пажарнай аховы, архіва – па 1, участковых ўпаўнаважаных – 18, асобных страявых падраздзяленняў – 19, ЗАГС – 2, інспекцыі папраўча-працоўных работ – 3. Усяго 71 супрацоўнік [13, арк. 1–29, 31–41, 52–53, 64–76]. Як бачна з гэтага пераліку, існавала разгалінаваная сістэма органаў унутраных спраў, у тым ліку і ў Заходняй Беларусі, якая і пасля 2 лістапада 1939 г. працягвала мець дэмаркацыйную мяжу з Усходняй Беларуссю з высокім плотам, калючым дротам, пагранічнікамі, кулямётамі і асобнымі працусками.

Усяго ў Заходняй Беларусі перад Вялікай Айчыннай вайной несла службу прыкладна 7–8 тыс. супрацоўнікаў органаў унутраных спраў, не ўлічваючы штаты страявых падраздзяленняў. У сувязі з гэтым тут былі разгорнуты кароткачасовыя школы дзеля падрыхтоўкі начальніцкага і радавога складу міліцыі, прынятага на службу з ліку мясцовага насельніцтва. У сваёй большасці гэта былі рабочыя і сяляне, якія належалі да ліку камуністаў і камсамольцаў. З мэтай аказання дапамогі ОУС рэспублік Прыбалтыкі і заходніх абласцей Украіны і Беларусі ў 1940 г. у НКУС СССР быў створаны спецыяльны аддзел з прадстаўнікоў вядучых служб саюзнага наркамата, які падпарадкоўвайся непасрэдна намесніку наркама [5, с. 149].

